

Dos jixes fun jidiš

Jidiš mit ivre, mit xumeš un Rəše,
Ivit haloxe, Agode un šc...
Mit jidiš – abej verxve, ro Rəše,
Mit jidiš – xkire, mu...n ...

Mit jidiš – xidoc, ...ajse, der mi...
Do varštat, dos ...ibl, di ...ejt.
Mit jidiš – dos lid far kinder in vig...
Un mit jidiš – di gilderne kejt.

Eliezer Šindler.

ᔕᑎᗅ ᐊᓯᑦᓂᐊᕐᓂᖅ ᐱᓕᕆᔨᓂᖅ

ᐊᒻᒪᓗᓕᒫᓂᖅ ᓴᓇᔨᓂᖅᓴᖅ, ᓴᓇᓕᖅ ᑎᑎᕋᕐᓂᖅ, ᑲᑎᒪᔨᖅ ᓴᓇᓕᖅ ᐃᓚᖏᑦ ᐊᑐᐃᓐᓇᖅᑐᑦ ᐊᑐᖅᑕᐅᓯᒪᓂᖅ.

. . .
און ייִדיש איז דער פּראָסטער קראַנץ פון דעמבנבלעטער
אויף די אריַינגאַנגען די הייליק־וואָכיקע פון שטאָט.
דאָס גרויע ייִדיש איז דאָס ליכט, וואָס פינקלט אין די פינצטער —
אָ, ווי אַ גייער ביַי אַן אַלטן ברונעם אונטערוועגס,
זיץ איך דאָ און האָרך די רויע שטים פון ייִדיש.
משה קולבאַק. ווילנע

. . .
Ідыш – просты вянок з дубовага лісьця
На гарадзкіх брамах сьвяточна-будзённых.
Шэры ідыш – сьвятло, што зіхціць у вокнах –
О, як вандроўнік каля студні на шляху,
Прысеў я й слухаю сыры голас ідышу.
Майсей Кульбак. Вільня

. . .
ייִדיש רעד, כדי זאָלסט ניט פאַרשטומען אונדזער קול,
ס'זאָל דורך דיר ווידער זינגען אונדזער דערוואָרגן געזאַנג.

. . .
ייִדיש - אַ געיאָמער אַזאַ וואָסער טויט קען פאַרשטומען!
ייִדיש - אַ תוכחה אַזאַ וואָסער קללה קען פאַרשילטן!
אָ, ווי דיַין פאָלק, ווי דער ים זאָל ייִדיש קיינמאָל ניט פאַרשטומען,
כדי אונדזער בלוט זאָל קיינמאָל, קיינמאָל ניט ווערן פאַרקילט,
אינגאַנצן ייִדיש זייַנען מיר - יעדעס וואָרט איז אונדזערס אַ גליד -
יערער אות: פון פאָנאַר, פון פאָלעגאָן - אַן אויסגעלאַכטע טרער:
פון דער גוטער מומע ביילקע - די ניט דערזאָגטע וויזוי,
איר געבעט: איינציקן בעל־רחמים - פון טויט אַליין דערהערט.

. . .
"ייִדיש רעד, דורך דיר זאָל אונדזער האַס ניט אויפהערן צאָרנען.
ייִדיש רעד, דורך דיר זאָל אונדזער ליבשאַפט יעדן פרילינג אויפמאָנען".

. . .
ברודער, דורך יעדן חן פון ייִדיש, זע אַ נייַעם באַגינען,
דורך יעדן קלאַנג הער אַ נאָך ניט געבאָרענעם ייִדן.
וויפל ווערטער אין ייִדיש, וויפל שטראַלן אין באַגינען,
אַזויפיל מאָרגנדיקע ייִדן וועלן נאָך לאַכן אויף ייִדיש.
ייִדיש, דער וווּנדער וואָס האָט אויף גאָר דער ערד,
ווי משהס שטעקן, ביַי יעדן שליַדער זיך צעבליט,
וועט נאָך צעטאָגן פינצטערן אַש זיַין באַשערט.
יעדער אונטערגאַנג וועט פאַרגיין ביַים אויפגייענדיקסטן ליד:
"זאָג ניט קיינמאָל אַז דו גייסט דעם לעצטן וועג".
מיט חכמה פון גליַד־ווערטל, מיט גינגאָלד פון פאָלק־ליד,
לויכט מיַין מאַמע־לשון - אַן אייביק ערשטער וועג.
מעינקע קאַץ. די צוואה

ᚹᚩᚱᛞ
"Меланхт"
2008



ІДЫШ-БЕЛАРУСКІ СЛОЎНІК

з прыказкамі, прымаўкамі, прыгаворкамі, выслоўямі, фразэмамі, параўнаньнямі, зычаньнямі, вітаньнямі, дражнілкамі-кепікамі, праклёнамі, загадкамі, скорагаворкамі, каламбурамі, цытатамі з жыдоўскіх песень, анэкдотаў і літаратурных твораў

Сабраў і пераклаў на беларускую мову

АЛЯКСАНДАР АСТРАВУХ

МІНСК
“Медисонт”
2008

УДК 811.161.3'374=112.28
ББК 81.2Идиш
И29

ВЫДАНЬНЕ [illegible] МАГЧЫМЫМ ДЗЯКУЮЧЫ ШЧЫРАЙ ДАПАМОЗЕ
[illegible]) АЛЯКСАНДРАВІЧА ГАРБЕНКІ

דאָס בוך גייט אַרויס אַדאַנק דער ברייטה[illegible]שיצונג
פון אַנדריי (אַברהם) גאָרבענ[illegible]

ISBN 978-985-6530-86-2

© Астравух А. М., укладаньне, пераклад на беларускую мову, ілюстрацыі, 2008
© Афармленьне. СТАА "Медисонт", 2008

ЗЬМЕСТ

Прадмова — Hakdome 8

Предисловие 9

Лексыкаграфічныя крыніцы — Bibliografje fun mekojrim 10

МАМЭ-ЛО(К)ШН — МУТЭРШ-“ПРАХ” — МАТЧЫНА МО(Й)ВА
або Якія чэрці растуць у “Герадотавым” ціхім балоце 15

“ЖАРГОН” — “МАМЭ-ЛОШН” или “МАЙНЭ-ЛОШН” 36

Як карыстацца слоўнікам — Onvajzungen farn banicer 43

Дыялекты ідышу — Jidiše dialektn 48

Сьпіс скаротаў — Kircungen 50

ALEFBEJS — АЛЬФАБЭТ — אַלף־בית 51

Слоўнік
A a 54
B b 114
C c 180
Č č 218
D d 224
E e 254
F f 270
G g 326
H h 366
I i 394
J j 410
K k 424
L l 478
M m 502
N n 560
O o 580
P p 656
R r 688
S s 708
Š š 728
T t 784
U u 810
V v 836
X x 860
Z z 882
Ž ž 900

Дадатак — Cugob
Беларуска-жыдоўска-беларускі слоўнічак 905

Ад Шэнёў да Пружаны (У. Ракіцкі) 924

Mejnke Kac. Maj in Mixališek un Svincjan 926

ПРАДМОВА — НАКDOME

Far der šprax leb ix. (Дзеля гэтай мовы жыву я.)
Аляксандар Гаркаві, 1888.

Ва усіх куточках сьвету размаўлялі і думалі жыды на гэтай чароўнай гаворцы...
Арнольд Цвэйг, 1957.

Dos same greste xideš, ven a jid hajnt redt nox jidiš.
(Самы вялікі цуд, калі жыд сёньня яшчэ размаўляе на ідышы.)
Мэер Харац

Гэта кніга ёсьць вынік маёй дзесяцігадовай працы, працы ня столькі са слоўнікам, колькі з моваю ідыш. Гэта бадай што дзёньнік, у які, наколькі сталася магчымым, дакладна ўпісаны моманты нараджэньня ўва мне гэтай мовы (вядома нават дакладная дата і месца нараджэньня: ліпень 1984 г., мястэчка Амсьціслаў), моманты яе бестурботнага дзяцінства, маруднага росту, сталасьці... У ім зафіксаваны і ўсе крызы розных узростаў. Разам з тым у гэтым слоўніку можа бракаваць самых звычайных рэчаў і словаў (да прыкладу, адсутнічае слова "норма") – чамусьці яны мяне не зацікавілі, гэтак жа як нас не цікавіць нешта ў пэўным узросьце. Але тут шмат дзіўных, састарэлых, мала вядомых, маўляў, непатрэбных словаў. Менавіта яны для мяне найдаражэйшыя, менавіта ім я даю перавагу і менавіта іх больш за ўсё я баюся згубіць. Маю ўпэўненасьць, што хібаў у гэтай кнізе нашмат болей як добрых якасьцяў. У слоўніку шмат што не адпавядае сучасным слоўнікавым стандартам. Часам рэчы, якія я чамусьці [illegible] звычайныя, у слоўніку бачацца дзіўнымі, але зьмяніць іх мне не з рукі. Напрыклад, у слоўніку [illegible] (~), што выклікае безьліч паўтораў, але, напэўна, і гэта можа здацца прыдатным. У лепшым выпадку [illegible] б назваць аўтарскім слоўнікам альбо "Мой навучальны слоўнік ідышу".

Але ж гэты слоўнік мае адну істотную вартасьць: як усялякі дзёньнік ён небесстароньні, ён прадузяты! У ім жыве мой нэрв, ён дыхае маім подыхам. У ім у розных якасьцях разам са мною жывуць і ўсе блізкія мне людзі.

У розныя часы і ў розных ступені ў маім ідыш-беларускім дзёньніку сапраўды жылі й жывуць шмат якія людзі. Маю жаданьне тутака іх усіх пайменаваць. Перад усім гэта мая сям'я: мае бабулі Хадорка і Анюта, мае дзядулі Ціхан і Пятрусь, мая матуля Маруся і мой тата Міхась, мой брат Аляксей, мая жонка Юлія й мае дзеці Ян і Радзім. Гэта й мае настаўнікі ідышу: Алег Хадыка, Гірша Рэлес, Мэньдзі Каган, Довід Кац, Ганна Вершык, Джэральд Фрэйкс, Ханан Бордзін, Элі Кац, Іцхак і Эльязэр Ніборскія, Аўром Ліхтэнбойм, Мірыям Гофман. Гэта й блізкія мне ў ідышы і ў беларушчыне людзі: Дзіна Харык, Шпрынца Рохкінд, Уладзімер Ракіцкі, Сяргей Верамейчык, Хведар і Алена Сарокі (разам з усімі колішнімі й цяперашнімі "бастальянцамі"), Вольф Рубінчык, Зьміцер Міцура, Гірша Пэрлаў, Гарнэт Мураў, Клэр ле Фоль, Шарон Бэрнштэйн, Марыя Крупавец, Паліна Белілоўская, Аўгіньня Хаздан, Дзіна Іткіна, Міша Акерман, Уладзімер Адамчык, Мікола Раманоўскі, Андрэй Антонаў, Зьміцер Ціхановіч, Генадзь Лойка, супрацоўнікі Нацыянальнага Цэнтру імя Ф. Скарыны Любоў Уладыкоўская-Канаплянік, Адам Мальдзіс і Аляксей Глушко. Асобна хочацца ўзгадаць Андрэя Гарбенку.

У новым "Ідыш-беларускім слоўніку" зьмешчана лексыка найбольш вядомых ідыш-слоўнікаў (аўтары: А. Гаркаві, Г. Страк, Ю. Марк, У. Вайнрайх, Н. Стучкоў, Р. Лёцш, Э. Фальковіч, Ш. Рохкінд, Г. Шкляр, Ш. Плаўнік, Н. Рубінштэйн, І. Бэрнштэйн, Ш. Бастомскі, І. Гуры, І. Ніборскі і інш.), апрача таго частка неапублікаваных фразэалягічных матэрыялаў з архіву Ш. Рохкінд і В. Сосенскага, жывая лексыка ідышу. У слоўніку блізу 25000 слоўных артыкулаў, 50000 словаў, больш за 5000 прыказак і прымавак, вялікая колькасьць ідыёмаў і цытатаў з літаратурных твораў і жыдоўскіх песень, анэкдотаў, блаславеньні й праклёны, кароткая этымалёгія словаў, а таксама аднакарэнныя словы, сынонімы й антонімы да словаў сэміцкага паходжаньня.

Я браў за мэту сабраць разам пад аднае вокладкай усё найлепшае ў ідышы, той ідышны скарб, які злы лёс раскідаў па розных краінах, мовах і друкаваных выданьнях. Мае высілкі пайшлі на тое, каб адшукаць і перакласьці на беларускую мову паўнакроўную лексыку перадваеннага жыдоўскага мястэчка: рэлігійную й простанародную, літаратурную й дыялектную, жартаўлівую й сур'ёзную, іранічную й зьедлівую, пяшчотную й грубую, з праклёнамі й брыдкай лаянкай.

Мой слоўнік – гэта адначасова і калектыўная праца шматлікіх разнамоўных людзей, якія шчыра вераць у гэты ***"моўны цуд сьвету"***, якія ***"сёньня размаўляюць на ідышы"*** і якія чуюць у гэтай ***"чароўнай гаворцы"*** рэха шматвяковой культуры розных народаў.

Шчыры дзякуй усім, хто так ці йнакш спрычыніўся да зьяўленьня гэтай кнігі!
Зь вялікай падзякай прыму ўсе заўвагі й пажаданьні разам з заўважанымі памылкамі й хібамі.

вул. Жукоўскага, 6–2–163
220007 Менск
Рэспубліка Беларусь
Тэлефон: +375 17 222 04 05, +375 29 5549 649
e-mail: astraukh@mail.ru

27 студзеня 2007 г. Аляксандар Астравух

ПРЕДИСЛОВИЕ

Тише идиш – дальше будешь! (анекдот)

… и я сказал себе: будь что будет! Я буду бороться в первых рядах
за этот самый жаргон и буду им служить моему народу.
Менделе Мойхер-Сфорим (1836–1917).

Если мне нечего сказать, я пишу по-английски. Если есть – то на идише.
Мойше Надир (1885–1943).

Эта книга – итог моей десятилетней работы, работы не столько над словарём, сколько над самим языком идиш. Её можно было бы даже назвать дневником, в который по возможности точно вписаны моменты рождения во мне этого языка (известна даже точная дата и место рождения: июль 1984 г., местечко Мстиславль), моменты его раннего безаботного детства, медленного роста, взросления... В нём зафиксированы и все кризисы разных возрастов. И вместе с тем в этом словаре может не оказаться самых привычных вещей и слов (например, отсутствует слова "норма") – почему-то они меня не заинтересовали, так же как что-то не интересует нас в определённом возрасте. Но зато тут много редких, мало употребимых, я бы даже сказал, ненужных слов. Именно они мне дороже всего, и именно их я больше всего боюсь потерять. Я уверен, что недостатков в этой книге гораздо больше, нежели достоинств. В словаре далеко не всё соответствует современным словарным стандартам. Есть вещи довольно странные для словарей, но и они мне кажутся почему-то очень обычными и привычными, и мне вовсе не хочется их менять. Например, в словаре нет тильды (~), поэтому много разного рода повторений, но, может быть, так даже удобней. В лучшем случае эту книгу можно было бы назвать авторским словарём или, например, "Мой учебный идиш-словарь".

Но всё же у этого словаря есть одно существенное достоинство: как всякий дневник он предвзят, он пристрастен! В нём живёт мой нерв, он дышит моим дыханием. В нём по-разному живут вместе со мною и все близкие мне люди.

В разное время и в разной степени в моём идиш-белорусском дневнике действительно жили и живут очень многие люди. Очень бы хотелось их всех здесь назвать. Прежде всего это моя семья: мои бабушки Хадорка и Анюта, мои дедушки Тихон и Пятрусь, моя мама Маруся и мой папа Михась, мой брат Алексей, моя жена Юлия и мои дети Ян и Радим. Это и мои учителя идиша: Олег Хадыка, Гирш Релес, Менди Каган, Довид Кац, Анна Вершик, Джерольд Фрейкс, Ханан Бордин, Эли Кац, Ицхок и Элиезер Ниборские, Авром Лихтенбойм, Мириам Гофман. Это и близкие мне в идише и в белорусском языке люди: Дина Харик, Шпринца Рохкинд, Вольф Рубинчик, Владимир Ракицкий, Сергей Веремейчик, Фёдар и Елена Сороки (вместе со всеми "бастальянцами"), Дмитрий Мицура, Гирш Перлов, Гарнет Мурав, Клер ле Фоль, Шарон Бершштейн, Мария Круповец, Полина Белиловская, Евгения Хаздан, Дина Иткина, Миша Аккерман, Владимир Адамчик, Николай Романовский, Андрей Антонов, Дмитрий Тиханович, Геннадий Лойка, сотрудники Национального Центра им. Ф. Скорины Любовь Владыковская-Конопляник, Адам Мальдис и Алексей Глушко. Отдельно хочется назвать Андрея Горбенко.

В новый "Идиш-белорусский словарь" вошла лексика наиболее известных идиш-словарей (авторы: А. Гаркави, Г. Страк, Ю. Марк, У. Вайнрайх, Н. Стучков, Э. Фалькович, Ш. Рохкинд, Г. Шкляр, С. Плавник, Н. Рубинштейн, И. Бершштейн, Ш. Бастомский, И. Гури, Р. Лёцш, И. Ниборский и др.), кроме этого часть неопубликованных фразеологических материалов из архива Ш. Рохкинд и В. Сосенского, живая лексика идиша. В словаре около 25000 словарных статей, 50000 слов, более 5000 пословиц и поговорок, большое количество идиом и цитат из литературных произведений, еврейских песен и анекдотов, благословения и проклятия, краткая этимология слов, а также однокоренные слова, синонимы и антонимы для слов семитского происхождения.

Целью книги было собрать вместе под одной обложкой всё самое лучшее в идише, то еврейское сокровище, которое злая судьба разбросала по разным странам, языкам и печатным изданиям. Я постарался найти и перевести на белорусский язык полнокровную лексику довоенного еврейского местечка: религиозную и простонародную, литературную и диалектную, шутливую и серьёзную, ироническую и язвительную, ласковую и грубую, с проклятиями и грубыми ругательствами.

Мой словарь – это одновременно и коллективный труд многих разноязыких людей, искренне верящих в это ***"языковое чудо света"***, которым, к счастью, ***"есть что сказать"*** и которые вместе с Менделе готовы ***"бороться в первых рядах за этот самый жаргон"***.

Большое спасибо всем, кто так или иначе содействовал появлению этой книги!
С большой благодарностью приму все замечания и пожелания вместе с замеченными ошибками и неточностями.

ул. Жуковского, 6–2–163
220007 Минск
Республика Беларусь
Телефон: +375 17 222 04 05, +375 29 5549 649
e-mail: astraukh@mail.ru

27 января 2007 г.

Александр Астраух

DUDEN
TASCHENBÜCH
Jiddisches Wörterbuch
Mit Anweisen zur Schreibung, Grammatik und Aussprache
ייִדיש-פראַנצייזיש
DICTIONNAIRE YIDDISH-FRANÇAIS
ווערטערבוך
ייִדיש-רוסישער
ערטערבוך
СЛОВАРЬ
съ приложеніемъ иностранныхъ словъ, вошедшихъ въ составъ русской рѣчи,
составилъ
І. Дрейзинъ
לשון-קודש-
שטאַמיקע
ווערטער
אין ייִדיש
ווערטערבוך
פון דער
ייִדישער שפּראַך
מלון
אידי-עברי
פריס

А. Аксамітаў. Прыказкі і прымаўкі. Мінск, 2000.
Ангельска-беларускі слоўнік. В. Пашкевіч. Пад рэдакцыяй С. Шупы. Менск: Зьміцер Колас, 2006.
Беларуска-расійскі (Вялікалітоўска-расійскі) слоўнік. Published by Lew Sapieha Greatlitvan (Byelorussian) Foundation. Укладальнік Др. Я. Станкевіч. New York, [1989].
Беларуска-рускі слоўнік. Пад рэдакцыяй акадэміка АН БССР К. К. Крапівы. Масква, 1962.
Беларускі клясычны правапіс. Збор правілаў (сучасная нармалізацыя). Вільня – Менск, 2005.
Беларускія прыказкі, прымаўкі і загадкі. Склаў Яўген Рапановіч. Мінск, 1958.
Біблія. Кнігі Сьвятога Пісьма Старога й Новага Запавету ў беларускім перакладзе Васіля Сёмухі. Duncanville, USA, 2002.
Біблія. Пяцікніжжа. Пераклад айца Ўладзіслава Чарняўскага пад рэдакцыяй Станіслава Акіньчыца. Менск, 2002.
Браты М. і Г. Гарэцкія. Маскоўска-беларускі слоўнік. Выдавецтва Ў. Знамяроўскага – Вільня, 1921.
Вульф Сосенскі. Беларуска-жыдоўскі фольклор. (Рукапіс).
Выслоўі. Складанне М. Я. Грынблата. Мінск, 1979.
Г. Ф. Юрчанка. Народнае вытворнае слова: З гаворкі Мсціслаўшчыны. У 3-х кнігах. Мінск, 1981, 1983, 1985.
Г. Ф. Юрчанка. Слова за слова. Устойлівыя словазлучэнні ў гаворцы Мсціслаўшчыны. Мінск, 1977.
Дзіцячы фальклор. Складальнік Г. А. Барташэвіч. Мінск, 1972.
Дуліна ад Барадуліна. Радыё Свабодная Эўропа / Радыё Свабода, 2004.
Жывое слова. [Рэд. Ю. Ф. Мацкевіч, І. А. Яшкін]. Мінск, 1978.
З. Санько. Малы руска-беларускі слоўнік прыказак, прымавак і фразем. Мінск, 1991.
І. Насовіч. Слоўнік беларускай мовы. Мінск, 1983 (Словарь белорусскаго наречія. Составленный И. И. Носовичемъ. Санктпетербургъ, 1870).
Л. Віленкін. Яўрэйскі лінгвістычны атлас Савецкага Саюзу. Менск, 1931
М. Байкоў, М. Гарэцкі. Практычны Расійска-Беларускі слоўнік. Выданьне "Белтрэстдрук" – Менск, 1924
М. Байкоў, С. Некрашэвіч. Беларуска-расійскі слоўнік. Менск, 1926.
Максім Гарэцкі. Невялічкі беларуска-маскоўскі слоўнік. Рэдакцыя Янкі Станкеўчыка – Вільня, 1921. Друкарня "Віленскага Выдавецтва".
Народны тэатр. Укладанне М. А. Каладзінскага. Мінск, 1983.
Прыказкі і прымаўкі. У дзвюх кнігах. Складанне М. Я. Грынблата. Мінск, 1976.
Расійска-крыўскі (Беларускі) слоўнік. Укладальнік В. Ластоўскі. Коўна, 1924.
Руска-беларускі слоўнік. Пад рэдакцыяй Я. Коласа, К. Крапівы, П. Глебкі. Масква, 1953.
С. Некрашэвіч, М. Байкоў. Расійска-беларускі слоўнік. Менск, 1928.
С. Плаўнік, Н. Рубінштэйн. Яўрэйска-беларускі слоўнічак. Беларуская акадэмія навук (Яўрэйскі сэктар). Менск, 1932.
Слоўнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча ў пяці тамах. Рэдакцыйная калегія: Ю. Ф. Мацкевіч і інш. Мінск, 1979–1986.
Слоўнік гаворак цэнтральных раёнаў Беларусі. Т. 1–2. Пад рэдакцыяй Е. С. Мяцельскай. Мінск, 1990.
Тлумачальны слоўнік беларускай мовы ў пяці тамах. Пад агульнай рэдакцыяй акадэміка АН БССР К. К. Атраховіча (Кандрата Крапівы). Мінск, 1977–1984.
Тураўскі слоўнік. Т. 1–5. Мінск, 1982–1987.
Ф. Янкоўскі. Беларуская фразеалогія. Фразеалагізмы, іх значэнне і ўжыванне. Мінск, 1968.
Шасцімоўны слоўнік прыказак, прымавак і крылатых слоў. Пад рэдакцыяй Н. А. Ганчаровай. Мінск, 1993.
Этымалагічны слоўнік беларускай мовы. Т. 1–11. Мінск, 1978–2007.
Я. Станкевіч пры ўчасьці Ант. Адамовіча. Маленькі маскоўска-беларускі (крывіцкі) слоўнічак фразэолёгічны і прыказкаў. Менск, 1992 (1944, 1953).
Б. А. Гринченко. Словарь української мови. Т. 1–4. Київ, 1907–1909.
Українсько-російський словник. Укладачи: В. С. Ільін, К. П. Дорошенко, С. П. Левченко і інш. Київ, 1976.
Этимологічний словник української мови. Т. 1–5. Київ, 1982, 1985, 1989, 2004, 2006.
Библейская энциклопедія. Трудъ и изданіе Архимандрита Никифора. Москва, 1990 (1891).
Библейский словарь. Составил Эрик Нюстрем. Санкт-Петербург, 2001.

Большой немецко-русский словарь. Составили Е. И. Лепиш, Н. П. Страхова, Н. И. Филичева и др. Т. 1–2. Москва, 1980.
Д. Гессен, Р. Стыпула. Большой Польско-русский словарь. Т. 1–2. Москва – Варшава, 1980.
Еврейские загадки на идиш (רעטעניש). Составитель Х. В. Бейдер. Москва, 1990.
Еврейские пословицы на идиш (ייִדישע פּאָלקס־ווערטלעך). Составитель Х. В. Бейдер. Москва, 1990.
Еврейскій и халдейскій этимологическій словарь къ книгамъ Ветхаго Завета. Составилъ О. Н. Штейнбергъ. Вильна, 1878.
Н. Винер. Еврейско-немецкіе слова въ русскіхъ наречіяхъ. // Живая старина. 1895, №1.
Иврит-русский словарь. Составил Ф. Л. Шапиро. Под редакцией проф. Б. М. Гранде. Москва, 1963.
Иосиф Гури, Шоэль Фердман. Краткий идиш-иврит-русский словарь. Иерусалим, 1992.
Лэхаим. Из еврейского фольклора. Сост. Э. Г. Иоффе, Г. Л. Релес. Минск, 2000.
М. А. Грачёв. Толковый словарь русского жаргона. Москва. 2006.
М. Фасмер. Этимологический словарь русского языка. Т. 1–4. Москва, 1986–1987.
Полный русско-новоеврейскій словарь. Составилъ І. Дрейзинъ. Варшава, 1909.
Рав Адин Штейнзальц. Введение в Талмуд. Израильский институт талмудических публикаций – Институт изучения иудаизма в России – 1993.
Русско-древнееврейско-жаргонный словарь. Составилъ Бенъ-Яковъ. Вильна, 1907.
(רוססיש־העבריאיש־זשאַרגאָן וואָרטערבוך פֿאָן בן־יעקב)
Русско-еврейский (идиш) словарь. Под редакцией М. А. Шапиро, И. Г. Спивака, М. Я. Шульмана. Москва, 1989.
Русско-укр[illegible] Главный редактор действительный член АН УССР М. Я. Калинович. Москва, 1948.
Словарь с[illegible] немецкого языка. Под руководством М. Д. Степановой. Москва, 1979.
С[illegible] Русско-ивритский/Иврит-русский словарь. Под редакцией д-ра Б. Подольского. [illegible]. Гель-Авив, 1993.
Э[illegible] русского языка. Вып. 1–8. Под руководством и редакцией Н. М. Шанского. Издательство [illegible] университета, 1963, 1965, 1968, 1972, 1973, 1975, 1980, 1982.
Этимологический словарь славянских языков. Т. 1–17. Под редакцией член-корреспондента АН СССР О. Н. Трубачёва. Москва. 1974–1980.
A. Lyberis. Lietuvių-rusų kalbų žodynas. Redagavo Ch. Lemchenas. Vilnius, 1962.
A. Mirowicz, I. Dulewiczowa, I. Grek-Pabisowa, I. Maryniakowa. Wielki słownik rosyjsko-polski. T. 1–2. Warszawa, 1993.
Aleksander Brükner. Słownik etymologiczny języka polskiego. Warszawa, 1996.
Ch. Lemchenas. Trumpas mokyklinis rusų-lietuvių kalbų žodynas. Kaunas, 1971.
David C. Gross. English-Yiddish/Yiddish-English Dictionary (Romanized). New York, 1994.
Der DUDEN in 10 Bänden. Das grosse Wörterbuch der deutschen Sprache. Bibliographisches Institut & F. A. Brockhaus AG. PC Bibliotek 2.0 (CD – ROM).
Dr. Moshe Wolf. Hebrew and Aramaic Words in the Yiddish Language. Oregon, USA, 1998.
Etymologie. Herkunftswörterbuch der deutschen Sprache. (DUDEN BAND 7). Bibliographisches Institut Mannheim/Wien/Zürich, 1963.
Friedrich Kluge. Etymologisches Wörterbuch der deutschen Sprache. Walter de Gruyter - Berlin - New York, 1975.
Gh. Bolokan. Dicționar rus-român. Chișinău, 1992.
Ignaz Bernstein. Jüdische Sprichwörter und Redensarten. Wiesbaden, 1988.
Jiddische Sprichtwörter. Insel Verlag, Frankfurt am Main, 1965.
Jüdisches Wörterbuch von D. Dr. Hermann L. Strack. Leipzig, 1916.
Latviešu-krievu vārdnīka. Sastādījis autoru kolektivs. Rigā, 1953.
Michał Federowski. Lud białoruski na Rusi Litewskiej. T. IV. Warszawa, 1935.
Ottorino Pianigiani. Vocabolario etimologico della lingua italiana. Fratelli Melita Editori, La Spezia, 1991 (1907).
Podręczny słownik polsko-białoruski. Pod redakcją A. Obrębskiej-Jabłońskiej i M. Biryły. Warszawa, 1962.
Ronald Lötzsch. DUDEN – Jiddisches Wörterbuch. Mannheim/Leipzig/Wien/Zürich, 1992.
Salcia Landmann. Jiddisch. Das Abenteuer einer Sprache. Berlin: Ullstein, 1997.
Samuel Kerner, Bernard Vaisbrot. Dictionnaire Français-Yiddish. Bibliothèque Medem – Paris, 2001.
Siegmund A. Wolf. Jiddisches Wörterbuch. Hamburg, 1993.
Václav Machek. Etymologický slovník jazyka českého a slovenského. Praha, 1957.
Where Once We Walked. A Guide to the Jewish Communities Destroyed in the Holocaust. By Gary Mokotoff and Sallyann Amdur Sack. 1991, Avotaynu, Inc. USA.
Wilhelm Gesenius. Hebräisches und aramäisches Handwörterbuch über das Alte Testament. Berlin/Göttingen/Heidelberg, 1962.
Władysław Kopaliński. Słownik wyrazów obcych i zwrotów obcojęzycznych z almanachem. Warszawa, 1994.
Yosef Guri. All's well that ends well. Иерусалим "Тарбут", 1993.
Yosef Guri. Let's hear only good news. Еврейский университет в Иерусалиме (Кафедра славистики), 2004.
1001 Yiddish Proverb by Fred Kogos. New York.

אוריאל ווײַנרײַך. מאָדערן ענגליש־ייִדיש ייִדיש־ענגליש ווערטערבוך. שאָקן – ניו־יאָרק, 1977.
ביים קוואל. געזאַמלטע און דערקלערט פון ש. באסטאמסקי. ווילנע, 1920.
האַנטבוך פון העברעיִזמען אין דער ייִדישער שפּראַך. אויסגעפֿאָרשט און צוזאַמענגעשטעלט פון נחמן קרופין.
בוענאָס אײַרעס, 1957.
הירש פערלאָוו. בעל־חי און פויגל נעמען אויף ייִדיש. לאָנדאָן, 2002.
ווערטערבוך ייִדיש־פֿראַנצייזיש. צונויפגעשטעלט פֿון ד"ר נח גרים און ד"ר שמואל קערנער. פּאַריז, 1982.
ווערטערבוך פֿון לשון־קודש־שטאַמיקע ווערטער אין ייִדיש. צונויפֿגעשטעלט דורך יצחק ניבאָרסקי מיט דער
מיטהילף שמעון נויבערג. מעדעם־ביבליאָטעק, פּאַריז, 1999.
ווערטערבוך פֿראַנצייזיש־ייִדיש. צונויפגעשטעלט און באַרבעט דורך שמואל קערנער און בערל ווײַסבראָט. פּאַריז, 1989.
ווערטערביכל פון העברעאיש־יידישע ווערטער. צוזאַמענגעשטעלט פון יעקב לעווין. ניו־יאָרק, 1958.
י. גוטקאָוויטש. אויף אַלע טעג פון אַ גאַנץ יאָר. וואַרשע, 1966.
יודאַ יאָפֿע, עודל מאַרק. נרויסער ווערטערבוך פֿון דער ייִדישער שפּראַך (בענד 1–4). ניו־יאָרק, 1961 – ירושלים 1980.
ייִדיש־ליטוויש ווערטערבוך. צונויפגעשטעלט לויט די נייַסטע מקורים דורך ד"ר א. מערטעס און ל. גרייף.
ווילניוס – קאַונאַס, 1940.
ייִדיש־פֿראַנצייזיש ווערטערבוך. מעדעם־ביבליאָטעק, פּאַריז, 2002. בערל ווײַסבראָט – יצחק ניבאָרסקי
מיט דער צוזאַמענאַרבעט פֿון שמעון נויבערג.
ייִדיש־ענגליש־העברעאישער ווערטערבוך (פֿון אַלעכסנדר האַרקאַווי). ניו־יאָרק, 1988 (1925).
ייִדיש־שפּאַניש ווערטערבוך. יעקב־יהושע לערמאַן, יצחק ניבאָרסקי. בוענאָס־אײַרעס, 1979.
יצחק (איגנאַץ) בערנשטיין. ייִדישע שפּריכווערטער.
ליטוויש־ייִדישער ווערטערניק. צוזאַמענגעשטעלט בר. קאַלאַדני. קאָווענע, 1923.
מלון. אידי־עברי מלא (I–II). פּאַריז, 1939.
נחום סטוטשקאָוו. דער אוצער פֿון דער ייִדישער שפּראַך. ייִוואָ, ניו־יאָרק, 1950.
ס. ראָבקינד, ה. שקליאר. ייִדיש־רוסישער ווערטערבוך. מינסק, 1940.
פֿולער ייִדיש־העברעיִשער ווערטערבוך (פֿון מ. צאַנין). תל־אביב, 1994.
קורצער ייִדיש־אוקראַיִנישער ווערטערבוך. צונויפֿגעשטעלט י. טאָרטשינסקי. קיעוו, 1996.
קורצער ייִדיש־רוסישער ווערטערבוך (אין צוויי העפטן). די אויסגאַבע האָט געגרייט ג. יאַ. עסטרייַך. אונטער
דער אַלגעמיינער רעדאַקציע פון אַרן וועַרגעלים. ביבליאָטעק פון "סאָוועטיש הײַמלאַנד". מאָסקווע, 1989.
רחל בוימוואָל. אַנקענען דעם וואָס איר זאָגט. ירושלים, 1991.
שרייב אָן גרייזן. צונויפגעשטעלט פון ד"ר מאַקס ווײַנרײַך. ווילנע, 1926.

ПАДРУЧНІКІ ІДЫШУ

С. А. Сандлер. Идиш. Учебник для русскоговорящих. Москва, 2001.
С. А. Сандлер. Самоучитель языка идиш. Москва, 1989.
Э. М. Фалькович. О языке идиш. // "Русско-еврейский (идиш) словарь". Под редакцией М. А. Шапиро,
И. Г. Спивака, М. Я. Шульмана. Москва, 1989.
D. Kosman, I. Niborski. שלום ייִדיש. 2 vols + 24 cassettes. Paris: Europe-Formation-Conceil, 1983.
Dovid Katz. Grammar of the Yiddish Language. London. Duckworth, 1987.
Jerold C. Frakes. Yiddish I. Vilnius Program in Yiddish, 2001.
Uriel Weinreich. College Yiddish. YIVO, New York, 1979 (1949).
אַניק פּרים־מאַרגולים. הוליעט קינדערלעך! אַ ייִדיש־לערנבוך פֿאַר קינדער. מעדעם־ביבליאָטעק, פּאַריז, 1997.
הוב־בער קערלער. "ייִדיש איינס". אָקספֿאָרד: די אָקספֿאָרדער פּראָגראַם פון ייִדישער שפּראַך און ליטעראַטור, 1994.
דוד גאָלדבערג. ייִדיש אויף ייִדיש. ניו־הייוון און לאָנדאָן, 1996.
הירשע־דוד קאַץ. תקני תקנות. פּראַגן פון ייִדישער סטיליסטיק. אָקספֿאָרד, 1993.
ווײַנגער מ. ייִדישע דיאַלעקטאָלאָגיע. מינסק, 1929.
זאַרעצקי אַ. פּראַקטישע ייִדישע גראַמאַטיק. מאָסקווע, 1926.
הנן באָרדין. וואָרט ביַי וואָרט. מאַטעריאַלן פֿאַר אָנהייבערס. ירושלים, 1999.
הנן באָרדין. מיט וואָרט און מעשים. לערנבוך פֿאַר ווײַטהאַלטערס. ווילנע, 2002.
כּלל־תקנות פון ייִדישן אויסלייג. אָקספֿאָרד, 1992.
מרדכי שעכטער. ייִדיש צוויי: אַ לערנבוך פֿאַר מיטנדיקע און ווײַטהאַלטערס. ניו־יאָרק: ייִדיש ליגע, 1993.

ЗБОРНІКІ ЖЫДОЎСКАЙ НАРОДНАЙ МУЗЫКІ

А. Двилянский. Музыкальный еврейский фольклор Беларуси. Могилёв, 1996.
Арфы на вербах. Призвание и судьба Моисея Береговского. Москва, 1994 – Иерусалим, 5755.
Еврейская народная песня. Антология. Составитель М. Д. Гольдин. Санкт-Петербург, 1994.
Еврейские песни из репертуара Нехамы Лифшицайте для голоса с фортепиано. Еврейский Общинный Центр Санкт-Петербурга, 2000.
Еврейскія народныя песни въ Россіи. Собраны и изданы С. М. Гинзбургомь и П. С. Маркомъ. СПБ, 1901.
И. Добрушин, А. Юдицкий. Еврейские народные песни. Москва, 1940.
שנירעלע פערעלע Песни на идише. Лариса Авербах и ансамбль "Симха". Санкт-Петербург, 1997.
М. Береговский. Еврейский музыкальный фольклор. Т. 1. Под общей редакцией М. Винера. Москва, 1934.
М. Береговский. Еврейские народные песни. Москва.
Anthology of Yiddish Folksongs. A. Vinkovetzky, A. Kovner, S. Leichter. V. 1–4. The Hebrew University of Jerusalem, 1983–1987.
Folksing. New York, 1960
Hai und Topsy Frankl. Wenn der Rabbi singt. Jiddishe Lieder. Gütersloh, 1996.
Jiddishe Lieder. Herausgegeben von Hai und Topsy Frankl. Fischer Taschenbuch Verlag. Frankfurt, 1981.
Jiddische Volkslieder aus Litauen. Wiegenlieder Berlin, 1981.
Jiddische Volkslieder [illegible] Berlin, 1992.
Lieder a[illegible] 1962.
M. Katz, R. [illegible] and Poetry. Oxford, 1985.
Pearls of Yiddish Song. Compiled by Eleanor Gordon Mlotek and Joseph Mlotek. New York, 1988.
Song of Gene[illegible] Pearls of Yiddish Song. Compiled by Eleanor Gordon Mlotek and Joseph Mlotek. New York.
Teksten cum [illegible] Peterburg, 1912.
ייִדישע פאָלקסלידער. צונויפגעשטעלט – דינע כאַריק. מינסק, 1990.
יידישע לידער. אפקלייב פאר די יידיש לערער־סעמינארן אין ישראל און מזרח איראפע. ירושלים, 1995.

ЖЫДОЎСКАЯ КУЛІНАРЫЯ

120 блюд еврейской кухни. Составитель М. Горшович. Таллинн, 1990.
Марлена Шпелер. Традиционная еврейская кухня. Москва, 2002.
Eugeniusz Wirkowski. Kuchnia żydów polskich. Warszawa, 1988.

У АФАРМЛЕНЬНІ КНІГІ СКАРЫСТАНЫ МАЛЮНКІ СЫНАГОГАЎ МАСТАКА СЯРГЕЯ ВЕРАМЕЙЧЫКА, А ТАКСАМА МАТЭРЫЯЛЫ З КНІГАЎ:

Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Т. 2. Мінск, 1994.
Альбом еврейской художественной старины Семёна Ан-ского (Шедевры еврейского искусства). А. Канцедикас, И. Сергеева. Мосты культуры – Москва, 2001.
Д. Гоберман. Еврейские надгробья на Украине и в Молдове. (Шедевры еврейского искусства). Москва, 1993.
Еврейское искусство в европейском контексте (сборник статей). Мосты культуры-Гешарим – Москва, 2002.
Каталог рукописей и архивных материалов из Еврейской теологической семинарии города Бреслау в российских хранилищах. Рудомино – Москва, 2003.
Краткая Еврейская Энциклопедия в 10-ти томах. Еврейский университет – Иерусалим, 1976 (Москва, 1996–2001).
Орнамент древнееврейских рукописей. (Шедевры еврейского искусства. Российская национальная библиотека). Москва – Тель-Авив, 2003.
Российская еврейская энциклопедия. Т. 1– 5. Главный редактор Г. Г. Брановер. Москва, 1994–2005.
Dovid Katz. Lithuanian Jewish Culture. Vilnius, 2004.
Image Before My Eyes. A Photographic History of Jewish Life in Poland, 1864–1939. Lucjan Dobroszycki and Barbara Kirshenblatt-Gimblett. New York, 1977.
Marija Rupeikienė. Nykstantis kultūros paveldas: Lietuvos sinagogų architektūra. 2003.
רחל בוימואָל. דריי העפטן. ירושלים, 1979.

МАМЭ-ЛО(К)ШН — МУТЭРШ-“ПРАХ” — МАТЧЫНА МО(Й)ВА
або Якія чэрці растуць у “Герадотавым” ціхім балоце

Жыды! “Хрыстапрадаўцы, юды і прыблуды”!
О слава вам і гонар людзкі вам!
Янка Купала.

“Варшавске сьмеце, гразь Масквы.”
Янка Купала.

Raxmonim-bnej-raxmonim
(“міласэрныя сыны міласэрных” – гэбрэі).

Любемася/жывем як браты, а таргуймася/рахуймася як жыды.

Нас ні вада не размыіць, ні сьвіньня не разрыіць.

Прадмова – Hakdome

A sejfer on a hakdome iz vi a guf on a nešome.
(Кніга без прадмовы, як цела без душы.)

Гэты ўяўны дыялог меўся адбыцца паміж двума выбітнымі, годнымі прадстаўнікамі беларускай і жыдоўскай культураў: Максютам Літвінам і Моўшкам Літваком. Не зважаючы на тое, што абодва выйшлі зь сялянскага асяродзьдзя й ўвасабляюць сабой пісьменьніцкую інтэлігенцыю толькі ў першым пакаленьні, гэтыя дзьве кангеніяльныя асобы, абраныя эпохай падвесьці рысу пад дзьвюма тысячагадовымі культурамі, усё ж за кароткі адведзены ім час пасьпелі скласьці мастацкія “хронікі” сваіх родаў, можна нават сказаць народаў.

Моўшка – нарадзіўся ў мястэчку Смургоні Віленскай губэрні. У Моўшкавай сям’і жыве паданьне, быццам ягоны дзед паходзіць з “глыбіні Расеі”. (“Мой дзед быў стары мястачковы яўрэй, /Хадзіў то ў сярмязе, то ў рэпсавым пыльніку. /Меў хату, каня і семнаццаць дзяцей /І жыў у Кабыльніку”). “Сухарлявы, з падоўжаным смуглым тварам. Вочы зьзяюць, як антрацыт. У іх – смутак, туга, мара. Непаслухмяная чорная чупрына над шырокім нізкім ілбом. Калі яна спадае на вочы, ён яе энэргічна адкідае назад моцным рыўком галавы”. “Мáе ямкі на шчоках. Звычайна ён спакойны маўклівец, цярплівы, не зласьлівы. Ён маўчыць пахмурна і весела.”

Максюта – нарадзіўся ў вёсцы Меншая Жабракоўка, Шамаўскай воласьці. “Зьнешне быў больш падобны да бацькі. Чарнявы, ладнай постаці, сярэдняга росту, з бліскучымі карымі вачыма, з прыгожым высокім ілбом, тонкімі вуснамі, цьвёрдым падбародкам, акуратнымі стройнымі зубамі... Ад маці перадаўся Максіму крышачку курносы нос, некалькі павялічаныя скулы, нізкага тэмбру пявучы голас, вялікія вочы. Па характары пайшоў у бацьку. Яскравы сангвінік, з праявамі халярычнасьці, надзвычайна жывы, рухавы, палкі, уражлівы, непасрэдны, актыўны, успрыімлівы. Але і ад маці многае перайшло ў характар. Выключная дабрата, цярплівасьць, стрыманасьць, разважнасьць, невычэрпны аптымізм, летуценнасьць, самаахвярнасьць.”

Час падзеяў – пачатак нейкага стагодзьдзя.

Месца – правінцыйная сталіца нейкай новаўтворанай дзяржавы.

I
Сварка — Maxlojkes

Trojeriker šmejxl oder laxndiker trojer. *A. Lixtenbojm.*
"Трагічна-сьмяшлівыя сцэны". *Янка Купала.*

Зь песьні слоў не выкідай, мусіць і гэта быць.

Vi es kristelt zix, azoj jidlt zix.
(Як робяць хрысьціяне, гэтак жа робяць і жыды.)

... Разгаўляюцца словам скаромным
І ня лічаць яго бессаромным.
Рыгор Барадулін.

Сустрэліся аднаго разу, "каб дзень зімовы прыстойна ўдвух скарагаць", каб пагутарыць аб набалелым, у кавярні на Нагорнай за філіжанкаю кавы Максюта і Моўшка. Настрой у іх быў рашучы, бо абодва быці здатыя прыняць ліхаманкі ўсіх моваў і культураў, а накіпела шмат...

Максюта: "Хто сьвіньня ў хаце?"
Моўшка: "А там збор-дружына: жыды, хрысьцяне і цыгане..."
Максюта: "Тры бабы, два жыды, адзін цыган – то й цэлы кірмаш!" Ага, і тутака "жыдава чортава апанавала, апаланіла!"
Моўшка: Ша, "літвіні – подлэ сьвіні!"
Максюта: Так, так, гэта ўсё пра нас: "Літвін, чырвоны як батвін; літвін як лін; літвін – каўтун; літвін гаўном зацьвіў; трус, трус – беларус; ні паляк, ні рускі – дурак беларускі!"
Моўшка: Хіба мо што лепшае пра нас кажуць: "Жыд, жыд, халамыд; людзі не жыды, а жыды не людзі; ня будзь дураком, ня будзь літваком! Жыд, жыд, баламут, насраў на хамут, жыдоўка ня ведала, узяла й пасьнедала."
Максюта: Мне ёсьць чым адказаць: "Католік, католік, насраў на столік, а беларус ня ведаў, узяў ды паабедаў; ці то сьвіньні елі, ці беларусы ласаваліся..."
Моўшка: "Сьвіньня ня статак – жыд не чалавек..." Ёсьць і на ідышы: "L(e)x(e)m" – "litvak - xazer - mamzer" (літвак - сьвіньня - байструк; польскія жыды некалі палохалі свае дзеці: "Der litvak vet ajx xapn!" (літвак вас пахапае!) – таму дзеці й дражнілі літвакоў: "Lexem"). Вось яшчэ: "A xucpe fun a mojd, ba a litvak kojft zi xale!" (нахабная дзяўчына, у літвака купляе яна халу!)
Максюта: "Рупь – ня дзеньгі, а мужык – ня брат..."
Моўшка: А ў нашай мове: "A goj iz a bejzer vorem" (гой – злы чарвяк), "zojer vi pojer" (кіслы як мужык) альбо "a pojeršer/gojišer kop" (сялянская/дубовая мазгаўня)!
Максюта: Ведама ж: "Як жыд родзіцца, то галавою круціць (бо ўжэ думае, як на сьвеці жыць), а як мужык (родзіцца), то мацае кала се рукамі (каб што ўкрасьці)".
Моўшка: Вось яшчэ словы: "Az der jid iz hungerik, zingt er, un der pojer šlogt der vajb" (калі жыд галодны, ён сьпявае, а селянін б'е жонку) альбо "a pojer, kox im zis un kox im zojer, blajbt er alc a pojer" (мужык, вары яму салодкае і вары яму кіслае, ён лепшым ня будзе).
Максюта: Так, "колькі варону ні мый, белай ня будзе". "Жыд не барануець, не арэць, як гандлюець, так жыўець, яму бог памагае, усё шчасьце дае, а мужык талалёх, талалёх, гдзе напіўся, там і лёг".
Моўшка: Ну, мо досыць ужо ганьбіць сябе, добра, вось апошняе пра вас: "A goj bakumt nit kejn derexerec, biz er xapt nit dem erštn pač" (гой не разумее павагі, пакуль не атрымае першую аплявуху).
Максюта: Тады прапягнем "вашую" тэму: "Пану верна не служы, жонцы праўды не кажы, з жыдам шчыра не дружы і здольнікаў не бяры" альбо "застуні жыду ад дзьвярэй, то ён праз вакно".
Моўшка: "Az me farčepet a jidn a hekele, vil er, me zol im opmaxn a ganen kaftn" (зачапі жыда за гаплік, ён наробіць шуму, быццам зь яго ўвесь каптан здымаюць).
Максюта: Так, тое-сёе і мы чулі: "Зачапі жыда ці чорта, то не атрасешся"
Моўшка: Але пра нас ёсьць і зусім брыдкае: "Жыды-церці, калі вам памерці? У суботу рана, у сабачы ямы, дзе коні канаюць, там жыдоў хаваюць, дзе сьвіньні рыюць, там жыдоў мыюць" альбо "дзе куры сралі, там жыда хавалі"!

Максюта: Троху дадам: "Што за ўстыд, што ўсраўся жыд!" альбо "не хацелі жыды есьці манны, няхай ядзяць гаўно!"

Моўшка: "Жыду, жыдку! Каб табе не было прыбытку, ні ўдзень ні ўночы, каб ты ссох на печы!"

Максюта: Але тым ня менш часам і спачуваючы: "Ой, жыдзе-пяцнота, якая то работа: мужык це кіем б'е і крычаць табе не дае" альбо "ой, жыдке, цікавы народ, ваш вельмі пекны род, трохі пархаты, рэшта – каўтунаваты".

Моўшка: Няўжэж, "пашкадаваў воўк кабылу", "зьлітаваўся рак над жабаю"...: "Жыдзе, жыдзе, чорт за табою ідзе: у чырвоным капялюшу – хап за тваю душу".

Максюта: Кажуць жа: "У жыда душы німа; ці жыд, ці воўк, то ўсё роўна" альбо "найлепшы жыд шыбеніцы варт".

Моўшка: Так: "Як бяда, то да жыда, а як па бядзе, то ідзі к чорту, жыдзе!" або "як апошняя надзея – так на габрэя."

Максюта: Але: "Лепі сібраваць з жыдам галапятым, як з панам багатым".

Моўшка: Чым жа табе адказаць? Хіба вось што: "Дай, божа, жыду той розум наперад, што мужык мае ззаду".

Максюта: І дае: "Пан карову за ногі дзержыць, а жыды дояць".

Моўшка: "Німа горшага на сьвеце, як жыд бедны, сьвіньня худая і баба п'яная".

Максюта: "Як пан пазнаў бунт, мужык фунт, а жыд грунт, то ўжо на сьвеце дабра німа".

Моўшка: У мяне застаўся толькі ідыш: "Der jid šlogt un šrajt "gevalt!" (жыд б'е і крычыць "гвалт!"), "fun jidiše rejd ken men zix nit opvašn in cen vasern" (ад жыдоўскага праклёну не адмыешся і ў дзесяці водах), "got zol ophitn far gojišn kojcx un far jidišn mojex" (барані божа ад мужыцкай сілы і ад жыдоўскага розуму), "got zol ophitn far jidišer gajve un far gojišer tajve" (барані божа ад жыдоўскай пыхі й ад мужыцкай прагнасьці), "got zol ophitn far jidišer xucpe, far jidiše majler un far jidiše kep" (барані божа ад жыдоўскай нахабнасьці, ад жыдоўскіх языкоў і жыдоўскіх галоў), "beser a jidiš harc mit a gojišn kop, ejder a gojiš harc mit a jidišn kop" (лепш жыдоўскае сэрца з мужыцкай галавой, чымся мужыцкае сэрца з жыдоўскай галавой) альбо "a jidiš cjnhorc iz erger, vi a gojišer kišef" (жыдоўскія сурокі горш за гойскую варажбу).

Максюта: Занадта схалястычна, наша прасьцейшае: "Кую, кую ножку, паедзем у дарожку, дарожка крывенька, кабылка сьляпенька, даедзем да броду, кінем жыда ў воду…"

Моўшка: Аб гоях я магу яшчэ шмат чаго сказаць: "Der goj iz trejf, zajn grošn iz košer" (мужык трэфны, ягоны грош кашэрны); "ojspucn zix vi a goj cu der pgire (in klojster)" (разадзецца як гой на сьмерць, у царкву); "herstu/zestu, Mojše, vi di goje xrapet?" (чуеш/бачыш, Моўша, як баба храпе? – кажуць, калі хочуць зьвярнуць увагу на камічны выпадак); "az ba gojim iz a kermešl, šlogt men jidn" (калі ў гояў кірмаш, б'юць жыдоў); "oj na menja i goj na menja!" (і ліха на мяне і гой на мяне!)...

Максюта: "Дзе чубы трашчаць, там і пэйсы ляцяць"...

Моўшка: Ну і яшчэ пару праклёнаў: "Me zol dir onzogn durx a goj!" (каб табе злая навіна прыйшла ад гоя!); "geharget zolstu vern durx a gutn goj!" (а бадай ты загінуў праз добрага гоя!)

Максюта: Але ў беларускай мове, як, дарэчы, і ў украінскай, літоўскай, латыскай, польскай, чэскай, славацкай і інш., само слова "жыд" не нясе ў сабе зьнявагі альбо абразы, як напэўна і жыдоўскае "goj".

Моўшка: Так, слушна, зьняважліва гучыць толькі зборны назоўнік "gajes" (нежыды, гоі), а таксама жыдоўскія словы "šejgec", "škoc", "šikse" (нахабны хлопец-няжыд, нахабная дзяўчына-нежыдоўка).

Максюта: Адно зь іх перайшло і ў нашую мову – "сікша"!

Моўшка: Як пяецца ў нашай песьні: "Lomir zix iberbetn, genug šojn zajn vi gojim" (давайма перапрашацца, до ўжо быць гоямі)!

Немаведама, ці доўга б змаглі яны яшчэ лаяцца, дзякуй богу, гэтага шчасьця хапае ў абедзьвюх мовах... "Чым якая сварка, лепі маленькі баёк" – на жаль, і гэтага не бракавала нават і ў Беларусі, колькі б не пісалі пра яе "талерантнасьць", але... Ці льга ўсё ж знайсьці ў гэтым сьметніку бруднай лаянкі ды ўзаемных дакораў той пункт, тую вось, вакол якой усё ж сталася магчымым такое доўгае суіснаваньне дзьвюх цалкам непадобных нацыяў?



II
Мова — Lošn

А вось якой я мовай гавару,
Хоць пры, каб сьцяміць, к знахару на лек...
Ну што? Скажу: тутэйшая яна,
Як я і сам тутэйшы чалавек!
Янка Купала.

Jidiš hot in zix a funk fun ejbikajt.
Jidiš iz efšer der grester špraxn-nes in der velt.
(Ідыш мае ў сабе іскру вечнасьці.
Ідыш – напэўна, найвялікшы моўны цуд у сьвеце.)
Icik Manger.

Vos šemt zix cu zogn af jidiš, zogt men af lošn-kojdeš.

Ідыш, сумесь гэбрэйскай і нямецкай моваў,
як і ўсякая чужародная сумесь, выклікае агіднае ўражаньне.
Карл Пухнэр, Мюнхэн, 1934.

Але размова пра "жаргон"...

Максюта: Зноў ты на сваім "жаргоне"! "Куды ён з гэтай мясцовай мовай пасунецца? Дзе яна яму прыдасца?.."
Моўшка: Нештачка чулі мы й пра вашу "чыста беларускую мойву": "Хто как хатіт, тот так і гаварыт"!
Максюта: Нашэ весьскае дзела, мы па-просту...
Моўшка: Я таксама ўмею гаварыць па-простаму.
Максюта: Ну, калі ласка...
Моўшка: "Брэйт – брэйтуля, цыбэлэ – цыбуля, кнобл – кнабуля"!
Максюта: Слухай анэкдот: – Колькі ты ведаеш моваў? – Дзьве: беларускую й рускую. – А я ведаю тры: жопа – срака – дупа! (па-руску, па-беларуску, па-польску).
Моўшка: У нас ёсьць песьня на словы Абрагама Рэйзэна:

A kind iz dos a goldene,
Un špilt zix frank un fraj,
Un vos far a dajge hot es den,
Az jorn hot es draj?

A core mit di špraxn nor,
Špraxn on a šir,
Jorn hot dos kind nor draj,
Un špraxn hot es fir.

Di mame iz a rusiše,
A litviše gemejnt,
Dan redt zi mit im rusiš nor,
Azoj iz zi gevejnt.

Di njanje iz a pojliše,
Vi ken dos anderš zajn?
Muz dos kind zix matern,
Af pojliš heflex zajn.

Di bobe iz a jidiše
Un redt mit im žargon,
Dan muz dos kind ir noxplaplen,
Vi ken es anderš ton?

Der tate iz a cionist,
Un halt fun Axad Haom,
Muz dos kind bagrisn im
Un zogn im: šalom!

Her nor, du, majn libes kind,
Mir zol zajn far dir,
Du mejnst, az du vest opkumen
Nor mit špraxn fir?

Me zuxt a guvernantke dir,
A dajčke un genug,
Vestu, kind majns, ojsvaksn,
Vi tate-mame klug.

Дзіцятка-залатца, вольна і хораша гуляецца, ці мае яно які клопат, калі яму толькі тры гадочкі?
Клопат толькі з мовамі, дзіцё мае толькі тры гадочкі, а чуе чатыры мовы.
Маці руская, зь Літвы, таму яна размаўляе зь ім толькі па-руску, гэта яе звычай.
Нянька палячка, ці можа быць хто іншы? Дзіцё мусіць пакутаваць, па-польску быць ветлівым.
Бабка – жыдоўка і размаўляе зь ім на жаргоне, і дзіцё мусіць паўтараць за ёй, што яно можа яшчэ зрабіць?
Бацька сыяніст, пасьлядоўнік Ахад-Гаама, таму дзіцё мусіць вітаць яго і адказваць яму: шалом!

Паслухай толькі, маё любае дзіцятка, я спачуваю табе, ты думаеш, што абыдзешся толькі чатырма мовамі? Табе шукаюць гувэрнантку, немку, і досыць, ты вырасьцеш, маё дзіцятка, разумным, як бацькі.

Я йшчэ анэкдот ведаю: – А скажэце, А. Р., ці праўда, што вы некалькімі мовамі валодасце? – Ешчо бы! Пяцью! – Пяцьцю? А не маглі б вы пералічыць, якімі? – Пажалуста: беларускай уснай, беларускай пісьменнай, рускай уснай, рускай пісьменнай і англійскай. – Англійскай! А. Р., а не маглі б вы сказаць што-небудзь па-ангельску для слухачоў нашага радыё? – Да сколька ўгодна: хэндэ хох! – Так, але ж, А. Р., э-э, але ж... гэта па-нямецку. – А, па-нямецку? Ну, значыт, шэсьцью!

Максюта: Пасьля далучэньня да Расеі чаго мы толькі ні дачуліся і ні даведаліся пра нашу мову: і "простая" (у процілегласьць "панскай" – польскай), і "мужыцкая" ("на мужыцкім языку"), і "тутэйшая", і "белорусское наречіе", і "винегрет уніатскаго наречия", і "грубая краёвая мова, ня маючая літаратурнай варгасьці", і "провінцыяльная гутарка", і "господствующий простонародный диалект", і "славяно-польский диалект", і "па-нашаму", і "па-простаму", і "наша весьскае дзела, мы па-просту"...

Моўчика: Так, і з нашай было ня шмаг лепей. Вось што разумныя людзі пішуць: "На працягу стагодзьдзяў мова ідыш заставалася сымбалем выгнаньня, успрымалася толькі як сродак камунікацыі й ніколі – як каштоўнасьць у сабе (і, дадамо, падобнае стаўленьне беларусаў да свасёй мовы нават сёньня). (...) Нягледзячы на ўсё гэта, стыгма мовы ідыш – "жаргону", успрыняцьце народнай культуры, як ніжэйшай і нязначнай, трывала надалей." *(В. Зайка)*

Максюта: Але ўсёж-такі гэта ўжо гісторыя. Нават савецкія выданьні дакладна фармулявалі: "Ідыш належыць да заходняй групы германскіх моваў. Ён склаўся на базе верхненямецкіх дыялектаў ва ўзаемадзейнасьці з сэміцкім (старажатнагэбрэйскім) і славянскім элемэнтамі. (...) Ідыш (альбо, як ён называўся тады, "ідыш-тайч", "іўрэ-тайч") стаў адрозьніваца ад нямецкіх гаворак ня толькі наяўнасьцю сэмітызмаў, але ў пэўнай ступені й своеасаблівай інтэграцыяй германскіх словаў, граматычных формаў і шэрагу фанэтычных асаблівасьцяў, што зьявілася найважнейшым штуршком для самастойнага разьвіцьця мовы." *(Э. Фальковіч)*.

Моўчика: Сухавата для такой мовы. Вось паслухай: "In kladovke af der polke štejt a banke mit varenje" (у кладоўцы на паліцы стаіць слоік з варэньнем) альбо "kupil za fufciker, prodal za ferciker, abi sveži groš" і яшчэ "redele jak redele, abi dobre mejnele". Ну, дзе тут тая "інтэграцыя германскіх словаў, граматычных формаў"?

Максюта: Нешта такое ёсьць і ў беларускай: "*Іх* цябе чакала, *варум* ты не прыйшоў, *шлэхт* было надвор'е, зь неба *васэр* шоў".

Моўчика: Ёсьцека й больш парадаксальная, але больш верагодная думка: "Крыніцай большасьці лексыкону мовы ідыш зьяўляецца нямецкая мова, а фаналёгія і сынтаксіс ідышу пераважна славянскія. На маю думку, ідыш пачынаўся як форма юдэа-сэрбалужыцкай мовы, якая была рэлексыфікавана ў верхненямецкі вакабуляр недзе паміж IX і XII стст., калі нямецкія пасяленцы пачалі каланізаваць лужыцка-моўныя землі сёньняшняй Усходняй Германіі. Такім чынам, ідыш зьяўляецца варыянтам заходнеславянскай мовы, г. зн. юдаізаванай сэрбалужыцкай (зь нямецкім лексыконам). Акт рэлексыфікацыі азначаў, што ідыш, будучы сэрбалужыцкай, застаецца заходнеславянскай мовай з нетыповаю рысай дамінаваньня пераважна нямецкага лексыкону." "Дзесьці пасьля XV ст. усходнеславянскія жыды – нашчадкі хазараў-юдэяў – рэлексыфікавалі сваю родную кіеўска-палескую гаворку (першааснову сучаснага паўднёвабеларускага і паўночнаўкраінскага дыялектаў) да ідышу, які іміграпты-ашкеназі прынесьлі на іхнюю тэрыторыю. Ідыш жа, у сваю чаргу, стаў лексыфікаванаю мовай для кіеўска-палескіх гаворак." *(Пол Вэксьлер)*. Вось бачыш, нават зь дзьвюх розных бакоў! Не зважаючы на тое, што "большасьць людзей меркавала, што ідыш быў альбо "дэфармацыяй", альбо "творчым жыдоўскім атожылкам" верхненямецкай мовы". Перапрашаю за празьмерную навуковасьць!

Максюта: Тут чорт нагу сабе зломіць, на трох мовах пагутарылі, але і дзьвюм не далі рады. Дзякуй богу ўжо й за тое, што хоць мы, беларусы, здолелі падараваць сьвету фэномэн і слова "трасянка"!

Моўчика: Але зноў жа, на Ўкраіне ёсьць сваё слова – "суржык". Напэўна, у ідышы гэта завецца "šmelcšprax" альбо "xoci-jidiš polovine gojiš", "halb dajč – polovine rusiš".

Максюта: "Яічніца, аўсяніца – будзе добрая трасяніца"...

III
Карані — Šerošim

Гэта яшчэ тады дзеялася,
калі ў нашых рэчках было шмат рыбы,
а ў местах ды мястэчках шмат яўрэяў.
Рыгор Барадулін.

"Белорусская разновидность русскаго народа".

У кожным родзе ёсьць курва і злодзей.

Только мёртвый литвин не дзекнет (как ни закайся литвин, а дзекнет).

Моўшка: Даруй, мой любы сябра, але яшчэ адна цытата: "Такім чынам, ідыш мае быць адбіткам лёсу "страчанага" хазарскага габрэйства і дае бясспрэчныя сьведчаньні таго, што сучасныя габрэі-ашкеназі ня ёсьць асноўнымі нашчадкамі палестынскіх яўрэяў". "Дагэтуль я мяркую, што габрэі, якія зь IX ст. насяляли германска-лужыцкія землі, мелі балканскае паходжаньне (нашчадкі балканскіх славяна-авараў і нямецкіх славянаў, што перайшлі ў юдаізм) (прынятае на працягу стагодзьдзяў меркаваньне пра пераважна французскае и італьянскае паходжаньне габрэяў-ашкеназі ня мае ніякіх падставаў)." *(Пол Вэксьлер).*

Максюта: О, сьвента Марыя, Езус Хрыстус!

Моўшка: Тэж жыдзі!

Максюта: Га! Дык мы ж браты-славяне! Ці ж гэта ня так?!

Моўшка: На гэты тэмат яшчэ Віталь Зайка напісаў "аўтадыялёг":

– Як наконт паходжаньня першых гэбраяў на беларускіх землях – з захаду ці з усходу?

– З усходу – з Хазарскага каганату. Нават князь Уладзімер Ясна-Сонейка быў каганам.

– Я не магу катэгарычна сказаць – усход, захад. Магло быць зь Бізантыі, праз Балканы. (...) Засяленьне магло быць з захаду – Польшча, Чэхія.

– Раданіты (гэбрайскія купцы) былі ўва Ўсходняй Эўропе ўжо ў IX–X стст., зьяўляліся часткай пэўнага гэбрайскага масіву, гандлявалі нявольнікамі, нявольнікі былі пераважна славяне. Спалучэньне гэтых фактаў робіць, на маю думку, Паўночнае Чарнамор'е, Хазарыю найбольш верагоднай прарадзімай беларускага гэбрайства.

– Вельмі слушна, тэрыторыя-мова-ўрад-звычаі – усё гэта мелі беларускія гэбраі, званыя літвакамі (пэўна таму, што іхны арэал збольшага супадаў з постлюблінскім Вялікім княствам).

Максюта: Дык я ж і кажу, што мы браты: мы – літвіны, вы – літвакі! "Не дакучай жыда, бо ён табе брат!"

Моўшка: "Магутная сіла беларускай зямлі дала асобны духоўны і ўнешні воблік беларускім жыдам. Цяпер яны рожнюцца ад усіх другіх жыдоў, і іх па ўсяму сьвету называюць: "літвакамі". *(Зьмітрок Бядуля).* "Ізраільскі гісторык Хаім-Гілель Бэн-Шошан (ураджэнец Валожына) узьнікненьне асобнага літвацкага субэтнасу датуе пачаткам XV ст." *(В. Зайка).*

Максюта: Гэта "залаты век" нашай мовы, часы дзяржаўнасьці беларускай мовы!

Моўшка: Ну, дык дзе ж тая "дзяржаўнасьць" падзелася?

Максюта: Зноў цытата: "Вялікая пустыня (разумей – Беларусь) зьяўляецца краінай вельмі мала культываванай, населенай масай цёмнага народу, жабруючага і амаль выміраючага. Дзе прычыны гэтае незразумелае адсталасьці краю? Ці не вінавата прырода? (...) Ці ня ў расе трэба шукаць тлумачэньне. Але раса – тыя ж славяне, што культывавалі Польшчу, Малую і Вялікую Русь. Чаму-ж беларусы вышлі няздольнымі?" *(С. Южаков, 1886).*

Моўшка: Тое ж у М. Някрасава:

... Волосом рус,
Видишь, стоит, измождён лихорадкою,
Высокорослый, больной белорус...

Што й казаць – схудалы "мякінынік", "гальцепа"! Дазволь яшчэ пажартаваць: – А за Гомлем людзі ё? – пытаецца адзін беларус у другога. – Ё. Толькі дробненькіё, – адгукаецца другі.

Максюта: Пажартаваць і я магу: "Тата, а чаму ў Беларусі ўвесь час такая хлюпота? Чаму тут увесь час так халодна і ўвесь час лье дождж?" – "Ну, разумееш, сынку, усё гэта тлумачыцца складанымі атмасфэрнымі працэсамі, зьменамі ў павстраных масах, непрадказальнымі ваганьнямі тэмпэратуры. Карацей, сынку, якая краіна – такі й клімат!" Дарэчы, слова "Літва" значыць "залева" і этымалягічна зьвязана зь дзеясловам "ліць" (тое ж самае: *б.* "litba", *р.* (дыялектнае) "литва"), больш таго сюды ж стасуюцца геаграфічныя назвы 'Латвія' і 'Латгалія'.

Моўшка: Я чуў, што пазьней той самы Южакоў перамяніў сваё меркаваньне: "Ранейшае ўяўленьне аб беларусах, як аб племені маларослым і слабасільным аказалася няверным. Большай часткай яны фізычна зложаны вельмі добра, маюць рост вышэй сярэдняга, жыцьцёвы індэкс перавышае ў іх 50 проц. і сьведчыць аб фізычнай крэпасьці." *(С. Южаков, 1908)*.

Максюта: Але нават і ў Расеі на нас па-рознаму глядзелі: "Не забудзьма, што яшчэ ў праграме кірыла-мэтодыеўскага брацтва быў прызнаны як асобны штат агульна-славянскае фэдэрацыі побач з расійскім, украінскім, польскім, чэскім і беларускі штат, што М. А. Бакунін у сваіх "лістох да брацьцяў славян" (1862) прызнаваў за Беларусьсю самастойнае месца як незалежнай дзяржавы, што падобныя правы прызнаваў Гэрцэн, што Надзеждзін акрэсьлена выдзяляў беларускую мову як самастойную славянскую мову разам з украінскай і польскай." *(А. Цьвікевіч)*.

Моўшка: А што наконт "Западно-руссизма"? Я чуў, што больш за іншых улягалі, увіхаліся менавіта "свае", беларусы.

Максюта: Так, слушна, і "празеліт з вуніятаў" Ксэнафонт Гаворскі (рэдактар часопіса "Вестник Западной России"), і ідэалёг "западно-руссизма" Міхайла Каяловіч (лічыў сябе "літвінам", напісаў "гісторыю вуніі ў Літве"), і "благородный" русыфікатар Іосіф Сямашка, і, як большасьць іншых "западно-руссов" мінулага веку, паходзілі зь сем'яў беларускіх вуніяцкіх сьвятароў ("у вуніі захоўвалася стыхія беларушчыны, і інтэлігентныя вуніяцкія сем'і былі носьбітамі ідэі беларускай самабытнасьці"). *(А. Цьвікевіч)*.

Моўшка: Бадай іх сьвет ня знаў!

Максюта: Але вось, што піша А. Цьвікевіч далей: ""Мясцовым ураджэнцам" было забаронена займаць пасады вышэй V клясы, а па службе праваслаўнага веравызнаньня – вышэй сьвяшчэньніка. Становішча "западно-руссов" было пры гэткіх умовах проста жалю годнае. Яны ўсёй душой хацелі быць "русскими", ад усяго сэрца жадалі быць карыснымі "вялікай Расіі", а яна, гэтая "богаслаўная Расія", вуснамі стопроцантавых вялікарусаў – *Соловьёвых* паварочвалася да іх задам і зь дзіўнай упартасьцю адпіхала ад сябе. (...) Першае сапраўднае выяўленьне беларускай ідэі – гэта толькі 70-я гады XIX ст., Францішак Багушэвіч, але і ягоны сын быў крайнім зоолёгічным польскім шовіністым і нават адмовіўся аддаць зацікаўленым асобам архіў бацькі."

Моўшка: "Междду протчым" трэба шчыра прызнацца, што і "даволі значная частка адукаваных яўрэяў выступала ў якасьці аднаго з найбольш дынамічных элемэнтаў русіфікацыі так званага "Северо-Западнаго края". (...) Пад іх кантролем знаходзілася значная частка сродкаў масавай інфармацыі беларускіх губэрняў, у тым ліку і афіцыйны дзяржаўны друк."

Максюта: Ізноў мы не прыходзім ні да якой пазытыўнай высновы. Дзе ж ён, той жыцьцёвы стрыжань?

IV
Край — Land

А як завуць край родны мой –
Забыўся ўжо пра свой прыгон і зьдзек;
Мабыць, забраны, ці тутэйшы ён,
Я-ж сын яго – тутэйшы чалавек!
Янка Купала.

"Тутэйшы", кажу я, свой чалавек,
Сын бацькі свайго, а бацька дзяцей,
Тут і радзіўся, тут і жыву век...
Мацей Бурачок.

Кепска каля Вітэбска, у Оршы горшэ, а ў Мінску па-сьвінску.
Мазыр, што пузыр – кругом вада, а ў сярэдзіне бяда.
У Вільне – што ў мыльне.
У Слуцку ўсё не па-людзку.

Маўчыць [illegible] *аб нашай роднай зямельцы. "Беларусь мела найбольшую шчыльнасьць* [illegible] *ў сьвеце яшчэ на пачатку XX стагодзьдзя. У мястэчках гэбраяў было звычайна* [illegible] *з якіх, паводле афіцыйнага перапісу 1897 году, негэбраяў было пару чалавек* [illegible], *тая шчыльная гэбрайская маса ўсьведамляла сябе натуральнымі й арганічнымі насельнікамі краю, нягледзячы на рэлігійную рыторыку пра 'goles' (выгнаньне). І сапраўды так. Аб'ектыўна гэбрай зрабіўся гэткім жа тыповым кампанэнтам беларускага краявіду, як балоты, каўтун, пан, прыгон ды што іншае." (В. Зайка).*

Максюта: Дзіўна, што ў кнізе А. Булыкі "Лексічныя запазычанні ў беларускай мове XIV–XVIII стст." жыдоўская мова падаецца ў разьдзеле "экзатычная рэлігійная лексіка". Ведама ж, словаў гэтых адзінкі: "ебионитъ", "рабинъ", "месиашъ", "шатанъ". Выяўляецца, што "старажытнаяўрэйскія" словы "пурым", "талмуд" і "шабас" прыйшлі да нас праз "старапольскую" мову! Не зразумела, чаму "рабін" і "шатан" маюць моўнае азначэньне *яўр.*, а "пурым" і "шабас" – *стяўр.*! "Бедны ідыш" нават ня ўзгадваецца! Ёсьць усе мовы – ад грэцкай да нямецкай, але жыдоў на Беларусі як і не было! Але, як ні дзіўна, шмат у якіх беларускіх мястэчках ажно да Другой сусьветнай вайны не жыды былі "экзатызмамі", а беларусы! Ня рабіны былі "экзотамі", а папы з ксяндзамі!

Моўшка: "Зразумела, што Беларусь была найбольш талерантным краем у сьвеце ў дачыненьне да гэбраяў. Менавіта тут споўніўся ідэал для вывучэньня Торы – бясьпека і спрыяльныя сацыяльна-эканамічныя ўмовы. І ня дзіва. што тут паўстала столькі інтэлектуальных рухаў і выгадавалася столькі рабінаў, мысьляроў ды інтэлектуалаў кожнага кшталту" *(В. Зайка).*

Максюта: "Тут-жа, на Беларусі, разыгралася вялікая барацьба паміж дзьвюма жыдоўскімі рэлігійнымі партыямі: Хасыдым і Міснагдым" *(Зьміцрок Бядуля).*

Моўшка: У XIX ст. "пад узьдзеяньнем суседніх нацыянальных рухаў стаў ствараца гэбрайскі нацыянальны рух ці, лепей, – рухі, зь якіх асноўнымі зрабіліся сіянізм, бундызм і аўтанамізм. Да стварэньня ўсіх трох літвакі мелі самае непасрэднае дачыненьне. У Вільні ўзьнік протасіянісцкі рух "Хібат-Цыён", што стаў арганізацыйнай асновай для Тэадора Герцля. Там жа была заснаваная гэбрайская сацыял-дэмакратычная партыя – Бунд (у 1897 годзе ў Вільні адбыўся першы зьезд Бунду). Зь Вільняй зьвязанае й ўзьнікненьне й разьвіцьцё руху за тэрытарыяльную аўтаномію (нацыяналізму дыяспары). Бундызм і аўтанамізм на пэўных этапах можна нават лічыць зьявамі ў пераважнай ступені "літвацкімі". (...) У міжваеннае дваццацігодзьдзе ў Вільні быў створаны Інстытут гэбрайскіх даследваньняў (YIVO), які прэтэндаваў на ролю гэбрайскай акадэміі навук, існаваў шэраг школаў і гімназіяў, адукацыйнае таварыства "Вільбіг", ПЭН-клюб, выходзілі дзясяткі гэбрайскіх публікацыяў у абедзьвух мовах, працавала некалькі гэбрайскіх тэатраў (у тым ліку славутая "Віленская трупа"), існавалі літаратурныя суполкі. Выдавецтвы Клецкіна, Ром, Розэнкранца ды іншыя выпускалі кнігі на ідыш і гэбрайскай, што разыходзіліся па ўсім сьвеце." *(В. Зайка).*

Максюта: Нездарма ж Вільню называлі: "Jerušolaim d'Lite" (Літоўскі Ерусалім).

Моўшка: "Пры высокай канцэнтрацыі гэбрайскага насельніцтва, а таксама навучальных установаў – гімназіяў, школаў, сэмінарыяў, даследчых цэнтраў гэбрайскай культуры – Інстытуту "YIVO", навуковага

таварыства імя Ан-скага, бібліятэкі Матыяса Страшуна – Вільня зрабілася выбітным цэнтрам вывучэньня ўсходнеэўрапейскага гэбрайства." *(В. Зайка)*.

Максюта: Але й беларусы шмат чаго прыдбалі ад такога суседзтва, нават надвор'е навучыліся вызначаць паводле жыдоў: "Будзе дождж, то жыды сьцягаюцца; бяз плагі жыдоў насьцягалася; назвалакалася жыдоў, окіць/окідзь/плага будзе; як жыды надта зімою па сяле цягаюцца, то будзе мяцеліца; жыды нешта паўспадаліся/ўспадываюцца/ўзвалачыліся/кешкаюцца/ўскешкаліся як перад дажджом; холадна як на жыдоўскі Пэйсах, на жыдоўскія Кучкі". Навучыліся таксама прадчуваньню бяды: "жыды ўзшасталіся перад нечывільлю; мудзер на ліха жыд: дагадаўся, што ўцёк; на нейкую бяду жыдава паўсьцягаліся, праходу німа за імі; нешта жыды паўскапашыліся, бегаюць; жыдава тут нешта паскешкалася; чаго гэты жыд разшастаўся тут?"

Моўшка: Што й казаць, шмат хто зь беларусаў гергетаў і на ідышы! "A hun, vos krejet, a goj, vos redt jidiš, un a jidene, vos lernt Tojre, iz nit kejn gute sxojre" (курыца, якая кукарэкае, гой, які размаўляе на ідыш, жыдоўка, якая вучыць Тору, – гэта ўсё кепскі тавар).

Максюта: "Суседзтва гэтых дзьвюх нацыяў тварыла такія жыцьцёвыя ўмовы і эканамічныя стасункі, у якіх адна нацыя без другой не маглі абыйсьціся. За ўвесь час сумеснага жыцьця беларусаў і жыдоў на Беларускай зямлі гэтыя дзьве нацыі так псыхічна шмат перанялі адна ад аднэй. У мовах, у звычаях, у легэндах, у будоўніцтве, будзённым жыцьці – у іх формы так перамяшаліся, што (болей усяго ў жыдоў) прынялі новую самабытную акрасу." *(Зьмітрок Бядуля)*.

Моўшка: "У некаторых месцах Віленшчыны, па мястэчках, жыды, пераняўшыся забабонамі і міталёгіяй беларусаў, на Купальле сьцелюць хлявы крапівой і папаратнікам, каб ведзьмы малака не адбіралі ў кароў. Нешта падобнае да беларускай каляднай казы ёсьць і ў жыдоў. На Дзяды пры выпіўцы адзін адзеваецца казою і пяе беларускія прыказкі ў парадку жыдоўскага альфабэта: (Алеф) Антон канцавы, Мой родны Хведар Балайло! (уначы). (Бэйс) Браў ні браў – Лаяць ні трэба. Балайло! (Гімэль) Глазамі горад ні браць, балайло! і г. д." *(Зьмітрок Бядуля)*. Ёсьць і прыказка: "На сьвятога Юр'я дастане жыд дурня".

Максюта: Так, мы таксама пільна сачылі за вашай суботай: "Прыгатуй у пятніцу, будзеш мець на суботу; слонка нізка, шабас блізка". У ахвотку падраблялі нашыя "шабас-гоі" ў вашых школах, па суботах запальваючы сьвечкі. Не забываліся й мы на вашыя сьвяты: Пэйсах (жыды засьвяткавалі свой Пэйсах), Пурым (Пурым ня сьвята, трасца не хвароба)... нават некаторым сьвятам далі свае найменьні: жыдоўскія Будкі (Сукэс, Сьвята буданаў) (лапак нарубіць трэба на жыдоўскія будкі) альбо Кучкі (сёмы рачок ад жыдоўскіх кучок); Босіны (Ём-Кіпур) (на Босіны жыды ў сынагогу прыходзяць босымі нагамі).

Моўшка: Пэўне, мы вам доўг былі сплаціўшы: у ідышы ёсьць таксама азначэньні для вашых сьвятаў: "(goiške) xoge" хрысьціянскае сьвята ("az me klingt in klojster, iz a xoge" калі звоняць у царкве, дык, мабыць, сьвята); "Nitl" Ражство ("Nitl iz a bejze lejd" Ражство – злая пакута; "Nitl iz a bejz lidl" Ражство – злая песенька; "nitl *abr.* nit tor lernen" нельга вучыць); "di blinde naxt" *pejor.* "сьляпая ноч", калядная ноч; "vertepl" вярцеп, батлейка, калядны лялечны тэатар; "Verbne" Вербная нядзеля; "Xreščene", "Tojf-hoge" Вадохрышча; "Grin-xoge" Зялёныя сьвяткі, Сёмуха, Тройца; "srode-post" сярэдзіна посту (чацьвертая нядзеля Вялікага посту). І яшчэ тое-сёе: "Geblekexc" *pejor.* літаньня, малебен, набажэнства, імша; "tume" духоўная альбо маральная нечысьціня; чартаўня, ліха; хрысьціянскі малітоўны дом, царква, касьцёл; "tole" *pejor.* укрыжаваны Ісус Хрыстос; "majse-tole" *pejor.* гісторыя Ісуса Хрыста; "jarid" кірмаш; *fig.* імша; "mojexl-avojnes" грахоўныя мазгі (на папа/ксяндза); "nit geštojgn nit geflojgn" (алюзія на ўваскрашэньне Ісуса Хрыста) нахабная хлусьня, лухта, бязглузьдзіца.

Максюта: А колькі жывых назіраньняў, якія перайшлі ў нашую мову: "Распусьціўся як жыдоўская панчоха; скрапіўся як чорт жыда зьеўшы; спадзяваецца як жыды Масьяша; сьпяшаецца як жыд на шабас; узяў як чорт жыда; верыш як жыд у дзесянцёра; заўзімаюцца як жыды за жыдамі; завёўся як жыд у танцу; ашукаў як жыд свайго бога; цягне як жыд за жыдам; ходзіць як жыдоўская памыйніца; аброхалася як жыдоўская карова; пашанцавала/пашэнціла як жыду з гары едучы; чухаецца, фарбуецца, зафлондраўся, шваргоча, гергеча, таргуецца як жыд".

Моўшка: "На першы погляд магло-б здавацца, што ў пераняцьці культуры адной нацыі ў другой жыды, як нацыя болей культурная, павінна была мець перавагу над беларусамі і мець свой большы ўплыў над імі, але ў самай рэчы ёсьць іначай." *(Зьмітрок Бядуля)*.

V
Радзіма — Hejmland

Усе мы патроху жыды. *Сакрат Янавіч.*
Усе мы патроху татары. *Хаім Майсеевіч Ліфшыц.*

Масква й Варшава аплюлі вам імя
І ў дзікай чэрні ненавісьць спладзілі к вам,
А Беларусь пад крыльлямі сваімі
Вас грэла й вашым нянькаю была дзяцям.
Янка Купала.

Сэрца баліць, калі ў парыскім Цэнтры Жоржа Пампіду
побач бачыш карціны Марка Шагала і Хаіма Суціна.
Пад Шагалам на шыльлзе – "Марк Шагал (нар. Лёзна, Расся)".
Пад Суціным – "Хаім Суцін, (нар. Смілавічы, Літва)". *Андрэй Дынько.*

Моўшка: Вось паслухай ліста, які Вульф Сосенскі, жыд з Даўгінава (Віленскага павету), даслаў Антону Луцкевічу 25 сакавіка 1935 г. у Вільню: "Шаноўны дзядзька Антоні! Як ваша здароўя, як пажываеце? Ці багата вама праца, і як працуецца? Ці добра, ці карысна вам йдзе праца? Як гадуюцца вашыя дзеткі? І дзе пробывяеце, ці вясела, ці лагодна, ведаеце, дзядзька, некалі меў я вам шмат чаго казаць і многа чым дзяліцца, але судзьба гэтага не хацела. Пагэтаму нехай досыць будзе, што ёсьць... а ёсьцека досыць: адзін з маіх сыноў хворы на эпілепсію, беднота на вушы, наастатку мне яшчэ і горшая бяда спадкала, 1/III г.г. мне жонка памерла, і пакінула мне шасьцёра малых дзяцей, дзяцей як боб дробных, як мак, і жыві на сьвеце, рабі што хочаш! Вы мне прабачыце і выбачайце, не прышоў я к вам, маім гэтым пісьмом, каб вам усю маю бяду выліваць, каб маю гору вам расказаць, печалі і бяды. Думаю, цяперака усім досыць хапаець. Хочу во што: 1) я маю цікавы зборнік бел.-жыд. фольклору (пэўна за адзін дзень яго не назьбіраў). Ён састаўляець пэўны, багаты навучны, гістарычна-этнаграфічны матэрыял, каторага я меў на ўвазе – гэдок як я некалісь рабіў – падарыць яго беларускаму музею ў Вільні! (...)".

Максюта: Я ведаю, што й Зьмітрок Бядуля (Шмуэль Плаўнік) вучыўся ў Даўгінаве, пэўна, яны зналіся?

Моўшка: Воляй лёсу гэты зборнік так ніколі й ня быў надрукаваны. Але, ня лічачы Гурвіча зь Вільні, які па словах Зьмітрака Бядулі даслаў "зборнік жыдоўска-беларускіх прыказак да друку ў загранічны журнал" у 1911–12 гг. (якога, на жаль, ніхто ніколі ня бачыў), гэта хіба што адзіны сшытак, які сьведчыць аб жывым карыстаньні жыдамі беларускай мовай:

шабэс – не бэн ёхід, пайдзе адзін, прыйдзе другі! [*jid.* 'benjoxed' адзінак, бянёха]
калі бацька добры, дай бацьку кібэд, калі бацька дурань, дай бацьку кіем [*jid.* 'kibed' пачастунак]
із хоцьбы гут, із хоцьбы ніт шлэхт [*jid.* 'šlext' блага, 'gut' добра]
я з табою адрабэ вэйадрабэ, а ты мне хайдарэеш! (я з табою як найлепей, а ты мне цягніш у балоту) [*jid.* 'adrabe-veadrabe' у найлепшых адносінах]
многа тілім начытаўся, пакуль ад грэхаў абчышчаўся [*jid.* 'tilim' псалтыр]
я тілім чытаць не хачу, благую жонкі брань ня буду
шішім рыбкес, плотка ў ахвотка, шчупак не дурак, еж, калі наведзеш, акунь не піскун, лін не блін, толька вока кінь, а келбіс глота, бо не жыве ў балота, малец, не сунь палец, бо укусіць! рыбу жывую ня сушуць? [*jid.* 'šišim riboj' 600 000 – колькасьць гэбрэяў, якія выйшлі з Эгіпту]
надан і іеруша з чортам у хаўрусы [*jid.* 'nadn' пасаг, 'jeruše' спадчына]
каму цымус не смакуе, таму кугель не дадуць, а хто сэйфэр пацалуе, таму леўёсан дадуць [*jid.* 'sejfer' рэлігійная кніга, 'levjosn' левіяфан]
німа тэй мамкі, каб не мела б на бэйс-гакворэс ямкі [*jid.* 'bejs-hakvores' могілкі]
ну, што значэ хосід? – хосід значэ: хоць бы сядзеў дома альбо: хоць сябруйся з другімі, а то кажуць: хорт, сабака, дурак [*jid.* 'xosid' хасід; набожны жыд]
кібуд значэ: кейах, ботэ, дай альбо: кіем бацьку добра біць [*jid.* 'kibed' пачастунак, 'kojex' моц]
пахэд што значэ? поўна хата дурняў [*jid.* 'paxed' страх, боязь]
посьле хупы цалуй у дупы [*jid.* 'xupe' шлюб]
багроб тваю маць, з бацькам разам [*jid.* 'bagrobn' пахаваць]
куш ін гохэс не баліць, можна напапалам падзяліць [*jid.* 'kuš in toxes' пацалуй у сраку]
хохам, хохам, каб сраў гарохам [*jid.* 'xoxem' мудрэц]
іх вэл дыр цу райбн аф ячнэ-мэкэнэ! [*jid.* 'ix vel dir cu rajbn af jačne-mekene!' я цябе сагру ў парахню! (на мякіну)]
а ворт із а воробей, хап эм! [*jid.* 'vort' слова, 'xap im' хапай яго]
насып соль на хвост, кэнст зайн а ров ін Сшкоўка [*jid.* 'kenst zajn a rov in...' можаш стаць рабінам у...]
– а ці-бу-ла ў кіно? – рэдзька хаджу (*vrš.* цыбуля і рэдзька)

Максюта: Дык гэта ж сапраўдныя беларуска-жыдоўскія "локшыны"! Пэўна, гэта той самы Вульф Сосенскі, які друкаваўся са сваімі беларускімі апавяданьнямі ў "НН"?

Моўчка: Так, разам са Зьмітраком Бядулям. Усьлед ім будуць пісаць па-беларуску паэты Юлі Таўбін з Мсьціслава (1911–1937) і Зяма Півавараў з Касьцюковічаў (1910–1938), Рыгор Жалязьняк зь Віцебску (1914–1942) і шмат хто іншы.

Максюта: Яшчэ ў 1880-я гады ў Пецярбурскім універсытэце гурток "Беларуская грамада" ўзначальваў разам з Аляксандрам Марчанкам жыд Ізраіль Рагнер (нар. 24.11.1861, Шклоў) – у беларускім адраджэнцкім руху яшчэ пры яго станаўленьні ўдзельнічалі й жыды. А за "польскім часам" "ува ўнівэрсытэце Сьцяпана Батуры ў Вільні беларусы й гэбраі разам праводзілі супольныя акцыі супраць антысэміцкай палітыкі польскіх уладаў. Беларусы ў знак салідарнасьці займалі *лавы жыдоўскае* – месцы зь левага боку аўдыторыі, якія рэакцыйны рэктарат адводзіў для гэбраяў. Беларуская і гэбрайская моладзь плячо ў плячо змагалася ў шэрагах эсэраў і капэзэбоўцаў." *(В. Зайка)*.

Моўчка: У 1913 г. на старонках віленскага часопіса "Di Judiše Velt" ("Жыдоўскі сьвет") зьявіўся вялікі артыкул Зьмітрака Бядулі пра беларускае адраджэньне. У тым самым годзе Бядуля стаў адным з заснавальнікаў, рэдактарам і вядучым аўтарам віленскага часопіса "Undzere gegent" ("Наш край"). У 1914 г. у Вільні выйшаў па-жыдоўску зборнік "Літва" зь перакладамі зь беларускай і літоўскай літаратураў.

Максюта: Барыс Аркадзевіч Клецкін (нар. 05.05.1875, Гарадзішча), віленскі жыдоўскі выдавец (першая палова XX ст.), выдаў чатырохтомны "Лексыкон жыдоўскай літаратуры, пэрыёдыкі і філялёгіі" (Вільня, 1926–29) Залмана Рэйзэна, клясыкаў яўрэйскай літаратуры, але разам з тым: першае выданьне "Гісторыі беларускай літаратуры" Максіма Гарэцкага (1920), "Геаграфію Беларусі" Аркадзя Смоліча, беларускія школьныя падручнікі для менскіх школаў.

Моўчка: Віленскае выданьне "Лексыкону" зьмяшчала 347 біяграфіяў жыдоўскіх пісьменьнікаў – ураджэнцаў Беларусі, а ўжо васьмітомнае пасьляваеннае нью-ёрскае выданьне – каля 450.

Максюта: А ці не пагутарыць нам пра "дзяржаўнасьць" нашых моваў?

Моўчка: Як ні дзіўна гэта чуць, але першымі менавіта "немцы падчас першай сусьветнай вайны прызналі мову ідыш, разам зь беларускай, польскай і літоўскай, афіцыйнай мовай у Вільні і на ўсіх прылеглых абшарах пад сваім кантролем. На ідыш былі выраблены пашпарты, друкаваліся афіцыйныя аб'явы ды іншыя дакумэнты, праводзілася навучаньне ў школах." *(В. Зайка)*

Максюта: Рушым у савецкія часы: у прынятай 15 ліпеня 1924 г. пастанове Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР "Аб практычных мерапрыемствах па правядзеньні нацыянальнай палітыкі" адзначалася: "Мовы нацыянальнасьцяў, якія насяляюць тэрыторыю БССР (беларуская, яўрэйская, руская, польская), з'яўляюцца раўнапраўнымі". "Навучаньне і выкладаньне ва ўсіх установах сацыяльнага выхаваньня і прафтэхнічнай адукацыі, а роўным чынам і абслугоўваньне ўсіх астатніх культурна-асьветных патрэбнасьцяў насельніцтва павінна весьціся на іх роднай мове".

Моўчка: У ліпені 1924 г. створаны яўрэйскі аддзел пры Інбелкульце, з 1925 г. створаны тры яўрэйскія камісіі й дзьве сэкцыі. Выдаваліся часопісы "Cajtšrift", "Працы БДУ". З 1929 г. ужо дзейнічала 5 камісіяў: лінгвістычная, тэрміналягічная, па вывучэньні гісторыі жыдоўскай літаратуры, па вывучэньні жыдоўскага фальклёру, па вывучэньні жыдоўскага насельніцтва. Камісіі займаліся зборам матэрыялаў для акадэмічнага слоўніка жыдоўскай мовы, а таксама складаньнем практычнага слоўніка жыдоўскай тэрміналёгіі, зборам і распрацоўкай матэрыялаў для дыялектычнага атласа жыдоўскіх гаворак Беларусі, распрацоўкай гісторыі жыдоўскай літаратуры і жыдоўскага фальклёру, гісторыяй жыдоў у Беларусі. Тэматычны плян на 1933 г.: "Яўрэйскі талковы слоўнік" (Х. Гальмшток, Шкляр, Файнзільбэрг), выдавецкі плян БАН на 1936 г.: "Граматыка яўрэйскай мовы" (А. Зарэцкі). Л. Віленкін выдаў у 1931 г. "Яўрэйскі лінгвістычны атлас Савецкага Саюзу", Зьмітрок Бядуля разам з Н. Рубінштэйнам у 1932 г. выдалі "Яўрэйска-беларускі слоўнічак".

Максюта: 21 кастрычніка 1926 г. – створаны Дзяржаўны яўрэйскі тэатар БССР (выпускнікі яўрэйскага сэктара Беларускай драматычнай студыі ў Маскве). У тым жа годзе адчынілася яўрэйскае аддзяленьне рабфака ва ўнівэрсытэце і яўрэйскае аддзяленьне ў Гора-Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі. 1928 г. – рэарганізацыя "Маладняка" ў Беларускую асацыяцыю пралетарскіх пісьменьнікаў і паэтаў, створана яўрэйская сэкцыя. 1931 г. – у Менску на базе пэдфака ствараецца Вышэйшы пэдагагічны інстытут зь яўрэйскім аддзяленьнем, якое праіснавала да сярэдзіны 30-х гадоў.

І вось ужо зерыла тое няўлоўнае шчасьце... Як усім жадалася таго лучэньня з Радзімай, як лучыцца маці зь дзіцем... Ужо хацелася сьпяваць разам:

Jankl, Mejcik, Jurke, Šurke, Raške, Baške, Cirke, Mirke,
Ale, ale, in a rod, ale, ale, in karahod:
Hajda-hajda-hajda, hajda-hajda-hajda-ho!

Ат не, усё зноў абарвалася, пакацілася долу... "Маці" зноў стала "мачахай", а ейныя "дзеці" – "пасынкамі й сіротамі"...

VI
Душа — Nešome

Ix ken dix, Vajsrusland, azoj vi ix ken majne ejgene finger...
X'gedenk dem vajsrusišn sum, velxer hot ale derflex farcojgn...
Izi Xarik.

Ver es hot nit kejn buše in ponem un kejn raxmones in harc,
der kumt nit arojs fun jidn.
(Хто ня мае сораму на твары і жалю ў сэрцы,
той паходзіць не ад гэбрэяў.)

Мойша [illegible] Вер[illegible] [illegible]пей зноў да літаратуры. Амаль усе, хто пісаў на ідышы, маўляў, усё роўна пісалі аб Беларусі [illegible] і самае вядомае:

[illegible] Кульбак. Беларусі
[illegible] гаючай!
[illegible] чабору тваіго прашу!
[illegible] ты гэтак балюча,
Я [illegible] у душу?..
(пер. В. Макаровіча)

***Майсей Кульбак. Беларусь** (паэма)*
Беларусь яшчэ бог сьцярог,
Хоць і доля ў яе Макарава,
Бо ў бясхлебіцу
Ўздоўж дарог
Яе шчы і баршчы – яе варыва.
(пер. Я. Семяжона)

***Ізі Харык. На чужым балі** (паэма, 1935)*
Я знаю цябе, Беларусь, як пальцы свае і далоні,
Апоўначы нават змагу пазнаць твае сьцежкі крывыя,
І мяккі пявучы заход, палаюча-смольны сасоньнік,
Бярозы у сьнежнай імжы, і рэкі, і тракты сівыя.
Я помню вясковы твой сум, што плыў па начах выцьцём воўчым,
Самоту-жаўтуху, тугу мястэчак гарбатых, кульгавых.
Такой ты была, Беларусь! І варта заплюшчыць мне вочы,
Успомню я могільнік скрозь, гнілыя крыжы і курганы.
Багатай была, Беларусь... Ня зьлічыш багацьце краіны...
Боханы сітніцы ў нас зьяўляліся толькі ў марах...
Багатай была, Беларусь... Пра гэта хай скажуць батрачныя сьпіны
Ды зьбіты у панскіх стадолах, навекі скалечаны карак.
Завея і цемра. І едуць дзьве буды дзірава-самотных.
Шукаюць мястэчка. Німа.
Толькі ветры тут выюць-шалеюць.
Нябёсы і долы гайдаюцца ў золкіх шыротах.
Німа ні карчмы, ні мястэчка. Нікога. Нічога. Завея.
"Губерния Минская" едзе зь зялёным "присутствием" царскім у будах.
А неба усё абляпілі вароны магутнаю, чорнаю плоймай.
Свой чэрап аб гэтае неба разьбіць бы.
Родныя! Пустка усюды!
І месяц у высях тут лазіць белым арлом двухгаловым.
Я знаю цябе, Беларусь, як знаю твой золак у росах,
Бо ў кожнай пустэчы, глушы брысьці-вандраваць меў ахвоту.

Зяма Цялесін. Радзіма
Той край, дзе калісь нарадзіўся,
дзе столькі год пражыў, зрадніўся,
не пакідае памяці маёй...

Zjame Telesin. Farnaxt nebn tajx
Fun dem derfl, vos hot zix farhit
Lengojs dem farvoksenem breg,
A štile vajsrusiše lid
Baglejt mix, bagajstert un regt.

Мэнке Кац. Вяртанье ў вёску Міхалішкі

Калі Вэлькс-містык, увесь у лахманах і латах, вярнуўся з усіх
тутэйшых пякелішчаў да абсмаленай крушні, што некалі
была вёскай-пяюхай Міхалішкі, ён убачыў, нібы
той Абрагам, кінуты ў вогнішча, – ружамі палаюць
ускрэсіны. Ён продкаў убачыў сваіх, пыхлівых нябогаў.
Яны пратачыліся праз абсмаленыя гады,
іх сьлёзы перамяшаліся з попелам
Жабрацкай Прысады. З болем выла ціпыня
гучней за галодную зграю ваўчыную
па-над месяцовым жахам
лесу. Пер'е ненажэрных
груганоў запаланяла
вецер.

(пер. Т. Галідэй)

Максюта: Мы таксама ў падушку ня спалі, а "батлейкі" складалі, вось паслухай:

А гдзе ета мая Сорка?
Гашпада, пазвольце мне пагукаць мая Сора!
О клейнцэ Сора, о клейнцэ Сора!
Хадзі скора, будзем гуляць уцора!
Казак прыдзець, неста будзець.
Гут морген, мой Абрумцык!
Гут морген, мая Сорацка!
А гдзе ты, Сорка, прападала?
На рынкі кабацок прадавала!
А сто ета я цябе так доўга не відала?
Ідзе ты быў, Хаім?
Ай, я буў у Полацку, Велізу,
ув Невелю, Дарагабузу,
і ў Склові, і ў Мугулёві,
у Старым Быхові і ў Орсы,
ігдзе сам цорт не хадзіў!
І сто я відзеў, уй, гевалт!
Ай, Хаім, ідзі папрасі музыкантаў,
хай зайграюць!
Ой, Сорка! полна нам гуляць,
у мяне будуць тут гарэлку браць.
Заўтра сабас, на гросы табе троску,
сзар мне рыбкі нямнозка.
А толькі хадзі – я цябе правяду.
А то тут есьць хандогі, –
яны цябе схандозуць.
Ой, гашпада! як ехалі мі з Дарагабуза,
А кабілка наса біла недуза,
абоз на абозе, воз на возе, –
адна кабіла ў вазе і тая не вязе.
Да як узьехалі мі на мост,
кабілка наса гоп пад мост!
А мі яс цап за хвост!
Нет, гаварым, ты не ўйдзес!..
Сталі мі думаць і гадаць,
сто нам з кабілкі рабатаць?
Мі ўзялі стрункі на ладункі,
з рэбер карэты,
а з ног пусталеты,
а з хвастоў сітцы.
Сталі мі кабілку выпрагаць,
катоцкі і аглоблі мі ламаць,
да як разлазылі мі агніска,
аз під самій небасіска;
а тут якраз казацыска ізь лясіска
і страснага дубавісца на пляцысца!
Як ударыў... пад нос,
дык ён носам затрос.
Уй, гевалт!..

Моўшка: Сапраўдны літвацкі дыялект: замест 'š' – 's', 'ž' – 'z', 'č' – 'c' (sabesdiker, losn, gesribn, sejn, snej, idis, stetl, zaleven...). Але "гэта ўсё жарты-шмарты. Бязь іх яўрэй не яўрэй. А глыбінная душа яўрэйства ў досьціпах, у казках, у песьнях, у зычэньнях, у заклёнах кшталту гэтага:

У чорным моры чорны камень маўчыць.
У горле варонінам костка тырчыць.
Паганая сьвечка з сала сьвінога.
Для п'яніц карчма,
Для праведнікаў сынагога.
Ляціць Гурмізах на перапудзе.
Дзе не стаяли ніколі людзі,
дзе не пасьвілася вясёла жывёла,
Дзе ўся з жалеза зямля наўкола,
Дзе неба зь медзі на сто зямель.
Ратуй мяне, Зэдыкіэль.
Ацалі мяне, Тафтыф'ях.
Бог праўдзівы, прымі мой страх.
Душа мая ў тваёй правіцы.
Хай мне ўсё існае
Бачыцца й сьніцца,
Як аб сустрэчы з Табой
Напамін.
Амін."
(Р. Барадулін).

На вулицы мяцелица,
снег усё агортае,
віхры, цэрці жэняцца,
шалеюць, дух ахапляе...
Вятры кручацца, шалеюць,
страшуць пад вакном,
завірухі ўсё змарэюць,
вось канец усім людзём...
А ў хатцы, у куточку,
седзяць Хаім і рэб Гэрц,
а каля печы, на прыпечку,
старая Малка бліны пячэць.
Удруг Малка цікавага нешта пачула:
трахта! нейкая брахкая, тэрц?!
Страх і сум Малцы агарнула,
са спуду закрычала: гвалт! Хаім, Гэрц!
Ах, ка и ветры там шалеюць.
чего табе, чаго было пугацца?!
[illegible]
[illegible]
[illegible]
[illegible]
[illegible]
[illegible]
[illegible]
Цха, цха, Малка, хай шашуюць
вятры, калі паашалелі,
пагадзі, пагадзі і гуляць перастануць, –
Хаім з Гэрцэм мудра гаманілі.
змоўкла Малка, змоўклі
Хаім і рэб Гэрц,
толькі вецер
не сьціхае пад вакном,
усё гудзіць і б'ець у шыбы:
тэрц да тэрц...
Мусі ткі быць хаўтуры
ўсім людзём...

На гар Сінай мы стаялі,
там Тойра нам давалі,
пекна, пекна, пекна нам давалі.
Нам Тойра там давалі,
з радасьцю мы скакалі,
пекна, пекна, пекна мы скакалі.
На гар Сінай мы стаялі,
там мы Тойра бралі,
добра, добра, добра Тойра бралі.
Тойра бралі праз Майсея,
дзесяць словы сьвятыя,
добра, добра, добра словы сьвятыя.
Словы сьвятыя дзесяцёры
самі ж ад бога чулі,
пекна, добра, пекна ад бога чулі.
Як гутарылі мы з богам,
адпавядалі адным словам,
брава, добра, пекна, адным словам.
Адным словам загукалі,
ад радасьці засьпевалі,
добра, пекна, добра засьпевалі.

Мы сьпевалі, як Тойра бралі,
Тойра праз Майсея,
добра, пекна, добра праз Майсея.
Праз Майсея ганцавалі,
галелуя засьпевалі,
добра, добра, пекна засьпевалі.
Засьпевалі на рохвольле,
галелуйя, галелуйя,
хай жыўе *ам ісроэйл, ам ісроэйл*.
(Зап. В. Сосенскім).

Бацька, бацька! Бацька, бацька!
Выбудуй ты нам нашу хатку,
выкупі ты нам нашу матку.
Бяз хаткі ня будзем,
бяз маткі заблудзім.
Аўромулю, Аўромулю,
Аўромулю, старушак ты наш.
(Ісхакулю, дзядулька наш,
Якавулю, татулька ты наш.)
Чаму-жа вы ня ходзіце,
чаму-жа вы ня просіце.
Чаму-жа вы ня моліцеся богу за нас.
Каб-жа нас асвабадзілі,
каб-жа нашу хатку выставілі,
каб-жа нашу матку выкупілі,
да із *голас* вывадзілі.
Лэйарцэйну правадзілі, *лэйарцэйну*.
Ня плач, сынок, сынок, сынок,
ня крой сваё сэрца, сэрца.
Будзе хатка выставена,
будзе матка выкупена.
Чакай канца,
вэйнэмар мыфонаф шыр охадошо.
Галэлуіе, галэлу, галэлу, галэлуіе.
(Зап. Я. Станкевічам ад В. Сосенскага).

Уставала Хана рана,
эй, і раненька,
і збудзіла свае слугі,
эй, і дабрэнькі.
"Уставайце, мае слугі,
дабрэнькі,
зажыгайце сьвечачонкі,
эй, ерусалімкі.
А я тым часам,
Хана, пахаджу,
да й сына *талмуд-хохэм*
ай, ураджу."
Урадзіўся Шмуэль-*ганові*
добрым часам.
Спавівала яго Хана
шаўковым пасам.
Сара, Рыўка, Рахіль, Лія
бабкамі бувалі.
Аўром, Іцхок, Янкев-*овіну*
сандіке бывалі
Моішэ, Арйе, Довід, Шлоймэ
кватэры бувалі
гакодэш борэху і малохім
Шмуэль-*ганові* назвалі.
(Зап. С. Ан-скім у Віцебскай губерніі ў XIX ст.)

Максюта: Вось што пісаў аб беларуска-гэбрэйскіх рэлігійных сьпевах Ян Станкевіч: "Ня толькі ў жыдоў былі рэлігійныя песьні па-беларуску, але з часу красаваньня беларускае культуры (XV–XVI вв.) маем навуковыя творы, перакладзеныя жыдамі з гэбрэйскае мовы на беларускую ("Тайна тайных", "Лёгіка" і інш.). У XV стаг. маем беларускія пераклады Бібліі, зробленыя жыдамі з мовы гэбрэйскае. Бібліі гэтыя прытарнаваны да ўжываньня ў сынагогах." Але ёсьць яшчэ шмат народных дзьвюх-, нават трохмоўных песень, вясёлых, жартоўных:

– Fun vanen kumt a jid?
– Fun Ljubavič!
– Vos tut men in Ljubavič?
– Me trinkt bronfn,
Un me huljet,
Un me tanct a karahod!
(Хасыдзкая песьня)

***

Afn barg, unter barg
Flien tojbn porn.
Nox kejn naxes nit gehat,
Šojn avek di jorn.
На гарэ, пад гарой
Галубы стаялі.
Я йшчэ шчасьця не відала,
Годы мінавалі.

Špant že, brider, gixer ajn,
Kare ferd di porn.
Mir veln forn un derjogn
Undzere junge jorn.
Запрагайце, хлопцы, коні,
Коні вараныя.
Мы паедзем даганяці
Годы маладыя.

***

Mir hobn derjogt undzere jorn
Afn brejtn brik:
– Jorn junge, kert zix umet
Xoč in gest curik
Мы дагналі нашы годы
На шырокім мосьце:
– Годы, годы маладыя,
Прыяжджайце ў госьці.

– Nejn, nejn, nejn, mir veln nit gejn,
Šojn nito cu vemen,
Ir hot badarft jungerhejt
Di jorn nit faršemen!
– Нет, нет, нет, мы не вернёмся,
Вы не заслужили,
Почему вы с юных лет
Годы погубили?
(Зап. А. Хадыкам і М. Залатухам у Амсьціславе)

***

Hop, majne homentašn,
Hop, majne vajse!
Hop, mit majne homentašn
Hot pasirt a majse.
Гоп, мае грачанікі,
Гоп, мае ячныя,
Чаму ж мае грачанікі
Такія ня смачныя?

Рыгор Барадулін прыводзіць свой варыянт:

Гоп, мае грачанікі,
Усе жыды начальнікі,
А ў калгасе дуракі
Дзеруць межы як быкі.

***

Un zi iz glajx in mark avekgelofn,
Un hot dort a goje mit a hun getrofn.
– "Сколько стоит" курка-маладзіца?
– Тры аршыны "ситца" на спадніцу.
(Зап. А Хадыкам і М. Залатухам у Амсьціславе)

VII
Суседзі — Šxejnim

"Гора нам... Жыды мы." *Зьмітрок Бядуля.*

"Jidiše natur" un "goišker mazl" ("жыдоўская натура" і "мужыцкая доля").
"A jidiše kop" un "a jevoniše kop" ("жыдоўскі розум" і "маскалёўская мазгаўня").

Жыдоўскі "зараз", як беларускі "пачакай".

Литвины – земляники, землекопы, лопатники, белошапошники, магерки.

"Пацьвельваньне – мяккая, гуманная, ачышчальная тэрапія сьмехам. Беларус не жадае ліха суседзям, калі іранізуе зь іх. Нехта можа і пакрыўдзіцца на іх нязлосныя показкі. Але апраўдвае беларусаў тое, што найболей [illegible] і дасьціпна яны пацьвельваюцца з саміх сябе." (П. Васючэнка).

М[illegible] [illegible] фальклёрны вобраз жыда-літвака?

[illegible] [illegible] Беларуса кажуць: багаты, брахлівы, хітры, скупы, бяздушны, паганы, адважны, [illegible]. Але гэта ж усё й пра жыда. Троху дадамо – да багатага: "Грошай як у жыда; [illegible] – Ой, жыдку, злажы на се світку! – Я і так багаты, хоць троха пархаты"; да брахлівага: [illegible] б'е і сам крычыць; жыд кожан хвалько; жыд з блахі то вала зробіць"; да хітрага: "Жыдоўска [illegible], мэнтнасьць; жыдоўскі розум – то шэльмоўства; на тое жыд, каб ашукваў; патуль жыд ня сядзе [illegible], пакуль хрысьціяніна не ашукае; жыда сам чорт не ашукае; жыд хітры, але падчас то й дурны"; да скупога: "На грошы ласы; жыд гаворыць: лай, адно грошы аддай; ну і даў жа, як жыд перцу"; да бяздушнага: "Такой ласкі і ў жыда дастанеш/знойдзеш"; да паганага: "Жыд чарцямі ўхоплен (навер'е); яшчэ рочэнцы цялёнку не вышлі, а яго зарэзалі паганэ жыды"; да адважнага: "Жыда і думка аб воўку палохае; жыда ўсюды страшыць; жыду і птушкі страшны; жыду воўк і ўва сьне страшны; жыду і жаба воўкам стане"; да патлатага: "Валасы кучмою лежаць як у жыда". Сёе-тое яшчэ: кампанейскі ("за кампанію і жыд павесіўся"), набожны ("як жыд прыдарожны"), удачлівы ("паньско і жыдоўско нідзе не прападае; пана і жыда ніколі чорт ня возьме"); "што будзе, то будзе, а жыд панам ня будзе; жыд скажа, як зьвяжа; жыд за жыда ўсёгды ўступываецца; жыд на рыбу як кот (жыду да рыбы сьмяюцца вочы), жыд заўсёды часныком сьмярдзіць (жыд жыдам сьмярдзіць), выпэцкаўся як жыд у гразь; у жыда ўсёгды шмацьцё вісіць, боўтаецца; ходзіць абшарпаўшысь як жыд; у падраных панчохах ходзіш як жыдоўка; ходзіць як жыдоўская памыйніца; каждая жыдоўка – абшарпанка; у кожнай жыдоўкі дарагій земчуг на шыі; жыдоўка ў перлах ходзіць". Напэўна, гэта і ёсьць тое, што завецца "жыдоўскай натурай, жыдоўскай работай". Вось яшчэ батлеечны партрэт: "На галаве рыжыя валасы з пэйсамі і гэтакая ж рыжая барада, доўгі чорны замызганы халат (лапсардак), шапка зімовая зь ліса, верх аксамітны, відаць белыя шкарпэткі, туфлі з задзёртымі насамі, гарбаты".

Моўшка: Але, "каб ты бачыў свой від, то думаў бы, што жыд"! Ды й самі жыды-суседзі ня надта ветліва ставіліся да "трэфных літвакоў". "Рацыяналізм літвацкага тэалягічнага дыскурсу стварыў для літвакоў уваччу суседзяў – гэбрэяў польскіх і ўкраінскіх земляў – стэрэатып эмацыйна стрыманай, крытычнай, нават чэрствай асобы, якая нічым ня грэбуе дзеля пошуку доказаў, каб у нечым пераканацца. Гэта апошняя рыса спрычынілася да мянушкі "цэйлэм-коп" (крыжагаловы): лічылася, што вучоны літвак можа лёгка перакінуцца ў хрысьціянства, каб толькі задаволіць сваю цікаўнасьць. Верагодна, што гэтаму паспрыяла распаўсюджаньне гэбрайскай асьветы (Гасколы) на беларуска-літоўскіх землях, а таксама гэткія вядомыя выхрысты, як арыенталіст Даніла Хвольсан (вядомы сваёй фразай "Лепей быць прафэсарам у Пецярбургу, чымся мэламэдам у Эйшышках") і авантурыст Якуб Брахман (аўтар антысэміцкага трактату "Кніга кагалу"), што паходзілі зь іх." *(В. Зайка).*

Максюта: "Ix bin a litvak – a bisele xoxem, a bisl durak!" Запраўды, "былі й выключэньні, як у выпадку Ўладзімера Мэдэма, што паходзіў зь менскай асыміляванай сям'і, дзіцем быў ахрышчаны ў праваслаўе, а пасьля стаў адным зь вядучых дзеячоў Бунду, вывучыў у сталым узросьце ідыш і ўсяляк прапагандаваў яго ўжываньне." *(В. Зайка).*

Моўшка: А як паконт забабонаў аб "крови христианских младенцев", аб "забойцах Хрыста"?
Максюта:

"Збаю байку:
Забіў жыд Хайку,
Павесіў над духам,
Абіў абухам,
Зрабіў дзюру,
Задраў скуру –
Кроў – кап, кап,
А жыд – хап, хап!"

Во яшчэ й прымаўкі: "Мэнчыў мяне, як жыды пана Езуса; жыды-анціхрысты шкуру з нас дзеруць; жыды тые ж басурманцы, бязьвернікі; жыды не вызнаюць Хрыста; жыды-інавернікі паганыя; усякая жыдоўка – чартоўка".

Моўшка: "У беларускім фальклоры існавала ўяўленьне аб "божай" птушцы-ластаўцы, якая, згодна з паданьнем, калі ўкрыжоўвалі Хрыста, скрала цьвікі ў яго забойцаў-"жыдоў". Ёй супрацьстаяла "жыдоўская" птушка-верабей. "Віна" вераб'я палягала ў тым, што ён зьдзекваўся з укрыжаванага Збаўцы, памнажаў яго пакуты на крыжы. Менавіта таму вераб'я ў прастамоўі называлі "жыдам". Ня менш цікавае і беларускае паданьне "Адкуль сьвіньні?". Паводле яго, падчас Крыжовага шляху адна з габрэяк вельмі моцна біла і кляла Хрыста. За гэта яна была перавернута Богам у сьвіньню." *(І. Марзалюк)*.

Моўшка: Сёе-тое ёсьць і ў батлейцы:

Жыд: Іцах-міцах, манарх-гіцах, бег я з павагаю і радасьцю праведаць цара. А што пану цару ад мяне патрэбна?
Цар: Адкажы мне, Лейба мой любы, колькі месяцаў таму назад нарадзілася тое дзіця?
Жыд: Калі пан цар хоча ведаць, бо я без сваіх талмудаў не магу сказаць. Сора Езэрмоўс, нойдзем талмуд гроўс. Барухаты едыной, елегэйну налегой, цібэлэ татэ, нібэлэ мамэ, і ліпа высока і на корань глыбока, а хто гэту ліпу будзе капаць, той будзе век панаваць. Ясны цар, ужо дзевяць месяцаў мінулася, як тое дзіця нарадзілася. Што знаў, тое і сказаў, няхай мяне цар прабачыць. падаю да ног. (...)
Жыд: Яснавяльможны сьвіняны кныр! Што ж, васпану, зрабілася, уся вантроба кроўю залілася. я думаў, што ты сьпіш, аж бачу, што ты сьмярдзіш. Браў ты з нас і драў ты з нас і крупавыя, і млынавыя, і мякіну, і сьмяціну, але ўжо цяпер як вазьму я тваю карону ды сяду на трону і буду каралём над яўрэямі, а ты сьвіньнёй над сьвіньнямі. От каб цяпер мая Сора знала, што я тут крулюю і над усімі яўрэямі паную. Сора, кум танцен маёхес.

Моўшка: А ці не жыды спаілі "братоў славянаў"?
Максюта: Вось што пішуць пра Зьмітрака Бядулю: "Драматызм крайняй і безнадзейнай беднасьці, як прычына з рэзультатам, зьвязанай з п'янствам, адчаем настрою і садызмам пачуцьця, таленавіта змалявана ў колькіх апавяданьнях" ("Сьцёпка", "Тулягі", "Сымон")". Ня менш яскравыя беларускія песьні:

На базары сесьці на прэкрасным месьце,
Вуй, вуй, вуй, мамуля,
Зок, зок, зок, Хаюля,
А гуценькі, гут, гут,
Рай-рам, рай-рам,
А гуценькі, гут, гут,
Там яўрэйка Хая віном таргавала,
Ой, яўрэйка Хая, што ж ты нарабіла?
Што ж ты нарабіла: віном напаіла.
(Зап. А. Глушко ў вёсцы Сялец)

На прэкрасным мейсцы карчомка стаяла, да нова,
Ай-вай і зут-зуг кум-кірім бом-бом.
А ў таей карчомцы Хайка маладая – жыдоўка,
Хайка маладая водкай шынкавала, гарэлкай,
А ў таей карчомцы два салдаты пілі-гулялі,
Два салдаты пілі, усё Хайку манілі – жыдоўку,
А ў суботу рана ўсе жыды ў школе, у школе,
Усе жыды ў школе, толькі Хайка дома – жыдоўка,
А ў нядзелю рана прыйшлі тры вазочкі па Хайку,
А ў першым вазочку падушкі-пярыны, пярыны,
А ў другім вазочку шэраброі злота, злота,
А ў трэці вазочак сама Хайка села, жыдоўка,
Сама Хайка села, песеньку запела, жыдоўка.
(Зап. А. Ласём у Жупранах)

Былі ў каморы ў нас грошы,
А я тыя грошы да Моўшы.
Ты піў, і я піла,
Ты насіў, і я насіла
Тыя грошы да Моўшы.
Было ў каморы ў нас жыта,
А я тое жыта да жыда.
Была ў каморы ў нас грэчка,
А я тую грэчку ў мястэчка (за рэчку).
Былі ў каморы ў нас боты,
А я тыя боты да Моты.
Былі ў каморы ў нас яйкі,
А я тыя яйкі да Хайкі.
Была ў каморы ў нас водка,
А я ж тую водку ды ў глотку.
(Зап. А. Хадыкам у вёсцы Пяскі)

Моўшка: Ведаем і мы добра вашыя беларускія песьні: "Сабралася бедна басота, дый гарэлку п'е... П'ем мы гарэлку, п'ем мы паліўку, будзем піць віно, а хто будзе з нас насьміхацца, будзем біць таго", "а я ў піру была, п'яная дамоў ішла, хмель-віно зялёнае, усё маё пахмелейка", "тая дзсўка напілася, ды і зь

печы звалілася", "ой, піла, піла, чапец згубіла", "у нядзелю п'ю, п'ю, ў панядзелак сплю, сплю", "ад панядзелка да панядзелка смачна п'ецца нам гарэлка", "паўзагона не ўзарала, да карчомкі дала драла, ад карчомкі да карчомкі нясі паўгарца гарэлкі", "бачыш, жана, як гарую: з адной карчмы – у другую", "пілі мы, пілі, усю пшаніцу прапілі", "у карчме ня быў, а каня прапіў", "ты, шынкарка маладая, пачом у цябе пляшка гарэлкі?", "шынкарачка малада, прадай мёду гарцы два", "волы нэ прісталы, з дарожкі нэ збывся, дашов до корчомкі, водочкі напывся", "гарэлачка-пітушачка, як я цябе люблю", "чарачка-каток, кацiся ў раток", "чарачка мая, залатая..." Або ў сучаснай музыцы: "У суботу, нядзельку, зазірнуць у бутэльку, а ў бутэльцы на дне чорт рагаты жыве", "хочаш піва...", "маленькі жаўнерык, налівай, налівай яшчэ, выпівай, выпівай хутчэй", "куфаль піва, келіх віскі", "мы дапіць не пасьпелі да дна..."

Максюта: Вядома ж, дзеяслоў "пець" паходзіць ад "піць"! Ну, а ўжо пра батлейку й казаць німа чаго – "пэрлы":

Ой, калі з ба на мяне
цорны год няхай напаў,
ей-ей, няхай напаў,
калі б мяне казацынька
на сем месьце не застаў!
Гарэлі-мамухі,
[illegible]
[illegible]м, гэшпада!
[illegible]ю смута, –
[illegible]мае
[illegible]ае!
[illegible] бага гора
і такіў гарэлінкі паболе.
А ў мяне сабасовая і дзясовая,
зь мельніцы, з-пад кола,
гдзе круціць і муціць,
і пенай б'ець, і назад валакець.
Так іна і таго будзець біць,
хто яе будзець піць,
але хто хоцыць яе піць,
трэба гросыкі плаціць!

***

Мая сапацка із злота,
з адной скурацкі работа,
і ярмулацка казына,
уся гнідамі спідкована.
Ой, мір, мір,
стэйлэм, бэйлэм,
стэйлэм, бэйлэм.
Там і Борух троху гуляў,
Масіясу поўху даў,
ой, мір, мір,
стэйлэм, бэйлэм,
стэйлэм, бэйлэм.
Там і Борух троху ўпіўся,
ён пад лаўку падваліўся,
ой, мір, мір,
стэйлэм, бэйлэм,
стэйлэм, бэйлэм.

***

Бэрка
Што кроквы і латы!
Ішоў ты на варты
і спрасіў паўкварты,
даць я не даў, а запісаць – запісаў.
Апяць ішоў ты з варты
і спрасіў паўкварты,
я даць не даў, а запісаць – запісаў.

***

казак
Я казак, небарак, работы не маю, жыдоў б'ю,
водку п'ю, весела гуляю.

Моўчика: Як у нас кажуць: "Fun a kvatirele hot men a goldenem šnirele" (кварта гарэлкі прыносіць залаты ланцужок – дае добры заробак). Але німа чаго й казаць – "pojer blajbt pojer" (мужык ёсьць мужык). У ідышы ёсьць устойлівыя показкі: "šikere pojerim" (п'яныя мужыкі/сяляне), "šiker vi goj/pojer" (п'яны як гой/селянін), "zojfn/trinken vi a goj" (жлуктаць/піць як гой), "cejušen zix vi a šikerer pojer" (разьюшыцца як п'яны селянін). І яшчэ: "Hobn a tam vi cvej šikere gojes voltn zix kušn" (такі смак, быццам бы дзьве п'яныя гойкі пацалаваліся).

Максюта: Ну, тады яшчэ два ўзоры з сучаснай музыкі:

Болей ніколі ў жыцьці да Рагойшы
Я не пайду, лепш нап'юся ў Мойшы
Ў простай звычайнай карчме местачковай
Гарэлкі празрыстай, гарэлкі жытнёвай.
(М. Анемпадыстаў. Настаўнік Рагойша)

Роснымі лугамі,
Полечкам траўлівым
Іду да Абрама
На моцнае піва.
(альбом "Byvajcie zdarovy")

VIII
Страчаны лёс — An ongevorn mazl

Божа мой!
Колькі ўжо раз рабіў я павароты назад у жыццці сваім...
І колькі яшчэ раз буду рабіць?
Максім Гарэцкі.

Вось так нітo жыву і ня жыву,
Сваім, што бачу, ня веру вачам,
Што чую – не бяру у галаву,
І што я знаю – ўжо ня знаю сам.
Янка Купала.

Dem jidn majdt kejn umglik nit ojs.
(Ні адно ліха не абміне жыда.)

Vos jaršenen jidn? – Cores un meridn.
(Што атрымліваюць ў спадчыну жыды? – Ліха і гэмарой.)

Як ні горка, але чым далей, тым болей пайшла гуляць "казаччына" і завіхрыла, загула...
"XX стагодзьдзе было росквітам здрады, тут і кветачкі цьвілі, "зялёны ліст, чырвоны цьвет", і ягадкі крывавыя сьпелі. На нашым матэрыяле можна складаць анталёгію здрадніцтва." *(П. Васючэнка).*

Моўшка: Вось пастанова Бюро ЦК КП(б)Б ад 24 ліпеня 1925 г.: "Считать необходимым – изживать из употребления в белорусском языке слова 'жид', заменив его словом 'еврей'".

Максюта: "Спрадвеку ў беларускай мове слова "жыд" ня мела й слабога водценьню абразы, прынізу. Бальшавікі з Масквы прынесьлі ў слова "жыд" значэньне абразы, непрыхаванай нянавісьці. Быў прыняты ўказ, па якім за слова "жыд" давалі да пяці гадоў турмы. І гэта пачало мацаваць і без таго моцную сталінскую дружбу народаў". *(Р. Барадулін)*. Вось анэкдот: сын вяртаецца са школы: – Тата, мяне ў школе жыдам называюць! – Калі кажуць "жыд" – будзеш доўга жыць, а калі кажуць яўрэй, дык памрэш скарэй.

Моўшка: Але слухай далей – у 1929 г. наркам асьветы А. Платун на сходзе камсамольскага актыву заявіў: "...у зьвязку з абвастрэньнем клясавага змаганьня і беларускі, і яўрэйскі, і польскі нац. дэмакратызм і шавінізм адлюстроўваюць настроі кулака, настроі варожай нам клясы, выступаюць супраць лініі партыі, супраць лініі савецкае ўлады. І яны надзвычайна добра паміж сабой ужываюцца. Ня сварацца паміж сабою яўрэйскія, польскія, беларускія шавіністы і нац. дэмакраты, а, наадварот, падтрымліваюць адзін аднаго. Гэта ёсьць адзіны фронт, які выступае супраць лініі камуністычнае партыі, супраць лініі савецкае ўлады" (1930).

Максюта: А вось ужо зноў Зьмітрок Бядуля: "Контррэвалюцыйныя дзеяньні беларускіх нацыянал-дэмакратаў, уся іх праграма, маюць адным з сваіх вытокаў буржуазны беларускі нацыянальны рух часоў "Нашай Нівы"... Я, былы нашанівец, за апошнія гады паступова перавыхоўваўся ў кірунку пяўхільнага набліжэньня да задач пралетарскай рэвалюцыі... рашуча адмяжоўваюся ад беларускіх нацдэмаў, як ад іх дзеяньняў, так і ад іх праграмы, якая ставіла курс на стварэньне буржуазна-фашысцкай Беларусі".

Моўшка: Блізу таго ж самага піша ў "Звяздзе" былы "нашанівец" Янка Купала...

Максюта: У маі 1939 г. Інстытут нацыянальных меншасьцяў цалкам ліквідаваны, а ў тым жа годзе Зьмітрок Бядуля адзін зь першых беларускіх пісьменьнікаў узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сьцяга. Купалу ж далі ордэн Леніна ("каму ордэн, а каму ордэр")...

Моўшка: 1930 год – "вялікая колькасьць рабінаў і настаўнікаў хедараў і ешываў у Беларусі былі пазбаўлены правоў і заклеймены як "лішэнцы". Іх жытло канфіскавалася дзяржавай, а яны разам зь сем'ямі вымушаны былі жыць нелегальна на гарышчах і ў падвалах сынагогаў. (...) Анонімнае прашэньне: "Хто не быў сьведкам выгнаньня беларускага яўрэя зь яго дома, той ня бачыў сапраўднай катастрофы... Калі яўрэй у Бабруйску маліў мэра, каб улады пашкадавалі яго дзяцей і не пакінулі іх без прытулку, той зьдзекліва казаў: – Рака яшчэ ня поўная."

Ёсьць і анэкдот: 1930 год. Ідзе вучэбная часіна (па-рассейску – урок) у менскай гэбрэйскай пралетарскай школе №1. Настаўнік пытаецца: – Дзеці, якая векапомная падзея адбылася ў 1799 г.? – Памёр Віленскі Гоэн. – Сьціхні! Што тут за рэлігійная прапаганда!?.. Дзеці, у 1799 годзе нарадзіўся наш вялікі паэт Пушкін! А якая падзея адбылася ў 1812 годзе? – У нашага Пушкіна было бар-міцвэ!

Максюта: Што і казаць – "страх і сумна". "Перад вайной 1941–1945 гадоў мне малому балюча запала жудаснае відовішча. Праз вокны зачыненых яўрэйскіх школаў ляцелі кнігі, як тыя птушкі з адарванымі крыламі. Літары, як птушыныя лапкі на сьнезе, на старонках гэтых бяздомных кніжак поўніліся лютай роспаччу, немым жалем. Пазьней зразумеў, што яўрэйскія кнігі паўтаралі сумны лёс беларускіх старадрукаў, уніяцкіх і глыбінных крывіцкім духам нашых фаліянтаў." *(Р. Барадулін)*.

Моўчика: Але, не зважаючы на свой лёс, нават і зараз жыды з асалодай размаўляюць і нават пішуць па-беларуску: выкладчыца з Полацку Дзіна Іткіна, Шыман Глазштэйн з Магілёва, Фэлікс Хаймовіч і Вольф Рубінчык зь Менску... Выдатна размаўляў па-беларуску, бо нават яшчэ ў дзяцінстве вучыўся ў Чашнікаўскай беларускай школе, сапраўдны носьбіт ідышу на Беларусі, як ня сумна гэта казаць, ужо нябожчык Гірша Рэлес. Шпрыца Рохкінд, аўтарка "Идиш-русского словаря", склала й "Слоўнік сынонімаў ў беларускай мове"...

Максюта: Пра беларускую мову і я збаю байку. За савецкім часам пры Машэраве ў Менску на Паркавай магістралі пачаў [illegible] кватэтар, які называўся па-беларуску "Масква". Праязджаў міма нейкі вялікі [illegible] Масквы, зьўважыўшы новабудоўлю, дый кажа: "Чаго гэта ў вас сталіца нашай радзімы з [illegible]?" Літару справілі, але і дагэтуль яна заўважна, бо зроблена з чарнейшай медзі. Але [illegible] разам зь літарай "А" зьніклі й апошнія беларускія школы...

Моўчика: Зачыстнікі выклік справакаваў фашысцкі адказ. Нацысты паставілі й габрэяў, і беларусаў на мяжу [illegible] вынішчэньня. Савецкі камунізм давёў абедзьве нацыі – куды толькі даставалі ягоныя рукі – да крайняй сацыяльнай дэградацыі і нацыянальнай асыміляцыі." *(А. Дыпько)*.

Максюта: "Дэнацыяналізацыя і русіфікацыя, як наўмысна прышчэпленая эпідэмія, у 30–50-я гады захапіла ня толькі беларусаў, але, магчыма, у яшчэ большай ступені – яўрэяў. А дэнацыяналізаваны чалавек часьцяком становіцца ня проста абыякавым, але – горш таго – варожым да сваёй нацыі, да тых, хто ня страціў яшчэ сваёй гістарычнай памяці, культуры й мовы."

Моўчика: Мусібыць, таму й беларуская мова цяпер стала лаянкай, сродкам абразы ў вуснах дзяржаўнай улады.

"Але ўжо ноч настала, і варта па вулках ішла... і разьвіталіся між сабой, у думках жадаючы, каб дзеля спажытку сэрцу і розуму таксама і далей удвох схадзіцца."

Абодва нашыя субяседнікі скончылі сваё жыцьцё заўчасна і трагічна, трапіўшы, паводле словаў віленца Шмэркі Качаргінскага, "cvišn hamer un serp" (паміж молатам і сярпом), – абодвух растралялі як культурных носьбітаў сваіх моваў – ідышу і беларускай: Майсея Кульбака – 29 кастрычніка 1937 году напэўна ў Курапатах, Максіма Гарэцкага – а 3-яй гадзіне апоўдні 10 лютага 1939 году ў г. Кіраве (Вязьма).

"Яе (мову) вывелі з ужытку, як слова "жыд". Сьледам за ёй ідзе й мова-гаспадыня. І гаспадыні сказалі гжэчна: не выганяем, але просім вон! Няхай сабе жыд будзе называцца яўрэем. Толькі б яўрэі былі." *(Р. Барадулін)*.

"Зьнікненьне частак гэтай самай Беларусі азначае скурчваньне беларускай прасторы, разбурэньне беларускага топасу." *(В. Зайка)*.

"...якіх яркіх, цікавых, своеасаблівых, неардынарных людзей страціла Беларусь у гады таго "вялікага зыходу", як нам іх не хапае! Не хапае іхняга энэргічнага, напорыстага жыцьцялюбства, іхняга гумару, іхняй вострай дасьціпнасці, без чаго наша беларускае цеста часам бывае прэсным, калі не сквасьнелым..." *(В. Тарас)*.

"Літвацкі субэтнас, сутэрытарыяльны з этнасам беларускім, уяўляе сабой дагэтуль амаль некранутую крыніцу зьвестак па беларускай гісторыі, мовазнаўстве, беларускай і яўрэйскай культуры." *(В. Зайка)*.

"Цудоўная каляровая экзатычная птушка (Goldene pave) заляцела калісьці пад нашу беларускую шэрую страху. Яна прамаўляла штосьці сваё, а мы, беларускія людзі, кідалі ў яе каменьнем. Гэтая птушка даўно ўжо паляцела прэч, і толькі цяпер здолелі разабраць сёньня словы. Птушка гэтая, як вы пэўна здагадаліся, – гэбрайская культура. Яна яшчэ абавязкова вернецца, забыўшыся на старыя крыўды, каб дапамагчы беларусам дывэрсыфікаваць сваю культуру, пераадолець гравітацыю расейскай культуры, увесьці ў культурны зварот новыя імёны й канцэпты." *(В. Зайка)*.

Людзі кажуць, што нарэшце "байструк-ідыш" дачакаў, каб яго прыгуліла да сябе "краіна продкаў". Але на Беларусі й дагэтуль хапун гуляе. Ці будзе тут што калі?..

"Нікому, ніколі, нічога, але каму калі што, дык абы як!"

Што-та будзе тут цяпер?
"Нічога не будзе!" –
Хітра думалі ў чацьвер
Палескія людзі.

Янка Купала.

"Ojb nit hajnt, iz morgn, ojb nit morgn, iz iberajor!" – Калі ня сёньня, дык заўтра, калі ня заўтра, дык праз год!
"Nox šabes dinstik" або "šabes noxn kaltn kugl" – Пасьля суботы ў аўторак або ў суботу пасьля халоднага кугеля!
"Iberajor mitvox!" – Цераз год у сераду! Калі не цяпер, дык у чацьвер!
На сьвятое ніколі! На сьвятыя Міколы або ніколі! На сьвяты Адам! На тое лета, пасьля абеду, гэтакаю парою!

ЛІТАРАТУРНЫЯ КРЫНІЦЫ

А. М, Булыка. Лексічныя запазычаньні ў беларускай мове XIV–XVIII стст. Мінск, 1980.
А. Цьвікевіч. Западнорусизм. Мінск, 1993.
Беларусіка – Albaruthenica. Яўрэйская культура Беларусі і яе ўзаемадзеянне з беларускай і іншымі культурамі. Мінск, 1995.
В. Зайка. Лёс мовы ідыш і інстытут гэбрайскіх досьледаў "ІВО". Газэта "Беларус", студзень 1996, № 431.
Газэта "Наша Ніва".
Давід Шульман. Дзе ўзяць крыху шчасьця. Мінск, 2005.
Е. Ф. Карскі. Т. 1 (стар. 155). Мінск, 2006.
Жартоўныя песні. Рэд. А. С. Фядосік, Г. І. Цітовіч. Мінск, 1974.
Запісы 27. Беларускі інстытут навукі й мастацтва. New York Miensk, 2004.
Зьмітрок Бядуля. Жыды (1915).
Зьмітрок Бядуля. Жыды на Беларусі. Бытавыя штрыхі. Менск, 1918.
М. Багдановіч. Творы. Мінск, 1957.
М. Гарэцкі. Збор твораў у 4-х тамах. Т. 1. Мінск, 1984.
Музычная культура Беларусі: Гістарычны шлях. Кантакты. Мінск, 2002.
Музычная культура Беларусі: пошукі і знаходкі. Мінск, 1998.
Музычная культура Беларусі: праблемы гісторыі і тэорыі. Мінск, 1999.
Пятро Васючэнка. Беларус вачыма беларуса. // ARCHE, 2004, Менск.
Рыгор Барадулін. Здубавецьце. Мінск, 1996.
Сямейна-бытавыя песні. Склад. І. К. Цішчанка. Мінск, 1984.
• er vet nemen di eršte-beste froj ён возьме за жонку першую, якая трапіць
• eršt nextn толькі ўчора
• eršt rext/beemes толькі праўда
• fun der eršter hant зь першых рук
• ict eršt толькі што, зараз
• bam erštn mol šrajt a mejdl "oj, oj, oj!" – bam cvejtn mol laxt zi "ха, ха, ха!" *glxv.* першым разам дзеўка крычыць "вой-ёй-ёй!" – другім разам сьмяецца "ха-ха-ха!"
• dos eršte vajb iz a gezunt cum lajb *glxv.* першая жонка – здароўе для цела
• ojb der erštling iz a mejdl – iz dos a guter simen far di kumendike kinder *glxv.* калі першая родзіцца дзяўчынка – гэта добры знак для будучых дзяцей

erter *pl.* →ort *n*, *dim.* **ertl** *n*, -ex, **értele** *n*, -x месца; **értervajz** *adv.* месцамі, тут і там

erve *f*, -s [*s.* (ות-)ערווה] "сорам"; палавы орган; нагата, нагасьць; брыдкая/агідная рэч, брыдкі/агідны ўчынак [*sin.* šand; seksueler organ, naketkajt; šendlexe zax, šendlexe uffirung]

es (im) [*d.* es] 1. яно (ён, яна), гэта; 2. **=se=s'** неперакладаная часьцінка перад дзеяслоўным выказьнікам на пачатку сказа
• bistu es? гэта ты?
• es vet kumen/zajn a cajt прыйдзе час
• ix ze/hob es я бачу/маю гэта
• dos kind vil esn, vejnt es *glxv.* як дзіцё хоча есьці – яно плача

-es [*s.* ות-] *suf.* -аньне, -ства, -цтва, -асьць (утварае назоўнікі ніякага роду са значэньнем роду дзейнасьці альбо ўласьцівасьцяў характару чалавека)
• kacoves занятак/прафэсія мясьніка; мясны промысел; šadxones сватаньне, сватаўство; akšones упартасьць; srises кастрацыя, імпатэнцыя

ese *m* [*s.* (ס-)עשה →majse] "рабі"; наказ, запавет нешта рабіць [*sin.* tu, *ant.* lojsese]

ese=hese *f*, -s [?] падсьвечнік, бра, каганец

ésebet=hésebet *f/n*, -n [*s.* (ן-)הסב־בעט] крэсла (з падуш-

камі) для вядоўцы на пэйсаховай бяседзе
eséj *m f*, -en [*p.* esej] эсэ, нарыс
eséne *f*, -n [*p.* eseneja] эсэнцыя
eser-mákes *pl.* [*s.* עשר־מכות →asore-, aseres-, majser; decax adas beaxab] дзесяць эгіпецкіх караў, якія пералічваюцца ў пасхальнай Агадзе; *mx.* (Вых. 7)
• dos beste fun di eser-makes (fun di eser-makes di beste) лепшая зь дзесяці эгіпецкіх караў (лепшае з горшага)
• cu di eser-makes nemt men kejn xosn nit cu gast (a xosn nemt men nit cu gast af Pejsex) *glxv.* жаніха не запрашаюць у госьці на Пэйсах (бо за сталом чытаюць аб дзесяці эгіпецкіх карах – барані божа, каб жаніх не падумаў, што і ён для сям'і – ліха)
• dos beste fun di eser-makes zajnen di knejdlex mit jojx *glxv. hum.* найлепшая зь дзесяці эгіпецкіх караў – клёцкі зь юшкай
eser-sfires *pl.* [*s.* עשר־ספירות →sfire] *kbl.* 10 сфэраў
esik *m* [*d.* Essig] воцат; **és(er)iker** вострый, кусачы, кусьлівы; **ésikajt** *f* едкасьць; **ésikflejš** *n* кісла-салодкае мяса; **ésiktropns** *pl.* воцатная эсэнцыя
• eserike kelt сьцюжа, халадрыга, халадзеча
• gepuct/ojspucn (zix) in esik un (in) honik апрануты/апрануць/апрануцца з іголачкі
• an esike zax vert nit farfaln *glxv.* вострая рэч не прападзе (аб ежы)
• az me trinkt ale mol esik, vejs men nit, az es iz do a zisere zax *šprxv.* хто п'е шораз воцат, ня ведае, што існуюць салодкія рэчы (хто ня еў пячэні, той вантробе рад)
• mit honik ken men xapn mer flign, vi mit esik *šprxv.* зь мёдам зловіш больш мух, як з воцатам (дзе мёд, там і мухі)
esn* [*d.* essen] 1. (gegésn) есьці; 2. *n*, -s, **és(n)varg** *n*, **ésnzaxn** *pl.* яда, ежа; **eser** *m*, -s ядок, ядун; **ésbarer, ésevdiker** ядомы, прыдатны да яды; **esarnje** *f*, -s харчэўня, карчма; **éseniš** *f/n*, -n грызьня; **éscimer** *m/n*, -n сталовы пакой; **éslefl** *m* сталовая лыжка; **ésn-liverant** *m*, -n пастаўнік правізіі; **éstiš** *m*, -n абедзены стол
• esn* kest сталавацца, быць на ўтрыманьні
• esn* makes/kadoxes (in a klejn tepele) (зь)есьці балячкі /трасцу/хваробу (у маленькім гаршчэчку)
• esn* teg сталавацца задарма у нечым доме ў азначаны дзень (аб навучэнцах ешыботу)
• esn* vi a grober-jung/pojer, vi far cen, vi nox a krenk есьці як хам/мужык, як за дзесяцярых, як пасьля хваробы (як не у сяое, як на голад, як перад сьмерцю, як у прорву, як у бяздонную кадушку; як у сячкарню закідае)
• esn* vi fejgele/flig есьці як птушачка/муха (як верабейка /кот)
• nit gegesn nit getrunken ня піўшы ня еўшы
• nit visn*, mit vos m'est dos ня ведаць, з чым гэта ядуць
• a gut kind: az er šloft, est er nit добрае дзіця: калі сьпіць, дык ня есьць
• a lebedike zax bet esn *glxv.* усё жывое просіць есьці
• ale šo an esleft за галзіну па лыжцы (памалу/марудна)
• ba klejne kinder iz šlext cu esn, ba grojse kinder iz šlext cu gejn *šprxv.* за малымі дзецьмі блага есьці, за вялікімі – блага хадзіць (добра апранутым)
• bejs dem esn, redt men nit (ven/az me est, tor men nit rejdn) *glxv.* калі ядуць, не размаўляюць (калі я ем, то глух і нем)
• cu lejd un cu frejd muz men esn (un trinken) *šprxv.* і ў горы і ў радасьці трэба есьці (і піць)
• der apetit kumt mitn esn *glxv.* апэтыт/смак прыходзіць за ежай
• ejner hot (nit) kejn apetit cum esn, der cvejter/anderer hot kejn esn cum apetit *šprxv.* адзін ня мае апэтыту, каб есьці, другі ня мае чаго зьесьці, каб спатоліць апэтыт
• er hot dos lebn fun got un dos esn fun menčn ён мае жыцьцё ад бога і ежу ад людзей
• er iz a grojser kener – er ken gut esn ён вялікі знаўца – ён ведае, як добра пад'есьці
• es bejner, vest du hobn a vajsn xosn *folk.* грызі косткі, будзеш мець бялюсенькага жаніха
• esn iz di beste tfile *glxv.* ежа – лепшыя модлы (*vrtš.* "esn" ежа – "ejson" [*s.* איתן הבין אמונתך] назва вядомай сьвяточнай малітвы) (калі не пад'ясі, і сьвятых прадасі)
• est, est, hajnt iz dox nit šabes! *iron.* ежце, ежце, сёньня ж ня шабас!
• mit cvej majler est men nit *šprxv.* двума ратамі есьці ня будзеш
• nit visn, mit vos me est (m'est) es ня ведаць, з чым гэта ядуць
esreg *m*, *pl.* esrojgim [*s.* (אתרוג(־ים] эсрог, цытрон (фрукт, над якім на Сукэс прамаўляецца блаславеньне); *fig.* прыгожы і далікатны чалавек; **ésregl** *n* прыгожая і каштоўная рэч [*sin.* mecie]
• a mejdl vi a korfuer esreg *glxv.* дзяўчына як цытрон з Корфу (вельмі прыгожая)
• az me hot ništ kejn esreg, benčt men ništ *glxv.* хто ня мае цытрона, не чытае блаславеньня
• az s'iz ništo kejn esreg, benčt men mit a bulbe *glxv.* калі бракуе цытрона, бласлаўляюць з бульбай
• vos tut kool on an esreg? – me benčt nit *glxv.* што робіць кагал, калі німа цытрона? – ён не бласлаўляе (як німа, дык німа)
esrim-v(e)árbe=svarbe *pl.* [*s.* עשרים־וארבע(ה)] "24" (азначэньне для Танаху, які складаецца з 24 кніг)
est=nest *f*, -n [*d.* Nest] гняздо, кубла
'est=du vest
Ester (hamalke) [*s.* אסתר המלכה] *inx.* царыца Эстэр (Эсьфір); Кніга Эстэр; **Ester-tónes** [*s.* תענית־] пост Эстэр (дзень перад Пурымам)
• afn barg, unter barg /štejt Ester di grine, /Ester štejt, Avrohom gejt, /Avrohom-ovinu *flksl.* на гары, пад гарой стаіць зьзелянелая Эстэр, Эстэр стаіць, Абрагам ідзе, праайцец Абрагам
• es dojert (vet dojern/ojshaltn) fun Ester-tones biz Purim гэта будзе цягнуцца ад посту Эстэр да Пурыму (і чыхнуць не пасьпееш)
Estonje *f*, **Estland** *n* [*d.* Estland] Эстонія; **ést(ó)nišer, éstišer** [*d.* estnisch] эстонскі
Estrajx *n* [*d.* Österreich] Аўстрыя; **éstrajxer** *m*, (-n *f*, -s) аўстрыяк; **éstrajx(iš)er** аўстрыйскі
ešelón *m*, -n [*p.* eszelon] эшалон
-(e)ši [?] *suf.* -уля, -уся, -ухна, -ічка (ласкальны)
• babeši бабуля, бабуся, бабічка; mameši матуля, мамуся, матухна; zuneši сынуля, сынку
ešper *m* [*d.* Vesper] полудзень, вячэра
et! [*p.* het] *int.* э(т)!; **et-et-et!** *int.* э-э-э..., фэ! фу!

-et/'et
• alejn'et сам
• er hejbt on'et ён пачынае
• er štejt uf'et ён устае
• er štelt zix op'et ён спыняе
• ojx'et таксама
• ništo vos cu ton'et (Abr.) німа чаго рабіць
'et=vet (veln*)
• er/ir'et=er/ir vet
e"t *abr.* **ivre-tajč** [*s.* ע"ט=עברי־טייטש] старайдыш; архаічны пераклад кніг на старайдыш
etablírn (etablírt) [*d.* etablieren] заснаваць, засноўваць
etáp *m*, -n [*p.* etap] этап
• mitn etap па этапу, этапам
etát *m*, -n [?] кагальны падатак; **etátove(r)** зарэгістраваны ў палатковым сьпісе
• zej betn m'zol dem etat farklenern яны просяць, каб зьменшылі падатак
etáž *m*, -n [*d.* Etage] паверх; **-etážiker** павярховы; **cvej-etážiker** двухпавярховы; **etažerke** *f*, -s этажэрка
étemen=ótemen [*d.* atmen] 1. дыхаць; 2. *n* дыханьне; **étemdiker** які дыхае, дыхальны
eter=ejter *m* [*d.* Äther] этэр, эфір; **éterišer** эфірны
Etiopje *f* [*d.* Äthiopien →Kuš] Этыёпія
etl-bétl [?] дзіцячая гульня зь ніткамі на пальцах
• špiln in etl-betl гуляць у гульню зь ніткамі
étlexe(ne) [*d.* etlicher] некалькі; **étlex-špraxiker** шматмоўны
• etlexe un cvancik дваццаць зь лішнім/лішкам
ette *m* [*d.* Ätte] *kšp.* тата
etui *m*, -en [*d.* Etui, *fr.*] скрынка, футарал
etvos [*d.* etwas] *adv.* нямнога, трохі, крыху; **étvosiker** нязначны, невялікі
• xoć etvos (vos meg zajn etvos) хоць трохі
-evate(r) [*sl.*] *suf.* -ават(ы), -авіт(ы) (утварае прыметнікі)
• tamevate(r), nariševate(r) дурнаваты; xojlevate(r) хваравіты
-evdik- [*d.*?] *suf.*
• onzeevdiker нябачны; špirevdiker адчувальны, успрымальны; špirevdikajt успрымальнасьць
eved *m*, *pl.* avodim [*s.* עבד(-ים) →avdes, avojde] раб, нявольнік, слуга [*sin.* sklaf, knext]; **eved-knájni/-knáani** *m*, *pl.* avodim-knájnim/-knáanim [*s.* כנעני(-ם)] нізкі раб, вечны раб
ev(e)n-bójxn *m*, -s [*s.* אבן־בו(ו)חן(-ס)] асялок, пробны камень [*sin.* pruvštejn]; **evn-hoézer** *m* [*s.* העזר־] трэцяя частка "Šulxn-orex" (запаветы аб шлюбе і разводзе); **ev(e)n-négef** *m*, *pl.* -n/avne-negef [*s.* (אבני־) נגף] камень спатыкненьня; перашкода, замін [*sin.* štrojxlštejn, šterung]; **én(e)n-tov** *m*, *pl.* avonim-tójves [*s.* (אבנים־טובות) טוב] каштоўны камень [*sin.* tajerer štejn, ejdlštejn]
• haltn*/arajnxapn/ojsxapn vi an evn-tov берагчы/схапіць як каштоўны камень
-eve(n) [*sl.*] *suf.* утварае дзеясловы
• šroteven драбіць; rabeven рабаваць; rasčoteven разьлічваць
eventueler [*d.* eventuell, *fr.*] магчымы, мажлівы, імаверны
ever=ojer *m/n*, -n, *dim.* **ojerl** *n*, -ex [*d.* Ohr] вуха
-eve(r) [*sl.*] *suf.* -ав(ы), -ёв(ы), -ов(ы) (утварае прыметнікі)
• maseve(r) масавы; planeve(r) плянавы
evjen *m*, *pl.* evjojnim, (-te *f*, -s) [*s.* אביון(-ים) →farevjenen] бядняк, бядак, бядуля, нябога, галота, басота [*sin.* oreman, kapcn]; **evjojne** *f*, -s, **evjojnes** *n/f* [*s.* אביונה(-ות)] беднасьць; **evjójnišer** бедны, бядняцкі; **evjen-šebeévjen** *m* [*s.* -שב(־)] бяднейшы сярод бедных
• ba an evjen a cviling iz vi dos finfte rod bam vogn *šprxv.* двойня бедняку, як пятае кола ў возе (як сабаку другі хвост)
• er iz nit kejn grojser ojšer un nit kejn klejner evjen *glxv.* ён – не вялікі багацей, але і не малы бядак
• Pinto iz rajx geven, un iz geštorbn an evjen *glxv.* Пінто быў багаты, але памёр бедным (Пінто – амстэрдамскі багацей)
evnux=ejnux *m*, -n еўнух, кастрат
ex [*p.* ech] *int.* эх; **exexé!** *int.* э-хэ-хэ!
• ex du, paxdn ejner! эх ты, баязьлівец!
ex=ix [*d.* ich] я
-exc/-exts/-ixc/-ixts/-axc [*d.* icht?] *suf.* утварае назоўнікі ніякага роду са зборным значэньнем (часта з адмоўным сэнсам)
• (ge)latexc коўдра з абрэзкаў; fajlexc пілавіньне; gefilexc начынка; tojgenixc нікчэмны чалавек
exo *m*, -s [*d.* Echo] рэха, водгульле
exód *m* [*s.* אחד →Axad-, axdes, meaxed, laxodim] "адзіны"; абвяшчэньне адзінасьці бога ў малітве "šma-Jisroel" (апошняе слова малітвы) [*sin.* ejner]
ext [*d.* echt] *adv.* якраз, акурат; **exter** сапраўдны, праўдзівы; **extkajt** *f* сапраўднасьць
• an exter чысьцейшай вады
• an exter šrajber iz jener, vos kon in a pošetn štekn derzen a gancn vald сапраўдны пісьменьнік можа ў простай палцы ўбачыць цэлы лес
Ezre [*s.* עזרא] *tnx.* Эздра; Кніга Эздры; **Ezre hasojfer** [*s.* עזרא הסופר] *tnx.* "Эздра пісьменьнік"
ezres-nóšim *m/f*, -s [*s.* עזרת־נשים(-ס) →(bal-)iše, barnaš] 1. жаночая частка ў сынагозе; 2. *fig.* жаночая парода

E



F=fej *m/f*, -en [*s.* (-ען)פא] 1. "фэй", літара гэбрэйскага альфабэту; 2. лічба 80; **lange(r) fej** [*s.* ף] літара "f", якая пішацца напрыканцы слова

f' *abr.*, **frajnt** *m*, (-n/-ine *f*, -s) друг, прыяцель, сябра, сябар

fabl *f*, *pl.* -en/fabeln [*d.* Fabel] байка, казка, прыпавесьць; фабула

fabricírn (fabricírt) [*d.* fabrizieren] фабрыкаваць, вытвараць; **fabrikacje** *f* фабрыкацыя, вытворчасьць; **fabrik** *f*, -n, **fábrike** *f*, -s фабрыка; **fabrikát** *m*, -n фабрыкат, фабрычны выраб, фабрычная прадукцыя; **fabrikánt** *m*, -n фабрыкант; **fabrične(r)** фабрычны

• vos a fabrik ken maxn, a kez mit azoj fil knejčelex *iron.* што фабрыка можа зрабіць, сыр зь дзіркамі

facét *m*, -n [*p.* facet] фацэт, франт, элегант; **facetevate(r)** фацэтны, франтаваты, фарсісты; **faceteráj** *f* франтаватасьць, фарсістасьць

• – Fun a zemele mit vajn, /ci ken men den zajn azoj šejn? /Vajl du gejst ale naxt mit andere facetn, /derfar bistu azoj šejn. *flksl.* Ад булачкі зь віном ці можна быць такой прыгожай? Таму што ты ходзіш кожную ноч з другімі фацэтамі, таму ты такая прыгожая.

facjat(k)e *f*, -s [*p.* facjata] мансарда, пакой пад дахам

fačejl(k)e/facejle=fečejle *f*, -s [*šp.* fazaleja, *it.* fazzoletto, *p.* facelet] хустка

fajanc/fajáns *m* [*d.* Fayence] фаянс; **fajáncener** фаянсавы; **fajončnik** *m*, -n гандляр фаянсам

fajer *m/n*, -n [*d.* Feuer] агонь; **fájer(d)iker** агнявы, агністы, палкі, палымяны; **fájerke** *f*, -s жароўня; камфорка; **fájern** страляць, паліць; палаць, палымнець; **fájer(-ge)cajg** *n*, -n крэсіва; **fájerfester** вогнеўстойлівы; **fájergeferlexer** вогненебясьпечны, вогнеапасны; **fájer(-)lešer** *m*, -s пажарны, пажарнік; **fájer-oper** *m*, -s *tnx.* вогненная ахвяра; **fájer-rojter** вогненна-чырвоны; **fájeršajn** *f* зарыва; **fájeršpajen-diker** вогнедышны; **fájerštejn** *m*, -er крэмень, скалка; **fájertop** *m*, *pl.* -tep гаршчок з вугольлем

• durx fajer un (durx) vaser *fig.* скрозь агонь і ваду

• fajer-folk агонь-людзі (небясьпечныя як агонь)

• krixn* in fajer лезьці ў агонь

• redn* far fajer un far vaser *fig.* гаварыць горача (з агнём /запалам; балбатаць/лапатаць не змаўкаючы)

• špiln zix mit fajer (me špilt zix do mit fajer) *fig.* гуляцца з агнём

• tojgn afn fajer нікуды ня варты (толькі ў агонь)

• az me antlojft fun/far fajer, bagegnt men dos vaser (fun fajer in vaser) *šprxv.* хто бяжыць ад агню, той трапляе ў ваду (з агню ды ў прысак/полымя; з прыску ды ў вагонь; з дажджу пад рыну; з холаду ў мароз; з гаручага ды ў балючае)

• a fajer af dir! *kll.* агнём цябе запалі!

• a fajer zol dix trefn (vi du redst)! *kll.* каб ты згарэў (як ты кажаш)!

• a fajer zuxt im/zi /dix! *kll.* агонь яго/яе/цябе шукае! (бадай яго агонь спаліў! а каб ты гарэў без агню!)

• az se brent, iz a fajer *šprxv.* дзе гарыць, там і агонь (дзе дым, там і агонь; дзе вярба, там вада; дзе кветкі, там і мёд)

• Di fajerdike libe /tut in majnem haren brenen... /Vos kumt arojs, az ix hob dix lib, /az mir kenen zix nit nemen. *flksl.* Палымяная любоў гарыць у маім сэрцы... Што з таго, што я цябе люблю, калі мы ня можам пабрацца.

• dos iz fajer mit vaser гэта агонь з вадою (агонь з вадою ў адной хаце не жывець)

• fajer iz a ganev *šprxv.* агонь – злодзей (злодзей хоць вуглы пакіне, а агонь і тое забярэ)

• špil dix nit mit fajer! *glxv.* не гуляйся з агнём! (не забаўляйся з агнём, бо ўсцысься)

fájern [*d.* feiern] сьвяткаваць; **fájerlexer** урачысты; **fájerlexkajt** *f*, -n урачыстасьць; **fájerung** *f*, -en сьвяткаваньне; сьвята, урачыстасьць; **fájertog** *m*, *pl.* -teg сьвята

fajfn* (gefájft/gefífn) (af) [*d.* pfeifen] 1. сьвістаць; 2. *n*, **fajferáj** *f* сьвіст; **fajf** *m*, -n сьвіст(ок); **a fajf ton*/gebn*** сьвіснуць; **fajfer** *m*, -s сьвістун; **fajfl** *n*, -ex сьвісьцёлка, жалейка; **fájfelex** *pl. bot.* мандрагора; **fajfiól** *m*, -n дудка, жалейка; **fajfke** *f*, -s жалейка, сьвістулька

• fajfn* af emecn а(б)сьвістаць кагосьці

• az der rebe fajft, /un az der rebe fajft, /fajfn ale xasidimlex... *flksl.* калі рэбэ сьвісьціць, сьвісьцяць усе хасыдзікі...

• es iz nito mit vos cu fajfn! *glxv.* німа чым сьвістаць!

fajg *f*, -n [*d.* Feige] 1. смоква, інжыр, фіга; 2. кукіш, дуля, фіга; **fájgnblat** *m*, *pl.* -bleter фігавы ліст; **fájgnbojm** *m*, *pl.* -bejmer фігавае дрэва

• a fajg vajzn* (fajgn arojsšteln; gebn* a fajg) даць/паднесьці/паказаць дулю

• cen finger mit a fajg дзесяць пальцаў зь фігай

• cvej fajgn! a fajg unter a dexl! a fajg unter der noz! фіга з маслам! фіга на талерцы! фіндос пад нос!

• krign*/hobn* a fajg атрымаць дулю (дулю зьесьці)

• šteln a fajg in arbl/kešene (unter der pole) паказаць фігу ў рукаве/кішэні (пад крысом)

• visn* a fajg дулю ведаць

• a held – er vajzt a fajg in kešene гэрой – ён паказвае фігу ў кішэні (гэрой – штаны дзірой; гэрой бабы старой)

• az me hot nit kejn finger, ken/zol men kejn fajg nit (ojs)-vajzn *šprxv.* хто ня мае пальцаў, ня можа паказаць фігу

• fun finf finger ken men mer vi kejn fajg nit maxn *šprxv.* зь пяці пальцаў больш аднае дулі ня зробіш

fajke *f*, -s [*p.* fajka] курыльная люлька

fajl *f*, -n, *dim.* **fajlxl** *n*, -ex [*d.* Pfeil] страла; **fajlnbójgn/fajl-un-bójgn** *m*, -s лук; **fajln-bójger** *m*, -s, (-n *f*, -s) лучнік; **fajln-bojgeráj** *n* стральба з лука; **fajl-ojs(n)-bójgn** (fajl fun bojgn) *adv.* стралой з лука, дужа хутка (наўскач /стрымгалоў/кулём; як высьцігнуць; з усіх ног); **fájln-taš** *f*, -n калчан

• durxšvindlen/durxflien* fajl-ojsn-bojgn пранесьціся стралой (прамайнуць, прамільгануць)

• šikn fajln пускаць стрэлы

• a vort iz (azoj) vi a fajl – bejde hobn grojse ajl *šprxv.* слова як страла – абодва маюць вялікую хуткасьць (з свайго языка спусьціш – на чужым ня зловіш; сьліны не падымеш, а слова ня вернеш)

fajl *f*, -n, *dim.* **fajlxl** *n*, -ex [*d.* Feile] напілак, напільнік; **fajln** пілаваць, тачыць (напільнікам); **fajlexc** *n* пілавіньне, апілкі

fajlxl *n*, -ex [*d.* Veilchen] *bot.* фіялка, браткі

fajner [*d.* fein] файны, прыгожы, харошы; **fajnkajt** *f*, -n прыгажосьць; дабрата, добры ўчынак; **fájnbrojt** *n* печыва, пячэньне; **fajne-bérje** *f*, -s [*s.* (-ות)בריה] фарсун, фігурант, франт; багаты, уладны чалавек; **fájnfiliker** тонкі, успрымальны, успрыімлівы; **fájngold** *n* чыстае золата; **fájnšmeker** *m*, -s, (-n *f*, -s) *iron.* танкач, эстэт;

fájnzilber *n* фанцыбэр, чыстае срэбра, выжыга
• ganc fajn gemaxt! файна зроблена!
• s'iz fajn varem добрае і цёплае надвор'е
• Štejen di karetn, štejen di karetn /arum majn foters tir... /– Šejne toxter, fajne toxter, zec zix, for mit mir. *flksl.* Карэты стаяць каля дома майго бацькі... – Прыгожая дачка, файная дачка, садзіся, паедзем са мной.
fájnkoxn/fá(j)nkuxn *m*, -s [*d.* Pfannkuchen] *kul.* яечня, амлет, латушнік
fajnt/fajnd *m* [*d.* Feind] вораг, непрыяцель; **fájnt(šaft)lexer /fajndlexer** варожы; **fajnt/fajnd hobn*** (cu) ненавідзець, не любіць, пагарджаць; **fajntšaft/fajndšaft** *f*, -n, **fájnt(šaft)lexkajt/fájndlexkajt** *f*, -n варожасьць, нянавісьць
• fajnt ejmes-moves сьмяротна ненавідзець
• fajnt hobn* emecn vi a misnaged a xosed ненавідзець кагосьці як міснагед хасыда
• fajnt hobn* epes vi a šiker a glezele, vi a kac hot fajnt smetene не любіць штосьці як п'яніца шклянку, як кот сьмятану
• fajnt hobn* vi a betler a halbn gildn *iron.* ненавідзець як жабрак паўзалатоўку
• fajnt hobn* vi ojgnvejtik ненавідзець як боль у вачох
• fajnt krign* пачаць ненавідзець
• fajnt vi a jid/xazer, vi a xosid a šikse, vi avojde-zore ненавідзець як жыда/сьвіньню, як хасыд сікшу, як паганства
• dort vu me hot dix lib, gej vejnik, vu me hot dix fajnt – gej gorništ *šprxv.* туды, дзе цябе любяць, не ўчашчай, туды, дзе цябе ня любяць, – і нагою не накладай (дзе ня любяць – не гасьці, а дзе любяць – не часьці)
• hitn zol men zix far di frajnd, nit far di fajnd *šprxv.* сьцеражыся сяброў, а ня ворагаў
• ver es hot lib cu nemen, hot fajnt cu gebn *šprxv.* хто любіць браць, ня любіць даваць ("дай" – ня чуе, а "на" – руку суе)
fajxter [*d.* feucht] вільготны, сыры, мокры; **fajxt vern*** рабіцца вільготным; **fajxtkajt** *f* вільгаць, сырызна, макрата
fakl *m*, -en [*d.* Fackel] факел, паходня; **fáklcug** *m*, -n факельнае шэсьце
faktazje *f* навуковая фантастыка
fakter/faktor *m*, *pl.* -s/faktojrim [*p.* faktor] фактар, чыньнік, пасярэднік; **fáktreven** пасярэднічаць, займацца пасярэдніцтвам
falb *m/f*, -n, *dim.* **felbl** *n*, -ex [*d.* Falbel, Falte, *fr.* falbala, *p.* falbana] складка, фалда, фальбона; **falber** адвіслы, абвіслы; **falbán** *m*, -es, **falbane** *f*, -s фальбона, брыжы; **falbn** скласьці, складваць, сабраць, зьбіраць у зборкі /складкі; пусьціць, пускаць кругі (рабізна на вадзе)
• in a kiške ken men kejn falbane nit maxn *glxv.* у кішцы фальбону ня зробіш (у запас не пад'ясі і ў запас ня высьпішся)
falc *m*, -n [*d.* Falz] *texn.* фальц, паз; **fálc(eve)n** фальцаваць
fald *m/f*, -n, *dim.* **féldele** *n*, -x [*d.* Falte, *p.* fald] складка, фалда, фальбона; **fáldeven, falten** скласьці, склад(в)аць, сабраць, зьбіраць у зборкі/складкі; пусьціць, пускаць кругі (рабізна на вадзе)
falje *f*, -s [*p.* fala, *d.* Welle] хваля; **faljen zix** хвалявацца (аб вадзе), ісьці хвалямі
faljerčik/falirčik *m*, -es [?] *kul.* клёцка, фрыкадэлька
falk *m*, -n [*d.* Falke] *zool.* сокал
faln* (iz gefáln) [*d.* fallen] 1. (у)пасьці, (с)падаць; меншаць, памяншацца, убываць; 2. *n* падзеньне, затуханьне; **fal** *m*, *pl.* -n/fel 1. падзеньне; 2. выпадак, акалічнасьць; **gebn* /ton* a fal** пляснуцца, плюхнуцца; **fálike** *f med.* падучка, падучая хвароба, эпілепсія; **fáliker** *m* эпілептык, хворы на падучку; **fálndiker** які падае, падучы; які ўбывае /меншае/спадае; **fálgrub** *m/f*, *pl.* -griber лоўчая (воўчая) яма; **fálširem** *m*, -s парашут; **fálvinkl** *m*, -en вугал падзеньня
• af jedn fal дзеля ўсяго дзеля, на ўсялякі выпадак
• faln* af a fal трапіць на выпадак
• faln* af a plan/hamcoe скеміць, сьцяміць
• faln* afn gedank патрапіць на думку, дайсьці да розуму
• faln* afn noz падаць носам
• faln* cu dr'erd рачкаваць, поўзаць па зямлі
• faln* fun di fis валіцца з ног, ногі заплятаюцца
• faln* fun di kojxes выбіцца зь сілаў
• faln* vi a gehargeter/snop/plaxe, vi flign/špener падаць як забіты/сноп/плаха/мухі/трэскі
• falndike štern *astr.* зьнічкі
• in bestn/ergstn fal у лепшым/горшым выпадку
• in fal (fun) у выпадку (чагосьці)
• in/af/far kejn fal nit! ні ў якім разе!
• jedn fals ва ўсякім разе
• s'falt fun di hent валіцца з рук
• vi der fal iz у выпадку
• zajn* gefaln ba zix прыйсьці ў заняпад
• az me falt ba zix, falt men ojx ba andere *šprxv.* хто сам сябе не паважае, таго й людзі не паважаюць (шануйся сам, калі хочаш, каб другія шанавалі)
• az me ligt af der erd, ken men nit faln *šprxv.* хто ляжыць на зямлі, той не ўпадзе
• faln zol men cum kop un nit cu di fis *glxv.* прыпадаць трэба к галаве, але не к нагам
• ojb šojn jo faln iz fun a gut ferd *šprxv.* калі ўжо падаць, то каб хоць з добрага каня (гінуць – дык гінуць з трэскам)
falšer/falčer [*d.* falsch] фальшывы, ілжывы, хлусьлівы, аблудны, падманны; **fálševen** фальшывіць, маніць, крывіць душой; **falškajt** *f*, -n фальш(ывасьць); ілжывасьць, хлусьлівасьць; **fálšedrang** *n*, -en памылка, хіба; **fálšmincer** *m*, -s фальшываманэтнік; **fálšmincung** *f* падробліваньне, падробка, фальшаваньне; **fálšgemíncter** падроблены, фальшывы, фальшаваны
• falš gedrungen памылковы
• falš vi a šlang/kac фальшывы як зьмяя/котка
• ojszen* vi a falše(r) zekser/matbeje/šilinger выглядаць як фальшывая манэта
• a falšer frajnd iz erger vi a hunt *šprxv.* няшчыры сябра горш за сабаку (добры сабака лепшы за ліхога чалавека)
familje/famelje *f*, -s [*d.* Familie] 1. сям'я; 2. **famílje-nomen** *m*, *pl.* -nemen прозьвішча, фамілія; **famíljenlozer** бесьсямейны, несямейны
fan *f*, -en, *dim.* **fendl** *n*, -ex [*d.* Pfanne] патэльня; каструля, рондаль
• dos esn blajbt klepn on der fan *glxv.* ежа прыліпла да патэльні (больш заходу, як карысьці; апуха ня варта кажуха)
• az zi hejst Hendl/Genendl (az er hejst Mendl), meg men esn fun ir/zajn fendl (az du hejst Mendl, meg men esn fun dajn fendl un trinken fun dajn kendl) *glxv.* калі яе/яго завуць Гэндл/Генэндл/Мэндл, можна есьці зь ейнай/ягонай /тваёй патэльні (і піць з твайго кубка) (калі кухарка – жыдоўка, то і ежа ў яе будзе кашэрная)

fanaberje/fajne-bérje *f*, -s [*s*. פאנע־בריה] фанабэрысты чалавек, фарсун, фігурант, франт; багаты, уладны чалавек; **fanabérješer** фанабэрысты

fanander=funander [*d*. voneinander] *adv*. паасобку, асобна адзін ад другога

fanánder-=farnánder-=funánder- [*d*. einander-] *knv./pref*. (па)раз(ь)-, (па)рас(ь)-

fanánderarbetn [*d*. arbeiten] распрацаваць, (па)распрацоўваць; **fananderarbetung** *f* распрацоўка

fanánderbajtn* [*d*. beuten, *mhd*. biuten] разьмяняць, (па)разьменьваць

fanánderbazecn [*d*. besetzen] расьсяліць, (па)расьсяляць (паасобна)

fanánderbejgn* [*d*. biegen, beugen] разагнуць, (па)разгінаць, (па)разгібаць

fanánderbiln* zix [*d*. bellen, *mhd*. bullen] разбрахацца

fanánderbindn* [*d*. binden] (па)разьвяз(в)аць; **fanánderbindung** *f* разьвязваньне

fanánderbl[illegible]n zix [*d*. blühen] расквітнець, расквітаць, расьцьвітаць, (па)расьцьвітаць; **fanánderbliung** *f* расьцьвітаньне, расквіт

fanánderblozn* [*d*. auseinanderblasen] (па)разьдзімаць, (па)разьдзьму(ва)ць; **fanánderblozung** *f* разьдзьму(ва)ньне

fanánderbojen [*d*. bauen] разбудаваць, (па)разбудоўваць, разгарнуць, (па)разгортваць (будаўніцтва); **fanánderboj** *m* разьвіцьцё, разгортваньне (будаўніцтва)

fanánderbrenen [*d*. brennen] распаліць, (па)распальваць; **fanánderbrenen zix** распаліцца, распальвацца, разгарэцца, разгарацца

fanándercien* [*d*. ziehen] расьцягнуць, (па)расьцягваць

fanándercindn* [*d*. zunden] распаліць, (па)распальваць

fanándercojmen [*d*. zäunen] разгарадзіць, (па)разгароджваць

fanándercoln zix [*d*. zahlen] расплаціцца, (па)расплочвацца

fanánderčepen [*p*. czepiać] расчаніць, расчапляць, (па)расчэпліваць

fanánderdrejen [*d*. drehen] раскруціць, (па)раскручваць, прымушаць вярцецца

fanánderefenen [*d*. öffnen] расчыніць, (па)расчыняць, раскры(ва)ць

fanánderfaln* (zix) [*d*. fallen] распасьціся, (па)распадацца; **fanánderfalung** *f* распад

fanánderfirn [*d*. führen] разьвезьці, (па)развозіць; разьвесьці, (па)разводзіць

fanánderflakern zix [*d*. flackern] разгарэцца, разгарацца

fanánderflancn [*d*. pflanzen] рассадзіць, (па)рассаджваць

fanánderflejcn zix [*d*. fliessen, *mhd*. vliezen] (па)разьлі(ва)цца; выйсьці, выходзіць зь берагоў

fanánderflextn* [*d*. flechten] расплесьці, (па)расплятаць

fanánderflien* zix [*d*. fliegen] разьляцецца, (па)разьлятацца

fanánderflisn* zix [*d*. fliessen] (па)разьлі(ва)цца

fanánderformirn [*d*. formieren] расфарміраваць, (па)расфарміроўваць

fanánderforn* zix [*d*. fahren] разьехацца, (па)разьяжджацца

fanánderfregn (zix) (ba) [*d*. fragen] (па)распыт(в)аць

fanándergartlen [*d*. Gürtel] расьпераззацца, (па)расьпярэзвацца

fanándergearbeter [*d*. gearbeitet] распрацаваны

fanándergebn* [*d* geben] (па)разда(ва)ць

fanándergeefnter [*d*. geöffnet] расчынены, раскрыты; раззяўлены

fanándergejn* zix (mit) [*d*. gehen] разысьціся, (па)разыходзіцца; **fanándergang** *m* разыходжаньне; **fanándergegangener** які разышоўся (з жонкай), разьведзены

fanándergenecn zix [*d*. gähnen] распазяхацца, пачаць пазяхаць

fanándergenumen vern* [*d*. genommen] (па)рассунуцца, (па)расставіцца

fanándergeviklter [*d*. gewickelt] разгорнуты

fanándergevorfener [*d*. geworfen] раскіданы

fanándergisn* [*d*. giessen] (па)разьлі(ва)ць

fanándergletn [*d*. glätten] разгладзіць, (па)разгладжваць

fanándergliderн [*d*. gliedern] расчляніць, (па)расчляняць, разьдзяліць, (па)разьдзяляць

fanándergrenecn [*d*. grenzen] разьдзяліць, (па)разьдзяляць, разьмежаваць, разьмяжоўваць; **fanándergrenecung** *f* разьмежаваньне

fanándergrinen zix [*d*. grün werden] зазелянець

fanándergrobn* [*d*. graben] раскапаць, (па)раскопваць; **fanándergrobungen** *pl*. раскопкі

fanánderhejcn [*d*. heizen] распаліць, (па)распальваць

fanánderhengen* [*d*. hängen] разьвесіць, (па)разьвешваць

fanánderhojbn* [*d*. heben] разьвесьці, (па)разводзіць

• fananderhojbn* di brik разьвесьці мост

fanánderhuljen zix [*p*. hulać, *ukr*. гуляти] разгуляцца, разгульвацца

fanánderjogn zix [*d*. jagen] разагнацца, (па)разганяцца; **fanánderjog** *m* разгон, разьбег; **zix fanánderjogndik** *adv*. з разгону, з разьбегу

fananderjomern zix [*d*. jammern] разьлямантавацца, расплакацца, разрыдацца

fananderjušen zix [*ukr*. юшити] разьюшыцца, разьюшвацца

fanánderkajklen zix [*d*. gaukeln, *mhd*. kugelen, kegelen?] раскаціцца, раскочвацца

fanánderkamen/fanánderkemen [*d*. kämmen] расчасаць, (па)расчэсваць

fanánderklajbn* [*d*. klauben] разабраць, (па)разьбіраць, рассартаваць

fanánderklapn [*d*. klappen] разьбі(ва)ць, разбарабаніць, разбарабаньваць

fanánderklejen zix [*p*. kleić, *r./ukr*. клеїй] расклеіцца, (па)расклейвацца

fanánderklepn [*d*. kleben] расклеіць, (па)расклеіваць

fanánderlaxn zix [*d*. lachen] расьсьмяяцца

fanánderlejgn [*d*. legen] раскласьці, (па)расклад(в)аць; **fanánderlejgt vern*** згні(ва)ць; **fanánderlejgung** *f* загніваньне, гніцьцё, распад, гніеньне

• fananderlejgn a fajer раскладаць агонь

fanánderlodn* [*d*. laden] разгрузіць, (па)разгружаць; **fanánderlodung** *f* разгрузка

fanánderlojfn* zix [*d*. laufen] разьбегчыся, (па)разьбягацца; **fanánderlojf** *m* разьбег

fanánderlozn* [*d*. lassen] 1. распусьціць, (па)распускаць; 2. растапіць, растопліваць; **fanánderlozung** *f*, -en растварэньне, роспуск

fanándermaxn [*d*. machen] разабраць, (па)разьбіраць; расчыніць, расчыняць

fanándernemen* [*d*. nehmen] разабраць, (па)разьбіраць, разь-

няць, (па)разымаць, рассунуць, рассоўваць, расставіць, (па)расстаўляць; **fanándernem-brik** *f*, -n развадны мост
• fanandernemen* di evajgn расчінуць галіны
fanándernіteven [*d.* nieten] раскляпаць, расклёпваць
fanánderpakn [*d.* packen] распакаваць, (па)распакоўваць
fanánderplontern [*p.* plątać] (па)разблытаць
fanánderpojkn [*d.* Pauke] разбарабаніць, разбарабаньваць, раструбіць, разазваніць, разбалбатаць, разгаласіць
fanánderprošen [*p.* prószyć] 1. распыліць, (па)распыляць; 2. *n* распыленьне
fanánde(r)rajbn* [*d.* reiben] расьцерці, (па)расьціраць
fanánde(r)rajsn* [*d.* reissen] разадраць, (па)разьдзіраць
fanánde(r)re(j)dn* zix [*d.* reden] разгаварыцца
fanánde(r)rukn [*d.* rücken] рассунуць, (па)рассоўваць; **fanánde(r)rukn zix** расступіцца, расступацца, разда-(ва)цца, разысьціся, разыходзіцца
fanándersorteven, fanándersortirn [*d.* sortieren] рассартаваць, рассартоўваць
fanándеršejdn [*d.* scheiden] адрозьні(ва)ць, разьняць, разьнімаць; **fanándеršejd** *m* разьдзел, падзел, разрозьніваньне
fanándеršern [*d.* scheren] разрэзаць, (па)разразаць (нажніцамі)
fanándеršifrirn [*d.* schiffrieren] расшыфраваць, (па)расшыфроўваць
fanándеršikn [*d.* schicken] (па)разаслаць, (па)рассылаць
fanándеršitn* [*d.* schütten] (па)рассыпаць
fanándеršixtung *f* [*d.* Schichtung] рассланьне
fanándеršlepn [*d.* schleppen] расьцягнуць, расьцягаць, (па)расьцягваць
fanándеršlogn [*d.* schlagen] (па)разьбі(ва)ць
fanánderšmirn [*d.* schmieren] (па)размаз(в)аць
fanánderšnajdn* [*d.* schneiden] разрэзаць, (па)разразаць
fanánderšnureven [*d.* schnüren] расшнураваць, (па)расшнуроўваць
fanánderšoklen [*d.* schaukeln] раскалых(в)аць
fanánderšpaltn [*d.* spalten] расшчапіць, расшчапляць
fanánderšparn [*d.* sperren] раздаць, расшырыць
fanánderšpiljen [*p.* zaszpilić] расшпіліць, расшпіляць
fanánderšpiln [*d.* spielen] разыграць, разыгрываць
fanánderšprejtn [*d.* spreiten] распаўсюдзіць, распаўсюджваць; разаслаць, (па)расьсьцілаць
fanánderšpricn [*d.* spritzen] распырск(в)аць, распыліць, (па)распыляць; **fanánderšpricung** *f* распырскваньне, распыленьне
fanánderšrajbn* [*d.* schreiben] расьпісаць, (па)расьпісваць
• fananderšrajbn* lojt di minutn расьпісаць па мінутах
fanánderšrajen* zix [*d.* schreien] раскрычацца
fanánderšrojfn [*d.* schrauben] расшрубаваць, (па)расшрубоўваць, разьвіньціць, (па)разьвінчваць
fanánderšteln [*d.* stellen] расставіць, (па)расстаўляць; **fanánderštelung** *f* расстаноўка, разьмяшчэньне
fanánderšіojsn [*d.* stossen] расштурх(в)аць
fanánderšіupn [*mhd.* stupfen] парасьпіхаць, разапхнуць
fanándertancn zix [*d.* tanzen] растанчыцца, растанцаваца
fanándertejln [*d.* teilen] разь-, па|дзяліць, разь-, па|дзяляць, разьмеркаваць, (па)разьмяркоўваць; **fanándertejlung** *f* разьдзяленьне, разьмеркаваньне
fanánderton* zix [*d.* tun] распрануцца, (па)распранацца
fanándertrajbn* [*d.* treiben] разагнаць, (па)разганяць
fanándertrejslen [*ukr./r.* трясти] растрэсьці, (па)растрасаць; расхіст(в)аць, раскалываць
fanándertrenen [*d.* trennen] распароць, (па)распорваць
fanándertrogn* [*d.* tragen] 1. разьнесьці, (па)разносіць; 2. *n* разнос; **fanándertreger** *m*, -s разносчык, нашэньнік
fanándervaksn* zix [*d.* wachsen] разрасьціся, (па)разрастацца
fanándervaremen [*d.* wärmen] разагрэць, разаграваць
fanándervarfn* [*d.* werfen] раскінуць, раскідаць
fanándervejnen zix [*d.* weinen] расплак(в)ацца
fanándervekn [*d.* wecken] па-, раз|будзіць
fanándervіclen zix [*d.* Witz] разжартавацца
fanándervign [*d.* wiegen] раскалыхаць, раскалыхваць
fanándervіklen [*d.* wickeln] разгарнуць, (па)разгортваць, разьвінуць, разьвінаць, разматаць, (па)размотваць; **fanándervіklen zix** распусьціцца, распускацца; **fanándervіklung** *f* разгортваньне, разьвінаньне
• fanandervіklen a šturmіše tetikajt разгарнуць бурную дзейнасьць
fanánderxlipen zix [*p.* chlipać, *ukr.* хлипати] разрумзацца, сутаргава хліпаць
fanánderzecn [*d.* setzen] рассадзіць, (па)рассаджваць
fanánderzejen [*d.* säen] расьсеяць, (па)расьсейваць (насеньне)
fanánderzifcn zix [*d.* seufzen] разуздыхацца
fanánderziglen [*d.* Siegel] расьпячат(в)аць
fanánderzingen* [*d.* singen] расьпецца, расьпявацца
fanánderzogn [*d.* sagen] расказ(в)аць, рас-, а|павядаць
fanánderzotlen [*d.* Sattel] расьсядлаць, расьсёдлываць
fand/fant *m*, -n [*d.* Pfand, *p.* fant] фант, застава; **fantove(r)** які мае дачыненьне да фанта
fanfaronke *f*, -s [*p.* fanfaron] фрывольная жанчына, какэтка
fangen* [*d.* fangen] 1. (gefangen) (з)лавіць; узяць, браць у палон, (за)паланіць; 2. **fang** *m* лоўля; (у)ловы, улоў; **fanger** *m* лавец; **fáng-grub** *f*, *pl.* -griber лоўчая яма, пастка; **fángorem** *m*, -s *zool.* шчупальца
• – Zog, maran, vi vest zix vern, /ven me vet dajn kol derhern? /– Ven der sojne vet mix fangen, /vel ix štarbn mit gezangen. (A. R.) Скажы, маран, што з табой будзе, калі твой голас пачуюць? – Калі ворагі мяне зловяць, я памру сьпяваючы.
fanír=fonír=finír *m*, -n [*p.* fornir, *d.* Furnier] дыкта, фанэра; **fanírener=finírener** фанэрны; **fanírn** (fanirt) фанэраваць
fankuxn=fajnkoxn/fajnkuxn *m*, -s [*d.* Pfannkuchen] *kul.* яечня
fantazje *f* [*d.* Fantasie] фантазія; **fantázjediker** здольны да фантазіяў; **fantazjór** *m*, -n, (-ke *f*, -s) фантазэр; **fantazjórišer** фантастычны
• dos iz hojle fantazje! гэта голая фантазія!
far [*d.* vor] *adv.* уперадзе, сьпераду, перад(а), да (каго/чаго)
• far der milxome да вайны
• far mir да мяне, перада мной
• farn hojz перад хатай
• far der cajt štarbt men nit *śprtv.* заўчасна не памрэш (душа чалавека рагата, без пары ня вылезе)
• far jugnt lebt men nit, far elter štarbt men nit *śprxv.* ні па старасьці мруць, ні па маладосьці жывуць
far [*d.* für] *prep.* для, дзеля; за; **farn=far dem**
• far der velt (far lajtn) для гэтага сьвету (для людзей)
• far majn ganc lebn за ўсё маё жыцьцё
• far mir для мяне

- far vor сапраўды
- far zix для сябе, асобна, самастойна
- farn esn перад ежай
- ix far dir un du far mir я табе, а ты мне
- nemen* far a vajb браць за жонку, жаніцца
- nuclex far di kinder карысна для дзяцей
- onnemen* emecn far di hent узяць кагосьці за руку
- onhaltn* far der porenče трымацца за парэнчы
- Far vemen zol ix šrajen, far vemen zol ix vejnen, /majn harc ojs-dercejln hob ix nit far kejnem... /Zol ix dercejln far majn švester, /zogt zi, s'iz ir ojx nit beser. *flksl.* Каму мне крычаць, каму мне плакаць, маё сэрца выказаць німа каму... Распавяду я сваёй сястрыцы, яна кажа, што ёй таксама ня лепш.

far-=fer- [*d.* ver-, vor-, *sl.* za-] *pref.* пра-, за-; перад-, пера-, ад-, рас(ь)-, раз(ь)- (паказвае на: 1. аддаленьне, расьсейваньне, перамяшчэньне; 2. паступовае спыненьне дзеяньня або стварэньне перашкоды; 3. выкарыстаньне, выдаткаваньне, перапрацоўку; 4. злучэньне; 5. пакрываньне, [illegible] нечым; 6. зьмену стану; 7. зьнішчэньне)

[illegible] **er, farajériker** [*d.* vorjährig] леташні, лонскі, [illegible] **farajórn=far a jorn** *adv.* летась

[illegible] farajorikn šnej, dem nextikn tog ідзі шукай [illegible] онскага сьнегу, учорашняга дня

[illegible] der farajoriker šnej цікавіць кагосьці як ле[illegible] лонскі/тагрочны сьнег (на градах)

farájzikter [*d.* vereist] абледзянелы, заледзянелы; **farájzikt vern*** за-, аб|ледзянець; **farájz(ik)ung** *f* абледзяненьне

farákern [*d.* ackern] 1. за(г)араць, заворваць; 2. *n*, **farákerung** *f* заворваньне; **farákerter** за(г)араны, завораны

farákšenen zix [*s.* עקשנען- →akšn] заўпарціцца [*sin.* zix ajnšparn]; **farákšnter** упарты

farálgemejnern [*d.* allgemein] абагульняць; **farálgemejnerndiker** абагульняльны; **farálgemejnerter** абагульнены; **farálgemejnerung** *f*, -en абагульненьне

faramól [*d.* einmal] *adv.* зараз, адразу

f(a)rán(en)=farhán [*d.* vorhanden] ёсьць; **faranen zajn*** мецца, быць у наяўнасьці, утрымлівацца, зьмяшчацца, знаходзіцца; **far(h)ánener, farániker** які існуе; наяўны; **faránenkajt** *f* наяўнасьць, прысутнасьць; быцьцё, існаваньне

- faran menčn, vos traxtn azój ёсьць людзі, якія думаюць так
- s'iz faran in farkojf ёсьць у продажы
- s'zajnen/s'iz faran ale meglexkajtn ёсьць усе магчымасьці
- es zajnen faranen zaxn, vos me tor afile dos ejgenem man nit vajzn *šprxv.* ёсьць рэчы, якія нават уласнаму мужыку не паказваюць
- – Ix vel dir a lejterl šteln /fun der erd bizn himl arajn, /nor du zolst mir di štern ibercejln, /vifl in himl s'iz faran. *flksl.* – Я пастаўлю табе драбіны ад зямлі да неба, толькі ты мусіш мне пералічыць зоркі, колькі іх ёсьць на небе.

faránkern [*d.* verankern] стаць на якар

farántvortlexer [*d.* antworten] адказны; **farántvortlexkajt** *f*, -n, **farántvortung** *f* адказнасьць; **farántvortfe(j)iker** *jur.* які знаходзіцца пры поўнай памяці; **farántvortlexkajt** *f jur.* наяўнасьць сьвядомасьці

farárbetn [*d.* verarbeiten] зарабіць, зарабляць, зароблiваць (шчыліну); а-, пера|працоўваць

fararéndeven [*p.* arendować] (за)арандаваць, заарандоўваць

faráverter [*s.* -אויר- →aver] сьмярдзючы, смуродны

faráxtn [*d.* verachten] пагарджаць, грэбаваць; **faráxteter, faráxtlexer** занядбаны, пагарджаны, пагрэбаваны; **faráxtiker** пагардлівы, гідлівы, грэблівы; **faraxtung** *f* пагарда, грэбаваньне

farax(t)tógn [*d.* acht, Tage] *adv.* тыдзень таму, на мінулым тыдні; **farax(t)tóg(ed)iker** які быў на мінулым тыдні

farb *f*, -n [*d.* Farbe] фарба; колер, масьць; **fárbiker** 1. фарбавы; 2. **fárbrajxer** каляровы, маляўнічы; **farbn*** (gefárbt /gefórbn) 1. фарбаваць; 2. *n* афарбоўваньне, фарбаваньне; **farber** *m*, -s, (-ke *f*, -s) фарбавальнік, маляр; **farberáj** *f/n*, -en красільня; фарбаваньне; **fárbikajt** *f* маляўнічасьць; **fárbfuler** шматколерны, шматкаляровы; **fárblozer** бясколерны; бяскроўны; **fárblozikajt** *f* бясколернасьць; **fárb-ejl** *m* пакост; **fárbštof** *m*, -n *xem.* фарбавальнік

farbaháltn* (farbaháltn) [*d.* vorbehalten] за-, с|хаваць; **farbaháltener** схаваны, схованы, захованы; **farbahaltung** *f* хаваньне, утойваньне

farbáj [*d.* vorbei] міма, каля; **farbáj zajn*** быць моцна хворым, пры сьмерці; **farbájiker** 1. які мінае/праходзіць міма; 2. небясьпечна хворы (пры сьмерці)

- ix bin farbaj! я прапаў! мне хана!
- zajn* farbaj un esn* far draj прападаць, але есьці за траіх
- Šlogt der zejger draj, /oj, oj, oj, draj, oj, oj, oj, draj, /ix bin šojn gevorn farbaj... /Hot a gute naxt, hot a gute naxt, /cores majne, grojse lejdn /hobn mix aher gebraxt. *flksl.* Гадзіньнік б'е тры гадзіны, ой-ой-ой, тры, я ўжо загінула... Добрай ночы, добрай ночы, мае гора, мае вялікае гора мяне сюды прывяло.

farbáj- [*d.* vorbei-] *knv./pref.* пра- (міма)

farbájfirn (far, ba) [*d.* fuhren] правесьці, праводзіць (міма); правезьці, правозіць (міма)

farbájflien* (far, ba) [*d.* fliegen] праляцець, пралятаць (міма); **farbájfli** *m*, -en пралёт, пралятаньне

farbájforn* (far, lebn) [*d.* fahren] праехаць, праяжджаць (міма); **farbájforndik** *adv.* мімаездам; **farbájforndiker** праежджы, праезджы

farbájgejn* (far) [*d.* gehen] прайсьці, праходзіць міма, абыходзіць, мінуць, мінаць; **farbájgejendik** *adv.* (па)між іншым, мімаходзь, мімаволі, балазе; **farbájgejendiker** праходзячы міма, мімаходны; **farbájgejer** *m*, -s, (-n *f*, -s) прахожы, падарожны; **farbájgang** *m*, -en праход

farbájjogn [*d.* jagen] пранесьціся, праносіцца, пра(й)мчацца (міма)

farbájkrixn* [*d.* kriechen] прапаўзьці, прапаўзаць (міма)

farbájlojfn* [*d.* laufen] прабегчы, прабягаць (міма); **farbájlojf(nd)iker** мімалётны, прабягаючы (міма)

- es veln nox a sax vasern farbajlofn шмат яшчэ вады ўцячэ (гэта яшчэ доўгая песьня)

farbájlozn* [*d.* lassen] прапусьціць, прапускаць

farbájrajtn* [*d.* reiten] праскакаць наўгалёп, прамчацца (міма)

farbájsn* (farbísn) [*d.* beissen] 1. закусіць, закусваць; 2. *n*, -s, **farbajsexc** *n*, -n/-er, **farbajsung** *f* закуска

- af a farbajsexc (far a farbajsn) на закуску
- farbajsn* di cung, (mit) di lipn, di cejn прыкусіць язык /вусны, сьціснуць зубы
- farbajsn* mit epes перакусіць, зьесьці што-небудзь
- farbajsung cu di cores ліха на закуску
- vinčn un šajsn iz alc ejn farbajsn *glxv. vulg.* што віншаваць, што сраць – усё адна закуска

farbájšisn* [*d.* schiessen] прамахнуцца, прамахвацца; **farbájšos** *m*, -n промах
farbájšvebndiker [*d.* schweben] мімалётны
farbájšvimen* [*d.* schwimmen] праплысьці, праплываць (міма)
farbájtn* (farbítn) (mit) [*d.* beuten] 1. замяніць, аб-, за|мяняць; 2. *n*, **farbájt** *m*, -n, **farbajtung** *f*, -en замена, зьмена; **farbajter** *m*, -s, (-n *f*, -s) зьменшчык, запасны гулец; **farbájtiker** які замяшчае/замяняе; **farbájtlexer** заменны
• af alc gefint zix a farbajt, xuc dem vajbs jugnt *šprxv.* на ўсё знаходзіцца замена, за выключэньнем жаночае маладосьці
farbájtrogn* [*d.* tragen] пранесьці, праносіць (міма)
farbákn* [*d.* backen] запячы, запякаць; **farbák** *m* баўтун, сапсаванае яйка; **farbákn vern*** запячыся, запякацца; **farbákener, farbakter** запечаны
• farbakn blut запечаная кроў
farbalaken (zix) [*ukr.* балакати] прабалакаць (пэўны час), забалакацца
farbalamuten/farbalemučen/farbalemiten [*p.* bałamucić, *ukr.* баламутити] забаламуціць, заблытваць, перашкаджаць
farbál(j)even [*p.* bałwać, *ukr.* балювати] (з)марнатравіць, марна (па)траціць, (пра)мантачыць
farbalotírn [*d.* ballotieren] забалатаваць, залесаваць
farbanalizírn [*d.* banalisieren] баналізаваць, зайграць (п'есу)
farbánd *m*, -n [*d.* Verband] саюз, зьвяз, аб'яднаньне; **farbándišer** саюзны
farbandažírn [*d.* bandagieren] забінтаваць, накласьці павязку
farbarikadírn [*d.* verbarrikadieren] забарыкадаваць
farbéjgn* (farbójgn/farbójgt) [*d.* verbiegen] загнуць, загібаць, загінаць; **farbejgter** загнуты; **farbéjg** *m*, -n, **farbejgung** *f* загіб, загін
• farbejgn* di finger загінаць пальцы
farbéjnerter [*d.* Bein] акасьцянелы; **farbejnert vern*** акасьцянець
farbejzter [*d.* verbósern] хмурны, пануры, сярдзіты, злосны
farbenken (zix) (nox) [*d.* bangen] засмуткаваць, засумаваць; **farbenkter** тужлівы, маркотны, нудотны, нудосны, сумны, журблівы; **farbentkajt** *f*, **farbénkeniš** *n*, -n нуда, нудота, туга, маркота, журба, смутак, сум
• Ix vel a zemerl dir zingen, gotenju! /Ix vel dir zingen fun dajn klezmerl: /špant a klezmerl farbenkt baginen. /– Klezmerl, majn klezmerl, vos brengstu? /– Ix breng, ix breng /dos fidele fun Dovid hamejlex, /a lidele der velt cu špiln, /az afn harcn zol vern frejlex. (M. B.) Я прасьпяваю табе песьню, божухна! Я буду сьпяваць пра твайго музыканціка: дыбае засмучаны музыканцік зранку. – Музыканцік, мой музыканцік, што ты нясеш? – Я нясу скрыпачку цара Давіда, песеньку сьвету сыграць, каб на сэрцах стала весела.
farbésern [*d.* verbessern] 1. палепшыць, паляпшаць; 2. *n*, **farbéserung** *f*, -en паляпшэньне; **farbéserter** палепшаны
farbétn [*d.* Bett] заслаць, засьцілаць
• farbetn dos bet заслаць ложак
farbétn* (farbétn) (af) [*d.* verbitten] запрасіць, запрашаць; **farbétener** запрошаны; **farbétn vern*** быць запрошаным; **farbetung** *f*, -en запрашэньне
• farbetene gest запрошаныя госьці
farbílik(er)n [*d.* verbilligen] панізіць, паніжаць (кошты), патаніць; **farbílikerung** *f* патанеьне, зьмяншэньне/зьніжэньне кошту
farbíndn* (farbúndn) [*d.* verbinden] 1. зь-, за|вяз(в)аць; злучыць, злучаць; 2. *n* зьвязка, зьвязваньне; **farbíndeter** *m* саюзьнік, хаўрусьнік; **farbindler** *m*, -s, (-n *f*, -s) сувязны, сувязіст; **farbind** *m*, **farbindung** *f*, -en сувязь
• farbindn* an ek un an ek зьвязаць канцы з канцамі
• farbindn* di hent зьвязаць рукі
• farbindn* emecn di ojgn завязаць камусьці вочы
• štejn* in farbindung (mit) быць у кантакце, мець сувязь, кантактаваць
• šteln zix in farbindung mit наладжваць сувязь
• me ken a kac dem ek nit farbindn (nit kenen*/visn*, (vi) a kac dem/an ek (cu) farbindn) *glxv.* быць ні да чога ня здатным (нават котцы хвост завязаць) (пальцам не паварушыць)
farbínteven [*d.* verbinden] забінтаваць, забінтоўваць; **farbínteveter** забінтаваны
farbísener [*d.* verbissen] злосны, зласьлівы, заядлы, жорсткі, каварны, падступны; **farbísnkajt** *f* злосьць, заядласьць, жорсткасьць, каварства, падступніцтва
• farbisener sojne закляты вораг
farbítener [*d.* beuten, *mhd.* biuten] зьменены
farbítern [*d.* verbittern] 1. разьлютаваць, зрабіць жорсткім, бязьлітасным, узлаваць, раззлаваць, азлобіць; 2. (з)рабіць горкім; атруціць, атручваць; **farbíterter** раззлаваны, злобны, разгневаны, люты, заядлы; **farbiterung** *f*, **farbítertkajt** *f* лютасьць, бязьлітаснасьць, узлаваньне, раззлаваньне, азлабленьне
• farbitern dos lebn атруціць жыцьцё
farblájbn* (farblíbn) [*d.* verbleiben] заста(ва)цца; **farblájbiker** пастаянны, нязьменны, сталы; **farblíbener** які застаўся, астаткавы, рэштні
• oj, saj a štetele, saj a derfele, /oj, ofte brivelex zolstu mir šrajbn, /oj vej, ofte brivelex zolstu mir šrajbn, /az an ejgene por zoln mir farblajbn *flksl.* ой, у мястэчку або ў вёсцы, ой, часьцей пішы мне, ой, часьцей пішы мне, каб мы засталіся парай
farbléndn/farblénzn [*d.* verblenden] асьляпіць, асьляпляць; прывабіць, зачараваць; **farbléndn zix** зажмурыцца, зажмурвацца; **farbléndeter** *m*, -te *fig.* сьляпак, сьляпы; **farblendter** асьлеплены; **farblendung** *f*, -en памылковая думка, памылковы погляд; **farbléndeniš** *n*, -n асьляпленьне, міраж, ілюзія, памылка
• farblendn emecn di ojgn настаўляць камусьці акуляры (пускаць туман; уводзіць у зман; замазваць вочы; забіваць бáкі)
farblien [*d.* verblühen] за-, ад|цьвісьці, за-, ад|цьвітаць
farblifter [*d.* verblüffen] ашаломлены, аглушаны, зьбянтэжаны
farbliščen [*p.* błyszczeć, *ukr.* блищати] заблішчаць, заблiскаць, зазьзяць
farblivter [*d.* blau] засінены, падсінены
farblófn [*d.* bluffen] зблефаваць, скруціць, змахляваць
farblojen [*d.* blauen] засінець; за-, пера|сініць, падсініць, пад-, за|сіньваць
farblokírn [*d.* blockieren] заблякаваць
farblondžen/farblon(d)zen, farblondžet/farblon(d)zet vern* [*p.* błądzić] заблудзіць, забрысьці, завалачыся; **farblóndžeter/farblóndzeter** заблудны, аблудны
• a farblondžet šefele аблудная авечка
• vi hostu farblondžet aher? як ты зацягнуўся сюды?
farblonken [*p.* błąkać] заблукацца, заблудзіць, забрысьці;

farblónkener заблудны, аблудны
farblótikn [*p.* błoto] забалоціць, забалочваць; забрудзіць, забруджваць; **farblótikter** забалочаны; брудны, забруджаны
farblóvn [*d.* blauen] падсініць, падсіньваць
• farblovn dos gret падсініць бялізну
farblózn* (farblózt/farblózn) [*d.* verblasen] задзьмуць, задзьмух(в)аць
farblútikn [*d.* verbluten] акрывавіць, акрываўліваць; **farblútikter** акрываўлены
farbódener [*d.* Bad] выкупаны, памыты; які перакупаўся
• zajn* farbodn in xojves купацца ў даўгох
farbojen [*d.* verbauen] 1. забудаваць, забудоўваць; 2. *n*, **farbojung** *f* забудова, збудаваньне; **farbojter** забудаваны; **farbójt vern*** забудавацца, забудоўвацца
farbórgn* [*d.* verborgen] распазычыць, распазычаць
farbórgn* [*d.* verbergen] с-, за|хаваць, захоўваць, затаіць, затойваць; **farbórgener** схаваны, схованы, сакрэтны, тайны, (па)таемны; **farbórgenerhéjt** *adv.* схована, употай, тайком, сакрэтна, пад сакрэтам; **farbórgeniš** *f/n*, -n тайна, таямніца; тайнік, патаемнік; **farbórgnster** запаветны
• a farborgn vinkele цыхі куток
farbótn*=**farbitn*** (farbótn) (cu) [*d.* verbieten] 1. забараніць, забараняць; 2. *n*, **farbót** *m*, -n забарона; **farbótener** забаронены
farbrakírn [*p.* brak] забракаваць, забракоўваць; **farbrakírung** *f* выбракоўка
farbraknjen [*ukr.* набрякати] набракнуць, набракаць, набрыняць
farbréjtern [*d.* verbreiten] распаўсюдзіць, распаўсюджваць, па-, рас|шырыць, па-, рас|шыраць; **farbréjterter** расшыраны, пашыраны; **farbrejtert vern*** па-, рас|шырыцца, па-, рас|шырацца; **farbréjt(er)ung** *f* расшырэньне, пашырэньне
• farbrejterter zac *gram.* разьвіты сказ
farbreklen [*d.* bröckeln] накрышыць
farbremen [?] абраміць, абрамляць, аблямаваць, аблямоўваць
farbrenen [*d.* verbrennen] спаліць, спальваць; **farbrenter** 1. спалены, згарэлы; 2. загарэлы; 3. заўзяты, заядлы; **farbrént vern*** 1. згар(в)аць, пагарэць; 2. загарэць, загараць; **farbrenung** *f* спаленьне
• farbrenen af aš спаліць на попел (ушчэнт)
• a fajer zol dix farbrenen! (farbrent zolstu vern!) *kll.* каб ты згарэў! (каб цябе агні высмалілі!)
• an eršte meloxe meg men farbrenen *glxv.* першы твор можна спаліць (першыя каты за платы, першыя шчаняты за плот выкідаюць, першы блін сабаку)
• farbrent zol vern der sejxl, vos kumt cu špet *glxv.* хай згарыць розум, які прыходзіць запозна (мужыку розум прыходзіць па шкодзе)
• mer lixt farbrent, vi gelt fardint *glxv.* больш сьвятла нагарэла, як грошай зарабіў (часам таго і не найграеш, што за дудку заплоціш; вычынка даражэй за аўчынку; скурка ня варта вычынкі; апуха ня варта кужуха)
kexójl-hajám [*s.* כחול־הים] "як пясок на беразе мора"; *tnx.* безьліч (Б. 22:17) [*sin.* nist ibercucejln, on a col]

kexojmer bejád-hajójcer [*s.* כחומר ביד־היוצר] *tnx.* "што гліна – у рукох ганчара" (Яр. 18:6)

kexút-haséjre [*s.* כחוש־השערה]
• medakdek zajn* kexut-hasejre быць вельмі дакладным, пунктуальным

kez *m*, -n, *dim.* **kezl** *n*, -ex [*d.* Käse] сыр; **kézkuxn** *m*, -s, **kézkixl** *n*, -ex *kul.* пірог з сырам; **kézlatke** *f*, -s *kul.* сырнік; **kézkoxer** *m* сыравар; **kezkoxeráj** *f*, -en сыраварня
• fun a štikl kez iz er šiker gevorn ад кавалка сыру ён сп'янеў

kezais/kezajes *m/n*, *pl.* -n/kezejsim [*s.* (-ן/-ים)כזית] "велічынёй з масьліну" (талмудычная мера); найменшая порцыя ежы, якую Талмуд разглядае ў гэтай якасьці; маленькі кавалачак
• ba šolem-bais iz men cufridn fun/mit a kezais *šprxv.* калі ў хаце мір, дык рады й акрайцу хлеба (калі ў хаце ціха, не бярэ ліха)

kezev=kozev *m*, *pl.* kzovim [*s.* (-ים)כזב →kizev] хлусьня, фальш(ываць) [*sin.* falskajt]; **kezev-/kozev-vešéker** *m* [*s.* ־ושקר] безумоўная хлусьня, надзвычайная хлусьлівасьць; **kezev-vešékerdiker** надзвычай хлусьлівы, брахлівы, фальшывы

kfices-hadérex *m* [*s.* קפיצת־הדרך] "дарожны скачок"; наднатуральная здольнасьць пераносіцца імгненна ў далёкае месца
• hobn* kfices-haderex насіць вялікія боты

kfire *f* [*s.* כפירה →kojfer] атэізм, бязбожнасьць [*sin.* ateizm, got-farlejkenung]

kfuje-tójve *pl.* →kofe-tójve *m* [*s.* (כפוי־) כפוי־טובה] няўдзячны чалавек, які ня памятае добрага

k(h)eref-áin/-ájen [*s.* כהרף־עין] *adv.* зараз жа, імгненна, адным позіркам, поглядам

ki *pl.* →ku *f* карова; **kíener, kíišer** цялячы, каровін; **kíele** *n*, -x цялушка; **kien-cóje** *f* [*s.* ־צואה] гной ад каровы
• a fet kiele *fig.* дойная карова
• kiene milx каровіна малако

kibe *f*, -s [?] шышка (лопуха), дзед; *fig.* надакучлівы чалавек

kibec *m*, -n [*d.* Kiebitz] *zool.* кнігаўка

kibec *m*, *pl.* kibucim [*s.* (-ים)קבוץ(י) →kibuc, kvuce] суполка, грамада, натоўп, група, купа, гурток; **kíbúc** *m*, *pl.* kibucim кібуц (калектыўная сельская гаспадарка ў Ізраілі); **kibucnik** *m*, -es кібуцнік; **kibec-góljes** *m* [*s.* ־גלו(ו)יות] згуртаваньне ў Ізраілі расьсеяных па сьвеце гэбрэяў; сустрэча ў адным месцы гэбрэяў рознага паходжаньня

kibecn [*eng.* kibitz] сачыць за гульнёй і даваць няпрошаныя парады; **kibec** *m* (на)дакучаньне, надакучваньне, назаляньне; **kíbecer** *m*, -s, (-ke *f*, -s) чалавек, які сочыць за гульнёй і дае няпрошаныя парады; назола, дакучнік; **kibecarnje** *f pejor.* выскаляньне, гаварыльня

kibed *m* [*s.* (-ים)כבוד(י) →mexabed, mexubed, nixbed, kvod-, koved, lixvojd] 1. пачастунак, частаваньне; 2. *m*, *pl.* kibudim ганаровае (у)шанаваньне, выказваньне пашаны; **kibed-áv/-óv** *m* [*s.* ־אב] шанаваньне бацькі, павага да бацькі; **kibed-av-voéjm** *m* [*s.* ־ואם] шанаваньне бацькоў; **kibed-éjm** *m* [*s.* ־אם] шанаваньне маці, павага да маці
• cutejln di kibudim шанаваць, выказваць пашану
• lejzn a kibed зарабіць пашану
• opgebn* kibed-av выказваць павагу да бацькі
• a guter gast af trukene kibed добры госьць на сухі пачастунак (кажуць госьцю, які адмаўляецца ад пачастунку)
• a zun, vos git op kibed-ov/-ejm пачцівы сын, які шануе бацькоў
• hot kejn faribl nit, s'volt gemegt zajn a šenerer kibed выбачайце, чым багатыя, тым і рады (што душа мае, тым і прымае; што маем, тым і прымаем; чым хата багата, тым і рада; не падзівіце, госьцікі, калі мала чаго было; частавалі, чым мелі, весялілі, як умелі)

kibl=kubl *m*, -en/-es кубел(ец), кубялок, кадзь, кадушка; памыйнае вядро

kic-kic-kic! [*ukr.* киць-киць] *int.* кыць-кыць, кыцы-кыцы-кыцы! (падзываньне для катоў)

kicer *m*, *pl.* kicurim [*s.* (ים-)צור(י)ק →mekacer, bekicer] скарачэньне, скарот, кароткі зьмест, скарочаная вэрсія; кароткасьць [*sin.* farkircung, gekirete versje; kurekajt]; **kicer-hadóver** [*s.* הדבר] *adv.* карацей, адным словам, у лічаных словах [*sin.* in kurcn, mit ejn vort, in gecejlte verter]; **kicer-hamájse** *m* [*s.* המעשה]; **kicer-jómim** *m* [*s.* ימים] скарочаныя гады, кароткае жыцьцё [*sin.* farkircte jorn, kurc lebn; *ant.* arixes-jomim]; **kicer-jómimdiker** нядоўгажывучы, хуткасны

- a kicer словам, карацей кажучы
- a kicer-hamajse закругляючы, скарочана, кароткім чынам

kicken [*d.* kitzeln] шчыкатаць, ласкатаць, казытаць; **kicl** *m.* -en ласкотка, шчокат, казытка; **kicldiker** ласкотны, ласкатлівы, далікатны, казытлівы

- er kiclt zix alejn un laxt alejn ён сам сябе казыча й сам сьмяецца
- kiclen a tojtn казытаць нябожчыка
- kiclen emecns ejgnlibe шчыкатаць чыё-небудзь самалюбства
- az a vajbl drejt mitn toxes, iz a simen, az zi iz forn kicldik *vulg.* калі кабета круціць сракай, гэта знак, што ёй сьпераду казыча

kicve *f* [*s.* (ת)צבה(ק] філянтропія, рэгулярная дапамога, міласьціна, падачка; **kícve-rejster** *m*, -s сьпіс дапамогі

- lebn fun kicve жыць зь міласьціны
- nemen* kicve прымаць міласьціну
- – Muter majne, muter getraje, /mit kejn guts nemt men zix nit iber. /ix hob šojn gezen, fil gresere miljonen, un af kicve kumen zej iber. *flksl.* – Маці мая, маці дарагая, ня трэба перабіраць з багацьцем, я ўжо бачыла, як вялікія мільянэры станавіліся жабракамі.

kíč=šá-kič 1. *int.* ш-ш-ш! ша! цыць! ціха! цішэй! цішыня!; 2. *adv.* вельмі ціха, спакойна

kíč [*ukr.* кіця] *kšp.* кіца, кацяня

kiče=kuče *f.* -s куча, кут, ніша ў печы для дроваў, чыгуноў альбо для свойскай птушкі

kičemént=kučemént/kočumént *m*, -n турма, вязьніца, засьценак

- X'bin geven a klejner jat, /hob ix ništ gevolt folgn dem brider; /hajnt zic ix in kičement /un zing mir lider. Di fejgelex štejen afn dax /un kukn arinter; /ix hob nox cu zicn /a zumer mit a vinter. *flksl.* Я быў малым хлопцам, я не хацеў слухаць свайго брата; зараз я сяджу ў засьценку й сьпяваю песьні. Птушкі сядзяць на даху і пазіраюць уніз; мне яшчэ сядзець лета і зіму.

kider-vider [*v.* кідэры?] 1. *adv.* насуперак, варожа, злосна, гадка; 2. *m*, -s спрэчка, сварка

- er iz gemaxt kider-vider ён зрабіў насуперак
- gejn* mit emecn kider-vider гладзіць некага супраць поўсьці
- ix bin mitn porec "aderabe-veaderabe", nor der porec iz mit mir "kider-vider" *glxv.* я з панам "калі ласка – будзь ласка", а ён са мной "туды-растуды"

kideš *m* [*s.* (ת)קדוש →mekades, makdeš, kodeš, kduše] "асьвячэньне"; бласлаўленьне над віном альбо над халай, якое чытаюць адвячоркам у пятніцу альбо напярэдадні сьвята; суботняе пасьляпалудзеннае сьвяткаваньне з нагоды радаснага выпадку [*sin.* hejlikung]; **kideš-levóne** *m* [*s.* לבנה]; **kideš-haxójdeš** *m* [*s.* החודש] абрад бласлаўленьня маладзіка пад адкрытым небам групай гэбрэяў, стоячы насупраць маладзіка й пры гэтым падскокваючы тры разы (паміж 6-м і 17-м чысламі кожнага месяца); **kideš-levóne-ojsjes** *pl.* [*s.* אותיות] голькі вялікія лігары (якімі некалі друкаваліся малітвы для бласлаўленьня маладзіка); **kídeš-maxer** *m*, -s *hum.* малады, жаніх, муж; п'яніца, піяка, прапойца, п'яніога

- maxn kideš бласлаўляць віно й халу
- nit tojgn* nit cu kideš nit cu havdole ні да печы ні да рэчы (ні к Сідару ні к Хведару; ні ў пір ні ў вір; ні богу сьвечка ні чорту галавешка/ражон)
- a boxer maxt kideš iber špener, un havdole iber a kaltn fajertop хлопец бласлаўляе трэскі й моліцца над халодным гаршком з вугольлем
- er ken in hozn-nisl "kideš" špringen *glxv.* ён моліцца й скача як гарэх (аб нізкарослым чалавеку або гарбуне)
- ongehojbn (hot zix es) mit (a) kideš un geendikt mit (a) kadeš пачаў з бласлаўленьня, а скончыў памінальнай малітвай
- Ša-ša, es vert šojn naxt, /der rebe kideš maxt, /ša-ša, nor, xsidim, hert /mit kavone fajn. /Ša-ša, me trogt cum tiš, /aj-aj, gefilte fiš, /ša-ša, di rebecn /tejlt a jedn ajn. *flksl.* Ша-ша, ужо настала ноч, рэбэ прамаўляе бласлаўленьні, ша-ша, хасыды, слухайце з добрым намерам. Ша-ша, нясуць да стала, ай-ай, фаршыраваную рыбу, ша-ша, рабініха надзяляе кожнага.
- vi di šul iz, azoj špringt men "kideš" *šprxv.* якая сынагога, так у ёй і моляцца (якая рада, такая й грамада; якая песьня, такія й скокі)

kideš-hašém *m* [*s.* קידוש־השם] пакутніцтва, гвалтоўная сьмерць (з-за прыналежнасьці да юдаізму)

- gejn* af kideš-hašem ісьці на сьмерць за веру
- kumen* af kideš-hašem быць закатаваным, гвалтоўна забітым за веру

kídnefn [*s.*?] 1. выкрадаць заложніка; 2. *n* выкраданьне

k(i)dúš(i)n *pl.* [*s.* קידושין] шлюб, вянец, вясельны абрад; *tlmd.* назоў 7-га трактату 3-га разьдзелу (запаветы аб шлюбе); **k(i)dúš(i)n-fingerl** *n*, -ex заручальны пярсьцёнак; **k(i)dúšndiker** законны (дзіцёнак), легітымны

kiem *m* [*s.* קיום →mekujem] існаваньне; трываласьць [*sin.* ekzistenc; festkajt, feikajt cu dojern]; **kiem-hóume** *m* [*s.* האומה] нацыянальнае існаваньне, статэчнасьць народу [*sin.* nacjonale ekzistenc, baštendikajt funem folk]

- bašicn dem kiem (fun) абараніць існаваньне
- hobn* a kiem цягнуцца, працягвацца, існаваць
- ale gelt-šiduxim hobn nit kejn kiem *glxv.* шлюбы за грошы ня маюць права на існаваньне

kier *m*, -s [*s.* (ס-)כיור] умывальнік у сынагозе альбо на гэбрэйскіх могілках [*sin.* vašbekn, hantfas]

kifn [*r.* киф?] *argo* пабіць, даць лазьню

ki-hú-ze [*s.* כי־הוא־זה] трош(ач)кі, крышачку, ледзь(ве), насілу, ледзь-ледзь [*sin.* a klejn bisele, kojm-kojm]

kijad-haméjlex [*s.* כיד־המלך] "адпаведна царскаму стану"; *adv.* па-царску, шыкоўна, раскошна, пышна, багата

kiker-léxem *m* [*s.* (י)כר־לחם →ad-kiker-lexem] бохан хлеба [*sin.* labn broji]

kikojen-dejójne *m*, -s [*s.* (ס-)קיקיון־דיונה(י)ק] *bot.* дрэва пророка Ёны, якое выросла за адну ноч, але на другі ж дзень засохла; *fig.* эфэмэрная рэч (Ён. 4)

kikries-jám-suf [*s.* כקריעת־ים־סוף] *adv.* выключна цяжка (як разьдзяленьне Чырвонага мора)

kilaim [*s.* כילאים] мешаніна, сумесь (якую Тора забараняе) [*sin.* gemišn]; *tlmd.* назоў 4-га трактату 1-га разьдзелу (запаветы аб забароне зьмешваць за ежай розныя рась-

ліны, птушынае мяса або мяса скаціны розных відаў)

kilaxer-jád [*s.* כלאחר־יד] *adv.* (па)між іншым, мімаходзь, мімаволі, укосна; *fig.* спляча [*sin.* farbajgejendik, umdirekt]

• baślisn* kilaxer-jad вырашаць спляча

kile *f*, -s [*p.* kiła, *r./ukr.* кила] *med.* кіла; **kilevate(r)** хворы на кілу; *hum.* прахладны, халаднавагы

kilejóde=keile-loj-jóde=keloj-jóde=kelejóde [*s.* כאילו־לא ידע=כלא־ידע] *adv.* быццам бы няведаючы

• Gist un gist a regndl, /vakst un vakst di blote, /zic ix af dem benkele /lateve un late. /Vojl iz dem, vos iz a šuster, /iz aza pagode. /Mont dos vajb ba mir af pite, /x'max zix kilejode. (Z. B.) Лье й лье дождж, расьце й расьце гразюка, я сяджу на лаўцы й латаю дзірку. Добра шаўцу ў такое надвор'е. Калі жонка патрабуе ў мяне хлеба, я раблю выгляд, што не разумею.

kileríb *f*, -n, **kilríbl** *n*, -ex [*d.* Kohlrabi] *bot.* кальрабі

kiljem *m*, -es [*p.* kilim, *r./ukr.* килим] кілім

kilke *f*, -s [*r.* килька, *p.* kilka] кілька

kilkl *m*, *pl.* kilkulim [*s.* (ים־)לקול(י)ק] пашкоджаньне, псаваньне, папсуньце, дэградацыя, рэгрэс

kiln [*d* kuhlen] халадзіць, студзіць, стыць; **kil** *m*, -n, **kíl(blex)kajt** *f* прахалода, прохаладзь; **kíl(blex)er** прахладны, халаднаваты; няветлівы, неласкавы; **kiler** *m*, -s *texn.* радыятар, ахаладжальнік; **kilung** *f texn.* ахаладжэньне; **kílkastn** *m*, -s, **kilšafe** *f*, -s халадзільнік, лядоўка, лядзік; **kílštibl** *n*, -ex морг

• kiln di erd памірацъ

• s'lozt zix filn a kilblexe friškajt павеяла прахалодай

kilxójx-hašór [*s.* כלחוך־השור] *adv.* "калі бык пад'ядае"; вельмі рана, ранкам, раніцой, раніцай, нараніцу, сьвітанкам, на сьвітаньні/досьвітку/золку [*sin.* zejer fri, baginen] (пародыя на "kaalos-hašaxer/-habojker")

kimát [*s.* כמעט] *adv.* ледзь(ве), чуць, амаль (што), блізка [*sin.* noent cu, ši(e)r]

• kimat hot amol dem tajč fun gorništ што амаль – што нічога

• kimat nit зь цяжкасьцю, наўрад ці

kímern [*d.* kummern] засмучаць, маркоціць, турбаваць, хваляваць; **kímern zix** бедаваць, сумаваць, смуткаваць, журыцца, маркоціцца; **kimer** *m* смутак, сум, маркота, журба; **kímerniš** *n* хваляваньне

• dos kimert im vejnik-vos гэта яго мала турбуе

• unter a klejn bejmele /zicn jingelex cvej, /zej rejdn fun a mejdele, /kejn zax kimert zej (C. M.) пад маленькім дрэўцам сядзяць два юнакі, яны гутараць аб дзяўчыне, нішто іх не засмучае

kiml *m* [*d.* Kümmel] *bot.* кмен, кмін

• arajnton* in tejg kiml пакласьці ў цеста кмену

kimpet=kinpet *f* [*d.* Kindbett] роды; **kímpetern/kímpetorn** *f*, -s парадзіха; **kímpet-brivl** *n*, -ex амулет, які носіць парадзіха; **kímpet-fiber** *m* радзільная гарачка; **kímpet(-)kind** *n*, -er нованароджанае дзіця

• lign* in kimpet раджаць

• a negidiš vajb meg zix farginen cvej mol in jor in kimpet cu lign *glxv.* жонка багацея можа сабе дазволіць два разы на год зацяжарацъ

• az dos vajb iz a kimpetorn, iz der man a kimpetor *šprxv.* калі жонка цяжарная, дык і мужык цяжарны

• ba im lign di hent in kimpet *glxv.* ён лежні спраўляе (халадкі/бакі апырае; зубы на сонцы грэе)

• der grester raxmones iz af an oreme mojd, vos ligt in kimpet найвялікшую міласьць выклікае цяжарная бядачка

kimxe-depásxe *n* [*s.* קמחאדפסחא], **kemex-péjsex** *n* [*s.* קמח פסח] "пэйсаховая мука"; грошы на муку (дапамога ад кагалу бедным людзям усім неабходным для сустрэчы Пэйсаху)

kin *m*, *dim.* **kindl** *n*, -ex, **kínele** *n*, -x [*d.* Kien] лучына

• dar vi a kinele худы як запалка/трэска

kin=ka=ke(j)n=kajn *part.* не, ні

kínbak *f*, -n, **kínbejn** *m*, -er [*d.* Kinnbacke] сківіца; **kin** *m*, -en падбародак, падбародзьдзе

kincler=kinstler *m* [*d.* Künstler] мастак, майстра, майстар; **kinclen=kinstlen** шчукарыць, прыкідваща; **kínclexer** 1. **kínstlexer** штучны; 2. умелы, мастацкі, майстэрскі; **kínclexkajt** *f* умеласьць, мастацкасьць, майстэрства

kind *n*, -er, *dim.* **kindl** *n*, *pl.* kinderlex, **kíndele** *n*, -x, **kíndenju** *n* [*d.* Kind] дзіця, дзіц(ян)ё, дзіцятка; **kínder(i)šer, kíndišer** дзіцячы, дзяціны; **kinderáj** *n*, -en, **kindhajt** *f*, **kíndiškajt** *f*, **kíndšaft** *f* дзяцінства; **kindlen (zix)** раджаць, пладзіць дзяцей, пладзіцца, размнажацца; **kíndvajz** *adv.* будучы дзіцём, у дзяцінстве; **kíndvarg** *n* дзетвара, дзятва; **kindhitn** *n* догляд за дзецьмі; **kíndhiter** *m*, -s, (-n *f*, -s) нянька; **kinds(-)kinder** *pl.* патомкі, нашчадкі, унукі, праўнукі; **kínder(-)cimer** *m*, -n дзіцячы пакой; **kínder-čeper** *m*, -s чалавек, які чапляецца да дзяцей; **kínder(-)gortn** *m*, *pl.* -s/-gertner дзіцячы сад; **kínderhejm** *f*, -en, **kínderhojz** *n*, *pl.* -hajzer дзіцячы дом; **kínder-jorn** *pl.* дзіцячыя гады, дзяцінства; **kínder-krankajt** *f* дзіцячая хвароба; **kínderlidl** *n*, -ex дзіцячы вершык; **kínderlozer** бязьдзетны; **kínderlozikajt** *f* бязьдзетнасьць; **kínder-ovnt** *m*, -n дзіцячы вечар; **kínder(-)špil** *f*, -n дзіцячая гульня, забаўка; **kíndl-kontrol** *m* рэгуляваньне нараджальнасьці; **kind-un-kéjt** *pl.* стары й малы, з усім кодлам; **kíndxaper** *m*, -s, (-ke *f*, -s) выкрадальнік дзяцей; **kíndxapung** *f*, -en выкраданьне/крадзеж дзяцей

• a tatns (a) kind з добрай сям'і

• az kinds-kinder zoln gedenken/visn у настаўленьне нашчадкам

• ba zajn mamen iz er a kind ён дзіця ў сваёй маці

• bakumen* kinderšn sejxl зьдзяцінець

• fun kindvajz on/af з самога дзяцінства

• gejn* cu kind адчуваць родавыя схваткі, раджаць

• kind majns! маё дзіцятка! (зварот)

• kinder un kinds-kinder дзеці й дзеці дзяцей (і ўнукі)

• kindlen vi a kabcn/kac, vi in posek štejt пладзіцца як бядняк/котка, як запаведана (плодны як відук/самасейка; плодная як сьвіньня)

• zajn* a kind fun der hejm быць прайдзісьветам

• ale kinder zajnen klejnerhejt klug, lejder (nor dos rov) blajbn zej bam kinderišn sejxl *šprxv.* усе дзеці ў дзяцінстве разумныя, на жаль, большасьць зь іх застаецца зь дзіцячым розумам (век пражыў, а розуму не нажыў)

• ba foter un muter iz kejn kind nit iberik *šprxv.* у бацькоў німа лішніх дзяцей

• beser dos kind zol vejnen, ejder di eltern (der foter) (zoln vejnen) *glxv.* хай лепш дзіцё плача, чым бацькі (калі бацька ня б'е сына малога, то сын адлупцуе бацьку старога)

• ejn kind iz azoj vi ejn ojg *glxv.* адно дзіцё, што адно вока (адна дачка ня стоіць і пятачка)

• kinder fun ejn tatn un ejn mamen un zajnen nit glajx *šprxv.* аднае маткі (і аднаго таткі) няроўныя дзяткі

• kinder un glezer hot men kejnmol nist cufil *šprxv.* дзяцей і шклянак не бывае ніколі зашмат

• kinder un naronim zogn dem emes *glv.* дзеці й дурні гавораць праўду (малое й п'яное найлепшу праўду скажа; чалавек да сямі лет праўду гаворыць; дурань языка на прывязі не трымае)
• klejne kinder – klejne cores/frejdn/zorgn, grojse kinder – grojse cores/lejdn/zorgn *śprv.* малыя дзеці – малыя няшчасьці/радасьці/клопаты, вялікія дзеці – вялікія няшчасьці /пакуты/клопаты (дзеці растуць – бяда падрастае)
• klejne kinder lozn nit šlofn, grojse kinder lozn nit lebn/ruen *śprv.* малыя дзеці не даюць спаць, вялікія дзеці не даюць жыць (дзеці падрасьлі, хату растрасьлі)
• šlof że, šlof że, kindenju, /šlof że, šlof że, kecele... *flksl.* сьпі жа, сьпі жа, дзіцятка, сьпі жа, сьпі жа, кацянятка
• štejner zol zi hobn, nit kejn kinder! *kll.* каб яна каменьне пад сэрцам насіла, а ня дзеці!

kíndikn [*d.* kündigen] паведаміць, паведамляць, апавясьціць, апавяшчаць, давесьці, даводзіць да ведама (аб звальненьні); **kíndiker** *m* вяшчальнік

kine *f*, -s [*s.* (-ות)קינה(י) →mekane] зайздрасьць, нядобразычлівасьць [*sin.* nist-fargineraj]; **kínefuler** зайздросны; **kine-sine** *f* [*s.* שינאה] варожасьць, моцная нянавісьць: саперніцтва, спаборніцтва; **kines-sófrim** *f* [*s.* קנאת־סופרים(י)] канкурэнцыя паміж вучонымі, нядобразычлівыя адносіны паміж пісьменьнікамі альбо іншымі інтэлігентнымі людзьмі

• kinefuler blik зайздросны позірк
• mit kine з зайздрасьцю, зайздросна
• ufvekn kine ba emecn узбуджаць зайздрасьць у кагосьці
• x'hob derfilt a kine мяне ахапіла зайздрасьць
• fun kine kumt/vert sine *glv.* ад зайздрасьці прыходзіць варожасьць (чужое дабро бярэ за рабро)
• Mojše rabejnus Tojre un vajbcriše kine-sine veln ejbik dojern *śprv.* Тора Майсея й бабская саперніцтва будуць існаваць бясконца

kine *f*, -s [*s.* (-ות)קינה →mekojnen; megiles-ejxe, tišebov] жалобная песьня; аплакваньне разбурэньня Ерусаліму або іншых катастрофаў у гэбрэйскай гісторыі; плач, галашэньне, лямант [*sin.* kloglid; gevejn, geklog]; **kínes-zoger** *m* плакун, плаксун (той, хто аплаквае)

• zogn kines плакаць, галасіць

kine *f*, *pl.* kinim [*s.* (-ים)כינה] вош [*sin.* lojz]; **kinim** [*s.* כנים(י) →decax] *tnx.* вошы, зьедзь (адна зь дзесяці эгіпецкіх караў) [*sin.* lajz] (Вых. 8:12)

• ven kinim zoln zajn moes, volt ix geven a grojser balebos *glv.* калі б вошы былі грошы, я быў бы вялікім гаспадаром

kinéres→jam-kinéres *m* [*s.* ים־כנרת] Галілейскае мора

kínftiker [*d.* künftig] будучы

kinhóg=kenoheg [*s.* כנהוג] *adv.* як вядзецца, як прынята, адпаведным чынам

kinig=kenig *m*, -n, (-n *f*, -s) [*d.* König] кароль; **kínign=kénign** (iber) царстваваць, кіраваць; **kíniglexer=kéniglexer** каралеўскі; **kínigrajx=kénigrajx** *n*, -n каралеўства, царства; **kínigkarp** *m*, -n *zool.* люстраны карп

kinikl/kinigl *n*,-ex [*d.* Kaninchen, *mhd.* künichin] *zool.* кролік, трус

kinim [*s.* קנים(י)] "пёзды"; *mšn.* назоў 11-га трактату 5-га раздзелу (запаветы аб ахвяраваньні свойскай птушкі) [*sin.* nestn]

kinjen *m*, *pl.* **kinjonim** [*s.* קנין(י)(-ים) →knie, kojne] набытак, здабытак, прылбаньне, дасягненьне, (духоўны) скарб, маёмасьць, майно; купля, куплянье, закупка, закупліваньне [*sin.* gekojfts, dervorbns, farmegn; ajnkojf]; **kínj(en)en** набы(ва)ць, купіць, куплять; **kinjen-hakó(h)ol** *m* [*s.* הקהל] кагальная (калектыўная) маёмасьць

kinpet=kimpet *f* роды

kinstler=kincler *m*, -s, (-n *f*, -s) [*d.* Künstler] мастак, майстра, майстар; **kínstlerišer** мастацкі; **kínstleriškajt** *f* мастацкасьць; **kínstlexer=kinclexer** штучны; **kínstlexkajt** *f* штучнасьць; **kinstlen=kinclen** штукарыць, прыкідвацца

kiósk *m*, -n [*d.* Kiosk] кіёск

kipjatók *m* [*r.* кипяток] кіп(ец)ень, вар

kiplen (af) [*mhd.* kipelen] перашкодзіць, перашкаджаць; паклёпнічаць, узводзіць паклёп; надакучыць, надакучваць, надакарыць, надакараць; **kipler** *m*, -s, (-n *f*, -s) мучыцель, надакучлівы чалавек; плятkар

kirbes *m*, -n [*d.* Kürbis] *bot.* гарбуз; **kírbesener** гарбузовы

kirc *f* [?] крыўда

kírclexer [*d.* kurzlich] кароткаваты; **kirclex** *adv.* у бліжэйшы час; **kírcerer=kércerer** карацейшы; **kircn** караціць, скарачаць; **kircung** *f*, -en скарачэньне

• – A gut-morgn dir, toxter majne. /– Oj. a gut-jor dir, zejdenju. /– Oj, ix bin nit gekumen nox dajn gut-jor, /ix bin gekumen dir kircn di jor. *flksl.* – Добры дзень табе, дачка мая. – Ой, добрага здароўя табе, дзядуля. – Ой, мне не патрэбна тваё прывітаньне, я прыйшоў скараціць тваё жыцьцё.
• du volst gemegt zajn mit a kop klener/kircer! *kll.* а каб ты стаў меншы на галаву!

kire 1. *m abr.* **kejser jorem hojde** [*s.* קיר"ה=קיסר ירום הודו] *hist.* "гэты імпэратар, хай зьзяе ягоная веліч" (аўстрыйскі імпэратар Франц-Язэп I); 2. *n* Аўстра-Вэнгрыя; **kíre-dajč** *m*, -n *pejor.* аўстрыяк

• kire mok/flokn *hist.* так некалі дражнілі аўстрыякаў у Польшчы і Галіцыі

kírcven=kércven [*d.* kehren, *p.* kierować] павярнуць, паварочваць, (на)кіраваць, накіроўваць

kirke *f*, -s [*r./ukr.* кирка] кірка

kírkenik *m*, -es [*v.* кіркаць?] чалавек, які дакучае/назаляе /раздражняе

kirves *f/n* [*s.* קרבות(י) →krejves, korev, krojve, mekarev, mekurev] блізкасьць, падабенства, роднасьць

kirx *f*, -n, **kirxe** *f*, -s [*d.* Kirche] царква, касьцёл; **kírxlexer** царкоўны

kirxójk-mízrex-mimájrev [*s.* כרחוק מזרח ממערב] "гэтак далёка, як усход ад захаду"; *adv.* вельмі далёка [*sin.* zejer vajt]

kiržner *m*, -s, (-ke *f*, -s) [*d.* Kürschner] шапачнік, кушнер; **kiržnerái** *f/n* кушнерства, шапачнае рамяство

• az me iz šuldik dem kiržner, iz men a balxojv ibern kop хто вінаваты кушняру, той даўжнік паверх галавы (доўг за шапку) (пазыкі завялі ў лыкі; даўгоў як у сабакі блох/кляшчоў)

kis *m*, -im [*s.* (-ים)כיס →bal-kis] 1. кашэль, каліта, кашалёк, машна, парт(а)манэцік, магалейка; 2. *anat.* машонка, шмонка [*sin.* geltbajtl; testiklen-bajtl]

kise *m* [*s.* כס(א)(י)] трон, крэсла, пасад; **kise-hakóved** *m* [*s.* הכבוד] божы/боскі трон/пасад; пачэснае, паважнае, урачыстае месца [*sin.* gots tron; ojbnon, onge/eenst ort]; **kise-hamálxes** *m* [*s.* המלכות] царскі трон/пасад, прастол; **kise-(ha)rabónes** *m/n* [*s.* (ה)רבנות] крэсла для рабіна; пасада, месца рабіна; **kise-haráxmim** *m* [*s.* הרחמים] "крэсла міласьці"; боскі трон/пасад; **kise-šel-eljóhu (ha-**

novi) [s. (הנביא) של־אליהו →sandek] крэсла, на якое садзяць чалавека, які трымае хлопчыка ў час абразаньня
• avekzecn afn kise-hamalxes узьвесьці на трон
kiséj *f*, -en [*r.* кисея] *tekst.* кісея, паркаль
ki-séjce [s. כי־תצא] "калі ты выйдзеш (на вайну)" (назоў 49-га разьдзелу Торы) (Др. З. 21:10–25)
kisél *m* кісель
ki-síso [s. כי־תישא] "калі будзеш лічыць (сыпоў Ізраілевых)" (назоў 21-га разьдзелу Торы) (Вых. 30:11–34)
kisler *m*, -s [s. (ס-)כיסלער] кішэньнік, машнарэз [*sin.* kešene-ganev, kesenik]
kislev *m* [s. (י)כסלו] кісьлеў, трэці месяц гэбрэйскага календару (лістапад-сьнежань)
kíslice *f*, -s [*ukr.* кислиця] квашаны/мочаны яблык; *fig.* злы, сварлівы чалавек
kisnen [*ukr.* киснути, *p.* kisnąć] кіснуць, хныкаць
ki-sóvo [s. כי־תבוא] "калі ты прыйдзеш (у зямлю)" (назоў 50-га разьдзелу Торы) (Др. 3. 26–29:9)
kiʳriim *pl.* →kejser *m*, *pl* kejsorim, (-inje *f*, -s) [s. (-ים)קיסר, *cf.* caesar, *d* Kaiser] імпэратар, цар
Kisve(j)-(ha)kójdeš *pl.* [s. (ה)קודש(י)כתבי →kakosev, kasve-, ksav, ksive, ksube, kosev-, mixtev, nixtev] Сьвятое Пісаньне, Танах [*sin.* Hajike Šrift. Tanax]; **kisve-jád** *pl.* →ksavjád *m/n*, -n [s. (כתב־יד-)כתביד] рукапіс, манускрыпт; **kisve-plás-ter** *pl.* →ksav-pláster *m* [s. (כתבי) פלסתר] пасквіль, брахняпіс, паклёп, абмова [*sin.* paškvil]
kiše-éjver *m* [s. (ק)שואר] эрэкцыя (пэніса)
kišef *m*, *pl.* kišufim, **kišefmaxeráj** *f* [s. (ים-)כישוף →(bal)-mexašef, maxšejfe, ojs-, far-, ba|kišefn] чарадзейства, чараўніцтва, чары, магія, кудзебства [*sin.* cojber, magje]; **kíšef-diker** чарадзейны, чароўны, магічны, кудзебны; **kíšef-hitele** *n*, -x шапка-невідзімка; **kíšef-krajz** *m* зачараванае кола; **kíšefmaxer** *m*, -s, (-n *f*, -s) чараўнік, чарадзей, вядзьмак, маг; **kíšef-šprux** *m*, -n заклінаньне, замова; **kíšef-štekele** *n*, -x чароўная палачка; **kíšefn, ton*/maxn kišef** чараваць, прычароўваць, чарадзейнічаць
• vi durx/mit a kišef чароўным чынам
• lojt a kišef-šprux па шчупачынаму загаду, цудам
• Hej, cigelex, kumt aher cu mir gešvind, /a šejn lidele vel ix ufzingen ajx acind. /Fun a pastexl hejbt dos lidele zix on /un a mejdele, vos hot kišef im geton. (M. G.) Гэй, козачкі, хадзеце сюды да мяне хутчэй, прыгожую песеньку хачу прасыняваць вам зараз. Пра пастушка пачынаецца гэта песенька і пра пастушку, якая зачаравала яго.
kišen [*ukr.* кишити, *r.* кишеть] кішэць
kiške *f*, -s [*p.* kiszka, *r./ukr.* кишка] кішка; **kiškes** *pl.* вантробы; **kíške-mekler** *m* змусьнік, баламут, калатнік
• di dine/grode/blinde/grobe kiške *anat.* тонкая/прамая (кутніца)/сьляпая/тоўстая (абадочная) кішка
• gefilte kiške *kul.* фаршыраваная/нашпігаваная мацой, курыным тлушчам, цыбуляй і перцам кішка (звычайна вараная або смажаная)
• jidiše kiške *hum.* жыдоўская душа, жыдоўскае сэрца
• kiške mit cvorex *fig.* кішка з тварагом (пра жыда, які есьць мясное разам з малочным)
• onlejgn/onstopn di kiške напхаць бруха
• a brox dir in di kiškes/gederem (in bojx)! *kll.* каб табе кішкі выкруціла! (а няхай цябе жывот папаржа! каб цябе за жывот/пуп брала!)
• a šleperše/oremans kiške ken men nit onštopn *glxv.* жабрацкую/бядацкую кішку не напхаеш
• az di kiške iz zat, frejt zix der toxes *glxv.* калі кішка сытая, радуецца срака
• di kiške hot nit kejn fenster *šprtv.* у кішцы вакон німа (бруха не зьвярыядла – што зьеў, то прапалла)
• er hot a kiške on a dno/dek ён мае бяздонную кішку (горла як прорва; праглынець, што ў рот пападзець)
• frej dix, kiške, du vest esn kadoxes! *glxv.* весяліся, кішка, грашу зьясі!
kiš-kiš-kiš [*r./ukr.* киш, *p.* kysz] *int.* кыш-кыш-кыш (выкрык, якім адганяюць курэй/птушак)
kišmíš *m* [*r./ukr.* кишмиш, *p.* kiszmisz] кішміш
kišn *m/f*, -s, *dim.* **kišl** *n*, -ex, **kíšele** *n*, -x [*d.* Kissen] падушка; **kíšele** *n*, -x *anat.* падпашнік
• kišelex unter di ojgn мяшкі пад вачыма
• cvišn cvej, vos šlofn af ejn kišn, tor/zol zix der driter nit (arajn)mišn *glxv.* утраіх нельга спаць на аднае падушцы
• Gej ix mir arajn cu majn gelibter froj, /gefin ix mir ejns un cvej, /in bet lign hern, /ejns un cvej un draj. /Gib ix mir a freg majn gelibter froj: /– vos far a hern dos iz? /Entfert zi mir: – Kop-kišns, /majn muter šikt mir dos. /Oj, kop-kišns mit švarce ojgelex, /oj, oj, vej, majn harc tut mir vej, /az ix bin dox dajn man, – /ax, vos darfstu zej? *flksl.* Заходжу я да сваей любімай жонкі й бачу, раз-два, у ложку ляжаць мужыкі, адзін і два, і тры. я пытаюся ў сваей любімай жонкі: – Што гэта за мужыкі? Яна адказвае: – Падушкі пад галаву, мая маці мне іх прыслала. Ой, падушкі пад галаву з чорнымі вочкамі, вой-ёй-ёй, у мяне схапіла сэрца, калі я твой мужык, – ах, навошта яны табе?
• šlof gixer, me darf di kišn! *hum.* сьпі хутчэй, бо патрэбна падушка!
• šlog zix kop in der vant (in kišn)! *glxv.* біся галавой аб сьцяну (у падушку)!
kišnjen [*ukr.* киснути, *p.* kisnąć] кіснуць
• kišnjen far gelexter ca сьмеху кіснуць/лопаць/здыхаць
kišren *m*, *pl.* kišrojnes [s. (ות-)כישרון →bal-kišren] здольнасьць, здатнасьць, талент, якасьць, уласьцівасьць [*sin.* feikajt, talant]; **kišrendiker** здольны, здатны, таленавіты, якасны
• muzikališe kišrojnes музычныя здольнасьці
kit *m* [*d.* Kitt] кіт (замазка); **kiteven** кітаваць
kitáj [*r./ukr.* китайка] 1. *m tekst.* нанка, кітайка; 2. *n* Кітай
kite *f*, -s [s. (ות-)כת(י)תה] 1. кляса ў школе; 2. група; сэкта, фракцыя, адлом, школа думкі [*sin.* klas; grupe; sekte]; **kites** *pl.* →kat *f* [s. (כיתות) כת] сэкта
• curexenen cu der kite fun hejlike (cu der hejliker kite) залічыць да сонму сьвятых
• Iz a kite mit gezang, ful mit frejd, /du host undz ojsgelejzt, un genug! /To špilt že ale, ale cuzamen, /zingt že hexer, ot azoj: /kat rino mole dico, podiso da! *flksl.* Атрымалася: людзкая грамада са сьпевамі, поўная радасьці, ты (бог) нас вызваліў, і дастаткова! Дык грайце ж усе, усе разам, сыпявайце ж грамчэй, вось так: кат рыно молэ дыцо, подысо да!
Kitev мястэчка Куты (Украіна)
• fun Kosev biz Kitev /iz a tajvele faranen, /avu der Balšem /zix tojvlen iz gegan'en *flksl.* паміж Косавам і Кутамі была рачушка, у якой Балшэм купаўся
kitke *f*, -s [*r./ukr.* кита, *p.* kita] кітка, булка, пляцёнка
• gerotene kitke! удалая булка!

kitl *m*, -en [*d.* Kittel, *p* kitel] мужчынскі ўрачысты белы халат
• Nox der sude, far kol-nidre, /flegt mix štendik benẽn majn zejde, /af majn kepl flegt er lejgn /zajne dare hent di bejde. /Cugetuljet cu zajn kitl /fleg ix citern un hern, /un majn zejde xmurne ojgn /flegn vern ful mit trern. (J. J.) Пасьля бяседы, перад малітвай, мой дзед заўсёды бласлаўляў мяне, на маю галоўку ён ускладаў свае худыя рукі. Прытуліўшыся да ягонага белага халата, я дрыжаў і слухаў, і хмурныя вочы майго дзеда поўніліся сьлязьмі.
• un az der rebe Elimejlex /iz gevorn nox mer frejlex, /iz gevorn zejer frejlex Eliemejlex, /hot er ojsgeton dos kitl, /un hot ongeton dos hitl, /un gešikt nox di pajkler di cvej *flksl.* а калі рэбэ Элімэйлэх яшчэ больш разьвесяліўся, стаў вельмі вясёлым Элімэйлэх, ён зьняў халат і надзеў шапку, і паслаў за двума барабаншчыкамі
kitnice *f*, -s [*v.* кутніца?] *anat.* кіньдзюк, сычуг
kitnies *pl.* [*s.* קט(י)טנית →mine-kitnies] гарох [*sin.* arbes]; *fig.* дробязь, драбніца
kitreg *m* [*s.* קט(י)טרוג →mekatreg, katejger] абвінавачваньне (перад нябесным судом), цкаваньне гэбрэяў на нябёсах [*sin.* bašuldikung]
kivn *m*, -s [*s.* (ס-)כּ(י)ונון →kavone, misxavn, mexavn] намер, замер, думка, мэта, жаданьне [*sin.* mejn, cil, kavone]; **kívndiker** наўмысны, намераны, задуманы
• mit a kivn з намерам
• on a kivn міжвольна, мімаволі
kix=kex *f*, -n [*d.* Kuche] кухня, сталоўка; **kixn** *f*, -es, **kixjidene** *f* кухарка, **kíxgešir** *n*, **kíxgefes** *n* кухонны посуд
• cvej kec in ejn zak azoj vi cvej vajber in ejn kix *glxv.* дзьве коткі ў адным мяху – як дзьве бабы на адной кухні
• vu es zajnen do a sax kixnes/kexins, es dort iz dos esn roj *šprxv.* дзе багата кухарак, там ежа сырая (дзе кухараў шэсьць, там нечага есьць; дзе багата гаспадыняў, там хата ня мецаная; дзе прыглядніка ў многа, там посьпеху мала)
kixl *n*, -ex [*d.* Kuchel] *kul.* кухан, пірог; **kíxelex** *pl. kul.* лёгкае, хрусткае, салодкае літоўскае печыва
kixlen=kexlen [?] несьціць, пялегаваць
kiz (rojer) [?] зусім/цалкам (сыры)
kizek/kizik *m* [*ukr.* кізяк, кизик] кізяк
kizev *m*, *pl.* kizuvim [*s.* (ים-)כּיזוב →kezev] хлусьня, фальш(ывасьць) [*sin.* lign, falskajt]
kizl *m*, **kízlštejn** *m*, -er [*d.* Kieselstein] крэмень, галька; **kízlerd** *f* краменязём
kižik *m*, -es [?] жарабя
k"j *abr.* **ksavjád** *m/n*, -n [*s.* (ן-)כתב"ד=כ"י] рукапіс, манускрыпт
kjanke/kjenke *f*, -s [*ukr.* кіянка] пральная дошка; прапік; качалка
kladke/klatke *f*, -s [*ukr.* кладка, *p.* kładka] кладка (на рацэ)
kladovke *f*, -s [*r./ukr.* кладовка] кладоўка; **kladovščík** *m*, -es кладаўшчык
• in kladovke af der polke štejt a banke mit varenje *hum.* у кладоўцы на паліцы стаіць слоік з варэньнем
klafte/klavte *f*, -s [*s.* (ס-)כּלבּטע →kelev] кепская баба; сука, прастытутка, блядзь, блядзіна, блядзюга [*sin.* šlexte froj; ojsgelasene froj, zojne]; **klafte-šebeklóvim** [*s.* ־שבּכלבּים] дужа кепская баба; блядзь зь блядзей
• di greste core – a vajb a klafte найвялікшае ліха, калі жонка сука (добрая жонка – дома рай, благая – хоць ты цяжу дай)
klafter *m* [*d.* Klafter] сажань (2,14 м); **kláfterdiker** сажнёвы; **kláfterholc** *n* дровы; **kláfteršvum** *m* кроль
• lejgn klafter плаваць кролем
• lign* cen klafter in dr'erd ляжаць на дзесяць сажанёў у зямлі (знаходзіцца ў цяжкім становішчы)
klajbn*=klojbn* (geklibn/geklójbn) [*d.* klauben] са-, вы|браць, зь-, вы|біраць; **klajbung** *f* выбар
• klajbn* a grošn cu a grošn зьбіраць грош да граша
• klajbn* di cejner зьбіраць зубы
• klajbn* naxes зьбіраць/мець шчасьце
• klajbn* vi a hunt bejner, vi varemdike arbes зьбіраць як сабака косткі, як цёплы гарох
• klajbn* zix in veg arajn зьбірацца ў дарогу
• klajbn* zix vi Borex afn jarid, vi cu der xasene, vi Vixne-Dvoše kejn Amerike, vi a nogid af a krenk зьбіраецца як Борух на кірмаш, як на вясельле, як Віхна-Двоша ў Амэрыку, як багацей на хваробу
• az me klajbt cufil, falt men arajn (falt men gor in blote arajn) *šprxv.* хто доўга выбірае, таму кепскае трапляе (за перабірачку дастанеш балячку ў срачку; хто перабіраець, той пераміраець; за пераборы лапці аборы; зь вялікага гурту выбраў (сабаку) курту)
klajen *f/n/pl.* [*d.* Kleie] 1. вотруб'е, вотрубі; 2. рабаценьне; **klájendiker** рабы; **klájenvejc** *m* вотруб'евая пшаніца; **klájenvejcener** з вотруб'евай пшаніцы
• az di ku est klajen, šokelt zix der bojdem *šprxv.* калі карова жывіцца вотруб'ем, ходырам ходзіць падстрэшша
• az me lejgt zix in klajen, šlepn avek di xazerim *šprxv.* хто ў мякіне сьпіць, таго сьвіньні зьядзяць
• beser fun klajen, ejder cu lajen *glxv.* лепей з вотрубей, чымся пазычаць
klájzldiker [*d.* Klause →klojz] абмежаваны, адасоблены, месьніцкі
klal *m*, *pl.* klolim [*s.* (ים-)כּלל →haklal] правіла, закон, прынцып [*sin.* regl, gezec, princip]; **klál-jidiš** *n* нармаваны/літаратурны ідыш; **klál-nomen** *m*, *pl.* -nemen *gram.* агульнае імя; **klál-šprax** *f*, -n нармаваная/стандартная/літаратурная мова
• als klal як правіла
klal [*s.* כּלל →bixlal, kojlel] *adv.* цалкам, зусім, на(в)огул, наагул, агулам, увогуле [*sin.* in ganen]
• a klal (haklal) ну, вось, карацей/агулам кажучы, словам
• er iz klal nit geven farxidešt ён быў зусім ня зьдзіўлены
• ix hob klal nit bedeje avekcuforn я зусім ня меў намеру ад'яжджаць
• klal uxlal nit зусім не?
• s'iz klal nit azoj гэта зусім ня так
klal *m* [*s.* כּלל →nixlel] грамадзтва, таварыства, грамада, калектыў, гурток [*sin.* gezelšaft, kolektiv, ciber; *ant.* joxed, prat]; **klálies** *n* [*s.* כּלליות] у агульных рысах, усё цалкам, агулам, разам [*sin.* dos algemejne]; **klál-tuer** *m*, -s, (-n *f*, -s), **klál-farzorger** *m*, -s грамадзкі, абшчынны лідэр, дзеяч, кіраўнік; **klal-jisróel** [*s.* ־ישׂראל] жыдоўства, жыдава, жыдоўскі сьвет, увесь гэбрэйскі народ; **klál-injonim** *pl.* [*s.* ־ענינים] грамадзкія інтарэсы, калектыўныя праблемы, палітычныя пытаньні; **klál-zax** *f*, -n калектыўны інтарэс, грамадзкая рэч
• gezogt hot er es in klaljes, in der velt arajn (Prc.) ён выказаў усё агулам, недарэчы
• vos s'vet zajn mit klal-jisroel, vet zajn mit reb Jisroel *šprxv.* што будзе з усімі жыдамі, тое будзе і з кожным жыдам паасобку (што ўсяму міру, тое й бабінаму сыну)

klamer *m*, -n, *dim.* **klémerl** *n*, -ex [*d.* Klammer] клямар, дужка; **klámern** 1. шчаміць, сьціскаць, счапляць, сашчапляць; 2. *pl.* ціскі, шчамлёткі, кляшчотка, лісіца
• (arajn)nemen*/ajnšlisn* dos vort in klamern узяць слова ў клямары
• kajlexdike klamern круглыя дужкі, ()
• kantike klamern квадратныя дужкі, []
klang *m*, -en [*d.* Klang] гук, тон, звон, званок, зык; чутка, пагаласка; **klánglexer** гукавы; **kláng-bavornter** гуканепранікальны; **klánglozer** бязгучны
• a puster klang пусты гук
• s'gejen um klangen ходзяць чуткі
klape [*s.* כלפי] *prep.* у напрамку, у кірунку, у адносінах, насустрач [*sin.* antkegn]; **klape-xúc** [*s.* חוץ] *adv.* для вуліцы, знадворку, звонку, у адносінах да вуліцы, каб было відаць звонку [*sin.* farn drojsn]; **klape-pním** [*s.* פנים] *adv.* усярэдзіне, унутры, у адносінах да інтэр'еру, дзеля ўнутранага карыстаньня [*sin.* inevejnik]
klape=kljape *f*, -s [*nhd.* Klappe, *ukr.* клап, *p.* klapa] навушнік у шапцы, адварот; борт у адзеньні
• hitl mit klapes аблавуха
klápern [*d.* klappern] шумець, грукатаць; **klaper** *m*, -s 1. *dim.* **kláperl** *n*, -ex бразготка; 2. карцёжнік; **a klaper ton*** бразнуць, грымнуць; **kláper(-)gecajg=klíper(-ge)cajg** *n* прылада, інструмэнт, начыньне; *fig.* сям'я, стары й малы; **kláperl** *n*, -ex бразготка; **klaperáj** *f/n*, -en біцьцё, стукат(ня), грукат(ня)
• mitn ganzn klaper-gecajg з усімі прыладамі/прыдаткамі
klapn=klopn (in) [*d.* klopfen] 1. стукаць, удараць, хлопаць, біць; 2. *n* біцьцё; **klap=klop** *m*, *pl.* klep, *dim.* **klepl** *n*, -ex стук, грук, удар; высьпятак, лупцоўка, наганяй, штурхан(ец), штурхаль, кухталь; **gebn*/ton* a klap** (mit) стукнуць, ударыць, хлопнуць, выцяць; **klápndiker** які стукае/грукае; **klápeniš** *n* біцьцё, стукат(ня), грукат(ня)
• derlangen dem sojne klep біць ворага
• emecn klapt a con in/on a con зуб на зуб не трапляе ў некага
• git nit a klap (nit a klap ton*) a finger on a finger палец аб палец ня ўдарыць
• klapn in der tir грукаць у дзьверы
• klapn in pojk барабаніць
• klapn mitn mojl/lamed (mit der cung) ляпаць/мяньціць /малоць языком
• klapn vi a baraban/kalekotke грукатаць як барабан/клякотка (гавораць як у бубен б'юць; барабаніць як пустая бочка; балбоча як індык/п'яны/удод/цецярук; трэпле языком як карова хвастом)
• klapn vi a zejger грукаць/працаваць як гадзіньнік
• klapn zix mit di glezlex чокацца шклянкамі
• klapndike oder *anat.* артэрыя
• klep vi hogl/droše-gešank удараў як граду, як вясельных падарункаў
• krign* klep атрымаць бярозавай кашы (пабоі)
• mit ejn klap адным ударам
• az ix vel im xapn, vel ix im klapn *glxv.* калі я яго злаўлю, дык я ўжо яму задам
• un az der rebe tanct, /tanzn dox mit der tiš, /lomir ale klapn mit di fis *flksl.* калі рэбэ танчыць, танчыць разам са сталом, давайма ж грукаць нагамі
klapót=klopót *m*, -n [*p.* klopot, *ukr.* клопіт] клопат; **klapótfuler** клапотны; **klapočen=klopočen zix** (far) клапаціцца
• bafrajen zix fun a klapot пазбавіцца клопату
• faršafn* (a sax) klapot нарабіць клопату
klas *m*, -n [*d.* Klasse] клясa
klaster-pónem *m* [*s.* קלסתר־פנים] фізыяномія, аблічча, выраз твару [*sin.* fizionomje, ojsdruk fun ponem]
klavíš *m*, -n [*p.* klawisz, *ukr.* клавіш] клявіш
klecer *pl.* →kloc *m*, *dim.* **klecl** *n*, -ex балванка (драўляная)
klej *m*, -en [*p.* klej] клей; **klejen** клеіць; **kléjiker** клейкі
• cien* dem klej fun di bejner ba emecn вызыскваць, эксплюатаваць кагосьці (жылы даставаць; кроў смактаць /ссаць; скуру дзерці)
kle(j)-báis=klebájes *n/pl.* [*s.* כלי בית →kejle, klezmer] хатнія рэчы, мэбля [*sin.* štubzaxn, mebl]; **kle-jóker** *m* [*s.* יקר] дарагі посуд; *fig.* вялікі чалавек; **kle-késef** *pl.* [*s.* כסף] срэбны посуд, срэбныя рэчы [*sin.* zilbern gefes, zilberne xfejcim]; **kle-kójdeš** *m* [*s.* קודש →rov, dajen, šojxet, xazn, šames] служачы гэбрэйскага калегу; **kle-ksíve** *pl.* [*s.* כתיבה] пісьмовыя прылады [*sin.* šrajbgecajg]; **kle-mášxis** *n* [*s.* משחית] зьнішчальны інструмэнт; моцная, разбуральная зброя [*sin.* fartilkungs-instrument, maxtik un ostereriš gever]; **kle-záin/kle(j)zájen** [*s.* זין] 1. *n* зброя, аружжа, дасьпехі; 2. *pl.* музычныя інструмэнты [*sin.* gever, voln; muzikinstrumentn]; **kle-zóhov** *pl.* [*s.* זהב] залаты посуд, залатыя рэчы [*sin.* goldn gefes, goldene xfejcim]
• a froj – ir ganc klejzajen iz mit ir кабета – усё яе ўзбраеньне пры ёй
klejdn [*d.* kleiden] 1. адзець, адзяваць, апрануць, апранаць; 2. пасаваць, падыходзіць, быць да твару; **klejd** *n*, -er (жаночае) адзеньне, адзежа, вопратка, спадніца, сукенка; **klejdl** *n*, -ex спадніца; лёгкая сукенка; **klejdung** *f* убор, убраньне, строі; **kléjder-almer** *m*, -s, **kléjder-šafe** *f*, -s, **klejderšank** *f/m*, *pl.* -šenk адзежная шафа; **klejder-baršt** *f*, *pl.* -beršt, *dim.* **klejder-berštl** *n*, -ex адзежная шчотка
• halb klejdl спадніца
• klejdn zix mitn ganzn knak апранацца з шыкам
• nit zajn* kejn por klejder быць несумяшчальным
• az me hot a naje klejd af der vant, iz dos alte klejd kejn šand *šprxv.* хто мае новую вопратку на сьцяне, старой не саромеецца
• klejder maxn lajt (dem menčn) (dos klejd halt erlex dem menčn) *glxv.* адзежа красіць чалавека
• kuk afn (af dem) mejdl, un nit afn (af dem) klejdl *glxv.* глядзі на маладзіцу, а не на спадніцу (краса да вянца, а розум да канца)
• nit far kluge iz gelt, nit far šejne iz klejder *glxv.* грошы не для разумнай, вопратка не для прыгажуні
• s'klejdt im vi a xazer a noz-ring/haldz-band/zotl гэта пасуе яму як сьвіньні кольца ў нос, аброжак/сядло/падсядзёлак (паўшоры/завушніцы/шапка/кульбачка/нацеркі/набэдрыкі)
• šojn dos klejd in der hejm, vet dix dos klejd šojnen ovšn lajtn *šprxv.* шануй адзежу дома, яна цябе ў людзях паважае
• zol zix azoj maxn a klejdele, vi es maxt zix a mejdele *glxv.* хай бы так рабілася сукенка, як робіцца дзяўчынка
kle(j)-kójdeš *pl.* [*s.* כלי קודש] духавенства (у гэбраяў), клір
klejme *f*, -s [*p.* kleimo, *ukr./r.* клеймо] кляймо, таўро; **klejmeven** клеймаваць
klejncoliker [*d.* klein, Zahl] нешматлікі, малалікі, малаколькасны; **klejncolikajt** *f* нешматлікасьць, малалікасьць

klejner (klénerer) [*d.* klein] 1. малы, дробны; 2. *m euph.* капец, шышка, лудучка, пеўнік, стручок, мазюка, пумпыська, пісюн, посік; **klejne** *f euph.* рассалічак, курыца, курка, перал, цяцерка, авечачка, шмон(іч)ка, дзюрка, разінька, касматая, сукрыстая; **klénjnerhéjt** *adv.* у маленстве; **klénjnikajt** *f*, -n драбязь, драбніца, дробязь; **klénjninker, klénjnči(n)ker** маленькі; **klejnkajt** *f* дробнасць, мізэрнасць, нязначнасць; **klénjnlexer** дробны, драбязьлівы; **klénjnlexkajt** *f*, -n дробнасць, драбязьлівасць; **klejnvajz** *adv.* па-дзіцячы, па-дзіцячаму; **klénjnvarg** *n* дзятва, дзеці; **klénerer** меншы; **klenster** найменшы

- a klejnikajt! *iron.* гэта ня жарты! лёгка сказаць!
- a klejns, ober a fajns малы, але ўдалы
- der mantl iz im cu klejn паліто яму замалое
- ejn klejnikajt! нічога сабе! добрая справа!
- ejns klener funem andern адзін менш за другога
- er iz nit klejn! ці малы ён (нешта зрабіць)?
- fun klejn biz grojs ад малога да вялікага, стары й малы, усім кодлам
- fun klejnvajz on/uf зь дзяцінства
- klejn vi a mojz/flig/genec малы/маленькі як мыш/муха/позех (як вузьлік/мак/палец; кату па пяту; вераб'ю/жабе па калена; пчале па крыльле; сабаку па хвост; раку па вусы; ад зямлі не адрос; на раз аблізаць)
- klejne trejst слабое суцяшэньне
- nojtike klejngelt неабходная дробязь
- ale ejvrim viln pišn, ober nor dem klejner štelt men arojs *glxv.* усе чалёсы хочуць сцаць, але толькі піцюн выстаўляюць вонкі
- az der menč iz umetik, lozt der klejner ojx arop dem kop *glxv.* калі чалавек сумны, дык і чэлес вісіць галавой уніз
- az ix bin geven a klejninker, bin ix geven a šejninker калі я быў маленькі, я быў прыгожанькі
- az nito kejn klejne, iz nito kejn grojse *glxv.* калі німа малога, німа й вялікага
- der klejner iz on bejner, un ale bejner kumen fun im arojs *glxv.* чэлес бяз костак, але ўсе косткі выходзяць празь яго
- der klejner šoklt mitn kop, un di klejne maxt zix nit visndik *glxv.* чэлес ківае галавой, але вульва й знаку не падае
- du host gedarft a kapore vern a klejninker! *kll.* табою яшчэ ў маленстве мусілі ахвяраваць! (навошта цябе маці нарадзіла!)
- fun klejninke vern grojsinke *glxv.* малы становіцца вялікім (дзіцёнак)

Klénjnazje *f* [*d.* Kleinasien] Малая Азія
klénjnfi *n* [*d.* Vieh] дробная скаціна
klénjngelt *n* [*d.* Kleingelt] дробязь, капейкі, дробныя грошы

- far klejngelt за капейкі
- maxn cu klejngelt недаацэньваць, заніжаць цану

klénjngezind *n*, **klénjnvarg** *n* [*d.* Gesinde] дзеці, дзятва, дробязь, драбяза, малеча, жамяра
klénjnhantiker [*d.*] малая (аб літарах)

- klejnhantiker os малая літара

klénjn-képldiker [*d.* Kopf] абмежаваны, слабы розумам
klénjnkernerdiker [*d.* Kern] дробназярністы
klénjn-marx *m* [*mhd.* march] *anat.* мазжачок
klénjnmutiker [*d.* kleinmütig] маладушны; **klénjnmutikajt** *f* маладушнасць
klejnod/klejnot *m*, -ótn [*d.* Kleinod] скарб
klénjn-šas *m* [*s.* ס"שי] *hum.* калода картаў
klénjnštetl *n*, -ex [*d.* Kleinstadt] мястэчка; **klénjn(-)štétldiker** местачковы, правінцыйны
klénjnvog *f* [*d.* Waage] гірка
klénjnvuksiker [*d.* kleinwüchsig] маларосты, нізкаросты
klejon(k)e *f* [*r.* клёнка] цырата
klejt *f*, -n, **klejtl** *n*, -ex [*p.* kleta] крама, склеп; клець; **klejtnik** *m*, -es крамнік

- a klejt iz a gildene kejt *sprcv.* крама як залаты ланцуг (крамнік як на ланцугу прывязаны да яе)

klek *m*, -n [*d.* klecken] 1. пляма, клякса; 2. *fig.* назольны, назойлівы, дакучны, дакучлівы, ачамерны чалавек; **klekn** пляміць; **kleker** *m*, -s прэс, прамакатка; **klék(-)papir** *n* прамакатка

- maxn a klek зрабіць клякcу
- (ojs)špajen* (a) klek (fun) *fig.* адплёўваць
- špajen* klek af emecn клясьці, лаяць, разносіць кагосьці, сварыцца на кагосьці

klekn [*mhd.* klecken] хапіць, хапаць (быць дастатковым), ставаць

- af undzer dor vet (nox) klekn на наш век (яшчэ) хопіць
- dem mejlexs ojcer vet nit klekn царскага скарбу ня хопіць
- dos vet klekn гэтага будзе дастаткова
- kojm vos s'klekt ледзь хапіла (у вабрэз)
- ojb s'vet klekn cajt калі дазволіць час
- s'hot im geklekt sejxl avekcugejn ён меў дастаткова розуму, каб сысьці
- s'klekt kejn cajt nit af alc не стае часу на ўсё
- s'vet klekn far alemen хопіць кожнаму
- vos klekt far a soldat a mace? *glxv.* ці хапае салдату мацы? (пытаецца нехта, калі адчувае, што яму не дадалі)

klekčen [*p.* klektać, *ukr.* клектати] клекатаць
klem *f* [*d.* Klemme] 1. заціск, клямар, цяжар; 2. ціскі, шчамлёткі, клюбы; **klemen** (сь)ціснуць, сьціскаць, шчаміць; **klemen zix** сумаваць, пакутаваць; **klémeniš** *n*, -n згрызота, сьцісканьне; **klémerl** *n*, -ex сашчэпка

- dos harc klemt im у яго сэрца ные
- ton* emecn a klem in harcn камусьці шчыміць у грудзёх (грудзі ныюць)
- zajn* rext in der klem зьнемагацца, нясілець
- zajn* in a klem быць пад прыгнётам (у ціскох)
- me laxt mit klemeniš *glxv.* сьмех скрозь сьлёзы (і сьмех і грэх)

klempe *f*, -s [*ukr.* клемпа, *p.* klępa] старая кляча; баба, клемпа
klep *pl.* →klap=klop *m*, *dim.* **klepl** *n*, -ex стук, грук, удар; каршэнь, высьпятак, лупцоўка, наганяй, штурхан(ец), штурхаль, кухталь; **klépcrl** *n*, -ex дзьвярны малаток, калатушка, ляскотка; **klepten** (in) пастук(в)аць
klepn=klebn=klipn (in, cu) [*d.* kleben] клеіць, ліпнуць; **kleper** *m*, -s а(б)клейшчык; **klép(ed)iker** ліпкі, ліпучы, клейкі; прычэплівы, заразны; **klépikajt** *f* клейкасьць, ліпкасьць; **klepexc** *n*, -n нешта клейкае, ліпкае; **klepung** *f* лепка; **klépcetl** *m*, -en наклейка, этыкетка

- der šmues klept zix nit размова ня клеіцца
- er hot klepike finger ён мае ліпкія пальцы (нячысты на руку)
- es klept zix nit a vort cu a vort ня клеіцца слова да слова

kler *m* [*d.* Klerus] духавенства, клір
klern (az, vegn, cu, ci) [*d.* klären] думаць, раздумваць, меркаваць, разважаць; высьветліць, высьвятляць; **kler** *m*, -n думка, развага, абмеркаваньне; **a kler ton*/gebn*** падумаць, разважыць; **klérenis** *f/n* 1. разважаньне, абмеркаваньне, перадумваньне; 2. беласьць, чысьціня; **klerung** *f* ход думак

• klern vegn epes разважаць аб нечым
• klern vi di velt drejt zix разважаць як сьвет круціцца
• vos iz do der kler? у чым справа?
• az me klert in šabes cufil, arbet men vejniker in der voxn *glxv.* хто зашмат думае ў суботу, меней працуе на тыдні

klétern (af) [*d.* klettern] лезьці, лазіць, карабкацца, караскацца; **kléternik** *m*, -es скалалаз, альпініст
• kletern vi a malpe, vi a kac afn dax лезьці як малпа, карабкацца як котка на дах (як певень на плот, як таракан у шчыліну)

klever *m* [*r.* клевер, *nd.* klever] *bot.* канюшына

klezmer *m*, *pl.* -s/klezmorim [*s.* (כלי־זמר-/ס-/ים) →kejle, kle-; zemer, zmires, mizmer] музыка(нт) (на вясельлі) [*sin.* muzikant, špiler]; **klezmeráj** *f* прафэсія музыкі, ігра на музычных інструмэнтах; **klézmern** *f*, -s жонка музыкі
• az dos mejdl ken nit tancn, zogt zi, di klezmer kenen nit špiln (az me ken nit tancn, zogt men az di klezmers tojgn nit) *šprxv.* калі дзеўка ня ўмее танчыць, яна кажа, што музыкі ня [illegible]юць граць (няўмелай танцэрцы і муха заваджае; [illegible]скаму танцору яйцы замінаюць; дурной танцоўцы [illegible] завада; ліхому танцору і кашуля заваджае)
• [illegible]jt ze mir a finf-un-cvanciker, /oj, af gole giln, /ix vel di klezmer gut bacoln, /zej zoln šener špiln *flksl.* разьмяняйце ж мне чацьвяртак, ой, на залатоўкі, я добра заплачу музыкам, каб яны прыгожа гралі
• ven oreme mejdlex gejen tancn, hern uf di klezmers špiln *glxv.* калі бедныя дзяўчаты ідуць танчыць, музыкі кідаюць граць (як нам жаніцца, то і ноч малая; беднаму і вецер у вочы; сіраціне і ўзімку дзень доўгі; каму месяц сьвеціць, а ад сіраты хаваецца)
• vi a kljamke on a tir, vi a xasene on a klezmer *glxv.* што клямка безь дзьвярэй, што вясельле без музыкі

klift *m* [*r.* клифт?] *argo* плашч, балахон, паліто(н), гарнітур

klign zix [*d.* klügeln] разумнічаць, мудрагеліць, мудраваць; умудрыцца, умудрацца; **kliglen/klígern zix** хітраваць, хітрыць; **klígeniš** *adv.* хітра; **kliger vern*** паразумнець; **klígerišer** разважны, разважлівы
• kliger vi frimer больш розуму як пабожнасьці
• m'ken zix nit klign можна не мудраваць
• ale klign zix, berjen zix mitn meser un mitn gopl (Š.-A.) усе ўмудраюцца спрытна абыходзіцца з нажом і зь відэльцам
• veln zajn kliger fun ale iz di greste nariškajt *šprxv.* жаданьне быць разумнейшым за ўсіх – найвялікшае глупства

klike *f*, -s [*fr.* clique, *r.* клика] хеўра, зграя

klimefójer *m* [*s.* כלי־מפואר] незвычайна/надзвычайна здольны чалавек; вялікі настаўнік

klímpern (mit) [*d.* klimpern] грымець, грукацець, тромкаць, брынкаць, дзынкаць, бразкаць, зьвякаць, бражджаць; **klímperl** *n*, -ex бразготка, бразгулька; **klímperlidl** *n*, -ex бразганьне

klin *m*, -en/-es [*p.* klin, *r./ukr.* клин] клін
• ejn klin šlogt arojs dem cvejtn *šprxv.* клін кліна выбівае /паганяе (Церахам на клін)

• in a magejfe iz a cig ojx a behejme (az es kumt a magejfe af fi, vert a cig ojx farrexnt als a behejme) *glxv.* як паморак, дык і каза пойдзе за карову (калі німа рыб, добры і грыб; як німа мяса, то і грыб закраса)
mage(-u)máse *m/f*, -s (mit) [*s.* (-ס)מגעומשא] дотык, сутыкненьне, кантакт, дачыненьне, зносіны, адносіны, стасункі (часта ў нэгатыўным сэнсе) [*sin.* barirung, baciung, kontakt]
• hobn* a mage-umase (mit) знацца, мець агульную справу
• nit hobn* mit emecn kejn mage-umase ня мець з кімсьці ніякай агульнай справы
magie *m*, *pl.* magiim [*s.* (-ים)מגיה →bal-magie] карэктар, выпраўца, выпраўляльнік [*sin.* korektor, durxkuker]; **magie zajn*** рабіць карэктуру, выпраўляць
magistrát *m*, -n [*d.* Magistrat] магістрат
• kop mojex mágistrat! *iron.* моцная галава! (мазгі густыя, розуму багата, чэрап густа варыць)
magl *m*, -en/-jes, **mangl** *m*, -en [*d.* Mangel, *p.* magiel] маглі, качалка; **mágl(j)even/maglen** качаць, маглявaць, праса ваць (бялізну)
mágnét *m*, -n [*d.* Magnet] магнэс; **magnétišer** магнэсавы; **mágnet-ajznštejn** *m min.* магнэсавы жалязьняк
• kools kerbl hot in zix magnet *glvv.* кагальны рубель мае ў сабе магнэс
• s'cit vi a magnet цягне як магнэс
• M'hot mir geredt kales mit nadn /un mit klejder, um mit a sax gelt. /Vi a magnet hostu mix cugecojgn, /ject gej ix durx dir fun der velt. *flksl.* Мне сваталі нявестаў з прыданым і з хусьцем, і зь вялікімі грашыма. Як магнэс ты мяне прыцягнула, цяпер я гіну праз цябе.
ma(ha)r... *abr.* **mojrejne haráv reb** [*s.* מהר...=מורנו הרב רב] наш настаўнік рабін рэб... (тытул, зь якога звычайна пачынаюцца імёны славутых рабінаў-вучоных)
Maharál *m* [*s.* מהר"ל] Магарал, Іегуда Ліва бэн Бэцалель [*s.* לוי־יהודה בן־בצלאל] (Познань, 1512/1525?–1609, Прага), рабін, талмудыст, вучоны
Maharám *m* [*s.* מהר"ם] Магарам з Ротэнбурга, Мэір бэн Барух [*s.* מאיר בן־ברוך] (Вормс, 1215?–1293, Энзісгайм, Эльзас), вучоны-талмудыст
mahar(h)er zajn* [*s.* מהרהר →hirer] удум(в)ацца, развaжыць, развaжаць, раздумваць, раздумляць, размысьліць, размышляць, ламаць сабе галаву [*sin.* arajntraxtn, arajnklern, zix arajngriblen]
• maharer zajn* af emecn падазраваць кагосьці

maharíč=magaríč=mo(ho)ríč *m* магарыч, барыш
Maharšál *m* [*s.* מהרש"ל] Магаршал, Шлойма бэн Exiэль Лурыя (Познань, 1510?-1573, Люблін), вучоны-талмудыст
Maharšó *m* [*s.* מהרש"א] Магарша, Шмуэль Эліэзар бэн Ісгуда га-Леві Эдэльс (1555–1631, Польшча), вучоны-талмудыст
mahón *m* [*d.* Mahagoni, *p.* mahoń] чырвонае дрэва; **mahónener, mahíneve(r)** з чырвонага дрэва
maj *m*, -en [*d.* Mai] май, травень; **majove(r), májiker** [*p.* majowy] майскі; **majovke/majuvke** *f*, -s маёўка; **majovnik** *m*, -es, (-nice *f*, -s) чалавек, які адпачывае; **májglekl** *n*, -ex *bot.* ландыш; **máj-žuk** *m*, -es майскі жук
• majove kadoxes *med.* сяннаая ліхаманка
• majove kadoxes iz gut – jener zol es hobn *glxv.* добрая рэч – сяннаая ліхаманка, але хай бы хто іншы хварэў
maj dekoamre rabonen [*s.* מאי דקאמרי רבנן] *tlmd.* што нашыя вучоныя рабіны кажуць; **maj dekoamre rébecn** [*s.* רביצין] што кажуць жонкі вучоных рабінаў (параджая на "maj dekoamre rabonen")
• nit visn* maj dekoamre rebecn нічога ня ведаць (ведае курыную сюсю, і тую ня ўсю)
maj ko mašme lon [*s.* מאי קא משמע לן] *tlmd.* што нам тут яго слухаць? навошта ён нам гэта распавядае?
• Maj ko mašme lon der regn? /Vos že lozt er mir cu hern? /Zajne tropns af di šojbn /kajklen zix, vi tribe trern. /Un di štivl iz cerisn, /un es vert in gas a blote; /bald vet ojx der vinter kumen – /x'hob kejn vareme kapote... (A. R.) Які сэнс мае дождж? Што ж я магу ад яго пачуць? Яго кроплі коцяцца па шыбам, як мутныя сьлёзы. І боты падраныя, і на вуліцы гразь; хутка яшчэ вецер задзьме – у мяне німа цёплай капоты...
maj kule haj [*s.* מאי כולי האי] што гэта азначае цалкам? што гэта такое? што за дзіва?
maj nafke-míne [*s.* מאי נפקא־מינה] якая розьніца?
maj tajme [*s.* מאי טעמא] паводле чаго? на якіх падставах?
majájsenik *m*, -es [*s.* (עס-)מח־יעשהניק] распусьнік, распушчаны, распутны, разбэшчаны чалавек, гультай, агіднік, гарэзьнік, нягоднік, паганец, вісус, свавольнік [*sin.* ojsgelasener menč, hultaj, kolbojnik]
majdane-méjlex/-mlóxim *pl.* [*s.* מעדני־מלך/־מלכים] царскія стравы, вельмі смачная ежа [*sin.* keniglexe špajzn, zejer gešmak esn]
majdanim *pl.* [*s.* מעדנים] смачная, файная ежа [*sin.* gešmake majxolim, fajne esns]; **majdánimdiker** смачны
majdem/majdim *m*, -s (af, in) [*s.* (ס-)מאדים →ojsmajdimen] аматар; маладзец, малайчына, малойца; зухаваты, здатны, здольны, спрытны, дасьведчаны, энэргічны чалавек [*sin.* libhober; feiker, geniter, flinker]
• a majdim af epes здатны на штосьці
• mazl majdem *astr.* Марс
majdn* (gemitn/gemájdt) [*d.* meiden] мінуць, мінаваць; **majdn* zix** разьсьціся (у дарозе)
májerkepl=mójerkepl=méjerkepl *n*, -ex марская ракавіна; *zool.* чарапашына
majestét *m/f*, -n [*d.* Majestät] вялікасьць (тытул); **majestétišer** велічны
ma(j)im *n* [*s.* מ(י)ם →gemajmter] вада [*sin.* vaser]; **ma(j)im-axrójnim** *n* [*s.* אחרונים] "апошняя вада" (вада, у якой абмываюць пальцы пасьля ежы і перад бласлаўленьнем); **ma(j)im-šeéjn-lóhem-sof** *n* [*s.* שאין־להם־סוף] бясконцыя воды; невычэрпныя пыганьні; **ma(j)im-rišójnim** *n* [*s.* ראשונים] "першая вада" (вада, у якой абмываюць пальцы перад ежай); **ma(j)im-šelónu** *n* [*s.* שלנו] вада, якую пакідаюць стаяць у посудзе на ноч і ўжываюць для прыгатаваньня мацы на Пэйсах; *hum.* наша вада, нейкая маёмасьць; **ma(j)im-xá(j)im** *n* [*s.* חיים] "сьвежая вада"; *hum.* гарэлка [*sin.* friš vaser; bronfn]
• Ongezoljet afn haren, maxt men a lexaim, /ojb der umet lozt nit ruen – zingen mir a lid. /Iz nito kejn bisl branfn – lomir trinken majim; /majim-xajim iz dos xajim – vos darf nox der jid? (Š. K.) Калі золка на сэрцы, мы выпіваем чарку, калі сум не дае спакою, мы пяем песьню. Німа ні кроплі гарэлкі – давайце піць ваду, вада – гэта ж жыньцё, а што яшчэ патрэбна жыду?
majke *f*, -s [*r.*] майка, саколка
májkern [*s.* מעקרן] 1. "выр(ы)ваць"; разбурыць, разбураць, (з)руйнаваць; 2. лягчаць, спакладаць [*sin.* ojsrajsn, češtern; kastrirn]
majl *f*, -n [*d.* Meile] міля; **májlntrit** *adv.* сямімільнымі крокамі
• af a majl fun an umglik далей ад граху
• far a majl за вярсту, вельмі далёка
• simxes af an ejl, cores af a majl *šprxv.* радасьці на локаць, гора на мілю
majle *f*, -s [*s.* (ות-)מעלה →lemajle] добрая якасьць, вартасьць, годнасьць, цнота; дадатнасьць, перавага, выгада; ступень, градус, вышыня [*sin.* gute ejgnšaft; hexerkajt, beserkajt; grod, štapl, hejx; *ant.* xisorn]; **majle zajn*** узвысіць, узвышаць, да(ва)ць перавагу
• ejne fun di vezntlexe majles funem roman адна з істотных вартасьцяў рамана
• hobn* di majle legabe/kegn epes выгодна адрозьнівацца ад чагосьці
• zix haltn* in der majle трымаць фасон, уласную годнасьць
• ale majles in ejnem iz nito ba kejnem *glxv.* ніхто не валодае разам усімі добрымі якасьцямі (яшчэ той не радзіўся, хто б усім дагадзіў; яшчэ гэткі не спаткаўся, каб усім ён спадабаўся; і бог усім не дагодзіць)
• ale majles kenen ništ zajn in ejnem (mit ale majles iz nito) *glxv.* німа ў сьвеце поўнай дасканаласьці (німа чалавека бяз ва́ды; і сонца свае плямы мае)
• az di kale iz nit šejn, hot zi andere majles *šprxv.* калі нявеста непрыгожая, дык мае іншыя добрыя якасьці
• der emes hot ale majles, ober er iz a šemevdiker *glxv.* праўда ўсім хораша, але цнатлівая
• es iz nito kejn majle on a xisorn *šprxv.* кожная вартасьць мае загану (німа роду без выроду; у кожнай чарадзе авечку з матыліцамі знойдзеш; і на здаровай яблыні гнілы яблык знойдзеца)
majle-géjrezajn* [*s.* מעלה־גירה →malegejren] пераможваць, жаваць жвачку; *fig.* паўтараць сказанае
majlem zajn* [*s.* מעל(י)ם →almə-, bealme] за-, (с)хаваць, захоўваць, затаіць, затоіваць, не выказ(в)аць [*sin.* ojsbahaltn, farhojln, farborgn, ništ ojszogn]
majler *pl.* →mojl *n*, *dim.* **majlxl** *n*, -ex рот
majln bakojdeš [*s.* מעלין בקודש] "падвышае ў сьвятась-

ці"; у кірунку сьвятасьці трэба штораз узвышацца, а не зьніжацца

majlose/majlosoj [*s.* מעלתו] тытул "яго годнасьць"; яго міласьць/мосьць, ягомасьць, ягамосьць

majmed *m* [*s.* מעמד →bemajmed] сытуацыя, стан, пазыцыя; пасада, месца [*sin.* situacje, štand, pozicje; štele]

majmek zajn* (in) [*s.* מעמיק →amkes, omek, (mi)maamakim] паглыбіцца, паглыбляцца, удум(в)ацца [*sin.* zix fartifn, arajntraxtn]

majmen *m*, *pl.* majminim [*s.* (-ים)מאמין →emune, bal-majmen] чалавек, які верыць у бога; вернік [*sin.* glejbiker]

majmer *m*, *pl.* majmorim [*s.* (-ים)מאמר] 1. жарцік, прыказка, выслоўе, афарызм; 2. аргыкул, эсэй [*sin.* vertl, zog, aforizm; artikl, esej]; **majmeristik** *f iron.* пісаніна, нудная публіцыстыка; **majmer-hamúsger** *m* [*s.* המוסגר] сказ у дужках, заўвага; **majmer-xazál** *m* [*s.* מאמרחז"ל] афарызм, які ўзгадваецца ў Талмудзе

majmodes *pl.* [*s.* מעמדות] 1. выбарка сэнтэнцыяў з Танаху, Талмуду і малітоўнікаў, каб чытаць іх пасьля ранішняй малітвы альбо пасьля чытаньня псальмаў; 2. штогодняя сума грошай, якую зьбіраюць паміж сабой хасыды для свайго рэбэ

• majmodes iz velveler vi tilim (tilim kost tajer, majmodes iz velveler!) цытаты з Танаху таней за псалтыр (з анэкдоту пра хворага багацея-скнару)

majne *f*, -s [*s.* (-ות)מענה] адказ, апраўданьне; повад, прычына, падстава, матыў; прэтэнзія [*sin.* entfer; ojsrejd, terec; pretenzje]

Májne-lošn *n* [*s.* מענה־לשון] "Словы мовы"; назоў кнігі з малітвамі, якія чытаюць на могілках; *fig.* востры язык, вялікі рот, вострыя і калючыя словы [*sin.* rejd fun der cung; šarfe cung, grojs mojl, šarfe un štexike šprax]

• arajnlejgn a majne-lošn паслаць падалей, аблаяць

• efenen dem majne-lošn разявіць пашчу

• hobn* a majne-lošn мець вялікі рот

majner [*d.* mein] мой; **májnike** мае (родзічы, сваякі); **májniker** мой, які належыць мне; **fun/far májn(e)tvegn/májn(e)t vegn** [*d.* meinetwegen] з-за/празь/дзеля мяне, па мне

• frier majne, špeter majne раней маё, пазьней маё

• majne – dajne маё – тваё

• majn vajb, majn ku, majn ferd un majne kunder! мая жонка, мая карова, мой конь і мае дзеці! (з анэкдоту пра жыла селяніна)

majneš zajn* [*s.* מנאץ →meaneš, ojneš, baronšin] (па)караць [*sin.* baštrofn]

majn-majn-majn [?] *int.* цялушка-цялушка... (так клічуць кароў)

majnster *m*, -s, (-ke *f*, -s) [*d.* Meister] майстар

majofes *m* [*s.* מה־יפית] "які ты прыгожы"; першыя словы і назоў аднаго са сьпеваў, якія сьпяваюцца ў пятніцу адвячоркам (мэлёдыя, на якую выконваўся гэты сьпеў у Польшчы, дужа падабалася панам); **majófesnik** *m*, -es, **majófes-jid** *m*, -n чалавек, які празнушчаецца, ламае карак, гнецца перад чужымі; ліськівец, падлізьнік, падліза, падхалім [*sin.* xojnef, culeker]; **majófes-lidl** *n*, -ex ліськівыя сьпевы, прамовы; падхалімаж

• zingen* majofes рассыпацца дробным макам

ma-jó(j)ker [*s.* מה־י(ו)קר] ці дорага гэта? колькі каштуе? які кошт? якая цана?

majontek/majontik *m*, -tkes [*p.* majątek] маёнтак

• a majontik (mit gelt) багацьце, скарб, маёмасьць

• s'kost a majontek! гэта каштуе вялікіх грошай!

• ufnašn ken men a gancn majontik *šprxv.* зласаваць можна вялікі скарб

majre=mejre=maare=meore *f*, -s [*s.* (-ות)מערה] 1. пячора, бярлог, логавішча, грот; 2. надгробак, грабніца

majrev *m* [*s.* מעריב] "той, хто робіць вечар" (назоў вячэрняй малітвы)

majrev *m*, **májrev(-)zajt** *f* [*s.* מערב] захад (кірунак сьвету); **májrev-cu=majrev cu** *adv.* да захаду; **májrevdiker, májrev-zajtiker** заходні; **Májrev-Ejrope** *f* Заходняя Эўропа; **májrev-ejropejišer** заходне-эўрапейскі; **májrev-lénder** *pl.* заходнія краіны; **májrev-vint** *m*, -n заходні вецер

• vajter majrev-cu больш на захад

• Oj, bobenju, zog nox nit "got fun Avrom", /vos iz dos mit dir hajnt der ajl? /In majrev-zajt iz nox di zun nit fargangen, /oj, bobenju, vart nox a vajl. (H. R.) Ой, бабуля, не кажы яшчэ "бог Абрагама", чаго ты так сёньня сьпяшаешся? На захадзе яшчэ сонца не схавалася, ой, бабуля, пачакай яшчэ хвілінку.

majrex/majrix *m*, *pl.* majrixim [*s.* (-ים)מאריך →arixes-, bearixes] пустаслоў, чалавек, які піша або гаворыць вельмі падрабязна і шматслоўна; **majrex/majrix zajn*** пра-, за|цягнуць, пра-, за|цягваць, адтэрмінаваць, адтэрміноўваць; пустасловіць, гаварыць, расказваць, распавядаць, пісаць (падрабязна/доўга/шматслоўна) [*sin.* ojscien, farlengern; redn oder šrajbn ojsfirlex]; **majrex-jómim(-vešónim) zajn*** [*s.* (-ושנים)ימים] "падаўжаць дні (і гады)"; доўга жыць [*sin.* lang lebn]

• ir zolt majrex-jomim-vešonim zajn! прадаўжы, божа, веку добраму чалавеку! (каб вам яшчэ многа гадкоў смачна спалася і лёгка ўставалася!)

• ix hob fajnt majrex cu zajn un hob lib redn cu der zax (Š.-A.) я ненавіджу пустасловіць і люблю гаварыць па сутнасьці справы

majse [*s.* מעשה] па падабенству, падобна, нібы(та), па прыкладу [*sin.* azoj vi a..., lojtn štejger fun a..., vi es past far a...]

majse *f*, -s, *dim.* **májsele** *n*, -x [*s.* (-יות)מעשה →ese, lemajse] 1. казка, байка, прыпавесьць, фрашка, (неверагодная/фантастычная) гісторыя, апавяданьне, аповяд, расказ; 2. здарэньне, прыгода, справа, падзея [*sin.* dercejlung, fantastiše gešixte; gešceniš]; 3. *euph.* "штучка", "сорам", палавы орган; **majse-betóx-májse** *f* [*s.* בתוך־מעשה] гісторыя, якая ўплецена ў другую гісторыю; складанае, заблытанае апавяданьне; **majse-brójšes** *f* [*s.* (-מעשׂ)בראשית] стварэньне сусьвету; хаос, перадгістарычны стан сьвету; пачатак; **májse-bixl** *n*, -ex кніга казак/апавяданьняў, фантастычныя гісторыі; **májse-bixldiker** казачны; **májse-geštaltn** *pl.* казачныя вобразы; **majse-jódaj** *pl.* [*s.* ידי →jad, šeljad, mijad-lejad] праца маіх рук; **majse-jódov** *pl.* [*s.* ידיו] праца іхных рук; **majse-merkóve** *f* [*s.* מרכבה] *kbl.* прывід боскай калясьніцы, патаемная боская містэрыя; **majse-nífle** *f* [*s.* נפלא →pe(j)le, pile-ploim, nifle, nisim-venifloes, nispoel, mafle-lajses, hafle-vofele, plie] дзівосная, цудоўная гісторыя; **majse-nísim** [*s.* נסים] 1. *f* дзівоснае/цудоўнае здарэньне; 2. праз цуд; цудоўным/дзівосным/незвычайным/надзвычайным чынам; **majse-nójre** *f*, -s [*s.* (-נורא)נוראות] дзівоснае/цудоўнае здарэньне; незвычайная/надзвычайная /дзівосная рэч; **majse-ójnen** *f* [*s.* אונן] ананізм; **majse-rá** *f*,

pl. majsim-róim [*s.* (מעשים־רעים) רע־] благі ўчынак, злачынства, ліхадзейства, бясчынства [*sin.* šlexte tuung, bejzvlike handlung]; **majse-sdóm** [*s.* (מעשי־) סדום־] амаральныя паводзіны, амаральная дзейнасьць, амаральны ўчынак, амаральнае дзеяньне; **majse-sótn** [*s.* שטן־] д'ябальскія штучкі, д'ябальшчына, чартаўшчына: на злосьць, на ліха; **majse-šábes** *f* [*s.* שבת־] байкі, балбатня; **majse-šehóje** *f*, -s [*s.* (שהה(-ס־] факт, сапраўднае здарэньне, прыгода, эпізод з жыцьця, быль; **majse-tatúim** *f*, *pl.* majse-/majsim-tatuim [*s.* (מעשים־) תעתועים־] амаральныя паводзіны, амаральная дзейнасьць, амаральны ўчынак, дзікасьць, дзікунства, скандал, лютасьць, шаленства, жорсткасьць, бязьлітаснасьць; **majse-tóle** *f* [*s.* תלוי־] *pejor.* гісторыя Ісуса Хрыста; **majsim** *pl.* [*s.* מעשים] падзеі, дзеяньні, учынкі; абыходжаньне, паводзіны [*sin.* tuungen, uftuen; uffirung]; **majsim-ašer-lójjeósu** *pl.* [*s.* אשר־לא־יעשו] незвычайныя, надзвычайныя рэчы, немагчымая навізна; рэчы, якія нельга рабіць; кепскія, благія дзеяньні, учынкі; **majsim-bexól-jóm** *pl.* [*s.* בכל־יום] штодзённыя падзеі, факты, звычайныя рэчы; **majsim-tójvim** *pl.* [*s.* טובים־] (gute majsim) добрае і чалавечае абыходжаньне, дабрадзействы

- a majse on an ek (on a sof) бясконцая гісторыя
- a miese majse брудная гісторыя/справа
- a mol iz geven a majse жылі-былі..., жыў некалі... (пачатак казак)
- a šejne majse! *hum.* добрая справа!
- arbetn majsim (mit) рабіць усё магчымае
- aza majse gor! вось яно што!
- bagejn* majsim-tatuim (vilde majsim) рабіць дзікія ўчынкі (бясчынствы), лютаваць
- di majse iz, az... так здарылася, што...
- dos iz majse parx гэта хамства
- es tuen zix majsim так атрымліваецца, гэтак выходзіць
- far velxe/vosere majsim-tojvim (kumt dos im)? *non.* за што яму такая ласка? чым ён гэта заслужыў?
- gexapt in der majse набрацца вальнадумства (у адносінах да юдаізму)
- (gor)nit majse sojxer неабдумана
- herst/gehért a majse! што ты кажаш! ці чуў ты!
- jene majse *vulg.* похва, вагіна, потка
- kejn majse nit зусім ня блага, нічога/нішто сабе
- majse ganev па-зладзейску
- majse sojxer сур'ёзна, прадукцыйна
- mit vort un majsim словам і справаю
- onarbetn majsim шмат нарабіць, перакуліць сьвет, рабіць усё магчымае; нашкодзіць, напракудзіць, насаваліць, нагарэзьнічаць
- puste majses бязглузьдзіца, бяссэнсіца
- s'iz bobe-majses! гэта бабскія казкі!
- s'iz jene majse! гэта іншая гісторыя!
- vi in a majsele як у казачцы
- vos far a majse! што за гісторыя!
- vos iz di majse mit im? што зь ім здарылася? у чым справа?
- xapn/pakn emeen bejs (der) majse схапіць кагосьці на месцы злачынства
- хоć tu zix a majse on хоць у вір/пельку галавою
- zix a majse onton* накласьці на сябе рукі, скончыць жыцьцё самагубствам
- a flekele/štekele arajn, a flekele/štekele arojs, di majse iz ojs kiёk туды, kiёk сюды, і казачцы канец
- a majse fun a cigele a vajse (di majse mit der cig) *glxv.* казка пра белую козачку
- a šejne majse, ober zi hot šojn a bord (di majse hot šojn a bord) *glxv.* прыгожая казка, але ўжо з барадой (старая показка/байка; сьпяваная песьня)
- es iz gor majse-sdom *glxv.* гэта дзікі ўчынак (лютасьць)
- es tut zix majsim *glxv.* дым каромыслам, гармідар
- majsim-tojvim helfn nit, majsim-roim šatn nit *šprxv.* дабрадзействы не дапамагаюць, злачынствы ня шкодзяць

majser *m*, *pl.* majsres [*s.* (מעשר(-ות →eser-, asore-] *tnx.* дзесяціна; дзясятая частка ўраджаю, якую кожны гэбрэй мусіў аддаваць сьвятарам; дзясятая частка заробку, якую аддаюць на дабрачыннасьць; **májsern** сыскваць дзесяціну; **majser-šéjni** [*s.* מעשר־שני] *tlmd.* назоў 8-га трактату 1-га разьдзелу (запаветы аб другой частцы дзесяціны, якую трэба зьесьці сям'ёй у Ерусаліме); **majsres** [*s.* מעשרות] "збожжавы падатак"; *tlmd.* назоў 7-га трактату 1-га разьдзелу (запаветы аб дзесяціне)

- majser fun štroj un zalc дзесяціна саломы й солі

majs(t)l=mejsl *n*, -ex [*d.* Meissel] разец; зубіла; долата

majstns=mej(n)stns [*d.* meistens] *adv.* большай часткай, у большасьці

májstreven/majstern (mit) [*d.* meistern, *p.* majstrować] майстраваць; **majster** *m*, -s, (-n/-ke *f*, -s) майстар; **májsteršaft** *f*, **májsteriškajt** *f* майстэрства; **májsterišer, májsterhafter** майстэрскі, умелы; **májsterverk** *n*, **májsterštik** *f* мастацкая праца, шэдэўр

- a majster vert nit gebojrn *šprxv.* майстрамі ня родзяцца (ня бог пашыў боты – шаўцовай работы)

majšer zajn* [*s.* מעשיר →nisašer, ašires, ošer, ojšer] (у)збагаціць, (у)збагачаць [*sin.* rajx maxn]

majtek *m*, *pl.* matikim [*s.* (מעתיק(-ים] перапісчык; перакладаль)нік, тлумач [*sin.* iberšrajber; iberzecer]; **majtek zajn*** перапіс(в)аць; перакласьці, перакладаць

majtke *f*, -s [*p.* majtki] майткі, нагавіцы

majver zajn* [*s.* מעביר →avejre, ojver, over] 1. зьняць, здымаць з пасады; адмовіць, адмаўляць, адхіліць, адхіляць; 2. (af) уводзіць (кагосьці) у грэх, падштурхнуць да граху; 3. чытаць кожны тыдзень "sedre" [*sin.* aropnemen fun amt, opzogn, bazajtikn]

Majver-jábek *m* [*s.* מעבר־יבוק] "Пераход цераз раку Ябэк" (назоў кнігі, у якой зьмешчаны малітвы, якія чалавек мусіць чытаць перад сьмерцю, і малітвы, якія чытаюцца пасьля сьмерці)

majver-náxle zajn* [*s.* מעביר־נחלה] адмовіць, адмаўляць у праве насьледаваньня/пераймаьня спадчыны: экспрапрыяваць, высваяць; адабраць, адбіраць уласнасьць [*sin.* opzogn fun jeruše-rext; ekspropriiren]

majver-sédre zajn* [*s.* מעביר־סדרה →sedre] перачытваць разьдзел з Торы з націскам

majxl *m*, *pl.* majxolim [*s.* (מאכל(-ים →axile, axlen, baaxle, meakl] страва, ежа, яда; ласунак, прысмакі, смаконікі [*sin.* špajz, sort esn; gešmak esn], **májxldiker** смачны, прыемны; **majxlmlóxim** *m/n* [*s.* מלכים־] царская (вельмі смачная) ежа; **majxl-tárfes zajn*** [*s.* טרפות־] частаваць кагосьці бязь яго ведама трэфнай ежай; **majxl-tárfesnik** *m*, -es жыд, які гандлюе быцам бы кашэрнай ежай; **majxoles-asúres** *pl.* [*s.* מאכלות־אסורות] забароненая (некашэрная) ежа

• a majxl-majxolim (a batamt majxl) (дужа) смачная страва, усім стравам страва
• harbe majxolim вострыя стравы
• maxn/grejtn gešmake majxolim гатаваць смачную ежу
• milxike majxolim малочная ежа
• a majxl farn bajxl! прысмакі для пузякі! (за вушы не адцягнеш! вельмі смачная ежа)
• a majxl vi a mojd mit a bajxl страва як брухатая дзяўчына
• der zelber (dos ejgene) majxl, nor in an ander(er) šisl *glxv.* тая самая страва, толькі ў іншай місцы (той сам штук, да другі спосаб; тая звяюля, але ня так кукуе; тое, але не такое)

majz *pl.* →mojz *f, dim.* **majzl** *n*, -ex, **májzele** *n*, -x мыш; **májzišer, májzener** мышыны; **májznlox** *m/f, pl.* -lexer мышыная пара

makabi *m*, -m, **makabejer** *m* [*s.* (-ם)מכבי, מכבייער] макавей

makábrišer [*d.* makaber, *p.* makabra] жудасны, жахлівы, страшны

makará *m* [?] ніткі для шыцьця

makarél/makerél *m*, -n [*d.* Makrele] *zool.* макрэль

makarones/makaronen *pl.* [*d.* Makkaroni] макароны

makdem/makdim zajn* [*s.* מקדים →kojdem] апавясьціць, апавяшчаць; апярэдзіць, а-, вы|пярэджваць, (з)рабіць раней [*sin.* zogn fun onhejb on; avekšteln cu eršt, ton frier]; **makdem/makdim zajn* zix** пасьпяшацца, прысьпешыцца, выперадзіць, выпераджаць, быць першым/наперадзе [*sin.* zix cuajln, zix federn, zajn fun di eršte]

makdeš zajn* [*s.* מקדיש →kodeš, mekadeš] прысьвяціць, прысьвячаць [*sin.* hejlikn, vidmen, opgebn]

make *f*, -s [*s.* (-וֹת)מכה →decax adaś beaxab, eser-makes] бяда, гора, пакута, ліха, злыдні; чума, пошасьць, звод, паморак, эпідэмія; *tnx.* адна зь дзесяці эгіпецкіх караў (Вых. 7): скула, верад, скульле, нарыў, гнайнік, болька, балячка, рана; *fig.* зусім нічога [*sin.* plog, pest, onšikeniš; bloter, gešvir: gor ništ, in ganen ništ]; **make ašer loj ksuve batojre** [*s.* אשר לא כתובה בתורה], **make šelój ksuve batojre** [*s.* שלא] "пакута, якая не была засьведчана ў Торы"; новае няшчасьце, насланьнё, ліха; новая бяда, навала, кара [*sin.* naj onšikeniš, culog cu di cores, friše štrof]; **makes** [*s.* מכות] *tlmd.* "удары"; пазоў 5-га трактату 4-га разьдзелу (запаветы аб цялесных карах) [*sin.* klep]; **makes-axzórjes** *pl.* [*s.* מכות־אזהרות] страшэнныя ўдары [*sin.* šreklexe klep]; **makes-bxójres** [*s.* מכת־בכורות] *tnx.* сьмерць першароднага сына (адна зь дзесяці эгіпецкіх караў) (Вых. 11:5); **makes-medine** *f* [*s.* מכת־מדינה] бяда, гора, ліха для ўсёй краіны [*sin.* landplog]; **makes-récex** *pl.* [*s.* מכות־רצה] сьмяротныя ўдары [*sin.* merderlexe klep]

• di cen makes *tnx.* дзесяць эгіпецкіх караў
• šlogn* makes-recex моцна аддубасіць
• a make! (makes!) чорта з два! трасцу/скулу!
• a make dir in bojx/haldz (in di bejner)! *kll.* скулу табе ў жывот/шыю/косткі! (скульле, мульле пад бок!)
• a make iz gut (cu zen) – ba jenem untern orem (afn haldz) (a make in jenems orem iz nit šver cu trogn) *glxv.* скула – добрая рэч у кагосьці пад пахай (чужая скула не баліць)
• az me vet makes esn, vet men kadoxes kenen *šprxv.* калі скулу зьясі, трасцу будзеш ведаць (чалавек галодны да нічога ня згодны; галодному ў галаву нішто ня йдзе; усё забудзеш, калі хлеба не здабудзеш)
• er iz a guter/vejx – xoć lejg im cu a make/gešvir (vejx/gut vi cuculejgn cu a make) ён такі дабрак (мяккі), хоць прыкладай яго да скулы (да нарыва)
• got šikt (cu) di refue far der make *glxv.* бог пасылае спачатку лекі, а пасьля хваробу (абы струп, будуць вошы, абы бяда, будуць грошы)
• got zol af dir onšikn fun di cen makes di beste! *kll.* хай бог нашле на цябе лепшую зь дзесяці караў эгіпецкіх!
• hobn zolstu makes-bxojres! *kll.* хай сьмерць возьме твайго першароднага сына! (адна зь дзесяці эгіпецкіх караў)
• ix vinč dir fun di cen makes di beste! *kll.* бажаю табе лепшую зь дзесяці караў эгіпецкіх!

makef *m*, -n [*s.* (-ן)מקף] *gram.* штрых, рыска, дэфіс, злучок, працяжнік [*sin.* štrix, tire]

makeróndl/makaróndl *n*, -ex, **makrón** *m* [*eng.* macaroon] міндальнае пячэньне

maker-tójve *m*, *pl.* makire-tójve [*s.* (מכירי) מכיר־טובר] чалавек, удзячны за дабро, за ласку [*sin.* dankbarer menč]

maklen [*s.* מקלען] (па)біць палкай (кіем рэбры памацаць)

makljer *m*, -ljáres [*d.* Makler] маклер

makohine *f*, -s [?] ступка, макітра

makovke/mákevke *f*, -s [*ukr./r.* маковка] макаўка

makped *m*, *pl.* makpidim [*s.* (-ים)מקפיד →kapdn, kpejde] строгі абаронец, пэдант, задужа пунктуальны чалавек [*sin.* štrenger ophiter, pedant]; **makped zajn*** (af) строга захоўваць, абараняць, зьвяртаць увагу на дакладнасьць

mákrete/mákerte/makitre *f*, -s, **máketer** *m*, -s [*ukr.* макітра, *r.* макитра] макітра, макацёр, міска, паўмісак

makrev/makriv zajn* [*s.* מקריב →korbn] ахвяраваць, прынесьці/прыносіць у ахвяру

• makriv zajn* dos lebn ахвяраваць жыцьцём

makše zajn* [*s.* מקשה →kaše, nisbakeš, bakoše] пытаць, ставіць пытаньні ў навучаньні [*sin.* fregn a kaše, šteln a frage inem lernen]; **makšn** *m*, *pl.* makšonim [*s.* (-ים)מקשן] апытвальнік; чалавек, які задае пытаньні [*sin.* freger]

• a makšn falt tomed in der blote arajn *šprxv.* хто шмат пытае, той заўжды падае ў гразь (язык і кія дапытаецца)

makše-/mekaše-léjled *f* [*s.* מקשה־לילד] (па)радзіха, у якой цяжкія роды [*sin.* švere gevinern, hobern]

makulatúr *f* [*d.* Makulatur] макулятура

makux *m*, **makuxe** *f*, -s [*ukr./r.* макуха, *p.* makuch] макуха

makxeš zajn* [*s.* מכחיש] абвергнуць, абвяргаць [*sin.* oplejkenen]

maláj *m*, -es малáй, кукурузная перапечка; хлеб з кукурузы, гароху альбо проса

Malat мястэчка Мал'яты (Літва)

• malater mejdlex laxn, nox ejder me hejbt zej on kiclen мал'яцкія дзяўчаты сьмяюцца яшчэ перад тым, як іх пачынаюць казытаць

malaxe(j)-hašóres *pl.* [*s.* מלאכי־השרת →malex] анёлы, якія дапамагаюць богу і знаходзяцца паблізу яго трона

malbeš *m/n*, *pl.* malbušim [*s.* (-ים)מלבוש →halboše, levuš] адзеньне, адзежа, вопратка, апранаха [*sin.* klejd, ontuexc, beged]; **malbeš zajn*** адзець, адзяваць, забясьпечыць, забясьпечваць адзежай [*sin.* baklejdn, bazorgn mit klejder]; **malbeš-arúmim** *m* [*s.* ערומים] "той, хто адзявае голых"; азначэньне для бога; **malbeš-arúmim zajn*** адзяваць голых; **malbeš-umánil zajn*** [*s.* ומנעיל] адзяваць і абуваць, цалкам забясьпечваць адзеньнем [*sin.* baklejdn un bašuxn]

• najer malbeš абноўка

• gerame malbušim раскошнае адзеньне
malc *n* [*d.* Malz] солад; **malcn** саладзіць (жыта); **málc(n)-milx** *f* саладавае малако
malčiške *m* [*r.* мальчишка] малец, хлопец
• Du host dox ongezogt, az du bist a malčiške, /farvos že hostu mir gedrejt azoj majn kop? /Du host dox ongevizn, konst nit zajn majn xosn. /cu vos že hostu zix untergexapt? *flksl.* Ты ж сказаў, што ты малец, чаму ж ты мне закруціў так маю галаву? Ты ж сказаў, што ня можаш быць маім жаніхом, павошта ж ты мне падвярнуўся?
maldeveške=mendeveške *f*, -s мандавошка, вош
mal(e)=malje zajn* [*s.* (מלע)→mile, mojel], **mal(e)n** [*s.* (מלע)ן] *tn.* абрэзаць, абразаць, (з)рабіць абразаньне [*sin.* bašnajdn, idsn. durxfirn di bris-mile]
male [*ukr./r.* мало] мала
• male vos! ці мала што!
• male vos er vil/zogt! ці мала што ён хоча/кажа!
malebonde=balebonde *f*, -s [*ukr./r.*] *hum.* балабонка, языкаты
malegéjren=molegéjren [*s.* מעלה־גירהן →majle-gejre] 1. перажоўваць, жаваць жвачку; *fig.* паўтараць сказанае; 2. *n* жвачка; **malegéjrediker** жвачны; **malegejrexc** *n* жвачка; **malegejre zajn*** жаваць бесьперастанку
• malegejredike balexaim жвачныя жывёлы
malejeen [*r.* мять?] млець
malér *n*, -n [?] ліха, бяда, няшчасьце
malex *m*, *pl.* maloxim [*s.* (מלאך-ים)] анёл; боскі служка, пасланец; *fig.* дужа добры чалавек; **malex pimper** *m folk.* анёл, які скідае зь неба ласункі на альфабэт, калі дзеці пачынаюць вывучаць гэбрэйскую мову: **malex-éljen** *m*, *pl.* malaxe-éljen [*s.* (מלאכי) עליון] боскі, божы анёл, ганец, пасланец; **malex-(ha)dójme** *m* [*s.* (ה)דומה] анёл, які прымае нябожчыкаў на тым сьвеце; **malex-hagójel** *m* [*s.* הגואל] анёл-збаўца, анёл-вызваліцель; **malex-hamojšíe** *m* [*s.* המושיע] анёл, які дапамагае; чалавек, які прыходзіць, каб дапамагчы ў неабходны момант; **mal(e)x(-h)amóves** *m* [*s.* (ה)מוות] анёл сьмерці, сьмерць; **malex-hašólem** *m*, *pl.* malaxe-hašólem [*s.* (מלאכי) השלום] анёл міру, які нясе мір; **malex-xabóle** *m*, *pl.* malaxe(j)-xabóle [*s.* חבלה] кепскі анёл, які мучыць грэшнікаў у пекле; *fig.* параджэньне пекла; кепскі, благі, дрэнны чалавек
• a cetrogener malex расьсеяны чалавек
• a guter/bejzer malex добры/злы геній
• a kalter malex абыякавы, бяздушны, халодны чалавек
• a malex vejnt, a malex vejnt /un badekt di groz mit toj; /libster majner, libster majner, /ix benk nox dir azoj... (P. H.) анёл плача і пакрывае граву расою; любы мой, я сумую толькі аб табе...
• a menč iz kejn malex nit *glxv.* чалавек – не анёл
• az a kind falt, štelt im a malex unter di hent (štelt der malex di hent unter) *glxv.* калі дзіцёнак падае, анёл падстаўляе яму рукі (як малы падае, то анёл зь пярынкаю, як старое, то чорт з бараною)
• der malex-hamoves hot a sax ojgn *glxv.* анёл сьмерці мае шмат вачэй
• der malex-hamoves klapt šojn cu im in tir анёл сьмерці грукае ўжо яму ў дзьверы (пасок паглядае ў пясок)
• der malex-hamoves šext un blajbt tomed gerext *šprxv.* анёл сьмерці забівае і заўсёды мае апраўданьне
• der malex-hamoves zol dix cunemen fun der velt! *kll.* каб цябе анёл сьмерці забраў з гэтага сьвету!
• der malex-hamoves zol zix in dir farlibn! *kll.* каб у цябе закахаўся анёл сьмерці!
• di maloxim gejen nit arum af der erd *šprxv.* анёлы па зямлі не пахаджаюць (ніхто не без граху; адзін бог без граху, а ўсякі грэшан)
• er hot derzen far zix dem malex-hamoves ён убачыў анёла сьмерці (семдзесят сем агнёў убачыў; аж зоркі ў вачох заскакалі; сьвечкі ў вачох засьвяціліся; яскаркі з аччу пасыпаліся)
• frier zajnen di maloxim arumgegangen af der erd, hajnt zajnen zej (afile) in himl (ojx) nito спачатку анёлы расхаджвалі па зямлі, цяпер жа іх і ў небе німа
• halt mix farn malex Gabriel un getroj mir ništ fil *glxv.* прымай мяне за архангела Габрыэля, але не давярай мне цалкам (вер Яўменю, а грошы кладзі ў кішэню; зь мядзьведзем дружы, а стрэльбу дзяржы)
máline/málene *f*, -s [*ukr./r.* малина, *p.* malina] маліна; **málinik** *m*, -es маліньнік; **malínove(r)** малінавы; **malínovke** *f*, -s 1. малінавая настойка; 2. *zool.* малінаўка
malíne *f*, -s [назва пецярбурскай карчмы "Малинник", *s.* melna?] *argo* "маліна"; сховішча, патаемнік (адмыслова ў гецце ў часы 2-ой сусьветнай вайны на выпадак аблаваў)
mal(j)aríe *f* [*it.* malaria] *med.* малярыя
mal(j)er *m*, -s/-ljáres [*d.* Maler] маляр; **máljeven** [*p.* malować] маляваць, мазюкаць; **maljarke** *f*, **mal(j)evanje** *f*, -s малярка, маляванье
malke *f*, -s [*s.* (מלכה-ות) →malxes, mejlex, meluxe] 1. царыца, каралева [*sin.* kenign]; 2. *kort.* дама; **malke-švó** *f* [*s.* שבא] *mx.* царыца Саўская (3 Цар. 10)
• di malke grin (švarc/pik) віновая/пікавая дама
• malke di cacke *flksl. iron.* царыца як лялька
• šteln af der malke švarc ставіць на пікавую даму
• af der malke grin nemt men ojx a mol ojs a grojsn kon *šprxv.* і на віновую даму ставяць вялікія стаўкі (аб непрыгожай нявесьце, але зь вялікім пасагам) (хоць бы дзеўка ня коха, абы грошай панчоха; няхай жонка і сьвінка, абы грошай поўна скрынка)
• af itlexer zax iz do a cajt – ix hob malke-mejlex-tojz mit bele *kort.* на ўсё свой час – у мяне дама-кароль-туз казырныя
• Pejscx kumt, bin ix mir frejlex, /majn vajb a malke un ix a mejlex; /majses hobn mir a fuln zak! /Tanc ix mir a frejlexn hop-čik-čak! *flksl.* Пэйсах прыходзіць, я весялюся, мая жонка царыца, а я цар; падзеяў мы маем поўны мех! Я танцую вясёлы танец гоп-чык-чак!
• vi dos vajb iz a malke, azoj iz der man a mejlex *šprxv.* калі жонка – царыца, дык і мужык – цар
malke-kedíše [*s.* מלכא־קדישא] "сьвяты цар"; бог
malkes *pl.* [*s.* מלקות] лупцоўка, цялесная кара; сымбалічная лупцоўка напярэдадні Ём-Кіпуру ў якасьці пакуты за грахі [*sin.* šmic, kerperlexe štrof]; **málkenen** цьвічыць, сьцёбаць, хвастаць, лупцаваць, дзяжыць, пляжыць
maloje *m*, -s [*s.*?] ліхвяр, квотнік
m(a)lojen=molojen (bam haren) адчуваць мло(сна)сьць /моташнасьць
malorós/malorús *m*, -n [*ukr.* малорос] маларос, украінец
Maloxi [*s.* מלאכי] *tn.* прарок Малахія; Кніга прарока Малахіі

malóxim-ksav *m* [*s.* מלאכים־כתב →malex] *hum.* неразборлівы, нечытэльны почырк; **malóxim-šprax** *f* неразборлівая, невыразная мова; **malóxišer** анёльскі

malpe *f*, -s [*p.* małpa] малпа; **málpišer** малпін(ы)

malšines *n* [*s.* מלשינות →lošn] паклёп, зласлоўе, абгавор, абмова, нагавор, плёткі [*sin.* false bašuldikung, barederaj, bilbl, mesire]; **malšínesdiker** паклёпніцкі; **malšines-biksáv** *n* [*s.* כתב־] пасквіль, памфлет; **malšn zajn*** (af emeen) [*s.* מלשין] узьвесьці, узводзіць паклёп, абылгаць, зьняславіць; данесьці, даносіць, даказ(в)аць, уда(ва)ць (на кагосьці), (з)рабіць данос [*sin.* varfn a falše bašuldikung, denuncirn, masern]

malve *f*, -s [*ukr./r.* мальва, *p.* malwa] *bot.* мальва; **malve lila** ружова-ліловы

malve *m*, *pl.* malvim, (-te *f*, -s) [*s.* (-ים)מלווה →halvoe, lojve] крэдытор, пазычальнік, вернік, ліхвяр [*sin.* gelt-ojsborger, gelt-ojslajer, bal-halvoe, procentnik]; **malve-beríbis** *m*, *pl.* malvim-beribis [*s.* בריבית־] ліхвяр; чалавек, які жыве з адсоткаў (дае ў рост) [*sin.* procentnik]

• ojszen* vi a malve-beribis мець выгляд бяздушнага ліхвяра

malxes [*s.* מלכות →malke, mejlex, meluxe] 1. *n*, -n царства, каралеўства, дзяржава, урад [*sin.* kenigrajx, meluxe, regirung]; *kbl.* адна зь дзесяці сфэраў; 2. *m/n* цар, кароль, уладар, валадар [*sin.* kenig, kejser]; **málxesdiker** царскі, каралеўскі; *fig.* шыкоўны; **málxes-brojt** *n kul.* сьвяточнае печыва; **malxes-horéše/-horešóe** *n* [*s.* הרשע־/־הרשעה] злая дзяржава, імпэрыя; юдафобнае царства; **malxes-jehúde** *n* [*s.* יהודה־] гэбрэйская дзяржава, якая існавала на поўдні Палестыны (X–VI стст. да н.э.); **malxes-jisróel** *n* [*s.* ישראל־] гэбрэйская дзяржава, якая існавала на поўначы Палестыны (X–VIII стст. да н.э.); **malxes-šomáim** *n* [*s.* שמים־] "нябеснае царства"; боскае валадарства, боскія запаветы

• malxes šomaim нябеснае царства

mamce zajn* [*s.* ממצא] 1. выдумаць, выдумляць, (вы)мудраваць, змысьліць, змышляць; вынайдаваць, вынайсьці, вынаходзіць; 2. выцякаць, вынікаць [*sin.* ojstraxtn, derfindn; dringen]

mame *f*, -s (*ak./dat.* mame(n); *pos.* mames) [*sl.*] мама, маці; **mámeši** *f*, **máminke** *f*, -s, **mámenju** *f* матуля, мамуся, матухна; **mamke** *f*, -s мамка; **mámišer** мамін, матчын, мамчын; **mámešaft** *f* мацярынства; **máme-lošn** *n* [*s.* לשון־] "матчына мова"; ідыш; **mamen** мамкаць; **mámes-fartexnik** *m*, -es мамчын сынок

• mame(lex) (majne)! mamінkes! мамачкі (мае)!

• maxn in der mamen arajn (dermonen di mame) узгадваць маці (ад болю)

• nor ba der mamen in bojx яшчэ ва ўлоньні маці

• vi di mame hot gehat у чым маці нарадзіла

• im iz gut vi ba der ejgener mamen яму добра як у сваёй маткі

• a mame iz a muter – a kind iz a moskviter *glvv.* мама – матка, дзіцёнак – маскаль

• a šlexte mame iz nito *glvv.* ліма кепскай маці

• der tate hot genumen di mamen, un ix darf nemen a fremdn!.. тата ўзяў маму, а я мушу браць чужую!.. (з анэкдоту)

• – Mame, oj, mame, ix halt es nit ojs, /majn gelibte kale – zi gejt šojn ojs. *flksl.* – Маці, ой, маці, я не магу гэтага перажыць, мая любая нявеста – яна ўжо памірае.

• vi ejn mame volt zej gehat як аднае маткі дзеткі (на адзін капыл; абодва роўныя; адзін чорт маляваў; адным грэбнем прычасаліся; з аднаго гнязда птушкі)

mamelige *f*, -s [*rom.* mámáligá, *p.* mamałyga, *ukr.* мамалига] *kul.* мамалыга

• a mamelige mišt men mit a drik, me šnajdt zi mit a štrik – un dernox benėt men vi a flig мамалыгу мяшаюць дручком і рэжуць вяроўкай – таму й бласлаўленьне над ёй чытаюць як муха (пудна)

mameš [*s.* ממש →bemamoš] *adv.* напраўду, сапраўды, насамрэч, навочна, дакладна, літаральна, проста-такі [*sin.* af an emes, konkret]; **mamóšes(diks)** *n* [*s.* ות־] рэальнасьць, рачаіснасьць, рачавістасьць, канкрэтнасьць; сутнасьць, вартасьць, важнасьць, значнасьць, істотнасьць, грунтоўнасьць [*sin.* konkretkajt, realkajt; vert, vixtikajt, giltikajt]; **mámešdiker** літаральны (сэнс); **mamóšesdiker** значны, істотны; заўважны, адчувальны, прыкметны; **mamóšesdikajt** *f* істотнасьць, грунтоўнасьць, адчувальнасьць, прыкметнасьць

• er hot mameš bavizn vunder ён напраўду рабіў цуды

• kejn mameš nit! глупства! дробязь!

• mameš derštik vern* задыхацца

• mameš fun unter der noz з-пад самага носа

• mamošesdike rezultatn адчувальныя вынікі

• s'hot ba im kejn mamošes nit cu ton epes (dos hot ba im kejn mameš nit) яму зрабіць нешта – раз плюнуць

mameš *m* [?] баваўняная падшэўка

mamlec zajn* (af) [*s.* ממליץ →mejlec, melice] добра казаць, (ад)рэкамэндаваць; абараніць, абараняць, апраўд(в)аць [*sin.* guts zogn, rekomendirn; fartejdikn, barextikn]

mamšex/mamšix zajn* [*s.* ממשיך →(be)mešex, hemšex] прадоўжыць, прадаўжаць, працягнуць, працягваць [*sin.* kontinuirn, forzecn, vajter firn]

mamtakim *pl.* [*s.* ממתקים] "ласункі, прысмакі"; *hum.* грошы, звонкая манэта; нікчэмны/агідны мэтал [*sin.* zisvarg; gelt, klingers]

• hobn* mamtakim-gelt мець грошы

mamtek zajn* [*s.* ממתיק] зь-, па|мякчыць, зь-, па|мякчаць; праявіць, праяўляць, даручыць, даручаць

mamzél *f*, -n [*d.* Mamsell] мамзэль, паненка

mamzer *m*, *pl.* mamzejrim [*s.* (-ים)ממזר] 1. незаконны сын, байструк, бастард, банюк; 2. *fig.* хітры/зламысны чалавек, пройда, прайдзісьвет, пракуда, праныра, гарэза, свавольнік; разумны і дасьціпны чалавек; 3. *fig.* малазначная рэч; **mamzerúk** *m*, -es байструк, выблялак; жулік, круцель; **mámzer(i)šer** разумны, галаваты, багаты на розум, хітры; пранырлівы, празухі, спрытны [*sin.* kluger, xitre, kunciker, gešikter]; **mamzeráj** *f/n*, -en свавольства, сьвінства; *argo* данос, доказ, уданьне; **mámzeriškajt** *f* хітрыкі; **mámzerte** *f*, -s, **mamzejres** *f*, -n [*s.* (-ן)ממזרת] 1. незаконная дачка, байстручка; 2. *fig.* хітрая і зламысная жанчына; разумная і дасьціпная жанчына; **mamzer-ben(-)hanide** *m* [*s.* הנידה־בן־] незаконны сын; выблядак, якога маці зачала ў нячыстыя дні; **mámzer-bilbl** *m* [*s.* בילבול־] абвінавач(в)аньне ў злачынстве; гнюсны паклёп

• der grošn iz ba im a mamzer грошы для яго сьмецьце

• ojsklern a mamzer-bilbl абгаворваць, паклёпнічаць, узводзіць гнюсны паклёп

• a mamzer ken/meg men zajn un klug muz/zol men zajn *sprvv.* байструком можаш быць, але разумным мусіш быць

• az a mame/muter šrajt af ir (afn) kind: "mamzer!", meg men

ir glejbn калі маці крычыць на свайго дзіцёнка: "байструк!", можна ёй верыць (знае матка, чыё дзіцятка)
• az es volt geven vejniker xazejrim, volt geven vejniker mamzejrim *glkv.* калі б было менш кныроў, было б і менш байструкоў

man *m* [*s.* מָן] *mx.* манна (нябесная); *fig.* дужа смачная ежа, прысмакі
• friše fete grivn, vos cegejen zix in mojl azoj vi der man, vos di jidn hobn gegesn in der midber (Š.-A.) свежыя тлустыя шкваркі, якія растаюць у роце нібыта манна, якую гэбрэі елі ў пустэльні

man *m. pl.* -en/mener, *dim.* **mánele=mén(d)ele** *n*, -x [*d.* Mann], **mancb(i)l/mansbil** *m*, *pl.* -(e)n/mánslajt, **mánsparšojn** *m*, *pl.* -en/manslajt, **mánsperzon** *m*, -en муж(чына), мужык; чалавек; **mánceb(i)lišer, mánebildikler** мужчынскі; **mánebilškajt** *f* мужнасьць, узмужнеласьць; **manšaft** *f*, -n каманда карабля, экіпаж; **man-un-vájb** *pl.* супругі, муж і жонка; **man-un-vájb-lebn** *n*, **man-un-vájbšaft** *f* шлюб, сумеснае жыцьцё
• zej zajnen man-un-vajb šojn cen jor яны мужык і жонка ўжо дзесяць гадоў
• az der'a man iz cu gut far der velt, iz er (cu) šlext farn (far zajn) vajb *glkv.* калі мужык добры для сьвету, ён благі для сваей жонкі (у людзей гуляка, а дома сабака)
• di maneblen hakn unter ba di frojen di fligl un zogn dernox, az jene zajnen nit kejn maloxim мужыкі падразаюць жанчынам крылы, і кажуць пасьля, што тыя зусім не анёлы
• dos vajb trogt funem man nejn xadošim, un der man trogt fun zajn vajb dos gance lebn *glkv.* жанчына носіць ад мужыка дзевяць месяцаў, а мужык носіць ад свае жонкі ўсё жыцьцё
• parnose iz inem mans mazl, kinder zajnen inem vajbs mazl *šprxv.* заробак – бацькаў лёс, дзеці – матчын

man [*mhd.* man] толькі

manatkes *pl.* [*ukr.* манатки, *p.* manatki] манаткі

mančen/manclen/mant(j)en=mončen/monclen/monten [*ukr.* мантити, *p.* mantyczyć] канькаць, клянчыць, цыганіць, мантачыць

mandehú *m* [*s.* מאן־דהוא] абы-хто [*sin.* abi ver]
• er iz dox epes ništ kejn mandehu (Š.-A.) аднак жа ён не абы-хто

mandl *m*, -en [*d.* Mandel] міндаль, міндаліна, мігдал; **mandlen** *pl.* 1. *anat.* гланды, міндаліны; 2. *kul.* печаныя або смажаныя зь цеста ўпрыгожваныі для супу; **mándl-bojm** *m*, *pl.* -bejmer міндальнае дрэва; **mándl-brojt** *n kul.* міндальнае печыва (яго выпякаюць два разы, ад чаго яно робіцца цьвёрдым і хрусткім); **mándl-ojgn** *pl.* вочы як міндаль
• ix hob gegesn mandlen, /ix hob getrunken vajn, /ix hob gelibt a jingele, /ix ken on im nit zajn *flksl.* я ела мігдалы і піла віно, я палюбіла мальца і не магу безь яго

mandomar *m*, -s [*s.* מאן־דאמר] той, хто гэта сказаў; чалавек, які мае дачыненьне; адпаведны чалавек, аб якім ідзе размова/справа [*sin.* der šajexdiker menč]
• faran a mandomar ёсьць такое меркаваньне, ёсьць такая думка

mandre *m*, -s [*ukr.* мандри] *pejor.* муж

mane *f*, **máne-grojpn** *pl.*, **máne-grajplex** *pl.* [*p.* manna] манна, манныя крупы; **máne-kaše** *f*, -s манная каша

maneg *m*, *pl.* manhigim [*s.* (מנהיג(־ים] кіраўнік, праваднік, п(р)авадыр, вож [*sin.* vegvajzer, (on)firer]; **maneg-hadór** *m*, *pl.* manhige-hadór [*s.* (מנהיגי) הדור־] вож пакаленьня, самы вялікі чалавек свайго часу

manever *m* [*p.* manewr] ход, прыём, манэўр

mangán *m* [*d.* Mangan] *chem.* марганец

mangl *m*, -en, **magl** *m*, -en/-jes [*d.* Mangel] маглі, качалка; **manglen** качаць, маглявaць, прасаваць (бялізну)

mangl *m* (in) [*d.* Mangel] недахоп, недахват, хіба, вада
• maxmes/iber mangl in cajt за недахопам часу (з-за недахопу часу)

manhigim *pl.* →maneg *m* [*s.* (מנהיג(־ים] кіраўнік, праваднік, п(р)авадыр, вож

manhojz *n*, *pl.* -hajzer [*d.*] вар'яцкі дом

maniforge/manifarge *f*, -s [*sp.* manifacero, maniobras?] хітрасьць, выкрут(ас); **manifórge-lošn** *n* мова злодзеяў, жаргон
• maxn maniforges ламацца, крыўляцца
• on maniforges бяз хітрыкаў, проста

manír *m/f*, -n [*d.* Manier] манера; **manírlexer** манерны; **manírlexkajt** *f*, -n манернасьць

mánišer [*d.* Manie] маніякальны

maniške=miniške *f*, -s [*ukr./r.* манишка] манішка

ma-ništáne [*s.* מה־נשתנה] "чаму іншае" (першыя словы чатырох пытаньняў пэйсаховай Агады)
• xoxem fun (der) ma-ništane arojs невялікі разумнік

manjen [*ukr.* манити, *p.* manić] маніць, прываблівaць; **mánjeniš** *n*, -n прынада

mank/mang [*d.* mank, mang] *prep.* (па)сярод, (па)між

mankét *m*, -n [*p.* mankiet] манкет, манжэта, абшлаг, закаўраш, адварот (рукава)

mankolje *f*, -s [?] манія, неадчэпная/назойлівая думка, ідэя-фікс
• er hot zix arajngenumen in kop a mankolje яму ўбіўся дур у галаву
• ir mankolje iz rejnkajt яна да вар'яцтва любіць чысьціню

ma-nóe [*s.* מה־נאה] *int.* як прыгожа! [*sin.* vi šejn!]

mant(j)en/mančen=monten/mončen канькаць, клянчыць, цыганіць, мантачыць

mantl *m*, -en, *dim.* **méntele** *n*, -x [*d.* Mantel] паліто(н), палітончык; **mántele-bájdele** *n*, -x *hum.* плашч-накідка
• itlexs mentele hot zix zajn kentele *šprxv.* кожнае палітэчка мае свой канцік (прыходзіцца шыльца к більцу)

mantočen [*p.* mantyczyć] мантачыць, марнатравіць

manxer [*d.* manch, *mhd.* manic, menic] 1. шматякасны, прынадны для ўсяго; 2. іншы, які-небудзь, якісьці, нейкі; **mánxmol** *adv.* калі-нікалі, часам

manžét *m/f*, -n [*ukr./r.* манжета] манжэта

mape *f*, -s [*p.* mapa] мапа, карта

mape *f*, -s [*s.* (מפה(־ות] кавалак тканіны, якім пакрываюць стол у сынагозе, на які кладзецца для чытаньня Тора

mapl *m*, -en, **mápele** *n*, -x, **mápl-kind** *n*, -er [*s.* (מפיל(־ען →nejfele, hamapl] выкідыш, выкідак, скідак, неданосак; *fig.* заморак, бяспомачны чалавек [*sin.* tojt gebojrn kind, švaxling, umbaholfener menč]; **mápldiker** датэрміновы, неданошаны; **maplen** [*s.* מפילן/מפלען], **mapl zajn*** скінуць, скідаць дзіця (аб цяжарнай), раджаць раней за тэрмін [*sin.* abortirn]; **maplung** *f*, -en скідваньне дзіцяці
• vest nit mapl zajn! дзіця ня скінеш! (шкоды табе ня будзе)

mapole *f*, -s [*s.* (מפלה(־ות →bal-mapoles] паражэньне, паражка, параза; правал, крах, разгром, непрыемнасьць, няўдача, благі канец [*sin.* (militerišer) durxfal, opsnit, mieser

psak, slexter sof, *ant.* nicoxn]; **mapojles** *f*, -n [*s.* (ן-)מפולת] развалiна, крушня, халупа, хацiна, руiна [*sin.* ajngefaln hojz, xurve, ruine]; **mapólenik** *m*, -es, (-nice *f*, -s) паражэнца; **mapoleráj** *f* паражэнства
• a gixe mapole хуткая паража
• derlangen/brengen* a mapole панесьцi паражэньне
• filn/farzuxn dem bitern tam fun mapoles un di frejd fun nicoxn спазнаць горыч паражэньняў i радасьць перамогi
• lajdn*/xapn/nemen* a mapole пацярпець паражэньне/крах
• af a šlextn porec tor men kejn mapole nit betn *sprav.* ня варта зычыць благому пану пагiбелi (за новым каралём – дагары камлём)

mar...=mahar... *abr.* **mojrejne haráv reb** [*s.* מורנו=...מהר הרב רב] наш настаўнiк рабiн рэб... (тытул, зь якога звычайна пачынаюцца iмёны славутых рабiнаў-вучоных)

maráп *m*, -en [*šp.* marrano "ядун сьвiней"] *ume.* маран, адхвяра насiльнага хрышчэньня ў Гiшпанii i Партугалii (кан. XIV–XV стст.); **maráпišer** які мае дачыненьне да марана
• – Zog, maran, du bruder majner, /vu iz grejt der sejder dajner? /– In tifer hejl, in a xejder, /dort hob ix gegrejt majn sejder. (A. R.) – Скажы, маран, браце мой, дзе ты правiш сваю пасхальную вячэру? – У глыбокай пячоры, у кутку, там я праўлю маю пасхальную вячэру.

maráпc *m*, -n [*p.* pomarańca] апэльсiн, памаранц, памяранец; **maráпcn-bojm** *m*, *pl.* -bejmer апэльсiнавае дрэва
• lomir zix iberbetn, iberbetn, /kojf mir a por maranen, /lomir zix iberbetn, /lomir gejn tancn *flksl.* давай перапросiмся, купi мне пару памаранцаў, давай перапросiмся, давай патанцуем

maráš [*s.* מה־רעש →raš, mareš] *int.* што за шум/лiха? што ж тут такога?; **marášikajt** *f* самаздаволенасьць, самаадзейнасьць

marbec-tójre zajn* [*s.* מרבין־תורה] распаўсюдзiць, распаўсюджваць Тору; вучыць дзецi, папулярызаваць веды

marberebaše *m* [*s.* מר־ב(ר)־רב־אשי] *iron.* славуты вучоны, арыстакрат, сьветлая галава [*sin.* barimter gelernter, grojser jaxsn, lixtiker menč]
• s'meg zajn marberebaše alejn! сапраўдны рабiн!

marc=merc *m*, -n [*d.* Marz] сакавiк; **marcove(r)** [*p.* marcowy] сакавiцкi; **marc-bir** *m* (marcove bir) сакавiцкае пiва (найсмачнейшае)
• dos cvejte vajb iz vi a marcove zun – zi maxt nit varem, zi maxt nit kalt *glxv.* другая жонка, як сонца ў сакавiку, – нi цёплая, нi халодная

marcipán/marcepán *m*, -es [*d.* Marzipan] марцыпан
• marcipanes! марцыпаны! (мiгдалы з кашэчымi лапкамi!)
• esn* marcepanes есьцi марцыпаны (пешта вельмi смачнае)

marder *m*, -s [*d.* Marder] *zool.* куніца; **márderner** кунiчны

mare *f*, -s [*s.* (ות-)מראה →maris-ain] выгляд, аблiчча, твар; колер твару [*sin.* ojszen, geštalt, ponem: farb funem ponem]

mare-kójen *m* [*s.* מראה־כהן] "аблiчча когэна"; прыгожы выгляд: **zajn* mare-kójen** 1. сьвяцiць, зьзяць; 2. мець чырвоны твар, напi(ва)ца
• er iz mare-kojen *glxv.* ён нападпiтку (у жарку; пад чаркай: у бутэльку зазiрнуў; з карчмаром прывiтаўся; у чуб укiнуў)

marél=morél *m*, -n абрыкос, марэля

mare-mókem/-mekójmes *m* [*s.* (ות)־מראה־מקום] нататка, спасылка, заўвага (у кнiзе); паказальнiк цытатаў/iмёнаў/назоваў [*sin.* note, referenc; citatn-onvajzer, zuxcetl]

mareš zajn* [*s.* מרעיש →(ma)raš] узбурыць, узбурваць, узбудзiць, узбуджаць, узрушыць, узрушаць, страсянуць, страсаць [*sin.* ufrudern, uftrejslen]; **mareš-ójlem zajn*** [*s.* עולם־] узрушыць сьвет, (з)рабiць сэнсацыю

mar(e)vixer *m*, -s [*s.* (ס-)מרוויחער →revex, onrevexdiker, marviex] "здабывальнiк"; *argo* злодзей-кiшэньнiк; гандляр крадзеным [*sin.* fardiner, ganev; handler mit geganvete zaxn]

margaritke/margeritke *f*, -s [*p.* margerytka] *bot.* маргарытка, стакротка
• in veldl, bam tajxl, dort zajnen gevaksn /margaritkelex elnt un klejn – /vi klejninke zunen mit vajsinke štraln, /mit vajsinke – trala-la-la! (Z. Š.) у лясочку, ля ракi, адзiнотка расьлi маленькiя маргарыткi, як маленькiя сонейкi зь бялюсенькiмi промнямi, зь бялюсенькiмi... траля-ля-ля!

margeš zajn* [*s.* מרגיש] ад-, па-, у-, (с)чуць, адчуваць [*sin.* deršpirn, filn]

margl zajn* [*s.* מרגיל →rogl, regilc] прызвычаiць, прызвычайваць, прывучыць, прывучаць, прывыкнуць, прывыкаць, прыжы(ва)ць [*sin.* cugevojnen]

margnise-táve *f* [*s.* מרגניתא־טבא] дарагая пэрла [*sin.* tajere perl]

marinarke *f*, -s [*p.* marynarka] марынарка, куртка

mariner *m*, -s [*d.* Mariner] марак, жаўнер марской пяхоты

marinírn (marinírt) [*d.* marinieren] марынаваць; **marinirter** марынаваны; **marinád/marinát** *m* марынад

maris-áin *m* [*s.* מראית־עין →mare] выгляд, аблiчча, вонкавы аспэкт [*sin.* ojszen, drojsndiker aspekt]

mariš-ojlem zajn* [*s.* מרעיש־עולם] выклiкаць шмат размоваў

mark *m*, *pl.* merk(er), **márk-tog** *m*, *pl.* -teg [*d.* Markt] рынак, кiрмаш, торг, базар; **márkišer** рыначны, кiрмашовы; **márkbajdl** *n*, -ex балаган на кiрмашы; **márkjid** *m*, -s, (-ene *f*, -s). **márkzicer** *m*, -s, (-n/-ke *f*, -s) гандляр на рынку (звычайна садавiнай i гароднiнай); *fig.* гарлапан, "базарная баба"
• arop fun (dem) mark! скончан баль!
• ejder der jid gejt in mark arajn, kost im alc volvl *glxv.* жыд яшчэ не ступiў на кiрмаш, а яму ўжо ўсё каштуе танна
• er iz šojn arop funem mark ягоная песенька сьпетая
• ir hot gehat mistame a gutn mark! напэўна, у вас быў добры кiрмаш! (кажуць чалавеку, у якога шапка надзета на бок)

marke *f*, -s [*nhd.* Marke] марка

markírn (markírt) [*d.* markieren] памячаць, значыць

markírn (markírt) [*p.* miarkować, marukować?] меркаваць, маракаваць

markn=merkn [*d.* merken] заўважыць, заўважваць

markotne(r) [*p.* markotny] маркотны

marl(j)e *f* [*fr.* marli] марля

pák(eve)n [*d.* packen] 1. у-, (с)пакаваць; 2. злавіць, схапіць; узяць у ахапак; падхапіць хваробу; 3. знайсьці, дастаць; **pakn zix** 1. (mit) у-, (с)пакавацца, склад(в)ацца; 2. укляпацца, улопацца, папасьціся; **pakn** *n* злаўленьне, злоў; **pak** 1. *m*, *pl.* pek, *dim.* **pekl** *n*, -ex, **pékele** *n*, -x пак(унак), клунак; куча, груда; 2. *adv.* так, такім чынам, усё ж, а такі; **pakét** *m*, -n пакет; **pakung** *f*, -en пакаваньне; **pákntreger** *m*, -s кніганоша; **pákpapir** *n* пакавальная папера
• a gancer/fuler pak (ful gepakt) зь лішкам, у пераліўкі, празьмерна
• pakn emecn ba der hant злавіць кагосьці за руку
• pakn zix in g(e)nejves пракрасьціся
• x'ken im nit pakn я ніяк яго не прыбяру да рук
pák(ú)lje/pakel(j)e *f*, -s [*v.*] пакульле
pakorne(r) [*p.* pokorny] пакорны, пакорлівы
pakost *m*, -n [*p.* pakość, *r.* пакость] пакасьць, паскудзтва, поскудзь, капасьць, брыда, брыдота; **pákostnik** *m*, -es пакасьнік, паскуднік, капасьнік, шкоднік
pakt=paxt *f*, -n арэнда, пасэсія; **pakter=paxter** *m*, -s аранда(та)р, пасэсар
pakute=pokute *f*, -s пакута; **pakúteven** пакутаваць
pal *m*, **palje** *f*, -s [*d.* Pfahl, *p.* pal] паля, байда; кол
• (aruf)zecn af der palje пасадзіць на кол
palac/palec *m*, -ácn [*d.* Palast, *p.* pałac] палац
palate *f*, -s [*ukr./r.*] палата; **palatke** *f*, -s палатка, кіёск
palaže *f* [*sl.*] пакаваньне, упакоўваньне, увязваньне; дзяруга, радно
Palecien=Pójale-cíen *pl.* [*s.* פועל־ציון] "Працоўны Сіёну"; назоў сіяністычна-сацыялістычнага руху (заснаваны ў 1906 г.)
paletrún *m* [?] *bot.* павой, бярозка
palevines=polovines=pilovines *pl.* пілавіньне
palge *m*, -s, **palgúc** *m* [?] краўчук, кепскі кравец
palínice *f*, -s [*ukr.* паляниця] пшанічны хлеб
palitre *f*, -s [*r.* палитра] палітра
paljen [*p.* palić, *ukr.* палити] паліць, прыпячы, прыпякаць

páljene *f*, -s [*sl.*] палена
palke *f*, -s [*sl.*] палка
pálmesn [?] 1. анатаміраваць, ускры(ва)ць (труп); 2. *n*, **palmes** *m*, -n анатаміраваньне (трупа)
• palmesn di flejš/lajb дапякаць, дадзяваць (зжываць са сьвету)
paltó *m*, *pl.* -en/poltes, **paltn** *m*, -s [*p.* palto] паліто(н)
palube *f*, -s [*sl.*] палуба
palúmesek/palúmesik=polúmisek *m*, -skes паўмісак (авальнае блюда)
pamalje *f* [*s.* פּמליא/פּמליה] боская прыслуга, анёлы [*sin.* gots dineršaft, di maloxim]; **pamalje-šel-májle** [*s.* שלּ־מעלה] бог са слугамі (з анёламі)
pamelex [*p.* pomalu] *adv.* памалу, паволі, марудна; **pamélex-(dik)er, pamélexinker** павольны, марудны; **pamélexn, pamélexinke, pamélexke, pamélinke** *adv.* памаленьку, патрошку; **pamélexkajt** *f* павольнасьць, маруднасьць
• az du vest forn pamelex, vest du šneler onkumen *šprxv.* будзеш ехаць памалу, хутчэй прыедзеш (памалу едзеш – далей заедзеш; ціхім крокам далей заедзеш)
• gej pamelex, vestu nit faln *glxv.* ідзі памалу, не павалішся (памаленьку далей зойдзеш)
• pamelex, abi gut *glxv.* памалу, абы добра
pamojes=pomojes *pl.* [*sl.*] памыі; **pamójnice=pomójnice** *f*, -s памыйніца
pámpuške/pámpeške *f*, -s [*p.* pampuch, *r.* пампушка] пампушка
pan *m*, -es [*p.* pan] пан; **pane** *f*, -s, *dim.* **pánele** *n*, -x пані, паня; **paníč** *m*, -es паніч; **panjenke** *f*, -s паненка; **panske(r)** панскі; **páneven** панаваць; **panibrát** *m* панібрат; **panibratske(r), panibrátišer** панібрацкі; **panibrátiškajt** *f* панібрацтва; **pánščine** *f* паншчына, прыгон
• panske x(v)arobe панская хвароба
• štrojene pane/panjenke кісейная/саламяная пані
• zajn* a gance pani-matke быць паважнай асобай
• zajn* mit emecn panibrat(iš) (haltn* zix mit emecn majse panibrat) быць/трымацца з кімсьці запанібрата
pancer *m*, -s [*d.* Panzer, *p.* pancerz] панцыр, броня; **páncern** браняваць
pančer *m*, -s [?] пракол (кола)
pánkeven [*p.* pan?] цацкацца, няньчыцца, песьціць, мілаваць
pantófl *m*, *dim.* **pantéfele** *n*, -x [*d.* Pantoffel, *p.* pantofel] пантопля; **pantófl-man** *m*, *pl.* -mener пакорлівы, паслухмяны мужік; **pantófl-post** *f* плёткі, зводы, абгаворы
• zajn* untern pantofl (ba) быць пад пятой (сядзець пад хвартухом)
• er zet ojs vi a floj in pantofl *glxv.* ён выглядае як блыха ў пантоплі (маленькі чалавек у вялікай вопратцы)
panu derex [*s.* פּנו דרך] дайце дарогу! дайце прайсьці! [*sin.* maxt a veg, lozt durxgejn!]
panu mokem [*s.* פּנו מקום] дайце месца! дайце прайсьці! расступецеся! (выкрык служкі, які ідзе папярадзе жалобнай працэсіі) [*sin.* lozt plac, lozt durxgejn!]
pap *m* [*mhd.* pap] клейстар
papa *m*, **pape** *m*, -s (*ak./dat.* papn) [*r.* папа] тата
papaxe *f*, -s [*r.*] папаха
pape *f* [*mhd.* pap, *ukr./r.* папа] *kšp.* папа, каша
papír *n*, -n [*d.* Papier] папера; **papíreńer** папяровы; **papír-gelt** *n* папяровыя грошы, асыгнацыя; **papír-korb** *m*, *pl.* -kerb кошык для паперы; **papír-krom** *f*, -en крама пісьмовых прыладаў
papirós *m*, -n [*p.* papieros] папяроса, цыгарка; **papirosnik** *m*, -es, (-nice *f*, -s) папяросьнік, вытворца папяросаў; **papirós-papir** *n* папяросная папера
papíš *m*, -n [*p.* papusza, *rum.* păpúşă] папуша, скрутак тытунёвага лісьця, цыгара
papke *f*, -s [*r.* папка, *d.* Pappe] папка
pap(k)en [*ukr.* пипка?] паліць, цягаць цыгарку
paplen [*d.* pappeln] перакусваць, пад'ядаць, пакляваць (печага)
paport *m*, -n, **páporotnik** *m*, -es [*p.* paproć, *r.* папоротник] *bot.* папараць
papuče *f*, -s [*p.* papucie, *terk.* papuč] пантоплі. шлёпанцы
papuge *f*, -s [*p.* papuga] папугай
papuse *f*, -s [*p.* papusza?] старая падраная кніга
pap(u)šój *m*, -es [*p.* papusza, *rum.* păpúşă] папуша, булаўка, кіёўка, кіях (кукуруза); **papšójener** кукурузны
par *m* [*ukr.* пара] папар, папарны палетак
parábl *f*, -en [*p.* parabola] парабала, прыпавесьць, байка
paradne(r) [*r.* парадный] парадны, урачысты, пышны; **paradne** *f* параднае, чысты ганак
• maxn a/di parad(e) ладзіць парад
parafje *f*, -s [*p.* parafia] парафія; **parafjaler** парафіяльны
parankes (af) [*p.* poranek] з самага ранку, зранку, на досьвітку
parasól *m*, -n [*p.* parasol] парасон
paraše *f*, -s [*r.*] *argo* параша (прыбіральня ў турме)
paraván *m*, -en [*p.* parawan, *fr.* paravent] параван, перагародка, шырма, перакрыцьцё
parazít *m*, -n [*p.* parazyt] паразіт
parcef *m/n*, *pl.* -s/parcufim [*s.* (־ים)פּרצוף], **parcef-pónem** *m*, *pl.* -pénemer [*s.* (־ער)פּנים] *pejor.* твар, морда, хара, мурзы, морзы, мурла; аблічча, постаць, выгляд [*sin.* ponem, fizionomje; ojszen]
• dem sojnes parcef варожая морда
• der heslexer parcef агідная асоба
parcél *m*, -n [*fr.* parcelle] невялікі кавалак зямлі для будаўніцтва; **parcelírn** (parcelirt) надзяляць зямлёй
párce(re) *f*, -s [?] морда, хара, мурзы, морзы, мурла, пашча
parčá *f* [*ukr./r.*] парча, грызэт; **parčeve(r)** парчовы, грызэтавы
parčik *m*, -es [*p.* parciak?] возьнік, (з)возчык, фурман, рамізьнік, вазак
pardes *m*, *pl.* pardejsim [*s.* (־ים)פּרדס] фруктовы сад; цытрусавы сад у Палестыне [*sin.* fruxtgortn]; *kbl.* рай
pare *f*, -s [*p.* para, *ukr.* пара] пáра (вадзяная); **paren** парыць; **parne(r)** парны; **parove(r)** паравы; **parenine** *f* парнасьць, духата; **parščik** *m*, -es лазеньнік; **parovik** *m*, -es паравая машына, паравік; **paraxód** *m*, -n параход; **párevnik** *m*, -es рондаль, каструля, чыгунок; **parovóz** *m* паравоз
• a ferd in pare узмылены/упараны конь
• a hic in parovoz жар у паравознай топцы (гарачая галава; як жару ўхапіўшы)
• citern far emecns pare дрыжаць за кагосьці
• gebn*/derlangen pare задаць пары/лазьню/чосу, дастаць /атрымаць паганяй
• koxn in pare варыць на пару, тушыць
• nit arojslozn* kejn pare і слова ня вымавіць
• s'iz parne парна
• štil, az a pare hert zix nit ціха, што й пáры не чуваць
pare *m*, -s (*ak./dat.* paren) [*s.* (ה־)פּרעה] *mx.* эгіпецкі фараон
• pares makes кары эгіпецкія

párecke=póręčke=púręčke *f*, -s [*v.*] парэчкі
parénč=porenč *m*, -n, **p(a)renče** *f*, -s поручань, парэнчы: балясы
• onšparn zix in/on dem parenč абаперціся на парэнчы
páreve(r) [*d.* bar?] 1. (аб ежы) немясны і немалочны (рыба, крупы, фасоля, яйкі, жыдоўскі хлеб (сьпечаны бяз масла і малака), садавіна і гародніна, арэхі і сланечнік); 2. *hum.* нэўтральны, абыякавы; няўстойлівы, хісткі
• pareve gekexc страва, прыгатаваная бязь мяса і малака
• pareve kejlim посуд, у якім нельга гатаваць мясную або малочную ежу
• pareve łokšn *fig.* ні лой/рыба, ні мяса (горай дурня Апанаса)
parjer *m* [*d.* Paria] парый
parkan *m*, -ánes, **parkn** *m*, -s/-kenes [*p.* parkan, *ukr.* паркан] паркан
• gebn* a kuk arojs fun hintern parkn выглянуць з-за паркана
parke *f*, -s [*v.*] пара коней, каламажка, фурманка
parkún *m*, -es [?] поркала, маруда
parmet *m*, -n [*d.* Pergament, *mhd.* perment, permit] пэргамін, пергамэнт; **parmet-ksavjád** *m*, -n [*s.* (ן-)כתב־יד] пергамент (рукапіс); **pármetener** пэргамінавы
• beser papir cerajsn, ejder parmet (šnajdn) *glxv.* лепш паравяць паперу, ніж пэргамін (рэзаць) (лепш скасаваць зарукавіны, ніж шлюб)
parnes *m*, *pl.* parnesim/parnosim [*s.* (-ים)פרנס] староста (абраны кіраўнік кагалу); прадстаўнік кагалу; кагальны дараднік, апякун [*sin.* kehile-ratman, forštejer un farzorger fun a kehile]; **parnes-xójdeš** *m*, *pl.* párnese-xójdeš [*s.* חודש־(פרנס־)] кіраўнік кагалу на месяц; староста, старшыня, кіраўнік кагалу; **parnes-xójdešte** *f*, -s жонка старасты
• a bojx vi a parnes *glxv.* пуза як староста (абаранка зьясі, пакуль надаўкол абыдзеш)
• a parnes meg zajn grojs, vi a hon, zict er fort ojbn on *glxv.* староста можа быць ростам зь пеўня, але сядзіць ён вышэй за ўсіх
• ir foter iz kools parnes, un zi iz kools tinthorn *glxv.* яе бацька – кагальны староста, а яна – кагальная атрамантніца
• vos far a kehile, aza parnes *glxv.* які кагал, такі й староста (варт Пац палаца, а палац Паца; па каню і хамут; які конь, такая й пуга; па Хомку шапка; яковы мы самі, таковы й нашы сані)
parnose *f*, -s [*s.* (-ות)פרנסה →mefarnes] заробак, прыбытак, даход; занятак, прафэсія, фах [*sin.* ojshalteniš, bašpajzung, fardinst; bašeftikung, fax]; **parnósediker** даходны, прыбытковы; **parnose-becímcem** *f* [*s.* בצימצום] невялікі/мізэрны заробак; недастатковае забесьпячэньне [*sin.* ništ-genugndike fardinstn, knape farzorgung]; **parnose-bešéfe** *f* [*s.* בשפע] сталы/добры заробак; дастатковае забесьпячэньне [*sin.* gute fardinstn, genugndike un regulere haxnoses, prosperitet]; **parnose-bzúje** *f*, *pl.* parnoses-bzúes [*s.* (-ות) בזויה] нягодны занятак, нявартая прафэсія [*sin.* umverdike bašeftikung, ništ-bekovediker fax]; **parnóse-geber** *m*, -s, (-n *f*, -s) чалавек, які прыносіць заробак
• krign*/hobn* parnose здабываць/атрымліваць заробак
• linke parnose левы даход
• ojsšlogn* zix dos bisl parnose бедна/мізэрна жыць, мадзець
• zajn* gešlogn in parnose ані грошна за душой
• a šejne froj (a šejn vajb) iz a halbe parnose *glxv.* прыгожая жонка – палова даходу
• ale miese parnoses hobn šejne mazoles *šprxv.* усе брыдкія заробкі маюць шчасьлівы лёс (німа благой працы)
• az got hot parnose gegebn, zol men andere ojx lozn lebn *šprxv.* калі бог даў заробак, дык і людзі дадуць спакойна жыць
• bist a man – to gib parnose (nemstu dix unter cu zajn a man – gib že parnose!) *glxv.* калі ты мужык – давай заробак (калі адзеў хамут, дык цягні; калі ўлез у дугу, не кажы: не магу)
• gezunt kumt far parnose *glxv.* здароўе дае заробак (абы грошы, усё будзе)
• got zol cušikn gezunt un parnose бадай бог паслаў здароўе і заробак
• me zol zix kenen ojskojfn fun dem tojt, voltn di oreme lajt šejn parnose gehat *glxv.* калі б была магчымасьць адкупіцца ад сьмерці, беднякі мелі б выдатны прыбытак
• parnose iz a refue cu alc krenk *glxv.* заробак – лекі ад усіх хвароб
• vos tut nit a jid culib parnose? *glxv.* чаго толькі жыд ня зробіць дзеля заробку?
• zol dir got gebn glik mit parnose mit lange jor! дай табе божа шчасьця з добрым заробкам на доўгія гады!
párobik/parebók *m*, -bkes [*ukr.* паробок, *p.* parobek] парабак
paróm *m*, -en [*ukr./r.* паром] паром; **paromščik** *m*, -es, **paróm-firer** *m* паромшчык
parondik=požondik=poradik *m*, -dkes парадак, лад, чын; **paróndkeven** парадкаваць
pároste *f*, -s [*r.*?] парус, ветразь
parše *f*, -s [*s.* (-יות)פרשה →poreš, smixes-haparšes; batim] 1. адзін зь 54 разьдзелаў Торы, якія прызначаны для штотыднёвага чытаньня [*sin.* sedre]; абзац з Торы; адзін з кавалачкаў пэргаміну з цытатамі з Торы, якія кладуць у філяктэрыі; 2. інтарэс, справа [*sin.* gešeft, injen, majse]
paršive(r) [*p.* parszywy, *ukr.* паршивий] пархаты, паршывы, шалудзівы; **paršivec** *m*, -vces парх, пархуцік, паршывец, пархуцька, шалудзівец
• a paršive krenk паршывая хвароба
• af a paršive ferd šteln zix ale flign *šprxv.* на паршывага каня садзяцца ўсе мухі (на пахілае дрэва і козы скачуць; над пешым арлом і варона з калом)
• ejn paršive šof maxt kalje di gance otare/čerede/stade (maxt ale šof paršive) *šprxv.* адна дрысьліва/паршыва гавечка ўсё стада запаганіць (адна задрыстана гавечка ўсё стада абасрала)
paršójn *m*, -en [*d.* Person] пэрсона, асоба; прасьцяк; **paršójnlexer** пэрсанальны, асабісты; **paršojnte** *f*, -s *pejor.* асоба, краля
• a fifiker/durxgetribener paršojn спрытнюга, прайдзісьвет, прайдоха, праныра
• kuk nor ón dem paršojn! ты толькі паглядзі на яго!
paršúk *m*, -es [*v.* паршук] паршывец, агіднік, нягоднік, басалай, паганец
partáčeven [*p.* partaczyć] партачыць; **partáč** *m*, -n/-es, (-ke *f*, -s) партач; **partáčišer, partačner** халтурны, спартачаны
• farendikn arbet af šlextn, partačnem ojfn спартачыць работу (кепска зрабіць)
parte *f*, -s [*r.*] парта
partéj *f*, -en [*d.* Partei] партыя; **partéjišer** партыйны; **partéjiškajt** *f* партыйнасьць; **partéj-mitglid** *m*, -er член/сябра партыі; **partéjman** *m*, **partejer** *m*, -s, (-n *f*, -s) партыец; **partéj-cuzamenfor** *m* партзьезд; **pártkemerl** *n*, -ex парт'ячэйка
partemán *m* [*fr.* appartement] прыбіральня

particip *m*, -n [*d.* Partizip] *gram.* дзеепрыметнік; **particípišer** дзеепрыметны
• a participiše konstrukcje дзеепрыметны зварот
partíkl *m*, -en [*d.* Partikel] *gram.* часьцінка
partje *f*, -s [*p.* partia] 1. партыя (тавару); 2. партыя (у гульні, у музычным творы)
parúk *m*, -n, **parík** *m*, -es [*d.* Perücke, *p.* peruka] парык; **parúk-maxer** *m*, -s цырульнік
• klajbn* far der vajb af a paruk зьбіраць для жонкі на парык (аб чалавеку, які адпусьціў доўгія валасы)
parusín(e)/parosine *f* [*r.* парусина] парусіна; **parusínener** парусінавы
parx *m*, -es [*p.* parch] 1. парша (у чалавека), кароста; 2. **parxúč** *m*, -es *vulg.* парх(уцік), вашывец, вашапруд; **parx(ev)ate(r)** пархаты, паршывы, шалудзівы; брудны; **parx(ev)ate(r) vern*** паршывець; **parxl** *n*, -ex пархі, шолудзі
• a menč, a menč un in mitn a parx *glv.* чалавек, чалавек, але пархаты
• "ale parxes in bod arajn!" – "ix bin ober nit kejn parx" "усе пархуцікі ў лазьню!" – "але ж я не пархуцік"
• der ferter jor – der ferter kind, /fir kinder, vi di monarxes, /un zej ale zajnen parxes *flksl.* чацьверты год – чацьвертае дзіцё, чацьвёра дзяцей, як манархі, але ўсе яны пархатыя
• vos mer me kract dem parx, vos mer vakst er *šprxv.* чым больш дзярэш кароету, тым больш яе нарастае
• vu a parx, iz er majner a korev (majn korev) дзе які пархаты, дык абавязкова мой родзіч (к нашаму берагу нішто добрае не прыплыве: альбо пясок, альбо гразі кусок, або гаўно, або трэска)
pas *m*, -n/-es, *dim.* **pasik** *m*, -es, **pásikl** *n*, -ex, **páskele** *n*, -x [*p* pas, *ukr.* пас] пас(ак), паска, пояс, матузок, паласа; **páseven** паласаваць; **pásnvajz** *adv.* пáсамі, (парэзаны) на пáсы; **paskevate(r)** у паскі, паласаты, перапялясы; **pásikšpil** *f* газардоўная гульня; **pásikšpiler** *m*, -s жулік, круцель, рвач
• a pasikl erd палоска зямлі
• a teler mit a bloj pasikl талерка з блакітным пасікам
• ajncien* dem pasik зацягнуць пасак
• er rajst/trent fun im pases (rajsn*/šindn* a pas; rajsn* pasnvajz) *glxv.* ён дзярэ яго на пáсы (тры скуры злупіў)
pas *m*, *pl.* peser, **paspórt** *m*, -n [*d.* Pass] пашпарт
pas *m*, -n [*d.* Pass] цясьніна, перавал
pas [*r.* пас, *eng.* pass] *kort.* пас; **pasn=pašn** пасаваць; *argo* перапрадаваць, махляваць, круціць; **paser** *m*, -s, (-ke *f*, -s) укрывальнік крадзенага
• on mir, pas безь мяне, я – пас
pas besale [*s.* פּת בסלו] "ёсьць хлеб у тваім кашы"; ён мае ўсё неабходнае (жонку) і німа патрэбы шукаць ішшага; **pas-ákum** *n* [*s.* עכו"ם] некашэрны хлеб (які ядуць гоі) [*sin.* gojiš brojt, ništ-košer brojt]
pasen=pašen [*ukr./r.* пасти, *p.* paść] пасьці; **paseviske** *f* паша, паста, папас
páse(ne)n=pastn (cu, far) [*d.* passen] 1. пасаваць, гадзіцца, падыходзіць, быць да твару, дапасоўвацца; 2. прымераць, прымяраць
• er zogt, er vet mix nemen un maxn a xasene, /er zogt, er vet mix nemen, majn tajerer šac, /er't onton a cilender, vi šejn s'vet im pasenen, /un di madamenju vet krign di plac! *flksl.* ён кажа, што возьме і жэніцца на мне, маё дарагое багацьце, ён надзявае цылíндар, як ён яму пасуе, а мая мадам хай лопне!
pasex=patex *m*, -n [*s.* פּתח →nekude] дыякрытычны знак (ַ), які ў гэбрэйскім правапісе азначае галосную літару "a" (ставіцца ўнізе зычнай літары, пасьля якой павінна гучаць гэтая галосная); у ідышы ставіцца пад літарай "a" [אַ] (**pásex-alef** *m/f* [*s.* אלף]) і пад падвойным "i" для азначэньня дыфтонга "aj" [ײַ]
• s'zoln kumen af dir di fir pasexn! *kll.* каб цябе трасучка/трасца трасла! (агаласоўка ў слове "трасца" [*ivr.* בכדחת] – чатыры пасэхі)
• vegn dem - pasex šin – ša! *hum.* аб гэтым – ані гуку!
pasilke *f*, -s [*r.* посылка] пасылка
pási(n)ke/páseke *f*, -s [*ukr.* пасіка, *r.* пасека, *p.* pasieka] пасека, пчальнік; **pásičnik** *m*, -es [*r.* пасечник] бортнік, пчаляр
pasírn (mit) (pasírt) [*d.* passieren] адбы(ва)цца, здарыцца, здарацца, стацца; **pasirung** *f*, -en здарэньне, прыгода
• s'hot epes pasirt штосьці здарылася
• gebn* jenem a pasircetl/pasiršajn выгнаць, справадзіць (кагосьці)
pasív *m*, -n [*d.* passiv] *gram.* залежны стан; **pasiver** пасыўны, нядзейны; **pasivkajt** *f* пасыўнасьць, нядзейнасьць
pasje *f*, -s [*p.* pasja] гарачае/моцнае пачуцьцё, захапленьне, пасія
• arajnkumen* in der pasje моцна захапіцца
paske *f*, -s [*ukr.* паска, *p.* paska] *kul.* паска, пасха
• a paske fun tvore *kul.* паска з тварагом
páske(ne)n [*s.* פּסק(נע)ן →psak, pojsek] выступаць у ролі рабіна ў вырашэньні спрэчных пытаньняў; вынесьці, вынасіць прысуд; вырашыць, вырашаць, пастанавіць, пастанаўляць [*sin.* arojstrogn an urtejl; onnemen a bašlus, antšejdn]; **páskenung** *f*, -en вырашэньне, пастанова
• a šames/šikse ba a gutn rov ken ojx paskenen šajles (a šikse ba a rov kejn ojx a šajle paskenen) *glxv.* служка/дзеўка-нежыдоўка ў добрага рабіна можа таксама даць параду
paskudne(r) [*p.* paskudny, *ukr.* паскудний] паскудны; **paskudnják** *m*, -es, (-ačke *f*, -s), **paskudnik** *m*, -es, (-nice *f*, -s) паскуднік, плюгавец, агіднік, нягоднік, паганец, выradак, нелюдзь; **paskudstve** *f*, -s поскудзь, паскудзтва; **paskudjen/paskudžen** паскудзіць
• a paskudne(r) veter паскуднае надвор'е
• a štik paskudstve поскудзь, паскудзтва
• bagejn* zix paskudne абыходзіцца паскудна, рабіць паскудзтвы
• s'iz paskudne! паскудзтва нейкае!
• di velt iz šejn, nor paskudnjakes maxn zi mies сьвет прыгожы, толькі паскуднікі робяць яго брыдкім
pasles *n* [*s.* פּסלות →psojles, poseler, kol-hapaslones] 1. дыскваліфікацыя, недахоп, загана, вáда, сапсутасьць, сапсаваць; 2. пячэснасьць, няшчырасьць, грэх [*sin.* diskvalifikacje, feler; umerlexkajt, fardorbnkajt]; **paslones** *n* [*s.* פּסלנות] нячэснасьць, няшчырасьць, несправядлівасьць, крыўда, шкода [*sin.* umerlexkajt, avle, avejre]; **pásle(ne)n** [*s.* פּסל(נע)ן] *rit.* (за)бракаваць; дыскваліфікаваць
• paslen a kac адсякаць кошцы хвост, каб выгнаць з хаты злых духаў
• paslen a kind/krankn лячыць дзіця/хворага ад сурокаў, націраючы мачой
• dales maxt pasles *šprxv.* беднасьць чыніць грэх (голад і лгар і злодзей; голад і лжэ і крадзе)
• ejdes maxt pasles *šprxv.* хто часта сьведчыць, таму веры німа

pas-léxem *m* [*s.* פת־לחם →laxme, lexem] кавалак, луста хлеба
pasme *f*, -s [*ukr./r.* пасмо, *p.* pasmo] пасма, маток
pásnice *f*, -s [*p.* pas, *ukr.* пас?] стан, талія
paste *f*, -s [*it.* pasta] паста
pásterke=pústerke *f*, -s [*p.* pasterka] жаночы каптур, капар, капялюшык
pástern(j)ak *m* [*p.* pasternak, *mhd.* pasternac] *bot.* пастарнак
pastex *m*, -er, (-ke/-(er)n *f*, -s), **pastúx** *m*, -er, (-tuške *f*, -s) [*p.* pastuch, *ukr./r.*] пастух; **pástexl** *n*, -ex, **pástex-jingl** *n*, -ex падпасак
• az es zajnen ništo kejn šof, culib vos darfstu a pastex? калі німа авечак, навошта табе патрэбны пастух?
• got zol vern cuhern dem pastex, voltn ale šof ojsgepejgert *glxv.* калі б бог слухаў пастухоў, усе б авечкі перадохлі
• voser pastex, azelxe šof *glxv.* які пастух, такія й авечкі (які поп, такі й прыход)
pastilke *f*, -s [*p.* pastylka] пастылка, таблетка
pastke *f*, -s [*v./ukr.*] пастка; **pástkediker** здрадніцкі, ашуканскі, падступны
• arejn in a pastke трапіць у пастку
• farnarn in a pastke завабіць у пастку
pastlin (cu, far) [*d.* passen] 1. пасаваць, гадзіцца, падыходзіць, быць да твару, дапасоўвацца; 2. прымераць, прымяраць; **pásiker** дапасаваны, адпаведны; **pásndiker** адпаведны, слушны, дарэчны, які падыходзіць/адпавядае; **pásikajt** *f* прыгоднасьць, прыдатнасьць, слушнасьць, дарэчнасьць, адпаведнасьць
• dos klejd past ir гэтая сукенка пасуе ёй
• es past nit aher гэта сюды не дапасоўваецца
• pasn zix vi a fidl mit a smiček, vi a cig mit a berdl падыходзіць як смычок да скрыпкі, як казе барада
• s'past cu zogn слушна
• unter a pasikn ojsrejd адпаведна падставе, з нагоды
• zi past im far a toxter яна можа быць ягонай дачкой
• es past vi majne cores, vi a hojker cu der vant, vi an oks mit a ferd in vegele, vi a ku/xazer a/der zotl, vi a xazer ojringlex (a štrajml), vi a kojmenkerer a cilinder гэта пасуе як мае беды, як гарбун да сьцяны, як бык з канём у адной вупражы, як карове/сьвіньні сядло/падсядзёлак/паўшоры, як сьвіньні завушніцы/шапка, як камінару цыліндар (як сьляпому акуляры/люстэрка; як лысаму грэбень; як (да) сьвіньні кульбачка/пацеркі/набэдрыкі)
pastrojke *f*, -s [*r.* постройка] пабудова, будынак, збудаваньне
pastronik *m*, -nkes [*p.* postronek] пастронак, вяроўка
pasude *f* [*r.* посуда] посуд
pasuxe=posexe *f* [*p.* posucha] сухмень, суша
Pasxe *f* [*p.* Pascha] Пасха (хрысьціянскае сьвята), Вялікдзень; **pasxaler** пасхальны, велікодны
paš *m*, -n, *dim.* **pešl** *n*, -ex [*d.* Pasch] гульня ў карты; *kort.* талія, калода
pašen=pasen [*p.* pasza, paść, popasać, *ukr.* паша] 1. пасьці, пасьвіць, карміць (скаціну); 2. *n*, **paše** *f*, -s, **páše-feld** *n*, -er, **páše-lonke** *f*, -s паша, папас, выпас
• arojstrajbn* af paše выганяць на пашу
• gepašet iz geforn *glxv.* пакарміў (каня) – паехаў (кармі мукою, дык пойдзе рукою; каб конь добра вёз, давай яму авёс)
pašen [*sl.*] пых(к)аць
• der ojvn pašet печ пыхае
pašk(e)víl *m*, -n [*d.* Pasquill, *it.*] пасквіль
pašól (von)! [*r.* пошел вон!] *int.* пайшоў вон! прэч адсюль!
pašren *m*, *pl.* pašronim, (-te *f*, -s) [*s.* פשרן(-ים) →pešer, pšore, balpašren] чалавек, які ідзе на кампраміс; пасярэднік, хадайнік; **pašrones** *n* [*s.* ות-], **pašres** *n* [*s.* פשרות] пасярэдніцтва, хадайніцтва, замірэньне; **pašrónišer** пасярэдніцкі, хадайніцкі, прымірыцельны
paštes *f/n* [*s.* פשטות →(a)pšite, pošeter, pšat, kepšute, pšute-, farpošetern] прастата, яснасьць, дакладнасьць, непасрэднасьць; адгадка, разгадка [*sin.* prostkajt, klorkajt, ejnfaxkajt, bašejdnkajt]; **paštn** *m*, *pl.* paštonim [*s.* פשטן(-ים)] чалавек, які робіць простыя і зразумелыя тлумачэньні, які паводзіць сябе проста; простая/непасрэдная асоба
• in paštes genumen зразуметы літаральна
patákeven=potákeven патакаць, падтакваць, патураць
patalók *m*, -n [*r.* потолок] столь
páteke/pátoke/pátike *f* [*p.* patoka] патака
patelnje *f*, -s [*p.* patelnia] патэльня
pátern [*s.* פטרן →poter, arojs-, avek-, ce|patern, piter, ptire, nifter] 1. (зь)нішчыць, па-, са|псаваць; 2. прамантачыць, прамантачваць, прамарнатравіць, прамарнатраўліваць, прасьвіст(в)аць, пралатраваць, пралайдачыць; 3. па-, с|кончыць (зь нечым), справіцца; 4. *vulg.* забі(ва)ць, (за)губіць, ліквідаваць [*sin.* kalje maxn, iberfirn; farsvendn, šlext banicn: opfartikn, endikn; avekhargenen, likvidirn]; 5. *n* перавод, звод, раскіданьне (грошай), марнатраўства; **páterniš** *n* вызваленьне, збаўленьне
• dos umziste patern gelt пусты звод грошай
• patern an ejsek заваліць справу
• patern (di) cajt церці (марна траціць) час
• patern di teg mit di jorn прамантачыць дні і гады
• patern dos gezunt, di štimung псаваць здароўе, настрой
• paterniš iz gelt vert *glxv.* збаўленьне каштуе грошай
• patert mix op! адчапецеся ад мяне!
pateš *m* [*s.* פטיש] "молат"; азначэньне для вялікага настаўніка-талмудыста [*sin.* hamer]
patex=pasex *m*, -n [*s.* פתח →nekude] дыякрытычны знак (_), які ў гэбрэйскім правапісе азначае галосную літару "а" (ставіцца ўнізе зычнай літары, пасьля якой павінна гучаць гэтая галосная); у ідышы ставіцца пад літарай "а" [אַ] (**pásex-alef** *m/f* [*s.* אלף־]) і пад падвойным "і" для азначэньня дыфтонга "aj" [ײַ]
patíl(n)ice=potíl(n)ice *f*, -s [*p.* potylica] патыліца; **patíličnik** *m*, -es каршэнь, удар у патыліцу/карак/каршэнь
• hobn* di ojgn in patilice мець вочы на патыліцы
• kracn zix in patilice чухаць патыліцу
patke *f*, -s [*p.* patka] хлясьцік
patlažán/patležán *m*, -es, **baklažán** *m*, -en [*p.* baklažan, *ukr.* баклажан] баклажан
patl(j)e *f*, -s [*ukr.* патла] патла, кудры; **patlate(r)** патлаты
patojpen=potojpen zix уклад(в)ацца, зьмяшчацца
• dos patojpet zix im nit in kop гэта не ўкладаецца ў ягоны розум (у ягоную галаву)
patope *f*, -s [*p.* potop, *ukr./r.* потоп] твань, багна, дрыгва
patos *m* [*d.* Pathos] патас, напышлівасьць; **patétišer** патэтычны
patrón *m*, -es/-en [*d.* Patron] *iron.* студэнт-талмудыст; няздара, бясталентны/няздатны/няздольны чалавек; **patronske(r)** тыповы для студэнта-талмудыста; *iron.* бясталентны, няздатны, няздольны
páuze=pojze *f*, -s [*d.* Pause] паўза
pave *f*, -s [*ukr./r.*] пава
• az di pave kukt af ire federn – kvelt zi, az zi kukt af ire fis –

vejnt zi *sprw.* калі пава бачыць сваё прыгожае пер'е – яна радуецца, калі бачыць свае ногі – плача

pavetinje=pojtine=povetine *f* [*sl.*] павуціна, павуцінне

pavolje, pavóli(nke)=povólinke [*p.* powoli] паволі, памалу, паціху; **pavólinke(r), pavolje(r), pavolne(r)** павольны

- gej ix pavolje, zogt men. ix krix; gej ix gix, zogt men, ix cerajs di šix *flksl.* іду я паволі, кажуць, я паўзу; іду я хутка, кажуць, я падзяру чаравікі (скарга сіроткі на мачыху) (недавернешся – б'юць, праверпешся – б'юць; і не даступіў – б'юць, і пераступіў – б'юць)
- gej pavolje, vestu gixer kumen *glxv.* ідзі паволі – хутка прыйдзеш (памаленьку далей зойдзеш; паволі едзеш – далёка станеш; ідзі ціха – абмінеш ліха)

pavjak *m* [*p.*] турма ў Варшаве

- x'bin geven a klejner jat, /hob ix ništ gevolt folgn dem tatn; /hajnt zic ix in pavjak /un kuk arojs durx di kratn *flksl.* я быў малым хлопцам, я не хацеў слухаць бацьку; цяпер я сяджу ў турме й пазіраю праз краты

paxed *m, pl.* pxodim [*s.* (פַּחַד-יִם) →balpaxdn] страх, боязь, жах [*sin.* šrek, mojre]; **paxdn** *m, pl.* paxdonim, (-te *f*, -s) [*s.* (פַּחְדָן-יִם)] баязьлівец, палахлівец, трус, тхор; **páxediker, paxdónesdiker, paxdónišer, paxedlíve(r)** баязьлівы, боязкі, боязны, пужлівы, палахлівы, страхатлівы, тхарлівы; **paxdones** *n* [*s.* וּת-], **paxdóniškajt** *f* баязьлівасьць, боязкасьць, боязнасьць, палахлівасьць, пужлівасьць, страхатлівасьць, тхарлівасьць

- a nešome fun paxdn заечая душа
- a paxdn ejner! (vistiker paxdn!) нікчэмны баязьлівец!
- er iz nit kejn paxdn ён не палахлівец
- far paxed iz af im dos hemd vajs gevorn ад жаху на ім кашуля зьбялела
- hobn* paxed (far) пужацца, палохацца, лякацца
- iberike/umziste pxodim дарэмныя страхі
- kedej cu varfn* a paxed af emecn каб нагнаць страхуна (напалохаць кагосьці)
- onvarfn* a paxed наводзіць жах
- fun raxmones un fun paxdones ken men zix nit ojshejln *glxv.* ад жаласьлівасьці і баязьлівасьці ня вылячышся

paxír/paxer=poxír=puxír *m*, -n [*sl.*] пухір

páxólik *m, pl.* -lkes/páxlikes [*p.* pacholek] маладзец, зух, юнак; паслугач, чаляднік, служка

paxože(r) (af) [*r.* похожий] падобны

paxt=pakt *f*, -n [*d.* Pacht] арэнда, пасэсія; **paxter=pakter** *m*, -s, (-ke *f*, -s), **páxthalter** *m* аранда(та)р, пасэсар

paxve *f*, -s [*p.* pacha] паха

- unter der paxve падпаха, пад пахамі

paze [*ukr.* повз] *prep.* паўз, поўз, вобач, ускрай, на краі, (на)ўсьцяж, у(з)доўж, паўзбоч

- gejn* paze dem breg tajx ісьці ўсьцяж берага (паўз бераг) ракі
- gejn* paze vent *fig.* туліцца/хінуцца да сьцяны

pazít *m*, **pazítl** *n.* -ex [?] банкнота, папяровыя грошы

pazren *m, pl.* pazronim, (-te *f*, -s) [*s.* (פַּזְרָן-יִם)] 1. чалавек, які шмат раздае; шчодры чалавек; 2. растратнік, марнатравец, марнатраўнік, марнатраўца, стратнік, мантач, неашчадны чалавек [*sin.* geber, frajgibiker; cetrencler, faršvender]; **pazrones** *n* [*s.* וּת-] 1. шчодрасьць; 2. раскідонства, мантацтва, марнатраўства, неашчаднасьць [*sin.* brejtkajt, frajgibikajt; farsvenderaj]; **pazrónišer** 1. шчодры; 2. растратны, марнатраўны, неашчадны

pázuxe/pázexe *f*, -s [*sl.*] пазуха

- bahaltn* in der pazuxe схаваць за пазухай
- hobn* a bejze pazuxe (af) сьлязу ў сэрцы трымаць (закалец мець)

pazvoljen [*r.* позволить] дазволіць, дазваляць

pebl *n* [?] натоўп, народ, плебс, галда

pec *pl.* →poc=boc *m, dim.* **pecl** *n*, -ex пэпіс, хуй, піцюн, чэлес; *fig.* балван, стаўбень; бязглузды, дурны хлопец

pécene *f*, -s [*p.* pecyna] 1. тлусты кавалак; 2. камлыга гразі; 3. няхлюйка, нязграйка, плюндра

pecke *f*, -s [*ukr.* пуц(ь)ка, *p.* pecię, pecior, pyciurka] піська, піцюн, посік

pečá(j)/pece *m/f* [?] *kul.* студзіна, халадзец, квашаніна

pečát *m*, -n [*mhd.* petschat, *r./ukr.* печать] пячатка

pečatek=počatek/počatik *m*, -tkes пачатак, пачын (у гандлі)

péčere *f*, -s [*ukr.* печера] пяколак, пачура, пячурка, груб-(к)а, пліта

- er meg ba im hejcn di pečere(s) (er darf ba im pečeres hejcn) ён можа пры ім толькі ў грубцы паліць (вады падаваць (богаў чысьціць) ня варты)

pečerice=pičerice *f*, -s [*ukr.* печерица, *p.* pieczarka] *bot.* шампіньён, пячурыца

pečlen, a pečl ton* [*d.* peitschen] (па)ляп(в)аць; **peč** *pl.* →pač *m, dim.* **pečl** *n*, -ex, **péčele** *n*, -x аплявуха, лупцоўка, наганяй

- a pečl ton* emecn iber der plejce паляпаць кагосьці па плячы

pedlen [*d.* Pedell, *lat.* pedellus?] займацца разноскаю тавараў па хатах; **pedler** *m*, -s, (-ke *f*, -s) разносчык, нашэньнік

pe-el-pé [*s.* פֶּהאֶלפֶּה →balpe] "рот у рот"; *adv.* сам-на-сам [*sin.* mojl cu mojl, perzenlex, unter fir ojgn]; **pe-éxed** [*s.* אֶחָד] "адным ротам"; *adv.* адзінагалосна, з агульнай згоды [*sin.* ejnstimik]; **pe-kódeš** *m* [*s.* קָדוֹשׁ] *xsd.* "сьвяты рот"; кіраўнік, старэйшы

pefer *m*, -s, (-n/-ke *f*, -s) [*it.* buffare →pofn] соня, сануля

pege *m/f, pl.* pgoim [*s.* (פֶּגַע-יִם)] 1. бяда, гора, пакута, ліха, злыдні, няшчасьце, навала, насланьнё; 2. прыдзірка, прычэпка, прычапка; зануда, назола, дакучнік; надакучлівы, назойлівы чалавек [*sin.* umglik, onšikeniš, plog; cučepeniš, nudnik]; **pegen** назаляць, дакучаць, надакучваць, дадзяваць; **pege-rá** *m, pl.* pgoim-róim [*s.* (רַע-יִם)] злыдні, д'ябал, чорт, нячысьцік, злы лёс [*sin.* ništ-guter, tajvl, bejz bagegeniš, cučepeniš]

- a pege fun fárn davnen непапраўны дакучнік

p(e)gime *f*, -s [*s.* (פְּגִימָה-וֹת) →pgam, pojgem, pogem-kejle] дэфэкт, загана, хіба, недахоп, шчарбіна, зазубрына

- er zuxt a pgime af der zeg *fig.* ён шукае зазубрыны на піле

p(e)gire *f*, -s [*s.* (פְּגִירָה-וֹת) →pejger] 1. сьмерць (толькі аб жывёлах) [*sin.* tojt, dos štarbn]; 2. труп, падла, здыхліна, здыхляціна, мярцьвец, мярцьвяк; **p(e)girišer** стары, слабы, кволы, нядужы, напаўздохлы, здыхлячы [*sin.* alter, švaxer, halbtojter]

- a por pgiriše ferd (Prc.) пара здыхлячых коней
- iz dos a pegire! якая здыхляціна!

pej=p *m/f*, -en [*s.* (פֵּא-עַיִן)] 1. "пэй", літара гэбрэйскага альфабэту; 2. лічба 80

peje *f*, -s(n), *dim.* **péjkele** *n*, -x [*s.* (פֵּאָה-וֹת-תַּיִן)] 1. пэйса; 2. шнурок на збожжавым полі, які пакідалі нязжатым для бедных

- a šejne bord un pejes, ober vejnik dejes *sprxv.* прыгожая барада і пэйсы, але мала навагі (барада па пояс, а розуму ні на волас; галава пасівела, а розуму не набрала)

• Donje zi hit zix ir stade, /gekrajzlte lemer, un traxt /epes fun pejelex šejne, /gekrajzlt un švarc vi di naxt (H. R.) Доня пільнуе свой статак, кучаравых авечак, і марыць аб прыгожых пэйсачках, завітых і чорных як ноч
• es iz groj di peje un nariš di deje *glxv.* волас сівее, а галава шалее (сівізна ў галаву, бес у рабро; сівізна ў бараду, а чорт у галаву; у старой печы паляць чэрці)
• es ligt im/mir/emecn in der linker peje (nit)! яму/мне/камусьці німа да гэтага справы! (у левай пэйсе/пятцы ня чэшацца! ані ў знак! ні ў пяце ні ў галаве)
• ix hob dix in der linker peje ты ў мяне ў левай пэйсе (я з табою не лічуся)

pej(e)m/pejim *m*, -s [*d.* Bohme] дробная манэта, тры грошы
• farmogn etlexe pejim зарабіць грашы
• er hot di vert fun a pejm un farrajst di kop vi a bejm (bojm) *glxv.* ён ня варты гроша, але задзірае галаву вышэй за дрэва (пусты колас угору пнецца; колас, што зярнят ня мае, угару лоб задзірае)
• zajn pejim gejt ojx in draj grošn! ягоныя тры грошы ідуць таксама за тры грошы!

pejger *m*, *pl.* p(e)gorim [*s.* (פגר-)ים →pgire. avek-, ce-, unter-, oj-pejgern] труп, падла, здыхл(яц)іна (толькі аб жывёлах); *pejor.* мярцьвяк, падла; *fig.* кепскі тавар [*sin.* tojter kerper, mes], **péjgern** па-, з|дохнуць, па-, з|дыхаць, здырдзіцца, скалець, апруцянець (толькі аб жывёлах) [*sin.* štarbn]
• pejgern far a grošn падохнуць за грош
• pejgern vi a hunt падохнуць як сабака
• er hot a gut ojg, er zol a kuk ton in tajx, voltn gepejgert ale fiš ён мае добрае вока, варта яму толькі глянуць у раку, каб уся рыба перадохла
• oder der porec vet pejgern, oder der hunt vet pejgern *glxv.* альбо пан здохне, альбо сабака здохне
• pejgern zolstu! *kll.* каб ты здох!
• šlep im nit – er iz nit, xolile, kejn pejger (šlep nit, s'iz nit kejn pejger) не цягні яго – ён яшчэ, барані божа, не мярцьвяк

pe(j)le *f*, *pl.* ploim [*s.* (פלא-)ים →pile-ploim, (majse-)nifle, nisim-venifloes, nispoel, mafle-lajses, hafle-vofele, plie, hispajles] дзіва, цуд, дзіўная рэч [*sin.* vunder, vunderlexe zax]; **pejle!** *int.* ага! вось як!; **pé(j)lediker** дзіўны, цудоўны; **pe(j)leveháfle** [*s.* והפלא] непраўдападобны, неймаверны, дзівосны

pejre *f*, -s [*s.* (פרות) פרי →pri-, prie-] плод, фрукт [*sin.* fruxt]
• a šejne pejre *iron.* фрукт (аб чалавеку)
• fun fartriknte bejmer kumen kejn pejres nit arojs *šprxv.* з сухіх дрэваў садавіны не зьбярэш

pejred(-ha)l(e)vóves *m* [*s.* רוד־הלבבות(י)פ] "разлучэньне сэрцаў"; парванасьць, разарванасьць, разьдзел [*sin.* cešejdung fun di hercer, cerisnkajt, cetejlung]

pejrek *m*, *pl.* prokim [*s.* (פרק-)ים →pirke-oves] разьдзел з Танаху альбо Талмуду
• zogn pejrek вывучаць "pirke-oves"

pejreš *m*, *pl.* pe(j)rušim [*s.* (פירוש-)ים →mefareš, mefojrešer, befejreš] (вы)тлумачэньне, выцлумачваньне, камэнтар [*sin.* komentar, ojstajčung]; **pejreš-hamíles** *m* [*s.* המילות־] тлумачэньне, значэньне словаў [*sin.* verter fartajčung, batajt fun di verter]
• maxn a (gancn) pejreš (fun epes) лічыць за галоўнае, рабіць вялікую справу
• af a nar iz kejn pejreš nit cu maxn *šprxv.* дурню нічога не паглумачыш (з дурнем справы ня зробіш)

Pejsex *m* [*s.* פסח →psoxim, xag-hamaces, kemex-pejsex] "пераход"; Пэйсах, Пасха (гэбрэйскае рэлігійнае сьвята Праснакоў, якое пачынаецца 15-га ніcана і цягнецца восем дзён); **péjsex(d)iker** пэйсаховы, пасхальны; **Pejsex-šéjne** [*s.* שני־] 14-га іяра па гэбрэйскім календары (дзень, які Тора прызначае для ахвяраваньня да Пэйсаху, таму што на само сьвята ахвяраваць нельга); **pejsexovke** *f* пэйсахоўка (гарэлка)
• ix vinč ajx a lixtikn Pejsex! жадаю вам сьветлага/шчасьлівага Пэйсаху!
• az es zol nit kumen der liber Pejsex, volt men fun der blote nit arojs *glxv.* калі б не прыходзіў жаданы Пэйсах, то й з гразі б ня вылез
• az me hot af Purim jesurim, hot/iz men af Pejsex xojšex *glxv.* хто ня мае, чым сустрэць Пурым, таму пра Пэйсах німа чаго й казаць
• erev Pejsex koxt men in bod ojx lokšn *glxv.* напярэдадні Пэйсаху гатуюць локшыны таксама і ў лазьні
• on knejdlex iz nit kejn Pejsex, on kreplex iz nit kejn Purim *šprxv.* бяз клёцак німа Пэйсаху, без калдуноў німа Пурыму
• Pejsex-lebn iz a šverer, ober a rejner jomtev *glxv.* Пэйсах – цяжкае, але й чыстае сьвята
• Pejsex iz itlexer jid a mejlex iber a vajberšn toxes *glxv. vulg.* на Пэйсах кожны жыд – цар над жончынай сракай
• s'iz nox vajt cu Pejsex яшчэ далёка да Пэйсаху
• un az es kumt der liber Pejsex /vider af dos naj, /nito kejn maces, nito kejn vajn, /aj, aj, aj... *flksl.* і калі настае любы Пэйсах зноў, німа мацы, німа віна, ай, ай, ай...
• vos iz dem indik far a xilek/nafkemine: ci me kojlet im af Purim cu der sude, ci af Pejsex cum sejder? *glxv.* якая індыку розьніца: ці зарэжуць яго на Пурым да бяседы, ці на Пэйсах да малітвы? (каму банкет, а курцы сьмерць)

pek *pl.* →pak *m*, *dim.* **pekl** *n*, -ex, **pékele** *n*, -ex пакунак, пак, клунак; **peker** *m*, -s пакавальнік
• a pekl ліха, гора
• jeder menč hot zajn pekl у кожнага свая ноша (сваё гора)
• lign* in pekl знаходзіцца ў цяжкім становішчы
• nemen* dem zekl/hekl mitn pekl браць мяшэчак/торбачку зь ліхам
• nem's pekl! лахі пад пахі і валі адгэтуль!
• zi hot ir pekl яна знаходзіцца ў цяжкім стане
• a jid on a pekl iz gornit faran *glxv.* німа жыда бязь ліха
• a mazl-broxe (zol dir der ejberšter cušikn) in dajn pekele cores! *kll.* пашлі, божа, блаславеньне на ўсё тваё ліха!
• jeder menč hot zix zajn pekl *glxv.* кожны чалавек мае свой клунак (ліха)
• ven ale zoln brengen zejere peklex cores in mark arajn farkojfn, volt jederer gix zajn pekl curik gexapt *glxv.* калі б усе прынесьлі свае пакункі зь ліхам на кірмаш прадаваць, кожны б хутка схапіў свой назад

pekarnje *f*, -s [*p.* piekarnia] пякарня

peklen [*d.* packeln] займацца кантрабандай; **pekler** *m*, **péklfirer** *m*, **pékl-maxer** *m*, -s кантрабандыст, шмуклер
• far a peklmaxer iz a finctere naxt a lixtike velt *šprxv.* для шмуклера цёмная ноч – белы сьвет

pekln [*d.* pökeln] саліць (мяса/рыбу); **péklflejš** *n* [*d.* Pökel-

fleisch] саланіна, салёная ялавічына
pel *m* [*p.* pela] шоўк-сырэц, грэжа; **pélener** грэжавы
pelc *m*, -n [*d.* Pelz] шкура; футра; кажух; **pélcvarg** *n* пушніна, хутравіна
• ojskern/iberkern dem pelc (af der linker zajt) вывернуць шкуру/кажух на левы бок, пераліцаваць (*fig.* зьмяніць перакананьні)
• rajsn*/bajsn* zix dem pelc шкура сьвярбіць (ня браць да сэрца)
• a fremder pelc varemt nit *glxv.* чужое футра ня грэе (чужое дабро ня грэе, чужы кажух нікога не нагрэе, чужым багацьцем сыты ня будзеш; лепш свае вошы, як чужыя грошы)
• a pelc un a svite, un kadoxes dos drite *glxv.* футра і сьвітка, і трасца ў дадатак (аб беднай нявесьце)
• az me iz alejn untergešlogn mit hunt, badarf men kejn pelc nit *šprxv.* хто падбіты сабачым футрам, таму й кажуха ня трэба
• der šverster pelc iz vinter gring, vi a federl, dos lajxste/gringste hemdl iz zumer šver, vi a štejn *šprxv.* найцяжэйшае футра ўзімку лёгкае, нібыта пёрка, найлягчэйшая сарочка ўлетку цяжкая, нібыта камень
• fun a hunt ken men afile kejn rextn/gutn pelc nit maxn *glxv.* з сабакі нават сапраўднай/добрай шкуры ня зробіш
• majn pelc iz nit ba mir! мая шкура не на мне! (я ня ўпэўнены ў гэтым)
pele=pejle *f*, *pl.* ploim [*s.* פלא(-ים)] дзіва, цуд, дзіўная рэч; **pé(j)lediker** дзіўны, цудоўны; **pe(j)le-veháfle** [*s.* והפלא] непраўдападобны, неймаверны, дзівосны
pélene *f*, -s [*ukr./r.* пелена] пеляна́, падол, пала, прыпол
pelerine *f*, -s [*p.* peleryna] палярына
péle(ve)n=póle(ve)n=pjel(j)en [*p.* pleć, pielenie] палоць
peliške *f*, -s [*p.* pieluszka] пялюшка
pempik *m*, -es, **pémpikl** *n*, -ex [*p.* pępeć; pępek] 1. пуза; 2. таўстун, пампыш, пампушка, бутуз, карапуз, пузан, пузач, пышка (аб дзіцяці)
pen *f*, -es/-en, **pene** *f*, -s/-n [*altfr.* pene] пяро; **pénkracer** *m* канцылярскі пацук; **pénmeserl** *n*, -ex сьцізорык
• haltn* a pen in der hant трымаць пяро ў руцэ
• nemen* zix far der pen (a pen in der hant) брацца за пяро, браць пяро ў руку
• a menč mit a pen (in hant) чалавек зь пяром (у руцэ), пісьменны чалавек
• a pen iz gut – az me ken *glxv.* пяро добрае, калі ўмееш ім карыстацца
• di cung iz a ligner, di pen iz a ligner *šprxv.* язык хлусіць, і пяро хлусіць
• di pen šist erger fun a fajl *glxv.* пяро страляе мацней за стралу
• er iz gešlogn af der pen *glxv.* яму цяжка пісаць
• vos s'iz ongešribn mit der pen, zol ojshakn ver es ken *glxv.* што напісана пяром, таго ня вырубіш сякерай
pen *m* [*p.* pena, *r.* пеня] пеня
penál *m*, -n [*d.* Pennal] пэнал
pencak/pencek *m* [*p.* pęcak] 1. панцак; 2. таўстун, тоўсьцік, гладун, апуцак, барыла
pendz(j)e [*p.* pędzić, *v.* пэндзіць]
• maxn pendzje (fun) высьмейваць, кпіць
pendzl=pindzl *m*, -en, *dim.* **pendzelik** *m*, -es [*d.* Pinsel, *p.* pędzel] пэндзаль; **pendzlen** маляваць
penec *m*, -er/-n [*it.* pane, *šp.* pan] сухар, скіб(к)а, луста, скрыль
pénemer *pl.* →ponem *m/n*, *dim.* **péneml** *n*, -ex [*s.* פנים(-ער)] твар
p(e)njók=pnjak *m*, -es, **penje** *f*, -s [*r.* пенёк] пень, пянёк, цялеш
penke *f* [*p.* pienka, *r.* пенька] пянька
• a štrik fun penke вяроўка зь пянькі
penken [*p.* pękać] трэскацца, лопацца, покацца
penten [*p.* pętać] жабра(ка)ваць, старцаваць; **pentak** *m*, -es [*p.* pętak] жабрак, старац
penten [*p.* pętać] путаць, стрыножыць (каня); **pente** *f*, -s пута; **péntendiker** спутаны, стрыножаны
• penten emecn ba di hent un ba di fis спутаць кагосьці па рукох і нагох
pentjux=petex *m*, -es [*ukr./r.* пентюх, *p.* pętak?] пяньцюх, дурань, доўбня, шалапут, бязглузды, бязмозглы, дурнагаловы, тлумны чалавек
penxer *m*, -s [*p.* pęcherz] *anat.* пузыр, пухір
peomim *pl.* [*s.* פעמים] разы [*sin.* mol]
• ix hob es dir šojn kame peomim gezogt я табе ўжо гэта некалькі разоў казаў
pepke *f*, -s [*v.* пэпка?] дурань, дурніца, ёлуп(ень), недарэка
péplnice *f*, -s [*r.* пепельница] попельніца
per [*lat.* per] *prep.* праз (што), з дапамогаю (чаго); **per lúftpost** авіяпоштай; **per náxname** [*d.* Nachname] накладной платай
per *m* [*s.* פאר] 1. прыгожасьць, краса, хараство, годнасьць, каштоўнасьць; 2. шаноўны, паважны, паважаны чалавек, лідэр [*sin.* šejnkajt, koved; bekovediker menč]; **per-hadór** *m* [*s.* הדור] выдатная/выбітная асоба, гонар нацыі
perdule *m*, -s [?] шарлатан, ашуканец, канавал
pere- [*sl.*] *pref.* пера-
pere *m*, *pl.* proim [*s.* פרא(-ים)] дзікун, дзікі чалавек, барбар [*sin.* vilder menč, barbar]; **pere(-)ódem** *m*, -s [*s.* אדם(-ס)] дзікун, дурань, ідыёт, дурыла, ёлуп, балдык, таўкач
• vern* a pere-odem (зь)дзічэць
pere *f* [?] пенка (на варэньні)
perebéndeven [*ukr.* перебендювати] капрызіць, наравіцца, карожыцца
perebór *m* [*r.* перебор] перабор
perednje *f*, -s [*r.* передняя] пярэдні пакой
perekupke *f* [*r.* перекупка] пярэкуп; **perekupščik** *m*, -es перакупнік
perem(j)eščen [*r.* переместить, *p.* przemieścić] перамясьціць, перамяшчаць
peren=puren [*r.* переть, *ukr.* перти] перці; прыставаць, лезьці
pérene/périne *f*, -s [*ukr./r.* перина] пярына
• unterlejgn a perine падкласьці пярыну
peres *m* [*d.* Borax?] *хем.* буракс
peresíp *m*, -n [*ukr.* пересип] пярэспа
peres(j)adke *f*, -s [*p.* przesiadka] перасадка
perfékt *m* [*d.* perfekt] *gram.* пэрфэкт (мінулы закончаны час)
periste(r) [*ukr.* перістий] пярэсты, перапялясы
perkl *m* [*r.* перкаль, *p.* perkal, *fr.* percale] *tekst.* паркаль, пэркаль
perl *m/n* [*d.* Perle, *p.* perła] пэрла, жэмчуг; бісэр; **pérldiker** пэрлавы, жамчужны, бісэрны; **perlen** пераліваццa (рознымі колерамі), зіх(а)цець; сыпаць пэрламі (у размове);

pérlmut(e)r *m/n* [*d.* Perlmutter] пэрлямутр; **pérl(a)mutener** пэрлямутравы
• di gance velt zorgt: di zorgt, vet di perl zajnen ir cu šiter, un di andere zorgt, vos di perl-gric iz ir cu šiter (vos der kuliš iz ir biter) *glxv.* увесь сьвет у турботах: гэту турбуе, што пэрлы ў яе дужа дробныя, а тую, што панцак у яе дужа вадкі (што кулеш у яе горкі) (аднаму аж з горла прэ, а другі з голаду мрэ; аднаму льецца, а другому нават ня капае)
• es šit(n) zix perl fun mojl ba im (s'perlt fun zajn/ir mojl; perl šitn zix fun zajn mojl) *glxv.* у яго сыплюцца пэрлы з роту (красамоўна гаворыць)
• perl afn haldz – štejner afn harcn *glxv.* пэрлы на шыю – камень на сэрца (што багацее, то выдрэе; тады чалавек гардзее, калі багацее)
pérlgrojpn *pl.* [*d.* Perlgraupe], **pérlgric** *f* ячныя крупы, панцак, груца
• a zup fun perlgrojpn ячны крупнік, панцак
• far ejnem iz di perlgrojpn šiter, un far dem andern iz di cimes cu zis *šprxv.* каму крупнік вадкі, а каму й цымус засалодкі
pérlhun *f, pl.* -hiner [*d.* Perlhuhn] *zool.* цацарка
perón *m*, -en [*p.* peron] пэрон
perpendíkl *n*, -ex [*d.* Perpendikel] маятнік
perušim/pejrušim *pl.* →pejreš *m* [*s.* פירוש(-ים) →mefareš] (вы)тлумачэньне, вытлумачваньне, камэнтар
persik *m*, -es, **pér(i)ške** *f*, -s [*d.* Pfirsich] пэрсік
Persje *f* [*d.* Persien] Пэрсія; **perser** *m*, (-n *f*, -s) пэрс; **pérsišer** пэрсыдзкі
perve(r) [*r.* первый] першы; **pérveske** *f*, -s [*p.* pierwiastka] пярвосьцінка, пярвустка, пяршачка, цёлка, карова першым целем
perzón *f*, -en [*d.* Person] пэрсона, асоба; **perzénlexer, personeler** пэрсанальны, асабісты; **perzénlexkajt** *f*, -n асоба; **perzóniker** *gram.* асабовы
• a hojxe perzon паважная асоба
• in perzon у асобе
• perzoniker pronom *gram.* асабовы займеньнік
peser *pl.* →pas *m* пашпарт
pesex-xaróte *m* [*s.* פתח־חרטה] магчымасьць раскайвацца
pesi *m, pl.* psoim [*s.* פתי (פתאים)] дурань [*sin.* nar]; **pesijáamen** *m* [*s.* יאמין] наіўны дурань; чалавек, які верыць кожнай рэчы
pésl-ponem *n* [*s.* פסל־פנים] *argo* прыгожы тварык
pest *f* [*d.* Pest] чума, пошасьць, звод, паморак, эпідэмія; **péstiker** чумны
péste(ve)n=pjesten/pješčen [*ukr.* пестувати] 1. песьціць; 2. *n* песты
pestl *m*, -en [*r.* пестик] *bot.* песьцік
pešer *m, pl.* pšorim [*s.* פשר(-ים)] міравое пагадненьне, кампраміс, умова, дамова, умовіны, угавор, угода, дагавор [*sin.* kompromis, opmax, ojsglajx]
peške *f*, -s [*r.* пешка] пешка
pet *pl.* [*p.* pet?] камісійныя грошы
petelke=pitelke *f*, -s [*p.* pętelka, *r.* петелька] гафтка, пяцелька
peterzl *m* [*d.* Petersilie] *bot.* пятрушка
petex=pentjux *m*, -es пяньцюх, дурань, доўбня, шалапут, бязглузды, бязмозглы, дурнагаловы, тлумны чалавек
• "het ix" iz a petex, "hob ix" iz a grund *šprxv.* "каб я меў" – дурань, "я маю" – падстава
peticje/petite *f*, -s [*p.* petycja] пэтыцыя, запыт, замоўка; *argo* хадайніцтва (у суд); **petic(jon)írn** (petic(jon)írt) запыт(в)аць, пада(ва)ць пэтыцыю
petív *m*, -n [?] паветраная камэра
petlje *f*, -s [*r.* петля] пятля
• mit der petlje afn haldz зь пятлёй на шыі
Petlure Сымон Пятлюра (1879–1926) (лідэр украінскага нацыяналістычнага руху ў час грамадзянскай вайны 1918–1920 гг.)
• zolst vern a vanc in Petlures matrac un pejgern fun zajn xazeršer blut! *kll.* каб ты быў клапом у пятлюравым матрацы і падох ад яго сьвінячай крыві!
pétreške/pétriške *f* [*p.* pietruszka] *bot.* пятрушка
• alc iz hefker petriške усё хаця б што
• hefker petriške *hum.* рабіць і казаць абы-што, усё магчы
• s'hot a petreške di vert (iz nit vert kejn petriške) пятрушкі ня варты (выскваркі, зломанага шэлега, тры грошы ня варты)
• s'iz af a petriške! *fig.* дужа мала!
pevne(r) [*p.* pewny, *ukr.* певний] пэўны
• nemen* af pevne дурыць, ашукваць, падманваць, абакульваць
pex *m/n* [*d.* Pech] смала, пэх; **péxiker** смаляны, смольны; **péxgibiker** смалісты
• a boxer mit pexšvarce hor хлопец са смалянымі валасамі
• cien* zix vi (fun) pex як са смалы цягнуць
• s'cit zix vi fun pex цягнецца як ад смалы
• šitn*/gisn* pex un švebl (af emecn) сыпаць гром і маланкі (смалу і серу) (клясьці кагосьці)
• švarcer vi pex (pex švarc) чорны як смала
• trinken zolstu pex! *kll.* каб ты смалы напіўся!
pexke(r) [*p.* puchki] пухкі
• beser švarc un pexke, ejder vajs un ljepke *glxv.* лепш чорнае, але пухкае, чымся белае, але ліпкае (печыва, хала)
pexnen=puxnjen пухнуць
• pexnen afn pisk пухнуць з голаду
pexote/pjexote *f* [*r.* пехота] пяхота; **p(j)exotne(r)** пяхотны
peze *f*, -s [*d.* Peso] пэса (манэта)
pgam *m, pl.* pgomim [*s.* פגם(-ים) →pogem-kejle, pojgem] памылка, недахоп, загана, ва́да, дэфэкт; пляма, сорам [*sin.* feler, xisorn; flek, šand]; **p(e)gime** *f*, -s [*s.* פגימה(-ות)] зазубрына, драпіна, шчарбіна (адмыслова аб рэзьніцкім нажы); загана, хіба, недахоп, дэфэкт [*sin.* kric, ščerb; morališer flek, feler, psul]; **pgíme(s)diker** дэфэктыўны, заганны
• an arbet (a mindstn) on a pgam бездакорная праца
• kejner vet kejn pgam nit gefint ніхто ня знойдзе ніякай заганы (камар носа не падаткне)
pgire=pegire *f*, -s [*s.* פגירה(-ות) →ojspejgern] 1. сьмерць (жывёлы) [*sin.* tojt, dos štarbn]; 2. труп, падла, здыхл(яц)іна; **p(e)gorim** *pl.* →pejger *m* [*s.* פגר(-ים)] труп, падла, здыхл(яц)іна; *pejor.* мярцьвяк; **p(e)girišer** стары, слабы, кволы, нядужы, напаўздохлы, здыхлячы (аб жывёле)
• ojszen* vi a pgire (vos di hint hobn nit avekgešlept) выглядаць як падла (якую сабакі не сьцягнулі)
• a pgire in dir! *kll.* падла цябе забі!
• a tojte pgire zol dix ojsdišen! *kll.* каб цябе падла задушыла!

פ

• a viste pgire af dir! *klil.* каб ты выцягнуўся! а каб ты здох, каб ты!
• an emese pgire сапраўдная здыхліна (худы як жэбра /сьмерць)
• bin ix mir ojx a ku, un pejger mir ojx in der pgire *glxv.* я таксама карова, і падыхаю як падла (нехта выхваляецца, ня маючы ніякага дачыненьня да справы)
• der "vjo" helft ništ, ven di ferd zajnežn pgires *glxv.* "но" не дапамагае, калі коні – здыхляціна

pgoim *pl.* →pege *m/f* [*s.* (ים-)פגע] 1. бяда, гора, пакута, ліха, злыдні, няшчасьце, навала, насланьнё; 2. прыдзірка, прычэпка, прычапка, зануда; надакучлівы, назойлівы чалавек

phiken [*p.* pchać?] піхаць
pi [*s.* פי →piv-hakodeš] рот [*sin.* mojl]
pi pa po
• pi pa po – mer iz šojn nito! пі-па-по – больш ужо німа! (кажуць дзецям, калі ўсё зьедзена)
piak *m* [*p.* pijak] піяка, п'яніца
• er darf ba jenem di štivl pucn (er meg ba mir di štivl pucn!) ён мусіць камусьці/мне боты чысьціць (ботаў чысьціць ня варты)

• hajnt trogt di eltste majne kreln, /az ir gelibtn zol zi ojx gefeln, /un di jingere – zi puct zix šojn, /špacirn vet zi šojn nit gejn alejn... (J. P.) зараз старэйшая носіць мае каралі, каб свайму любаму яна таксама спадабалася, а меншая – яна ўжо прыбіраецца, гуляць яна ўжо адна ня пойдзе...

puč *m*, -n [*p.* pucz] путч

pud *m*, -n [*p.* pud] пуд (16,3 кг); **pudove(r), púdiker** пудовы; **pudnik** *m*, -es пудовая гіра

• du zolst hobn cores afn pud! *kll.* а бадай табе пуд ліха будзе!

pudle *f*, -s, **púdele** *n*, -x, **ped(e)l** *n*, -ex, **pidle** *n*, -x [*p.* pudło] скрынка, пушачка, кардонка

puder *m*, -s, **pudre** *f*, -s [*d.* Puder] пудра, парашок; **púdern** пудрыць; **púderartiker** парашкападобны; **púdrenice** *f*, -s, **púdre-šaxtl** *n*, -ex, **púder-gecajg** *n* пудраніца; **púder-kišele** *n*, -ex пухоўка для пудры

pudjen/pudžen [*v.*] пужаць, палохаць, лякаць, страшыць; пудзіць; **púdele=púgale** *n*, -x пудзіла

• firn pudele fun emecn (maxn a pudele fun emecn) зьдзекваваца з кагосьці

pudl *m*, -n [*p.* pudel] пудзель

puf *m*, -n [*p.* puf] 1. пуфік, ясік; 2. клубы дыму; 3. зухвальства, выхваляньне, самахвальства, фанабэрыя

púfloks=búfl(aks)/búfl(-)oks *m*, -n [*mhd.* büffelochse] буйвал

púgale=púdele *n*, -x [*ukr.* опудало, *r.* пугало] пудзіла

puhač=pohač *m*, -es [*ukr.*] *zool.* пугач

puk [*s.* פּוֹק/פּ֫יק] выхадзі, выходзь [*sin.* gej arojs]

puken [*p.* pukać] пукаць; покаць; **puk** *m*, -es 1. шчыліна, расколіна; 2. *bot.* пучок, пупышка; **púkeniš** *n* пуканьне; трэсканьне, лопаньне

púkldiker, pukle(r) [*ukr.* пукатий] пукаты; **pukl** *m*, -en гуз, шышак

• a pukldike brust пукатыя грудзі

pułap=polap *m*, -es [*p.* pułap] столя

pule *f*, -s [*s.* (-וֹת)פְּעוּלָה →pojeln] 1. мэтода навучаньня ў хедары; 2. посьпех, карысьць, узьдзеяньне; вынік, рэзультат, эфэкт (ад навучаньня) [*sin.* virkung, uftu]; **púlediker** пасьпяховы, карысны, дзейсны, эфэктоўны

• di gute pule добрае ўзьдзеяньне

• di refue hot gehat af im a pule лекі паўзьдзейнічалі на яго

• du vest hobn derfun a pule табе гэта пойдзе на карысьць

• hobn* a pule (af) мець узьдзеяньне, паўзьдзейнічаць

• ton* a pule дасягнуць посьпеху, рабіць поступ, прагрэсаваць

• vos iz di pule (fun)? якая карысьць? навошта? дзеля якой мэты?

pulemjót *m*, -n [*r.* пулемёт] кулямёт

pul(j)en [*p.* pylić, *ukr.* пилити] пыліць; **pul** *m* пыл

• pulen an ojer пускаць пыл у вуха (дурыць/тлуміць галаву; туману/чмуту ў вочы пускаць)

pulk=polk *m*, -n [*p.* pułk] *milit.* полк

pulke=polke *f*, -s пол(ь)ць, полец, палаток, сьцягно, сьцягняк, ляжка, ножка (курыная/гусіная/качыная)

pulke=polke *f*, -s паліца; палок

pulkovnik=polkovnik *m*, -es [*p.* pułkownik] палкоўнік

pulver *m*, -s [*d.* Pulver] порах, парашок; **púlverdiker** парахавы

• gebn* emecn pulver cu šmekn даць камусьці пораху панюхаць

• bistu a zelner, šmek źe pulver *glxv.* калі ты жаўнер, дык нюхай порах (колісь грыб, браце, мусіш у боршч машэраваці; колісь рак, то лезь у сак)

• er vet kejn pulver nit derfindn ён пораху ня выдумае

• nit vert zajn* kejn/a šiške pulver выскваркі (зломанага шэлега, тры грошы) ня варты

• ver es ken kejn pulver nit šmekn, der zol nit gejn in der milxome arajn *šprxv.* хто пораху ня можа нюхаць, таму й на вайну нельга ісьці

• vos hot nox kejn pulver nit gešmekt яшчэ пораху ня нюхаў

pulxne(r) [*p.* pulchny] пульхны, надзьмуты, пухлы, пухкі

pump=plump *m*, -n [*d.* Pumpe] помпа; **pumpn** памповаць

• fun di pumpes зь вярхоў, з эліты

punč/puns *m* [*p.* ponez, *d.* Punsch] пунш

pundl *n*, -en [*d.* Bündel] вязка, зьвязак, вясло

punje *f*, -s [*p.* punia] пуня

punkt [*d.* Punkt] 1. *m*, -n, *dim.* **pintl** *n*, -ex кропка, пункт; 2. *adv.* якраз, акурат, дакладна; **punktueler** пунктуальны, акуратны; **punktuacje** *f gram.* пунктуацыя; **punktuelkajt** *f* пунктуальнасьць

• es iz punkt cvej дакладна два

• punkt af mizrex дакладна на ўсход

• punkt der tate (s'zol feln a hor) цалкам як бацька (але ж увесь чысты бацька і брызачкі яго падабраў)

• punkt farkért! якраз наадварот!

• himl iz šojn xmarne švarc, /punkt azoj vi do ba mir in harc *flksl.* на небе ўжо чорныя хмары, так як у маім сэрцы

pupčik *m*, -es [*p.* pupa, *ukr.* пуп'янок] хлапчаня, пупсік, карантыш, курдупель

pupik/pupek *m*, *pl.* púp(i)kes, **pupke** *f*, -s [*ukr./r.* пупок, *p.* pępek] пуп(ок)

• er klert, ci a floj hot a pupik ён высьвятляе, ці мае блыха пуп

• er hot nit kejn grošn bam pupik (ba der nešome) *glxv.* ён ня мае гроша за душой

• lign* šojn mitn pupik aruf ляжаць ужо пупам угору (памерці)

• s'trejslt zix ba im der pupik у яго нават пупок дрыжыць (ад страху)

pup(k)e=popke *f*, -s [*d.* Puppe] лялька

Pure [*s.* פּוּרָה] *kbl.* Пур(а); імя анёла, які быў пастаўлены над забыцьцём, князь забыцьця

púrečke=pórečke *f*, -s парэчка

purer [*d.* pur] чысты

Purim *m* [*s.* פּוּרִים →Axašvejreš, Ester, Homen, Mortxe] Пурым(ы) (гэбрэйскае рэлігійнае сьвята, якое сьвяткуецца 14-га адара); **púrimdiker** які тычыцца Пурыму; **púrim-gelt** *n* міласьціна, якую раздаюць на Пурым; **púrim-gret** *n kul.* печыва, якое гатуецца на Пурым; **púrim-flodn** *m kul.* пірог з начынкай; **púrim-kojleč** *m*, -n сьвяточны куліч/пірог; **Purim-kótn** *m* [*s.* קָטָן →vejoder] "малы Пурым"; прысьвятак, паўсьвята (спраўляюць 14-га адара І гэбрэйскага высакоснага году); **Purim-megile** *f* [*s.* מְגִילָה] *tmx.* Кніга Эстэр; **purim-róv** *m* [*s.* רַב] "рабін на Пурым"; камэдыянт, які на Пурым робіць імправізаваныя пародыі на рабінаў; **Púrim-špil** *f*, -n п'еса народнага жыдоўскага тэатру (ставіцца на Пурым); камэдыя, жарт [→Mexires-Jojsef, Akejdes-Jicxok]; **púrim-špiler** *m*, -s, **púrim-špilnik** *m*, -es актор у такой п'есе; актор-імправізатар; *pejor.* штукар, блазен, блазьнюк, камэдыянт

• a ganc jor šiker, um Purim nixter *glxv.* увесь год п'яны, на Пурым цьвярозы (усё наадварот)

• az es kumt Purim, fargest men on ale jesurim *glxv.* прыйдзе Пурым, забудуцца ўсе пакуты

• nit štendik iz Purim, nit tomed iz jomtev (nit ale teg iz Purim) *šprxv.* не заўжды Пурым, не заўжды сьвята (не заўсяды, як на Дзяды; мінуўся той час, што зь мёдам варыў квас; ня ўсё ж мігдалямі карміць)

• ništ ale Purim treft zix a nes *glxv.* ня кожны Пурым здараецца цуд

• Purim dankt men nit *glxv.* за пурымскія падарункі ня дзякуюць (падарункі – гэта сьвяты абавязак)

• Oj, di rebeen, /oj, iz dos a rebeen, /vi zi gejt azoj brejt /fun der šul ahejm. /Xasidimlex, talmidimlex /tancn, zingen kegn ir, /oj, iz dos a rebeen, /aza jor af mir! /Grojs un klejn, /zol zi zen, /vi a purim-kojleč šejn, /oj, iz dos a rebeen, aza jor af mir! *flksl.* Ой, рабініха, ой, гэта рабініха, як паважна яна ідзе з сынагогі дахаты. Хасыдзікі, вучні танчаць, сьпяваюць перад ёй, ой, гэта рабініха, каб я так жыў! Хай малы й вялікі бачаць, якая яна прыгожая, як куліч на Пурым, ой, гэта рабініха, каб я так жыў!

• Purim iz nit kejn jomtev, kadoxes/fiber iz nit kejn krenk (un "kuš in toxes" iz nit kejn klole) (Purim nje svjata, trasca nje xvaroba) *glxv.* Пурым ня сьвята, трасца не хвароба (а "пацалуй у сраку" – не праклён)

• Purim-kotn darf/meg men zix onšikern, ober Jom-Kiper-kotn darf men ništ fastn *glxv.* на малы Пурым трэба напіцца, але ня трэба пасьціцца ў апошні дзень кожнага месяца

• Purim nox der sude iz afile kejn hunt nit hungerik *glxv.* пасьля пурымскай бяседы нават усе сабакі сытыя

• Purim zajnen ale šikurim nixter *glxv.* на Пурым усе п'яніцы цьвярозыя

• s'treft ejnmol in Purim здараецца такое на Пурым (з анэкдоту)

• ven ale tog zol zajn der nes fun Purim, vos voltn jidn gehat cu zorgn mit zejere texter? *glxv.* калі б штодня здараўся пурымскі цуд, які б клопат жыды мелі са сваімі дочкамі?

• vos far a Purim – aza Pejsex *glxv.* які Пурым – такі й Пэйсах (якое Благавешчаньне, такі Вялікдзень будзе)

purken=por(k)en (ba, in, mit) пароць, поркаць, вожкаць

pur(k)en=peren перці; прыставаць, лезьці

puronjes *n*, -n [*s.* (ן-)פּוּרעניוּת] нягода, няшчасьце, бяда, ліха, злыдні, катастрофа [*sin.* umglik, plog, katastrofe]

purpl/purpur *m* [*d.* Purpur] пурпура, багра; **púrpelner** пурпурны, пурпуровы

pus-butélke *n* паўбутэлькі, палова бутэлькі

pusderke *f*, -s [*p.* puzdro?] жаўнерскі казанок (казанец, кацялок)

pust/pušt *m*, -n, **pušte** *f*, -s [*ukr.* повсть?] валёнак

puster [*p.* pusty] пусты, парожні; **pústeven** пуставаць; **pust** *m*, -n пустата, пустое месца, поласьць, паражніна; **pustine** *f*, -s, **pustke** *f*, -s, **pustbodn** *m*, **pústeniš** *f*, -n пустка, пустэльня, пустэча; **pustkajt** *f* пустэча; **pustepáseven** 1. лынды /бібікі/тыльлы забіваць; 2. *n* гультайства, лодарнічаньне, пустадомства, бязьдзейнасьць; **pustepasne(r)**, **pust-un-páser** бязьдзейны, марны, гультайскі; **pustepasnik** *m*, -es, (-nice *f*, -s) пустапас, пустадомак, гультай, лайдак, абібок; **pust-un-pás** *adv.* пустапасам; **pústplac** *m*, *pl.* -plecer пустое месца, пусты пляц, пустка

• a puste zax/kejle *fig.* пусты чалавек, ёлуп(ень)

• arbetn af pust працаваць на пустату (марная праца)

• puste rejd/verter/majses/diburim лухта, бязглузьдзіца, недарэчнасьць, пусты гук, пустаслоўе, біліндрасы

• puste xalojmes пустыя мары

• umgejn*/arumgejn* pust-un-pas гультайнічаць, лайдачыць

pústerke=pásterke *f*, -s жаночы каптур, капар

pustilnik=postilnik *m*, -es гарбар

pustják/puščák *m*, -es [*r.* пустяк] дробязь, глупства, дрэнь

pušče *f*, -s [*p.* puszcza] 1. пушча; 2. пустка, пустэльня, пустэча

puše *f*, -s [*p.* puszka] пушка, скрынка; **púše(-)gelt** *n* міласьціна; **(puše-)gábete** *f*, -s [*s.* (ס-)גבאיטע] дзяячка рэлігійнай лабрачыннай грамады (зьбірае грошы для бедных людзей); *fig.* крыкуха

• a blexene puše бляшаная пушка, копаўка

• az me hot nit kejn esreg, darf men kejn puše nit hobn *šprxv.* як німа цытрона, дык і скрыпка не патрэбная

• ven me lebt fun der puše, iz lejdik di kiške *šprxv.* хто жыве зь міласьціны, у таго пустая кішка (хто з рук гледзіць, на том пропасьць седзіць)

puten [*ukr.* путати, *p.* pętać] путаць

puter *f* [*d.* Butter] масла; **púternice** *f*, -s масьляніца; **púterbrojt** *n*, -n хлеб з маслам; **púter-bulke** *f*, -s булка з маслам, здобная булка; **púterfas** *m/f*, *pl.* -feser (масла)бойка; **púter-gebeks** *n*, **púter-kuxn** *m*, -s/-xenes *kul.* здоба; **pútermilx** *f* сыроватка; **púterštejndl** *n*, -es гладкі камень

• az dos brojt falt mit der puter arop (af dem ponem), iz a simen, az di kale iz hungerik *glxv.* калі хлеб падае маслам уніз, значыць нявеста галодная

• az got git brojt, gibn menčn puter *šprxv.* калі бог дае хлеба, дадаюць людзі масла (дасьць бог хлеба – дасьць і да хлеба)

• az me šlogt, šlogt men ojs puter *šprxv.* калі доўга біць, дык масла ўзаб'ецца

• dos brojt falt im štendik mit der puter arop (es gejt im/ir mit der puter arop) *glxv.* хлеб падае ў яго/яе заўжды маслам уніз (шанцуе як тапельцу)

• tu dir arajn šmalc in dem top un puter afn kop *glxv.* кладзі тлушч у гаршчок, а масла на галаву (кажуць упартаму чалавеку, каб ад яго пазбавіцца)

• ven es felt puter cu brojt, iz es nox nit kejn nojt *šprxv.* калі німа масла да хлеба, гэта яшчэ ня беднасьць (бяда – не бяда, калі е хлеб да лебяда; еж хлеб з вадою, абы не зь бядою)

• ver es hot puter afn kop, tor af der zun nit gejn *šprxv.* у каго масла на галаве, таму нельга ісьці на сонца

púthon *m* [*d.* Puter] індык

pux *m* [*sl.*] пух; **púxener**, **puxove(r)** пуховы; **púxele** *n*, -x пушынка; **púxiker** пушысты, пухкі; **púxblum** *f*, -en *bot* коцік (на вярбе)

puxír=poxír=paxír *m*, -n [*ukr.* пухир, *p.* pęcherz] пухір

puxn(j)en=pexnen [*p.* puchnąć] пухнуць; **puxle(r)**, **puxke(r)** пухлы, пухкі, мяккі

• puxke bulkele пышка (булка)

Púxovič мястэчка Пухавічы (Беларусь)

• hern vi in Puxovič di megile слухаць як у Пухавічах сьвятое пісаньне (між вушэй (паўз вуха) прапускаць)

puz *m*, **puze** *f*, -s [*ukr./r.* пузо] пуза; **puzak** *m*, -es пузач, таўстун, тоўсьцік, гладун, апуцак, чараваль (дзіцёнак); **puzate(r)** пузаты

puzír *m*, -n/-es [*ukr.* пузир, *r.* пузырь] булдыр, пухір, пузыр

púžele=pídžele *f*, -s [*ukr.* пужалко] пугаўё

pxas *m* [*s.* פּחת] страта, шкода, убытак

pxe! [*ukr.* пхекати] *int.* ціш-ціш-ціш!

pxie=bxie *f*, -s [*s.* (ות-)כּביה] плач, лямант

pxine=bxine *f*, -s [*s.* (ות-)כּחינה →maf'xn] 1. праверка, абсьледаваньне, абыходжаньне; 2. катэгорыя, кляса, градус, ступень; пункт гледжаньня

pxi(n)ken [*ukr.* пхикати] хныкаць, кныхаць, ныць, румзаць, стэпкаць, зыкаць, ныдзьвіць; **pxikendiker** які ные /ныдзьвіць
• a pxikendike štim ныючы голас
pxir=bxir *m*, -im [*s.* (בחיר-)ים] (най)лепшы, абраны, выбраны
pxire=bxire *f* [*s.* בחירה] абраныне, адбор, (волыны) выбар (паміж добрым і благім)
pxises-hakóved *n* [*s.* פחיתות־הכבוד] гнібеныне, зьнявага, зьневажаныне, абраза, ганьба [*sm.* demidenkung, balejdikung]
• a grojs pxises-hakoved (far) няварты годнасьці
• hadu* far a pxises-hakoved лічыць няварпым сваёй годнасьці

pxodim *pl.* →paxed *m* [*s.* (פחד-)ים] страх, боязь, жах; **pxódimdiker** перапуджаны, спужаны, перапалоханы, спалоханы; страш(эн)ны, жудасны, злавесны [*sm.* der-srokener; šreklexer]
pxo(j)r=bxor *m*, *pl.* pxojrim/bxojrim [*s.* (בכור-)ים] першынец, першародны сын, пяршок, пярвок; **pxojre=bxojre** *f*, -s [*s.* (בכורה-)ות] права старэйшага сына, першака, першародзтва; першае месца паводле важнасьці; **pxorte=bxorte** *f*, -s [*s.* (בכורטע-)ס] старэйшая дачка, першыня
pxuse-érex *pl.* [*s.* פחותי־ערך] людзі нізкага званыня



R=rejš *m/f*, -n [*s.* (ן-)ריש] 1. "рэйш", літара гэбрэйскага альфабэту; 2. лічба 200

r'=reb [*s.* ר'=רב →rabojsaj, rav, rov] рэб (зварот да жыда)

r'=er/ir ён/вы

• r'hot (er/ir hot) ён мае, вы маеце

rabarber *m* [*d.* Rhabarber] *bot.* рэвень, (рэ)ба́рбара, рабарбара

rabát *m*, -n [*d.* Rabatt] скідка; **rabátkrom** *f*, -en крама ўцэненых тавараў

• farkojfn epes mit rabat прадаваць штосьці са скідкай

Rabe Bar-Bar-Xóne [*s.* רבה/רבא בר־בר־חנה] Раба Бар-Бар-Хуна, юдэйскі вучоны III-га ст. (у Талмудзе гаворыцца, што ён распавядаў цудоўныя гісторыі)

rabejnu/rabenju *m* [*s.* רב(י)נו] (тытул) наш рэбэ, наш настаўнік; **rabeim** *pl.* →rebe/rebi *m*, -s [*s.* (ס-/רבי(-ים)] настаўнік рэлігійнай школы; *xsd.* рэбэ, рабін, духоўны [illegible], праведнік; п(р)авадыр, вож; **rabéišer=rébišer** [illegible] рабінаў(скі); **rabáj** *m*, -s неартадаксальны рабін у [illegible]; **rabiner** *m*, -s, (-te/-še *f*, -s), **rabin** *m* [*d.* Rabbi-[illegible] rabin] неартадаксальны рабін; **rabineráj** *n* неартадаксальны рабінат; **rabínerišer** рабінаў(скі); **rabinát** *m*, -n рабінат; **rabojsaj!** [*s.* רבותי], **rabojsim!** [*s.* רבותים] спадары! шаноўнае спадарства! паважаныя сябры! (зварот да гэбрэяў) [*sin.* majne hern, xoševe frajnd]; **rabones** *n* [*s.* רבנות] рабінат, пасада рабіна; **rabónišer** рабінаў(скі); **rabonim** *pl.* →rov *m*, *dim.* **revl** *n*, -ex [*s.* (רב(-ים)] рабін; **rabónen-kadeš** *m* [*s.* רבנן־קדיש] кадыш, які чытаюць за здароўе настаўнікаў (пасьля лекцыі або казані)

• opzogn rabonen-kadeš (nox) (m'ken šojn nox dem zogn a rabonen-kadeš) згубіць усялякую надзею

• zicn* af rabones займаць пасаду рабіна

rabejnu Tam [*s.* רב(י)נו תם] папулярнае наймя Якуба Тама (адзін зь вялікіх ашкенаскіх вучоных-камэнтатараў Талмуду; Францыя, 1100–1171); **rabejnu Tams tfiln** *pl.* [*s.* תפילין] малітвы, якія чытаюцца адпаведна парадку, які рэкамэндаваў Якуб Там (у адрозьненьне ад звычайнага парадку паводле Рашы [*s.* רשי]; артадаксальныя гэбрэі моляцца адпаведна Таму)

rabe(r), rabetine(r) [*ukr.* рябий, *r.* рябой, *v.* рабаціньне] рабы

rábeven/raboven, rabírn (rabírt) [*d.* rauben, *p.* rabować] рабаваць, грабіць; **rabirer** *m* рабаўнік, рабоўнік; **rabirung** *f* рабаваньне, рабунак

rabim *m*, -s [*s.* (ס-)רבים →rov, nisrabe, berabim] 1. большасьць, натоўп, грамада, грамадзтва, калектыў [*sin.* merhajt, ojlem, gezelšaft; *ant.* joxed]; 2. *gram.* множны лік [*sin.* mercol, lošn-rabim]

• a kapore a joxed far a rabim *šprxv.* індывід – ахвяра натоўпу

• a rabim firt štendik ojs *šprxv.* грамада заўжды даб'ецца свайго (добра там жывецца, дзе гуртам сеецца і жнецца)

• es iz biter un šlext, ven der rabim iz umgerext *glxv.* горка і кепска, калі грамада памыляецца

rábine=rjábine *f*, -s [*r.* рябина] *bot.* рабіна

rablje=grablje *f*, -s [*ukr.* граблі] граблі

rac *m*, -n [*d.* Ratte, *mhd.* ratze] *zool.* пацук

racemore *f* [*mhd.* ratze?] махер (ангорская поўсьць), **racemórener** махеравы

racje *f*, -s [*p.* racje] рацыя, аргумэнт, сэнс

racje *f*, -s [*p.* raca] 1. наветраны зьмей; 2. ракета

racn [*d.* ratzen] драпаць, шкрабаць, скробаць, скрэбці, пісужыць; **rac** *m*, -n драпіна, скрабіна, пісуга, пісужына, пісюга; рана; **a rac ton*** шкраб(а)нуць, скробнуць; **ráciker** шурпаты, шаршавы, шорсткі

• ix vel ništ lozn fun kejnem farfirenen, /un megn dox ale kegn mir zajn, /x'vel zix lozn di negl af rojt manikirenen, /me zol ništ derkenen di racn fun xrejn *flksl.* я не дазволю нікому сябе ашукваць, бо кожны можа быць супраць мяне, я зраблю манікюр, і ніхто ня ўбачыць маіх падраных хрэнам пальцаў

racxn *m*, *pl.* racxonim, (-te *f*, -s) [*s.* (רצחן(-ים) →recixe] разбойнік, галаварэз, забойца, кат, злачынец, ліхадзей, вылюдак, зьвер, душагуб [*sin.* merder, recejex]; **rácxe(ne)n** [*s.* רצחע(נע)ן] забі(ва)ць [*sin.* mordn, hargenen]; **racxones** *n* [*s.* ות-] лютасьць, ліхадзейства; **racxónišer** зьверскі, люты, злачынскі, ліхадзейскі

račkom=rakom/rakem *adv.* ракам, рачком; **ráčke(ve)n zix** рачкаваць; празнушчацца, ламаць карак

rad=rat *m* [*d.* Reichstaler] талер

rad *m*, -n [*ukr./r.* ряд] рад, шэраг

rádenice *f*, -s [*ukr./r.* ряд?] гандлярка на кірмашы

rádeven zix (af) [*sl.*?] (па)квапіцца, галіцца

radicírn [*d.* radizieren] 1. (radicírt) *mat.* здабываць корань; 2. *n*, **radicirung** *f mat.* здабываньне кораня

radírn (radírt) [*d.* radieren] травіць; гравіраваць; **radír** *m*, -n афорт, гравюра

radnik *m*, -es [*ukr.* радник] дараднік, саветнік, (па)раднік, (да)радца, райца

radzivulke/radzevulke/ra(d)ževulke=rozevolke *f*, -s [*p.*?] накідка, балахон, насоў

ra(e)š *m* [*s.* רעש] суматоха, шум, тлум, гармідар, гам(ана), гоман, галас; **ráešdiker** шумлівы; **rá(e)šn** шумець, рабіць шум, галасіць, гаманіць

rafe(re) *f*, -s [*p.* refa, *d.* Reif] рэхва, рафа, рахва, вобад кола, жалезны абруч на калясе воза

rágene *f*, -s [*fr.* rage?] злосьніца, злая жанчына, мэгера

raglaim *pl.* [*s.* רגלים →mej-raglaim, šoleš-regolim, regl] *hum.* ногі [*sin.* fis]

ragzn *m*, *pl.* ragzonim, (-te *f*, -s) [*s.* (רגזן(-ים) →rojgez, rugze] гарэза, вісус, сарвігалава, злосьнік; апрысклівы, гарач(лів)ы чалавек; **ragzones** *n* [*s.* ות-] гарачнасьць, злоснасьць [*sin.* hicikajt, corndikajt]

• hejbstu on mit ragzones, vestu endikn mit nariškajtn *glxv.* пачнеш з гарачнасьці, скончыш глупствам

rahočen=rohočen [*ukr.* реготати] 1. рагатаць; 2. шчыкатаць, казытаць, ласкатаць

rajbax/rajbak *m* [*d.* reiben?] *kul.* страва зь цёртай бульбы (бабка)

rajbn* (geríbn) [*d.* reiben] церці; **rajb** *m*, **rajbung** *f*, -en, **rájbeniš** *f*, -n трэньне, цярцё; **rajber** *m* 1. гумка, сьцірка; 2. абжора, жрун, аб'ядайла; **rájbiker** цёрты; шурпаты; **rajbexc** *n* 1. пыл, парашок, парахно; 2. **rájbbrojt** *n* паніровачныя сухары; **rájbungen** *pl.* сваркі, нелады; **rájbajzn=ríbajzn** *m*, -s [*d.* Reibeisen] тарка

• rajbn* a noz/morde, di zajtn нацерці/надраць нос/морду /бакі (намуляць/намацаць бакі; рэбры памацаць; даць у косьці; (за)даць пытлю/зыра)

• rajbn* af bejde bakn аплятаць/упісваць за абедзьве шчакі (есьці папоўніцы)

• rajbn* af vos di velt štejt аплятаць/упісваць на чым сьвет стаіць (аж нос у прысядкі гуляе)

• rajbn* cajt церці час
• rajbn* di hent церці рукі
• rajbn* un švajgn* церці й маўчаць (з анэкдоту)
• rajbn* zix arum gebildete lajt церціся праміж разумнага люду
• rajbn* zix cvišn menčn церціся сярод людзей
• rajbn* zix dem štern церці сабе лоб (чухаць патыліцу)

raje *f*, -s [*s.* (וֹת-)ראיה →veho-raje] довад, доказ, знак, аргумэнт [*sin.* bavajz, cejxn, argument]; **raje-ledóver** *f* [*s.* לדבר] доказ пэўнай рэчы; знак, які пацьвярджае сказанае; **rajes-brúres** *pl.* [*s.* ברורות] сапраўдныя, пэўныя, зразумелыя доказы/довады/аргумэнты

• ale rajes far un kegn усе довады "за" і "супраць"
• brengen* rajes прыводзіць довады
• dos iz nox kejn raje nit гэта яшчэ нічога ня значыць
• s'iz nit kejn raje, az... гэта ня доказ, што...
• zix (arop)nemen* a raje (fun) браць сабе да ўвагі
• a raje vi (cen mol) gorništ пусты довад
• es iz a raje fun der alter bobe Xaje (a raje – (vi) di bobe hejst Xaje) *glxv.* гэта доказ старой бабы Хаі (гэта плёткі старой цёткі; а. б. с. – адна баба сказала)
• fun a nar ken men kejn raje ništ brengen *glxv.* дурню нельга прывесьці доказаў (дурань законаў не чытае, а свае мае; дурному хоць кол на галаве чашы, то ён усё сваё)

rajeler=rejeler сапраўдны, дабраякасны, надзейны, грунтоўны, дакладны (аб чалавеку)

• rajel biz gor цалкам надзейны
• rajel vi ba zix in kešene надзейна як ва ўласнай кішэні
• der tojt iz a rajeler sojxer – er klajbt nit iber *šprxv.* сьмерць, як упэўнены купец, – яна не перабірае (сьмерць не перабірае і не мінае; сьмерць і радзіны не выбіраюць гадзіны; сьмерць не разьбірае, каго забірае; сьмерць у зубы не глядзіць)
• oder gornit nit ton, oder ton alc rajel *glxv.* або нічога не рабіць, або рабіць ўсё надзейна (як з пустым займацца, то лепей ні з чым)

rajen [*ukr.* радити, *p.* radzić] ráіць, рáдзіць; **rajce** *m*, -s дараднік, саветнік, (па)раднік, (да)радца, райца

rajen *m*, *pl.* rajojnes [*s.* (וֹת-)רעיון] думка, ідэя; развага, разважаньне, роздум [*sin.* gedank, idee; zinen]

• farzinken* (fartifn zix) in rajojnes (traxtn rajojnes) паглыбляцца ў разважаньні
• šikt der barg cum tol a blik, /entfert tol bald op curik /zelbike rajojnes, /xolemen xalojmes (A. G-t) гара пасылае далёкае позірк, далёка зараз жа адказвае тымі ж думкамі, сьняць сны

rajf *m* [*d.* Reif] шэрань

rajfer [*d.* reif] сьпелы; **rajf vern*** узмужнець; **rajfkajt**/сьпеласьць; узмужнеласьць; **rajfn** сьпець; **rájfgevorener** пасьпелы, насьпелы

rájferke *f.* -s [*p.* rajfurka] зводніца, бандарша

rajm *m*, -en [*d.* Reim] рыфма

ra(j)n *f*, -en *dim.* **rajndl** *n*, -ex [*ahd.* rina] рондаль, міска

Rajn *m* [*d.* Rein] рака Рэйн

Rajne Райна (жаночае імя)

• ojszen* vi Rajne afn naxttepl выглядаць як Райна на начным гаршку

rajniš *m* [*d.*?] старая аўстрыяцкая манэта

rajón *m*, -en [*fr.* rayon] раён; **rajóniker** раённы

rajose [*s.* רעיתו] яго жонка (выкарыстоўваюць у лістох) [*sin.* zajn vajb]; **rajosi** [*s.* רעיתי] мая жонка [*sin.* majn vajb]

Rajsn *n* [*d.* Reussen] Беларусь; **rajs** *m* беларус; **rajsiš** *n* беларуская мова; **rájsišer, rájsenerer** беларускі

• opton* af rajsiš зрабіць па-беларуску (утнуць штуку)
• s'iz rajsiše vaser *iron.* гэта беларуская вадá

rajsn* (gerisn) [*d.* reissen] 1. рваць, драць, дзерці; 2. нарываць; **rajsn* zix** 1. (in, cu, af) рвацца; 2. біцца, сварыцца, лаяцца; **rájsiker** які разьдзірае/рве; крыклівы; абуральны; **rájseniš** *f/n*, -n 1. **rajseráj** *f*, -en грызьня, сварка, разлад; 2. скульле; **rájscon** *m*, *pl.* -cejn(er) ікол

• maxn a sof cu di rajserajen скончыць сваркі
• rajsn* af zix di hor (fun kop) рваць на сабе валасы
• rajsn* dem bisn fun mojl вырываць кавалак з рота
• rajsn* dexer *fig.* драць дахі (быць вельмі пабожным)
• rajsn* di ojern драць вушы (раздражняць)
• rajsn* emecn ba di ojern драць каго-небудзь за вушы
• rajsn* emecn di ojgn драць/рэзаць камусьці вочы (выклікаць зайздрасьць)
• rajsn* epes fun vemen vi šnorers драць нешта ў кагосьці як жабрак
• rajsn* fun di hent вырываць з рук
• rajsn* zix af di vent дзерціся на сьцены (ад болю)
• rajsn* zix dem gorgl драць глотку
• rajsn* zix in an ofener tir ламацца ў адчыненыя дзьверы
• rajsn* zix in gešleg лезьці ў бойку
• rajsn* zix vi di/cvej kec/hint, vi a kac mit a hunt, vi hint iber a bejn, vi švegerns біцца/сварыцца/жыць як два каты/сабакі, як кот з сабакам, як сабака за костку, як швагеркі (як агонь з вадою, як ятроўкі)
• er rajst fun tojt un fun lebedik (rajsn* fun tojte un fun lebedike) *glxv.* ён дзярэ зь мёртвых і з жывых
• rajs im di cejner fun mojl! дзяры яму зубы з рота! (на скнару)

rajtn* [*d.* reiten] 1. (iz/hot geritn) (af) ехаць, езьдзіць конна /вярхом; 2. *n* (верхавая) язда; **rajter** *m*, -s, (-n/-ke *f*, -s) коньнік, вершнік; **rájterke** *f*, -s *hum.* верхаводка ў сям'і; **rájtndiker** конны, які едзе вярхом; **rájtferd** *n* верхавы конь; **rájtvogn=réjtvogn** *m*, *pl.* -s/-vegn, *dim.* **rájtvegl** *n*, -ex карэта, павозка, каляскa

• forn* (katajen zix) rajtndik ехаць/катацца вярхом
• zecn zix rajtndik (af) садзіцца вярхом
• er rajt af der kočere, un zi rajt af dem fartex *glxv.* ён езьдзіць на качарзе, яна езьдзіць на фартуху (я кажу васямнаццаць, а яна – бяз двух дваццаць)
• vos nuct a jung mit šporn, az er ken nit rajtn? (az er hot kejn ferd nit?) *glxv.* чаго варты юнак са шпорамі, калі ён на кані сядзець ня можа? (які каня ня мае?)

rajung *f* [*d.* Reue] раскаяньне

rajxer [*d.* reich] багаты, багач, багатыр; **rajxkajt** *f*, -n, **rajxtum** *n*, *pl.* -timer багацьце; **rajx vern*** багацець

• rajx maxn (у)збагаціць, (у)збагачаць
• rajx vi Rotšild/Brodski, vi graf Potocki, vi noxn onzecn багаты як Ротшыльд/Бродзкі, як граф Патоцкі, як пасьля банкруцтва (як зямля сьвятая, як чорт рагаты)
• a nar vert in xolem rajx *glxv.* дурань багацее ў сьне
• az me iz gezunt, iz men šojn rajx *glxv.* хто здаровы, той багаты
• az me iz rajx iz men i šejn, i klug, i me ken zingen *glxv.* хто

багаты, той і прыгожы, і разумны, і можа сьпяваць (багатаму і чорт у кішэню сера)
• got alejn iz nit rajx, er nemt nor ba ejnem un git dem andern *śprav.* бог сам не багаты, ён толькі бярэ ў аднаго і дае іншаму (і бог ашуканствам жыве: у аднаго адбярэ, другому дае; скуль бы бог усяго набраўся: у аднаго адбярэ, а другому дасьць; бог не гуляе, ды людзей раўняе)
• me zogt: oreme lajt, vajl di rajxe zajnen kejn lajt nit *glxv.* кажуць так: бедныя людзі, таму што багатыя ўжо не людзі (як забагацеў, дык і завяліся мухі ў носе; як забагацелі, то і папыхцелі (дык запыхацелі); мужык багаты, што нёс кудлаты)
• vilst rajx zajn (vern)? – zaj zibn jor a xazer *glxv.* хочаш быць багатым? – будзь сем гадоў сьвінгухом (стань сьвінаватым, то будзеш багатым; хто касматы, той багаты)
• zolst zajn gezunt un štark, un rajx, un frejlex! (gezunt zolstu zajn!) будзь здаровы і дужы, і багаты, і вясёлы! (будзьце жывенькі-здаравенькі!)

rajz *m/t* [*d.* Reis] рыс; **rájzener** рысавы

rajzn=rejzn [*d.* reisen] ездзіць, падарожнічаць, вандраваць; **rajze=rejze** *f*, -s паездка, падарожжа, вандраваньне; **rájznder** *m*, -s/-de падарожнік, вандроўнік; **rájze-bašrajbung** *f*, -en апісаньне падарожжа, (па)дарожныя запіскі/нататкі, дзёньнік; **rájze-ojsgabes** *pl.* дарожныя расходы/выдаткі; **rájzntaš** *f* сакваяж
• a gliklexe rajze! шчасьлівай дарогі!

rak [*sl.*] 1. *m*, -es, *dim.* **rakl** *n*, -ex *zool.* рак; 2. *m med. astr.* рак; **rákiker** ракавы; **rakom/rakem=račkom** *adv.* ракам; **rákgešvel** *n*, -n. **ráktumor** *m*, -s *med.* ракавая пухліна
• šteln zix (lign/krixn*) rakom станавіцца/поўзаць ракам
• got zol dir gebn a rak mit a rekele – vestu hobn a gancn kostjum! *kll.* хай бог дасьць табе рака з рачком – будзеш мець цалкам гарнітур! (*vrtš.* "rak" рак – "rok" сурдут)
• zolst handlen mit rakes, un ejner zol dir blajbn revex! *kll.* каб ты ганляваў ракамі, а адзін (хвароба) хай будзе табе прыбыткам!

rak [*s.* רק] 1. толькі (і ўсяго), раз-по-раз, сюд-туд; 2. запар, засаб, стала, пастаянна, заўсёды, бязупынна, статэчна, бесьперапынна, бесьперастанку [*sin.* nor, blojz; kesejder]
• rak me vil прагнуць, прагна жадаюць
• rak er est ён есьць бесьперастанку

rakét *m*, -n [*d.* Rakete] ракета
raketke *f*, -s [*p.* rakietka] ракетка
rakovine *f*, -s [*r.* раковина] ракавіна
rale *f*, -s [*ukr./r.* рало] рала, барана; **ralen** баранаваць, скародзіць
ram=rem=rom *f*, -en, *dim.* **reml** *n*, -ex [*d.* Rahmen] рам(к)а, аправа, абрамленьне
• in di ramen (fun) у рамках (нечага)
ramaj *m*, *pl.* ramoim [*s.* (ם-) רמאי] ашуканец, ашукальнік, падшывальнік, абакула, круцель, вілаводнік, манюка, чмурыла, махцін, махляр, шахрай, самазванец [*sin.* švindler, opnarer]; **ramoes** *n* [*s.* רמאות] хлусьня, падман, ашуканства, жульніцтва, махлярства, круцельства [*sin.* opnareraj, švindl]; **ramóišer** ашуканскі, падманны
• a rojter/geler iz a ramaj *glxv.* рыжы – заўжды ашуканец (лысы, рыжы і кутэрнога – то найгоршыя людзі)
ramaške=romaške *f*, -s [*r.* ромашка] *bot.* рамон(ак)

ramáx=remáx ejvrim *pl.* [*s.* רמ(")ח אברים →šasa girn, tarjag micves] *tlmd.* усе чалавечыя органы (248); усё цела
• mit ale ramax ejvrim душой і целам, усімі фібрамі душы
Rambam *abr.* **rabejnu Mojše ben-Majmon** [*s.* בן־מימון רמב(")ם=רבנו משה] Рамбам, рабін Майсей бэн-Майман (Майманід), вялікі сэфардзкі рэлігійны аўтарытэт і філёзаф (Гішпанія, 1138–1204)
ramen=ro(j)men [*d.* raumen] чысьціць, прыб(і)раць; **rámern** *f*, -s прыбіральшчыца
ramš *m*, -n/-es [*r.* Ramsch] старызна, старыя рэчы, транты, тандэт; **rámšfarkojf** *m*, -n продаж тандэту
ram-tara-ride... рам-тара-рыдэ... (у песенных рэфрэнах)
• šejn i' zi vi a kaline, /zis i' zi vi a maline, /ram tara ride, ram tara rideram *flksl.* прыгожая як каліна, салодкая як маліна
ran=rajn *f*, -en *dim.* **rajndl** *n*, -ex [*p.* Rondel?] рондаль, міска
rand *m*, -n [*d.* Rand] край, бераг; ранг; **ránd-gegnt** *m*, -n ускраіна
• afn rand fun umkum на краі пагібелі
randar=rendar=arendar *m*, -n/-es, (-ke *f*, -s) [*p.* arendarz] (а)ранда(та)р, пасэсар
rándkeven zix (mit) [*p.* randka] прызначаць сустрэчу/спатканьне; **randke** *f*, -s спатканьне
ranét=renét *m*, -n [*fr.* reinette] ранэт (сорт яблыкаў)
rang *m*, -en, **range** *f*, -s [*d.* Rang] ранг(а)
rang(l)en zix [*d.* ringen, *mhd.* rangen] змагацца, дужацца, барукацца, бораца; **rangleráj** *n*, **rángleniš** *f*, -n барацьба, стычка; **rangler** *m*, -s барэц
• ranglen zix mit epes vi mitn malex-hamoves/tojt змагацца як са сьмерцю (б'ецца як рыба аб лёд)
ran(j)ec *m*, -n/-nces [*d.* Ranzen] ранец
rán(j)ecke(r) [*v.* раніца] раньні, досьвітны
ran(j)en, ranírn (ranírt) [*p.* ranić] раніць; **rane** *f*, -s рана
ranke *f*, -s [*d.* ranken] завіток (у расьлін)
ranúnkl *m* [*d.* Ranunkel] *bot.* курасьлеп
rapnik=narapnik *m*, -es [*p.* harapnik, *ukr.* гарапник] арапнік, бізун
raptem/raptom/raptum [*d.* raptim, *p.* raptem] *adv.* раптам, раптоўна
rarer [*d.* rar] рэдкі; **rar** *m*, -n рэдкасьць, рэдкая рэч/асоба
rasade *f* [*r.* рассада] расада
rasčóteven [*r.* рассчитывать] разьлічваць
rase *f*, -s [*d.* Rasse] раса; **ráseve(r)/rasove(r)** пародзісты; **rásndiker** расавы
rase=grase *f*, -s [?] яма для вапны
Raséj=Roséj *n* Расія, Расея
raskolnik *m*, -es [*r.* раскольник] раскольнік, старавер; адшчапенец
raskop(k)e *f*, -s [*r.*] раскопка
raspašet vern* [*r.* распахнуть?] трэскацца, лопацца, покацца
raspološen zix [*ukr.* розполохати] успалашыцца
raspor *m* [*sl.*] шырынка, гульфік, распорка, праразь
ras(t)n [*d.* rasten] адпачываць, рабіць прывал/адпачынак
rasxód *m*, -n [*r.*] выдатак, расход, страта
raš=raeš *m* [*s.* רעש →mareš, barašn] суматоха, шум, тлум, гармідар, гам(ана), гоман, галас [*sin.* gerojš, geruder, tuml, gepilder]; **rá(e)šdiker, rášiker** шумны, шумлівы; **rá(e)šn** шумець, рабіць шум, галасіць, гаманіць [*sin.* rojsn, rudern, tumlen, pildern]; **rá(e)šn zix** расшумецца

Raše *abr.* **reb Šlojme Jicxoki** [*s.* רש"י=ר' שלמה יצחקי] Рашы, Шлойма Іцхакі, аўтар камэнтару да Танаху і Талмуду (Францыя, XI ст.); **ráše-ksav** *m* [*s.* כתב] тып гэбрэйскага шрыфта, якім, сярод іншых, надрукаваны камэнтары Рашы
• maxt Raše як Рашы казаў
• Raše maxt af dem posek Рашы камэнтуе гэтую цытату з Танаху наступным чынам
• Raše maxt un maxt, un me gejt fort naket un borves Рашы кажа і кажа, а людзі ходзяць голыя і босыя
• visn, vos Raše maxt веданъ, што Рашы кажа
ráš(ik)er [*mhd.* rasch] хуткі, пасьпешны, борзды, шпаркі
rašfajl *f*, -n [*d.* Raspel] рашпіль
raške *f*, -s [*ukr./r.* ряжка] ражка (для вады)
rašt *f* [*d.* Rast] адпачынак, спакой
rat=rad *m* [*d.* Reichstaler] талер
rate *f*, -s [*d.* Rate, *p.* rata] узнос, рата; тэрмін; **rátesvajzer** растэрмінаваны, у растэрміноўку
• arajntrogn* di rate унесьці чарговы ўнёсак
ráteven [*p.* ratować] 1. вы-, (у)ратаваць; 2. *n*, **ratunek/ratunik** *m*, -nkes (па)ратунак
• er vil rateven di velt ён хоча выратаваць сьвет
• gebn* ratunek емесп выратаваць кагосьці
• jidn, ratevet! жыдэ/людцы, ратуйце!
• Zint ix bin cu majn sejxl gekumen, /oj, azoj bin ix fun der libe farbrent. /In majn harcn, oj, brent a heliš fajer, /rateven kon mix kejner nit. *flksl.* З тых часоў, як да мяне розум прыйшоў, ой, я згараю ад каханьня. У маім сэрцы, ой, гарыць пякельны агонь, выратаваць мяне ніхто ня зможа.
ratírn [*d.* retten] 1. (ratírt) вы-, (у)ратаваць; 2. *n*, **ratirung** *f* уратаваньне, (вы)ратаваньне; **ratirer** *m*, -s, (-n *f*, -s) ратаўнік, збаўца, збавіцель; **ratir(-)ring** *m*, -en выратавальны круг
ratn*=rotn* (gerótn) (па)радзіць, (па)раіць; **rat=rot** *m*, -n рада, савет; **rátzamer** разважны, мэтазгодны; **rátn(-)farband** *m* Савецкі Саюз; **rátgeber** *m*, -s дарадчік, саветнік, (па)раднік, (да)радца, райца; **rátman=rótman** *m*, *pl.* -mener/-lajt прадстаўнік рады, савету
ratuš *m* [*p.* ratusz] ратуша
rav *m* [*s.* רב] тытул, якім хасыды-хабаднікі называюць першага хасыдзкага рэбэ Залмана Шнэйера зь Лядаў; **rav-hakójlel** *m* [*s.* הכולל] галоўны рабін (некалькіх кагалаў); **rav-horóši** *m* [*s.* הראשי] галоўны рабін усяго раёну альбо краіны
rax [→хосп-rax?]
• finf rax пяць рублёў
raxáš=rexáš *m abr.* **rov - xazn - šames** [*s.* - חזן - רב=רח"ש שמש] рабін - кантар - служка; грошы, якія плацяць у розных выпадках, зьвязаных з кагальнымі рытуаламі; сватаўскія грошы
raxe *f* [*d.* Rache] помста
raxem *m* [*d.* Rachen] пашча, зяпа, глотка
raxem [*s.* רחום →raxmen] міласьцівы (бог) [*sin.* derbaremdiker]; **raxem-vexánen** [*s.* וחנון] міласьцівы і ласкавы (бог)
rax-haníml *m* [*s.* רך־הנימול] хлопчык пасьля абразаньня [*sin.* erst bašnitn kind, jingele bald noxn bris], **rax-hanójled** *m* [*s.* הנולד] першародны сын [*sin.* erst gebojrn kind]; **rax-lév** *m* [*s.* לב] мяккасардэчны чалавек [*sin.* vejxhareiker menć]
raxmen *m*, *pl.* raxmonim [*s.* (רחמן(-ים →(me)raxem, umberaxmonesdiker, balraxmim] міласэрны, літасьцівы, спачувальны, спагадлівы, жаласьлівы чалавек; **raxmones** *m/n* [*s.* רחמים-ות], **raxmim** *n* [*s.* רחמים] міласьць, ласка, жаль, спачуваньне, спагада, літасьць, рахманасьць, міласэрнасьць [*sin.* baremhareikajt; mitlejd; genod]; **raxmónesl** *n*, -ex бядуля, жабрак, сіротка; **raxmónesdiker** літасьцівы, міласэрны, ласкавы, рахманы; **hobn*/bakumen*/krign* **raxmones** 1.(аf)мець ласку, спачуваць, выказваць жаль; *iron.* зьлітавацца, зьмілавацца; 2. абкрасьці; **raxmónespónem** *n*, *pl.* -pénemer [*s.* (עיר-)פנים] жалкі, жаласны, убогі, мізэрны выраз твару; міна, якая выклікае спачуваньне [*sin.* nebexdiker ojsdruk, mine vos dervekt mitlejd]; **raxmone-jecilćjne/-jecilćjnu** [*s.* רחמנא־ציליננו], **raxmone-liclán=r"l** *abr.* [*s.* ר"ל=רחמנא־לצלן] барані/бронь/крый нас божа, хай нас бог крые [*sin.* got zol undz bahitn]; **raxmónim-bnej-raxmónim** [*s.* בני] "міласэрныя сыны міласэрных"; азначэньне для гэбрэяў; **raxmónes-gefil** *n*, -n пачуцьцё жалю, літасьці
• a biter(er) raxmones дужа шкада, горкія шкадаваньні
• a gots raxmones сэрцаразьдзіральная рэч
• a raxmones cu kukn варты жалю
• me darf hobn raxmim трэба быць спагадлівым
• mit raxmim з ласкай, паблажліва, шкадуючы
• onhejbn* betn zix raxmim пачаць маліцца, прасіць літасьці/міласэрнасьці
• raxmonesdike ojgn ласкавыя вочы
• s'iz (mir) a raxmones af im/dir мне шкада яго/цябе
• (zix) betn* raxmim (ba) маліць, умаляць, упрошваць
• af a šlang tor men kejn raxmones nit hobn *glxv.* са зьмяёй ня трэба быць рахманым (німа гаду бязь яду)
• got (der ejberšter) zol raxmones hobn! божа, будзь міласэрным/літасьцівым!
• ver es hot nit kejn buše in ponem un kejn raxmones in harc, der kumt nit arojs fun jidn *šprxv.* хто ня мае сораму на твары і жалю ў сэрцы, той паходзіць не ад гэбрэяў
• ver es vil hobn raxmones far/af zix, muz hobn raxmones af andere (ver s'hot kejn raxmones af jenem, hot kejn raxmones nit af zix) *šprxv.* хто хоча ласкі сабе, мусіць мець яе для другіх
ráxmister=róxmajster *m*, -s [*p.* rachmistrz] рахаўнік, рахункавод
raxves *n*, -n [*s.* רחבות →marxev, (be)harxove] 1. шырыня, раскоша, выгоднасьць, дабрабыт, дастатак; 2. шыр, прастора, абшар, шырокая сфэра [*sin.* brejtkajt, bakvemkajt, vojlzajn; brejter šetex]; **ráxvesdiker** 1. прасторны, раскошны, неабсяжны, неабдымны; 2. вольны, здаволены [*sin.* brejter, cešprejter; frajer, cufridener]
• lebn in raxves жыць у раскошы
razbáleven [*r.* разбаловать] разбалаваць, разбэсьціць
razbój *m* [*r.* разбой] разбой; **razbojnik** *m*, -es разбойнік
rázeve(r)/razove(r)=rózeve(r) [*p.* razowy] жытні, аржаны; пытляваны
• razeve brojt аржаны, пытляваны хлеб
• razeve sxojre галоўны прадукт пэўнага краю
razgovór *m*, -n [*r.* разговор] размова
razírn (razírt) [*d.* rasieren] галіць, брыць; **razirer** *m*, -s галяр; **razír(-)meser** *m/n*, -s брытва, галяк; **razirter** голены, брыты; **razure** *f*, -s цырульня

Razjel [*s.* רזיאל] *kbl.* Разіэль, імя анёла, які ведае таямніцы Торы

razmáx *m* [*r.* размах] размах

razruxe *f*, -s [*r.* разруха] разруха

raževulke=radzivulke=rozevolke *f*, -s накідка, балахон, насоў

reb [*s.* רב=ר' →rabejnu, rav, rov] рэб (зварот да жыда) [*sin.* her, frajnd]; **rebe/rebi** *m*, -s/rabeim, *dim.* **rébinke** *m*, -s, **rébele** *n*, -x (*ak. dat.* rebn, *pos.* rebns) [*s.* רבי(-ים/-ס)] настаўнік рэлігійнай школы; *xsd.* рэбэ, рабін, духоўны вож, праведнік; п(р)авадыр, вож [*sin.* lerer, melamed; gajstiker firer, cadek, guter-jid; vegvajzer]; **rébecn** *f*, -s [*s.* רביצין(-ס)] рабініха (жонка рабіна); традыцыйная настаўніца дзяўчат; пабожная і адукаваная жанчына; **rébenju** *m xsd.* любы наш рэбэ (ласкавы зварот, які часта ўжываецца ў песьнях); **rébišer=rabéišer** *xsd.* рабінаў(скі); **rébešaft** *f n*, **rebistve** *n*, -s *xsd.* пасада або функцыі рабіна; **rébe-gelt** *n* 1. плата за навучаньне ў хедары; 2. *iron.* плата за навуку; **rébe-nislex** *pl.* арахіс, земляны гарэх

- bacoln rebe-gelt *fig.* дорага заплаціць за навуку
- lernen rebe-gelt *fig.* будзе навукай наперад
- reb jid/korev! даражэнькі! дзядзьку! спадар! (традыцыйны зварот да незнаёмага жыда)
- a rebe un a dokter vern rajx nor fun vajber *glxv.* рэбэ і доктар багацеюць толькі праз жанчынаў (жанчыны маюць патрэбу ў цудах і ў леках)
- a rebecn hot a lange hant un a kurc ojer *glxv.* жонка рабіна мае доўгую руку, але кароткае вуха (яна ахвотна прымае падарункі, але ня чуе просьбаў)
- alc vi der rebe vil *glxv.* усё як рэбэ хоча (ня мець уласнага меркаваньня)
- az der man iz a rov, iz dos vajb a rebecn *glxv.* калі мужык рабін, дык жонка рабініха (які чорт Хомка, такая яго жонка)
- az der rebe ken ton nisim, /hob ix alejn gezen, /er gejt arajn in vaser /un kumt arojs a naser, /aj-jaj-jaj-jaj, jaj-jaj-jaj, /nisim-venifloes, /er gejt arajn in vaser /un kumt arojs a naser *flksl.* як рэбэ можа рабіць цуды, я бачыў на ўласныя вочы, ён зайшоў у ваду і выйшаў мокры, ай-яй-яй..., дзіва дзіўнае...
- dem rebns cig meg *glxv.* рабінавай казе дазволена (што дазволена ваяводу, то не дазволена смуроду)
- dem rebns esn un dem ferds trinken ken men ojshaltn, ober dem rebns trinken un dem ferds esn iz ummeglex *glxv. hum.* рэбэ накарміць і каня напаіць ільга, але рэбэ напаіць і каня накарміць нельга
- der rebe iz grojs, ven er hot (arum zix) a sax klejne jidelex /xsidimlex *glxv.* рэбэ вялікі, калі ён мае (вакол сябе) шмат маленькіх дзяцей/вучняў
- der rebe meg! *glxv.* рэбэ дазволена! (што можна пану, то не Івану)
- der rebe vert rojter, di flešl vert blaser рэбэ пачырванеў, пляшачка зьбялела (з анэкдоту)
- majn rebe iz šojn lang geštorbn *glxv.* мой рэбэ ўжо даўно памёр (кажа чалавек, які доўгі час не выказваў ніякіх думак)
- rebe-lebn! vos tut men nit alc fun parnose vegn? *glxv.* шаноўны рэбэ! чаго ня зробіш дзеля заробку?
- šikt im cum rov, gejt er cu der rebecn *glxv.* адпраў яго да рабіна, ён пойдзе да рабініхі
- ver zajt ir reb jid? хто вы такі?
- Zogt der rebe reb Motenju: A gutn-ovnt dir, gotenju! /Der tog iz avek, ix hob alc gemaxt, /gib že mir a gutinke naxt. (А. С.) Рэбэ рэб Мотэню кажа: – Добры вечар табе, божухна! Дзень скончыўся, я ўсё зрабіў, дай жа мне добрай ночкі.

reb *f* [*d.* Rebe] вінаградная лаза

rebelírn (rebelírt) [*d.* rebellieren] бунтаваць, паўста(ва)ць; **rebél** *m*, -n, (-n *f*, -s) паўстанец, бунтар, бунтаўнік, мяцежнік; **rebélišer** бунтарскі, мяцежны

rebójne-/ribójne-šelojlem/rebéjnu-šel-ojlem *m*, **rbš"e** *abr.* [*s.* רבונו־של־עולם=רבש"ע] уладар сусьвету, (пан) бог, госпад, гасподзь

- rebojne-šelojlem, gib mir brojt, azoj lang (vi) ix hob cejn божа ўсемагутны, дай мне хлеба, пакуль я маю зубы
- rebojne-šelojlem! halt mir nor dos štrikl, drejen vel ix šojn alejn *glxv.* божухна! трымай толькі вяроўку, круціць я ўжо буду сам
- rebojne-šelojlem, kuk arop fun dem himl un kuk dir on dajn velt! уладар сусьвету, кінь позірк зь неба і паглядзі на свой сьвет!

recépt *m*, -n *med.* рэцэпт

- šrajbn zol men dir receptn! *kll.* каб табе пісалі толькі рэцэпты!

recixe *f* [*s.* רציחה(-ות) →racxn] забойства, злачынства, разбойства, разбойніцтва; бязьлітаснасьць, лютасьць, жорсткасьць, азьвярэньне, разьюшанасьць, шаленства [*sin.* mord, blutiker akt, farbrexn; šrajendik umrext; merderišer kas]; **recíxediker, recíxišer** разбойніцкі, зьверскі, люты, злачынскі, ліхадзейскі; азьвярэлы, разьюшаны, шалёны; **recejex/recojex=rojcejex** *m*, *pl.* rocxim, (-te *f*, -s) [*s.* רוצח(-ים)] разбойнік, галаварэз, забойца, кат, злачынец, ліхадзей, вылюдак, зьвер, душагуб [*sin.* merder; bejzer man]; **recixe-sárfener** *m* [*s.* -שרף] *argo* падпальшчык

- arajn in recixe раззлавацца, разьюшыцца
- arajnbrengen* in der recixe уводзіць у шаленства
- lomir zix iberbetn, /dermon zix in undzer jixes; /lomir zix iberbetn, /loz nit af undz mer kejn recixes *flksl.* давай перапросімся, (божа) узгадай аб нашым паходжаньні; давай перапросімся, не напускай на нас больш лютасьці
- red nit in di ojgn kejn xnife un tu nit hinter di ojgn kejn recixe *glxv.* не кажы лісьлівых словаў у вочы і не рабі злачынстваў за вочы (ня плямкай і ня гамкай; ня гладзь і не дзяры (і не кусай); ня дай і ня лай)

recue *f*, -s [*s.* רצועה(-ות)] скураны раменьчык на філяктэрыях, з дапамогай якога філяктэрыі замацоўваюцца на руцэ або на галаве

rečke/recške *f* [*ukr./r.* гречка] грэчка; **réčener** грачаны, грэчкавы; **réčanik/réčenik/réčičnik/réčišnik** *m*, -es *kul.* грачанік

- er kumt mitn hejsn rečenik ён прыйшоў раззлаваны
- rečene kaše грэцкая каша

redagírn (redagírt), **redaktírn** (redaktírt) [*d.* redigieren, *r.* редактировать] рэдагаваць

reder *pl.* →rod *f/n* кола, круг, карагод; **redl** *n*, -ex 1. кола, кольца, круг; гурток; 2. народны жыдоўскі танец (удзельнікі становяцца ў карагод і бяруцца за рукі або кладуць адзін аднаму рукі на плечы); **rédl(-)firer** *m*, -s, (-ke *f*, -s) верхавод, заправіла; **redlen** 1. набіраць нумар

тэлефона; 2. пракатваць (дзіравіць) мацу зубчастым кольцам; **redler** *m*, -s рабочы, які дзіравіць мацу зубчастым кольцам; **rédern** [*d.* rädern] калесаваць; **réderšpur** *m f*, -n каляіна; **rédlexvajz** *adv.* гуртам
• dos redl hot zix ibergedrejt лёс павярнуўся, абставіны зьмяніліся
• iberdrejen dos redl зьмяніць тактыку
• redlexvajz zajnen ale gegangen гуртам усе пайшлі
• azoj lang dos redl drejt zix, drejt es zix *šprxv.* пакуль кола круціцца, і справа круціцца

redife *f*, -s [*s.* (ות-)רדיפה →rojdefn, nirdef] ганеньне; перасьледаваньне (звычайна ўжываецца ў множным ліку) [*sin.* farfolgungen]

rediske *f*, -s, *dim.* **redískele** *n*, -x [*ukr./r.* редиска] радыска

redne *f*, -s [*ukr./r.* рядно] радно, дзяруга; **rédne(čke)** *f*, -s радніна, надсьцілка, посьцілка; **rédne-zak** *m*, *pl.* -zek мех (з радна)

reéj [*s.* ראה →rie, xuš-harie, roje-] "глядзі"; назоў 47-га разьдзелу Торы (Др. З. 11:26–16:17) [*sin.* ze]

reft *m*, -n, *dim.* **reftl=riftl** *n*, -ex [*mhd.* ranft] скіб(к)а, луста, акраец, скрыль

refue *f*, -s [*s.* (ות-)רפואה →rojfe] сродак, лёкі, лякарства; вылячэньне [*sin.* medikament, hejlmitl; ojshejlung]; **refúediker** лекавы, мэдыцынскі; **refue-bdúke** *f* [*s.* בדוקה] выпрабаваныя лекі; **refúe-geviks** *n*, -n лекавая расьліна, зёлкі; **refue-šléjme** *f* [*s.* שלמה] поўнае ачуняньне (папраўка); пажаданьне поўнага вылячэньня
• a refue fun kopvejtik сродак ад галаўнога болю
• kalte/knape refue(s) бескарысны сродак
• ništo (afile) af a (kejn) refue німа ніякіх лёкаў, німа ніякага паратунку, цалкам німа
• s'iz do a refue dercu гэта – адпаведны сродак
• vinčn* emecn a refue-šlejme жадаць камусьці хуткага вылячэньня
• a mol iz di refue erger fun der make *glxv.* лекі бываюць горшыя за хваробу
• a refue far di make *glxv.* бальзам на рану (выратаваньне ад пакутаў)
• a refue šlejme af ale ejvrim! бадай табе палепшала! (дай бог, каб хвароба ішла на сухі лес! дай бог пахварэць у добрым здароўі!)
• der dokter hot a refue cu ale, ober nit cu dales (der dokter ken ales, nor nit arojstrajbn dem dales) *šprxv.* доктар мае лекі ад усяго, акрамя беднасьці (німа горшай балесьці, як хочацца есьці)
• draj voxn noxanand bin ix gelegn krank, /un du bist cu mir kejn ejn mol nit gekumen, /di beste refue volstu mir geven gebraxt, /ven du zolst ejn mol gevezn cu mir kumen *flksl.* тры тыдні запар я ляжала хворая, а ты ні разу да мяне не прыйшоў, лепшымі лекамі для мяне было б, калі б ты хоць раз да мяне прыйшоў
• far akšones (an akšn) iz kejn (šum) refue ništo *glxv.* ад упартасьці зусім німа лёкаў
• (zol zajn) cu refue! на выздараўленьне/здароўе!

rege *f*, -s, *dim.* **régele** *n*, -x [*s.* (ס-)רגע] сэкунда, імгненьне, момант, хвіля, хвіліна [*sin.* sekunde, vajle, kurce cajt]; **régediker** імгненны, мамэнтальны; **rege-kemémre/-kemímre** *f* [*s.* כמימרא] вельмі кароткі адрэзак часу, які неабходны, каб вымавіць адно слова [*sin.* zejer kurce cajt]
• af der rege зараз-жа, у гэты ж момант
• in ejn rege, af a rege мігам, умомант, умірг, як вокам згледзець
• di rege/minut zol es bašafn vern зараз-жа мусіць быць зроблена (хоць радзі, а падай; хоць рыгні, а мусіш; хоць ялаўка, а цяліся)
• – Gib a kuk, majn toxter, vi azoj du bist gevorn, /vi azoj du gejst ajn ejder rege un minut, /oj, gej arajn, majn toxter, cu a dokter, /vet er dir zogn, vos iz dir gešen. *flksl.* – Паглядзі, мая дачка, якая ты стала, як ты марнееш кожнае імгненьне і хвіліну, ой, схадзі, мая дачка, да доктара, хай ён скажа табе, што з табою.

regiles *n*, -n [*s.* (ן-)רגילות →rogl, margl] звычка, прывычка [*sin.* gevojnhajt]; **regílesdiker** звычайны, прывычны; **regilim** *pl.* →rogl *m* [*s.* (ים-)רגיל] спрактыкаваны, дасьведчаны, звыклы, прывычны чалавек

regírn (regírt) [*d.* regieren] 1. (iber, mit) правіць, кіраваць; 2. *n* праўленьне, кіраваньне; **regirer** *m*, -s кіраўнік, уладар, валадар; **regírndiker** які правіць/кіруе, кіроўны; **regirung** *f*, -en урад
• koved un gelt regirn di velt *šprxv.* гонар і грошы кіруюць сьветам

regl *m*, *pl.* regolim [*s.* (ים-)רגל →šoleš-regolim, (mej-)raglaim] "нага"; адно з трох галоўных сьвятаў: Пэйсах, Швуэс, Сукэс; **régl-gelt** *n* ахвяраваньні на гэтыя сьвяты
• "regl" iz dox der tajč a fus – /kejn Kock darf men gejn cu fus, /zingendik un tancndik, /un az xasidim gejen kejn Kock, /gejt men mit gezang *flksl.* "рэгл" – гэта нага, у Коцк трэба хадзіць пеша, пяючы і танцуючы, і калі хасыды ідуць у Коцк, яны ідуць зь песьняй

regl *m*, -en [*d.* Regel] 1. правіла; 2. мэнструацыя, месячнае, аплавы; **réglmesiker** рэгулярны, правільны, нармальны; **réglmesikajt** *f* рэгулярнасьць, правільнасьць, норма

regl=rigl *m*, -en [*d.* Riegel] завалка, засаўка

regn *m*, -s, *dim.* **regndl** *n*, -ex, **régele** *n*, -x [*d.* Regen] дождж; **régenen** дажджыць; **régndiker** дажджлівы; **régnbojgn** *m*, -s вясёлка; **régnbojgndiker** вясёлкавы; **régnbojgn-hajtl** *n anat.* радужная абалонка; **régn(-)mantl** *m*, -en дажджавы плашч; **régnfrir** *m* галалёд; **régnširem** *m*, -s парасон; **régnšveml** *n*, -ex *bot.* порхаўка; **régnvaser** *n* дажджавая вада; **régnveter** *m* дажджлівае/пахмурнае надвор'е, непагадзь, непагода; **régn-vorem** *m*, *pl.* -verem/-verim дажджавы чарвяк
• a mexaediker regn жыватворны дождж
• bejs a regn у дождж, дажджом
• s'gejt a regn (s'regnt) ідзе дождж
• a gast iz vi a regn, az er dojert cu lang, vert er a last *glxv.* госьця, як і дождж, доўга цяжка пераносіць (госьць першага дня золатам, другога срэбрам, а трэцяга медзь і дадому едзь; госьць, як і рыба, на трэці дзень сьмярдзіць)
• a nar vakst on regn *glxv.* дурань расьце без дажджу (дурняў ня сеюць, а самі родзяцца; пустазельле расьце нясеянае)
• af regn un af dem tojt hot men nit vos got cu betn *glxv.* ня варта прасіць у бога дажджу або сьмерці (сьмерць і радзіны не выбіраюць гадзіны)
• az es regnt mit gold, štejt der oreman untern dax *glxv.* калі ідзе залаты дождж, бядуля стаіць пад дахам (ня быў там, дзе дзялілі)
• az es regnt, regnt es umetum *šprxv.* калі ўжо ідзе дождж, дык паўсюдна

R

• az s'a regnbojgn, vajzt got dem simen, az er iz undz mojxl *glxv.* калі на небе вясёлка, бог дае знак, што ён даруе нам нашыя віны
• fun ejncike tropn vert a gancer regn *šprxv.* вялікі дождж пачынаецца з аднае кроплі
• Regn, regn, regndl! /X'bin a klejner menčele; /x'loz zix mix baregenen, /x'vejs kejn xoxmes nit. (E. K.) Дождж, дождж, дожджык! Я маленькі чалавечак; хай сабе лье на мяне, большай мудрасьці я ня ведаю
• zol dir cien di fis on a regn! *kll.* каб цябе раматуз мучыў без дажджу! (раматуз/кастылом табе ў пяткі!)

regn [*d.* erregen] раздражняць, узбуджаць; **regn zix** хвалявацца, турбавацца, грывожыцца, непакоіцца; **régndiker** узбуджальны; **regung** *f*, -en раздражненьне, узбуджэньне

regulírn (regulírt) [*d.* regulieren] рэгуляваць; **regulerer**, **regulírter** рэгулярны; **regulerkajt** *f* рэгулярнасьць; **regulírung** *f* рэгуляваньне; **regulírung-ájnrixtung** *f* рэгуліроўнае абсталяваньне

ré-hirš *m*, -n [*d.* Reh, Hirsch] *zool.* казуля

rej *f*, -en [*d.* Reihe] чарга, чарада, рад, шэраг; **réjikajt** *f* чаргаваньць

• in der erster rej у першую чаргу
• lojt der rej напераменку, па чарзе
• nox der rej (nox) паводле чаргі
• stejn in der rej стаяць у чарзе

rejcn [*d.* reizen] дражніць, вабіць, разьвярэджваць, цьвяліць, узбуджаць; **rejc** *m*, -n прываба, спакушэньне; раздражненьне; **réjcndiker** прывабны, прынадны; **rejcung** *f*, -en раздражненьне; **réjcmitl** *n*, -en *med.* узбуджальны сродак

• (ce)rejcn di alte vundn разьвярэджваць старыя раны
• rejcn dem hunt дражніць сабаку

re(j)dn* (er redt; gerédt) [*d.* reden] гаварыць, гутарыць, размаўляць; **rede** *f*, -s, **re(j)d** *f* прамова; **a red ton*/gebn*** (mit) загаварыць, пачаць гаварыць; **re(j)d(n)er** *m*, -s, (-n *f*, -s) прамоўца, красамоўца, дыктар; **rédnerišer** прамоўніцкі, красамоўніцкі; **ré(j)d(elex)** *pl.*, **ré(j)deniš** *f/n*, -n, **re(j)deráj** *f/n*, -en гутарка, (раз)мова; гаворка; **ré(j)d-šprax** *f*, -n, **ré(j)d-lošn** *n* [*s.* לשון] (гутарковая) мова; **rejdarnje** *f pejor.* гаварыльня; **ré(j)devdiker** гаварлівы, гутарлівы, гаваркі; **ré(j)devdikajt** *f* гаварлівасьць, гутарлівасьць; **re(j)derajen** *pl.* плёткі; **re(j)dexc** *n*, -n погалас(ка); *pejor.* гаворка; **ré(j)dndiker** гаворачы, які размаўляе/гутарыць; **ré(j)dnsart** *m*, -n прыказка, прымаўка; **réjd-toes** *m*, *pl.* -n/-teúsim [s.(ם-/ן-)תעות] аговорка, абмоўка

• arajnfaln* in di rejd улезьці ў размову
• dos kind redt šojn дзіцё ўжо размаўляе
• geredt un geton сказана і зроблена
• glate rejd гладкая размова
• haltn* a rede весьці размову
• harbe rejd жорсткая размова
• kumen* cu rejd абмяркоўваць
• nit lozn* emecn redn не даваць гаварыць каму-небудзь
• ojb redn ofn (ofn geredt) калі казаць прама/адкрыта, шчыра кажучы/гаворачы
• rejd vi perl слова як пэрла/золата (як соль; сказаў як адрэзаў/алмераў/зьвязаў, як цьвіком прыбіў)
• redn* afn vint кідаць словы на вецер
• redn* cu der vant (rejd cu der vant! rejd cu im un rejd cu der vant, iz alc ejns) гаварыць як у сьцяну
• redn* fun finger гаварыць ад пальца (ня ведаючы)
• redn* fun hic гаварыць з жарам
• redn* fun(em) veg (nit cu der zax) несьці/вярзьці лухту /бязглузьдзіцу, гаварыць наўздагад/недарэчы
• redn* mit a halbn/halbe mojl гаварыць напаўголаса/няўпэўнена, недагаворваць, хітраваць
• redn* unter der noz гаварыць/бурчаць пад нос
• redn* (vi) far cen, gedixt vi kaše гаварыць за дзесяцярых, густа як каша (як макам сыпаць; гаворыць бы з бочкі, як у торбу кладзе)
• rejdn* fun bux/sider (fun a zixerer kvele) гаварыць як з кнігі/малітоўніка (з дакладнай крыніцы)
• rejdn* mit got гаварыць з богам (кажуць на сьвятошу)
• rejdn* verter гаварыць адкрыта, рэзаць праўду ў вочы
• rejdn* vi fun a bux, vi fun sider гаварыць як па кнізе/малітоўніку (гаворыць як казань кажа, як з ксёнжкі бярэ. гладка як вол языком ліжа, як на споведзі, як зашчыт на судзе)
• s'gejt a rejd vegn epes размова ідзе аб чымсьці
• vegn dem kon gor kejn rejd nit zajn аб гэтым зусім ня можа быць размовы
• vegn dem redt men a sax аб гэтым шмат гавораць
• (vos iz) šajex cu redn? (vos iz do faran cu redn?) што й казаць? што на гэта скажаш?
• vos redt er? што ён гаворыць?
• zajn* a rejd vegn epes мець пыганьне аб нечым
• zindikn mit di rejd грашыць на словах
• culib/iber dem hot got gegebn dem menčn cvej ojern un ejn mojl, er zol mer hern, vi rejdn (un vejniker redn) *šprxv.* з-за таго, што бог даў чалавеку два вухі і адзін рот, ён мусіць больш слухаць і меней размаўляць (маўчанка ня квяліць. але славу вялічыць; меней гаварыць – сабе ўрадзіць)
• es iz nit varem fun dobre rejdele, nor fun dobre mejnele (redele jak redele, abi dobre mejnele) *glxv.* цёпла не ад добрых словаў, а ад добрага намеру
• Far lajt tu ix zix šemen, /me zol fun mir nit rejdn... /Ict iz šojn di cajt gekumen, /mir muzn zix cešejdn. *flksl.* Я саромеюся людзей, каб яны мяне не абгаворвалі... Зараз прыйшоў час, мы мусім разьвітацца.
• fun vos me redt, kumt men alc arojs afn tojt *šprxv.* аб чым ні кажы, прыйдзеш да сьмерці
• mit gute rejd nemt er ba im di nešome arojs *glxv.* добрымі словамі душу выняў (ласкай душу дастане)
• zolst azoj šejn redn, az nor di kec zoln dir farštejn! *kll.* каб тваё красамоўства разумелі толькі коткі!

reje *f*, -s [*s.* (ות-)ראה →rejke] лёгкае забітаі скаціны [*sin.* lung fun a gešoxtener behejme]

rejeler=rajeler [*d.* reell] сапраўдны, дабраякасны, надзейны, грунтоўны, дакладны (аб чалавеку)

rejent *m*, -n [*p.* rejent] натарыюс

rejer=bákr(ej)er *m*, -n [*d.* Backrohre] (хлебная, руская, кухенная) печ

re(je)r *m/f*, -n руля, труба, рурка

rejex *m*, *pl.* rejxes [*s.* (ות-)ריח] пах, водар, дух [*sin.* gerux, duft]; **rejex-nixójex** *m* [*s.* ניחוח] прыемны пах, водар, арамат, пахошчы, духмянасьць [*sin.* ajngenemer gerux, duft, aromat]; **rejex-tójre** *m* [*s.* תורה] "арамат Торы"; высакароднасьць/эгэтызм Торы

ך

rejf *m f*, -n, *dim.* **réjfele** *n*, -x [*d.* Reif] абруч, вобад
• rejfn fun di reder вобады колаў
• tunk(e)le rejfelex arum di ojgn цёмныя кругі над вачыма
• az di rejfn cešpringen, cefalt dos fas *šprxv.* абручы разьляцеліся, бочка развалілася
re(j)ger *m*, -s [*d.* Reiher] *zool.* чапля
rejk *m*, -im [*s.* (ים-)ריק] лайдак, гультай, пустапас, пустадомак, абібок, дзяньгуб [*sin.* lejdik-gejer, puster menč, gornist]
rejke *f*, -s [*s.* (ס-)ריאהקע →reje] лёгкае, сэрца і пячонка жывёлы (вантробы)
rejmen [*d.* reimen] рыфмаваць; **rejm** *m*, -en рыфма
rejner [*d.* rein] чысты; **réjnikn** [*d.* reinigen] чысьціць; **réjnikajt** *f* сувоі Торы; **rejnkajt** *f* чысьціня, нявіннасьць; **réjnikung** *f*, -en чыстка; **ré(j)n(t)lexer** ахайны, чысты; **réjn(t)lexkajt** *f* ахайнасьць; **réjnblutiker** чыстакроўны; **réjnharciker** чыстасардэчны; **réjnvašn*** абяліць, абяляць, рэабілітаваць
• rejn vi a xazerše fus чысты/кашэрны як сьвінячыя капыты (чысты як комін навыварат)
• rejn vi gold чысты/ясны як золата (як крынічная вада, як крышталь/раса/шкло, як рыбінае вока)
• rejn vi in smetnik чыста як на сьметніку
• a rejner oreman iz a šejner dales *šprxv.* чысты бядняк – прыгожая беднасьць
• gis nit arojs dos umrejne vaser, kolzman du host nit kejn rejne (me zol nit dos umrejne vaser ojsgisn, biz dos rejne kumt nit cu flisn) не вылівай брудную ваду, пакуль ня маеш чыстай (ня скідвай старыя рэчы зь печы)
• rejnkajt hit op dos gezunt *šprxv.* чысьціня захоўвае здароўе
• zajn zolstu far mir a šejne rejne kapore! *kll.* каб ты стаў годнай ахвярай за мае грахі!
rejster *m*, -s [*mhd.* reister, register] сьпіс, рэестар
rejš=r *m f*, -n [*s.* (ן-)ריש] 1. "рэйш", літара гэбрэйскага альфабэту; 2. лічба 200
rejšes/rejšis [*s.* ראשית →berejšis, roš; (veha)šejnes] *adv.* па-першае [*sin.* erštns, cu eršt]; **rejšes-dóver** [*s.* דבר] ранейшы за ўсіх [*sin.* frier far alc]; **rejšes-xóxme** [*s.* חכמה] 1. "Пачатак мудрасьці" (назоў маралістычнай кнігі); 2. *hum.* самае першае, першае за ўсё; **réjšes-kol** [*s.* כל] па-першае, перш за ўсё
rejš-golúse *m* [*s.* רישגלותא] старэйшына дыяспары, тытул правадара гэбрэяў у Бабілёніі пасьля разбурэньня другога Ерусалімскага Храма рымлянамі ў 70 г. [*sin.* roš-hagojle]
rejšn [*d.* Reis?] адрошчваць зялёную цыбулю; прыпраўляць зялёнай цыбуляй; **rejšexc** *n kul.* рэзаная зялёная цыбуля ў тлушчы альбо алеі
rejtlen=rojtlen zix [*d.* roten] расчырванецца, чырванець; **rejtl** *n* губная памада
• rejtlen zix vi a kale чырванець як нявеста (счырванеў як рак вароны/печаны)
rejtúzn *pl.* [*d.* Reithosen] рэйтузы
re(j)vex *m*, *pl.* revoxim [*s.* (ים-)ווח(ר)] заробак, заработак, выгода, даход, прыбытак, барыш(ы)
réjxern/réjxenen=rójxern [*d.* rauchen, rauchern] 1. курыць, паліць, дыміць; 2. *n* курэньне; **a rejxer ton*** курнуць, зрабіць зацяжку; **rejxeráj** *f*, -en вянглярня; **réjxerer** *m* курэц; **réjxer-papir** *n* папросная папера
• rejxern vi a kojmen дыміць як комін (дым як на татарскай працэсіі)
rejzlen [*d.* rieseln] цурчаць, журчаць; мармытаць
rek *pl.* →rok *m*, *dim.* **rekl** *n*, -ex капота, хламіда, сурдут, куртка
rekide *f* [*s.* רקידה] *xsd.* танец, танок, скокі [*sin.* tanc]
rekordirke *f*, -s [*d.* Rekorder] магнітафон
rekrút *m*, -n [*d.* Rekrut] рэкрут; **rekrutírn** (rekrutírt) рэкрутаваць, вербаваць; **rekrutírung** *f* вярбоўка
• in (di) rekrutn у рэкрутах
religiezer [*d.* religiös] рэлігійны; **religje** *f*, -s рэлігія; **religiezkajt** *f* рэлігійнасьць
rels *m*, -n [*r.* рельс] чыгуначная рэйка
• aropgejn*/arop(forn*) fun di relsn сыходзіць з рэек
• aroplozn* fun di relsn пусьціць пад адхон
rem=ram=rom *f*, -en, *dim.* **reml** *n*, -ex рам(к)а, аправа, абрамленьне
remates *m* [*d.* Rheumatismus] *med.* рэўматызм, раматуз, касталом
• di fis zoln dir dinen nor af remates! *kll.* каб табе ногі служылі толькі дзеля раматузу!
• remates in di piates! *kll.* раматуз/касталом табе ў пяткі!
remáx=ramáx ejvrim *pl.* [*s.* רמ"ח אברים →šasa girn, tarjag micves] *tlmd.* усе чалавечыя органы (248); усё цела
• a blinder iz krank af di ojgn, a štumer iz krank af dem mojl, a nar iz krank af ale remax ejvrim *šprxv.* сьляпы – хворы на вочы, нямы – хворы на рот, дурань – хворы на ўсе чалёсы (сьляпы, глухі, дурны – усё роўна; бяз розуму горш, чым без здароўя)
remen=rimen *m*, -s, *dim.* **rímendl** *n*, -ex [*r.* ремень, *p.* rzemień] рамень, рэмень
reméslenik *m*, -es [*r.* ремесленник] рамесьнік; **reméslene(r)** рамесьніцкі
remez *m*, *pl.* remozim (af) [*s.* (ים-)רמז →meramez, birmize, beremez] намёк, прымёк, прымінка, знак [*sin.* onvunk, oncuhereniš, cejxn]; **remózimdik** *adv.* намёкамі, недамоўкамі, недаказам
• redn* remozimdik намякаць
• der remez šlogt štarker, vi der emes *glxv.* намёк б'е мацней за праўду
remí *m*, -en [*fr.* remis] нічыя (у гульні)
• maxn remi згуляць унічыю
remjanik=rumjanek/rumjanik *m bot.* рамон(ак)
Remó *abr.* **reb Mojše Iserls** [*s.* רמ"א=ר' משה איסערלס →Hamape] Рэмо, Майсей Ісэрлс, вялікі рэлігійны аўтарытэт, кабаліст, філёзаф, кіраўнік кракаўскай ешывы (Польшча, каля 1525–1572)
remonént *m* [*šp.* remanente] прылада(к), інструмэнт
remónt *m*, -n [*fr.* remonte] рамонт; **remontírn** (remontírt) рамантаваць
rencl *n*, -ex [*d.* Ranzen, *mhd.* rentsel] ранец (вучнёўскі); сакваяж, чамадан, валіза
rendár=randár=arendár *m*, -n/-es, (-ke *f*, -s) [*p.* arendarz] (а)ранда(та)р, пасэсар
• az a rov tut a šidex mit a rendar, blajbt er tomed a nar *šprxv.* калі рабін мае справу з арандатарам, той яго абавязкова абдурыць
rendl *n*, -ex [*d.* Rand] залатоўка, дукат; чырвонец
• opšitn* mit rendlex абсыпаць золатам
• (ba im iz) a rendl a vort (у яго) слова – золата
• a mol kojft men dem klugn far a grošn un dem nar far a

rendl *šprxv.* часам разумнага купляюць за грош, а дурня за рубель
• a rendl a bilet білет – залатоўка
• a rendl a lojt лот – залатоўка
• a rendl a minut мінута – залатоўка
• a rendl aruf, a rendl arop – abi zix nit gedungen *glxv.* залатоўка туды, залатоўка сюды – абы толькі ня быць абавязаным (з гаворкі гандляроў)
• a rendl iz klejn – ober gevixtik/tajer *šprxv.* рубель маленькі – але важкі (талер маленькі, а даражэнькі; маленькі, да залаценькі)
• az dos mazl gejt fel, iz dos rendl nit gel *šprxv.* як шчасьця німа, дык і залатоўка ня жоўтая
• azoj lang dos rendl iz nit ojsgebitn, gilt es *šprxv.* колькі залатоўку ні мяняй, яна мае вартасьць
• dos rendl meg zajn nox azoj rojt, muz men es ojsbajtn far a brojt *glxv.* якая б чырвоная ні была залатоўка, мусіш яе абмяняць на хлеб
• ix hob zix ajngelibt in a šejn jingele, /šejn, vi a rendl gold, /im, mamenju, hob ix gelibt /un im hob ix take gevolt *flksl.* я закахалася ў прыгожага хлопчыка, прыгожага, як залатоўка, яго, матуля, я палюбіла і толькі б яго хацела
• ven es regnt in drojsn mit rendlex, zict der oreman/šlimazlnik in štub *šprxv.* калі на двары залаты дождж, бядуля сядзіць у хаце (ня быў там, дзе дзялілі)

renét=ranét *m*, -n ранэт (сорт яблыкаў)
renifér *m*, -n [*d.* Ren(tier)?] *zool.* паўночны алень
repak *m* [*p.* rzepak] *bot.* рапс
rephun *f*, *pl.* -hiner [*d.* Rebhuhn] *zool.* курапатка
repórt *m*, -n [*d.* Report] справаздача
rer=rejer *m/f*, -n, *dim.* **rerl** *n*, -ex [*d.* Röhre. Rohr] руля, труба, рурка; **rérndiker** трубчасты, трубкаваты
resondne(r) [*p.* rozsądny] рэзонны, слушны
restoracje *f*, -s [*p.* restauracja] рэстаран
rešante=rošejte/róšete *f*, -s [*s.* רשע(נ)טע(ס-)], **rešás** *f*, -n [*s.* רשעת(ן-) →(ha)roše, rišes, maršas] кепская і злая жанчына, злосьніца
rešéjrn *m*, -s [*s.* ראש־עירון(ס-) →roš-] мэр, бургамістар
rešen [*r.* решать] вырашаць; **rešenje** *f*, -s вырашэньне
réšete *f*, -s [*ukr./r.* решето. *p.* rzeszoto] 1. рэшата; 2. рэшка
• špiln in rešete-odler гуляць у арлянку
• emes vi in a rešete vaser *glxv.* праўда як у рэшаце вада
• vos tut a nar? – er mest in rešete vaser *glxv.* што робіць дурань? – мерае рэшатам ваду (носіць ваду ў рэшаце)
rešime *f*, -s [*s.* רשימה(ות-)] расклад, сьпіс; адзнака, запіс, нататка [*sin.* liste, register; farcejxeniš, notic]
• di rešime fun di limudim расклад заняткаў
rešinke *f*, -s [?] *kul.* пірог з сушанымі фруктамі, які падаецца пасьля рытуалу абразаньня
reške *f* [*r.* решка. *p.* reszka] рэшка
• reške ci odler? арол ці рэшка?
rešl/resl *n*, -ex [?] шарык (для гульні)
rešoim *pl.* →roše *m*, (-te/rošejte *f*, -s) [*s.* רשע(ים-)] зласьлівы, зламысны, кепскі, благі, дрэнны чалавек, паганец, ліхадзей, злачынец, злосьнік, незычлівец; юдафоб
• oj, cadikim, cadikim gejen bom, /oj, rešoim, rešojim faln bom, /bom, bom, biri-biri-bom, /bim-bom, bim-bom, biri-biri-bom... (A. C.) ой, цадзікі, цадзікі ідуць бом, ой, злыдні падаюць бом, бом, бом, біры-біры-бом...

rešotke *f*, -s [*r.* решётка] краты
rešt *f/m/n*, -n, **rešt(k)e** *f*, -s, *dim.* **reštl** *n*, -ex [*d.* Rest, *p.* reszta] рэшта, астача, астатак
• a rešte bobes! *iron.* бабіна рэшта!
• a reštl cu di cores апошняя кропля гора
• der rešt xojv астатак доўгу
• fun a knepl rešte рэшта ад гузіка
réšteven [*ukr.* решетувати] лаціць, абшываць дранкай, абрашэчваць
rešús *m*, -n [*s.* רשות(ן-) →haršoe, biršus-] моц, улада, праўленьне, кіраваньне, валоданьне, кантроль; дазвол, распараджэньне, паўнамоцтва [*sin.* maxt, farvaltung, kontrol; derlojbeniš, fulmaxt]; **rešús-hajóxed** *m* [*s.* היחיד] уласная маёмасьць, уласнае валоданьне тэрыторыяй; **rešús-horábim** *m* [*s.* הרבים] адкрытае месца, грамадзкая маёмасьць, грамадзкае валоданьне тэрыторыяй
• dos iz nit in majn rešus гэта не ў маёй уладзе
• gebn* emecn rešus (cu) даваць камусьці дазвол
• hobn* in rešus разьмяркоўваць, мець у распараджэньні; распараджацца
• ibergebn* in emecns rešus перадаць/прадставіць у распараджэньне камусьці
• nemen* in rešus браць пад уладу
• nemen* rešus браць/прасіць дазвол
• opgebn* zix in emecns rešus аддацца ў чыесьці рукі
• zajn* in rešus знаходзіцца ва ўласнасьці, пад уладай
rešxojdeš=roš-xójdeš *m* [*s.* ראש־ח(ו)רש] пачатак месяца, першыя два дні месяца (паводле гэбрэйскага календару)
• es hot gezolt zajn rešxojdeš, hot der hon a krej gegebn, iz cu ništ gevorn *glxv.* мусіў быць пачатак месяца, певень кукарэкнуў – і нічога німа (лухту непадсяваную лухціць; боб з гарохам мяшаць)
réteniš *f/n*, -n [*d.* Ratsel] загадка; **rétenišdiker, rétenišfuler** загадкавы
• fargebn*/fregn a reteniš задаць/загадаць загадку
• lejzn a reteniš (trefn* dos reteniš) адгадаць загадку
rét(eve)n [*d.* retten, *p.* ratować] (вы)ратаваць, вы-, у|ратоўваць; **reter** *m*, -s, (-n *f*, -s) [*d.* Retter] збаўца, ратаўнік, выратавальнік; **retung** *f*, -en (па)ратунак, уратаваньне, (вы)ратаваньне
retex/retak *m*, -er [*d.* Rettich] рэдзька
• gepreglt in honik iz retex ojx a majxl *šprxv.* гатаваная ў мёдзе рэдзька – таксама ласунак
• "gut-morgn!"– "retex trog ix!" "дабрыдзень!" – "я рэдзьку нясу!" (неўпапад, недарэчы, не да месца)
retikjúl=ridik(j)úl *m*, -n рыдыкюль
retonde=rotonde *f*, -s ратонда
revelacje *f*, -s [*p.* rewelacje] выкрыцьцё, выкрываньне, выяўленьне
reven=roven [*ukr.* ревти] равець, раўці, рыкаць
• reven far vejtik равець ад болю
reverende *f*, -s [*p.* rewerenda] жаночая накідка, палярына, трыніца, сутана
revex=rejvex *m*, *pl.* revoxim [*s.* ר(י)ווח(ים-) →marviex, onrevexdiker, berevex] заробак, заработак, выгода, даход, прыбытак, барыш(ы) [*sin.* fardinst, profit]; **révexdiker, revóximdiker** даходны, прыбытковы; **revoxim** *pl.* адсоткі, процанты
• brengen*/gebn* revex прыносіць даход

• der revex blajbt klepn on di reder *glxv.* прыбытак прыліп да колаў (апуха ня варта кажуха)
• draj zaxn vaksn iber naxt: revoxim, diregelt un mejdl/mejdn *glxv.* тры рэчы растуць уначы: процанты, кватэрная плата і дзяўчына
• er (der ojšer) šloft, un zajne revoxim gejen *sprxv.* багацей сьпіць, а баганьце расьце (нашго пану тужыць, яму і так набяжыць; багатаму і чорт у кашу маслам кідае)

revidern, revidírn (revidírt) [*d.* revidieren] перагледзець, пераглядзець, пераглядаць; **revíderung, revidírung** *f* перагляд
• revidirn di bixer рабіць справаздачу

revii *m*, -s [*s.* (ת-)רביעי →alte] "чацьвертый"; гэбрэй, якога чацьвертым заклікаюць да чытаньня Торы ў сынагозе [*sin.* ferter]
• gebn* emecn revii выклікаць каго осьці чацьвертым
• kadoxes reviis чатырохдзённая трасца

revír *m*, -n [*d.* Revier] акруга; **revírove(r)** акружны (служачы)

revl *n*, -ex [*s.* רבל →rov] малы, мізэрны і малазначны рабін

revoltírn (revoltirt) [*d.* revoltieren] паўстха(ва)ць, узьняць паўстаньне; **revólt** *m*, -n бунт, паўстаньне

revuse *f* [*s.* רבותא] наві(з)на, дзіва, цуд; дзіўная, вялікая рэч (адмыслова ўжываецца ў пытаньнях або ў адмоўных сказах) [*sin.* uftu, vunder, grojse zax, xideš]
• s'iz nit kejn revuse, az... ня дзіва, што...
• vos iz di revuse? што тут дзіўнага?

rexáš=raxáš *m abr.* **rov - xazn - šames** [*s.* - חזן - רב=רח"ש שמש] рабін - кантар - служка; грошы, якія плацяць у розных выпадках, зьвязаных з кагальнымі рытуаламі; сватаўскія грошы

réx(e)nen (af, far, cu) [*d.* rechnen] рахаваць, лічыць; **a rexn ton*** зрахаваць, падлічыць; **réxener** *m*, -s чалавек, які вядзе разьлік; **réxenendik** *adv.* лічачы, з улікам; **réxenung** *f*, -en, **réxentšaft** *f* рахунак, рахуба, разьлік; **réxn(-)bejndlex** *pl.*, **réxnbretl** *n*, -ex лічыльнікі; **réxntbux** *m/n*, *pl.* -bixer задачнік; **réxnakt** *m* арытмэтычнае дзеяньне
• a tajčiše rexenung нямецкі (дакладны) разьлік
• opgebn* zix a rexenung (fun) разьлічыцца
• rexenen emecn far a paskudnjak лічыць кагосьці за паскудніка

rexiles *n*, -n [*s.* (ן-)רכילות] абгавор, паклёп, зьнявага, абраза, плёткі, пляткарства [*sin.* barederaj; lošn-hore; pljotke, bilbl, farlojmdung]; **rexílesdiker** паклёпніцкі, зводнічны; **rexílesnik** *m*, -es, (-nice *f*, -s), **rexíles-trajber** *m* зласьліўца, паклёпнік, пляткар, плётнік, абмоўнік, звод, зводзень, брахун; **rexíles-trajberáj** *f* абмаўленьне, абняслаўленьне, кляпаньне, браханьне; **rexilesn** абгаворваць, пляткарыць, паклёпнічаць
• dos vilde (a gemejn) rexiles гнюсны паклёп
• onredn*/trajbn* rexiles (af) абгаворваць, пляткарыць, паклёпнічаць
• dos ergste rexiles iz der emes *glxv.* самы злы паклёп – праўда
• fun rexiles un sojdes antlojf vi fun šejdim ад плётак і ад сакрэтаў уцякай як ад чарцей (шэпты хату зводзяць /губяць)
• rexiles iz di ergste mide *glxv.* паклёпнічаць – найгоршая манера

rexnen [*d.* rächen] (ад)помсьціць

rext *n* [*d.* Recht] права; **rexter** правы; правільны, сапраўдны, ладны, значны; **rexts** *adv.* направа, управа, справа; **réxtlexer** прававы; **rextbrégiker** правабярэжны; **réxtbrexer** *m* правапарушальнік; **réxtbrexung** *f* правапарушэньне; **rextcájtiker** своечасовы; **rextcájtikajt** *f* своечасовасьць; **réxtfartikn** [*d.* rechtfertigen] апраўд(в)аць; **réxtfartiker** справядлівы, правільны, прыстойны; **réxtfartikajt** *f* справядлівасьць, правасудзьдзе; **réxtglojbiker/réxtglejbiker** прававерны; **réxthantiker** праўша, праўшун; **réxtloz(ik)er** бяспраўны; **réxtlozikajt** *f* бяспраўнасьць, бяспраўе; **réxtmaxtiker** правамоцны; **réxtmesiker** правамерны; **réxtmesikajt** *f* правамернасьць; **réxtšafnkajt** *f* сумленнасьць, прыстойнасьць; **réxt-tetikajt** *f* правасудзьдзе
• a rexter nar сапраўдны дурань
• bejde mol rext! і гэта праўда, і гэна праўда!
• cu rext maxn ладзіць, даводзіць да ладу
• in der rexter cajt у добры час
• mit di rext fun a gast на правох госьця
• rext af dir/im! так табе/яму й трэба!
• rexte zajt поўдзень (кірунак сьвету)
• rexts un links улева-ўправа (туды-сюды, ва ўсе бакі, так-сяк накасяк)
• s'iz nit rext нельга
• s'vet rext vern! будзе льга!
• vi epes rexts як нешта сапраўднае
• beser a bisl un rexts, ejder a sax/fule un šlexts *glxv.* лепей трошкі, але добрага, чымся шмат, але благога (лепш крышачку, абы добрага)

rezede *f*, -s [*d.* Resede] *bot.* рэзеда

rezignírn (rezignírt) [*d.* resigniert] пада(ва)ць у адстаўку, звольніцца, звальняцца; **rezignacje** *f*, -s, **rezignirung** *f*, -en рэзыгнацыя, адстаўка, пакорлівасьць; **rezignirter** *m* адстаўны, звольнены

rezín *m*, -en, **rezine** *f* [*fr.* rézine] гума

reznje/réznice *f*, -s [*p.* rzeźnia, *ukr.* різниця] разьніца, бойня

režisér/režisór *m*, -n, (-še *f*, -s) [*fr.* régisseur] рэжысэр; **reží** *f*, -en рэжысура; **režisírn** (režisírt) рэжысіраваць

rib *m*, -n, **ribn** *m*, -s [*d.* Rube] *bot.* рэпа
• axt brider zajnen mir gevezn, /hobn mir gehandlt mit ribn; /ejner iz geštorbn, /iz geblibn zibn *flksl.* нас было восем братоў, мы гандлявалі рэпай; адзін памёр, нас засталося сем
• ix hob dix lib vi a farfojlte rib *glxv.* я цябе люблю як гнілую рэпу
• vi kumen di ribn in dem zak? *glxv.* як трапілі рэпкі ў мех? (аб дзьвюх розных рэчах, якія трапіліся разам)

riba *f* [*sl.*] рыба

ribajzn=rájbajzn *m*, -s [*d.* Reibeisen] тарка

ribes [*s.* ריבית] грашовыя процанты, інтарэс, барыш [*sin.* geltprocent, interesn, voxeraj]; **ríbesnik** *m*, -es ліхвяр; чалавек, які жыве з грашовых процантаў [*sin.* procentnik, voxernik]

ribójne-/rebójne-dealme(-kúle) [*s.* רבונו־דעלמא(־קולא)] уладар сусьвету, (пан) бог, госпад (звычайна ў якасьці вокліча) [*sin.* got, rebojne-šelojlem]; **ribójne-/rebójne-šelojlem** *m* [*s.* ־של־עולם] уладар сусьвету, бог, гаспадзь, госпад

ricn [*d.* ritzen] (па)драпаць, (па)драць; **ric/rič** *m*, -n драпіна, скрабіна, пісуга, пісужына, пісюга
• ric rojter крывава-чырвоны
ricnejl *m* [*d.* Rhizinusöl, *p.* olej rycynowy] рыцына
• azoj fil ricnejl zolstu ojstrinken! *kll.* каб ты рыцыну жлукціў!
ričen [*p.* ryczeć, *ukr.* ричати] рычаць, рыкаць; **a riče ton*** рыкнуць
ričke *f*, -s, *dim.* **ríčkele** *n*, -x [*ukr.* річка] рэчка, ручай
ričn zix [*d.* ritschen, rutschen?] цягнуцца, валачыся, паўзьці; **ričer** *m*, -s маланка (засьцежка)
ridik(j)úl=retikjúl *m*, -n [*fr.* ridicule] рыдыкюль
ridl *m*, -en/-s [*p.* rydel] лапата, рыдлёўка; **ridlen** капаць
• mit ridlen cu šarn заграбаць рыдлёўкамі
ri(d)zen=grižen [*p.* grzyść, *ukr.* гризти] грызьці
rie *f* [*s.* ראי"ה →xuś-harne, roje-, reej] зрок
• a štarke rie моцны зрок
• hobn* a vajte/niderike/kurce rie быць далёказрочным /нізкавокім
• maxmes der šlexter rie з прычыны дрэннага зроку
• mit a šarfer rie з вострым зрокам
• der jid šlogt zix mit der deje un šist mit der rie *glxv.* жыд б'ецца думкамі і страляе вачыма
rien=rojen [*p.* ryć, *ukr.* рити] рыць
rien=rojen zix [*p.* roić się] раіцца, кішэць
riftl=reftl *n*, -ex акраец, скрылёк, скіб(к)а, луста
rígeven=fastrígeven [*p.* fastrygować] 1. (фа)стрыгаваць; 2. перасоўваць; **rigevanje** *f* фастрыгаваньне
rigl=regl *m*, -en [*d.* Riegel] завалка, засаўка
rike *f*, -s [*ukr.* рика] рака, ручай
riked *m*, *pl.* rikudim, **rikúdl** *n*, -ex [*s.* (ים-)קוד(י)ר] *xsd.* танец (удзельнікі становяцца ў карагод і бяруцца за рукі або кладуць адзін аднаму рукі на плечы) [*sin.* tanc]
rile *f*, -s, *dim.* **rilce** *f*, -s [*ukr.* рило] рыла
• farmax dajn rile! закрый сваё рыла!
rim *m* [*p.* rum] рум
rimen [*d.* ruhmen] хваліць
• rimen epes/emecn vi a šadxn выхваляць кагосьці/штосьці як сват
• rimen un lojbn узьвялічваць, выхваляць
rimen=remen *m*, -s, *dim.* **rímendl** *n*, -ex. **rimet** *m*, -n [*d.* Riemen] рамень, рэмень: выпрабленая скура; **rímener** раменны, скураны
• majne rimendlex vegn ariber dajne dimentlex *glxv.* мае раменьчыкі пераважаць твае брыльяньцікі
rimer *m*, -s [*p.* rymarz] рымар
rimplen=rumplen [*d.* rumpeln] гракатаць, грамыхаць; брынкаць, дзынкаць, рыпаць, тромкаць
rinál=urinál *m*, -n судна для хворых, "качка"
rinčók *m*, -es [*p.* rynsztok] невялікі рынак
rind *n*, -er [*d.* Rind] быдла, буйная рагатая жывёла; **rinder** *pl.*, **rínd-fi** *n* буйная рагатая скаціна; **rínderner** ялавічны; **rínd(n)flejš** *n*, **rínderns** *n* (ríndern flejš) ялавічына; **ríndfets** *n* (ríndern fets) ялавічны тлушч; **rínd-štal** *m/f*, -n хлеў, абора
• kejn kind kejn rind (on a kind un on a rind) ні вала ні кала (ні хаты ні лапаты; ні плоту ні азяроду; ні курчаці ні парасяці)
rinen* (iz gerunen) [*d.* rinnen] цячы; **rin** *m*, -en цеча; **ríndiker** цякучы; **rinexe** *n* прасочваньне, цеча; **rinung** *f* цячэньне
• der dax rint дах цячэ
• es rint ibern mojl цячэ з рота (узбрэж, у пераліўкі)
• Dajn mine, dajn šmejxl, dajn ejdele figur... /Oj, zog že mir, du ojg, vos iz mit dir der mer, /az ven du laxst mit grojs frejd, /dan rint fun dir a trer... *flksl.* Твой твар, твая улыбка, твой высакародны стан... Ой, скажы мне, ты вока, што з табой, калі ты сьмяешся ў вялікай радасьці, тады цячэ й сьляза...
ring *m*, -en, *dim.* **ríngele** *n*, -x [*d.* Ring] зьвяно, круг, кола; пярсьцёнак, кальцо; **ríngeven** кальцаваць; **ringlen zix** круціцца, кружыцца, віцца; **ringung** *f*, -en віток; **ringler** *m*, -s кіраўнік групы/зьвяна; **ríngfinger** *m* безыменны палец; **ríngltojb** *f*, -n *zool.* вяхір
• ringen far di ojgn кругі пад вачыма
ring *m* [*mhd.* ring, *p.* rynek] рынак, кірмаш
rinštok *m*, -n [*p.* rynsztok], **rin(v)e/ríndeve** *f*, -s рына, латáк, ры(н)шток; канава, роў
• mitn mojl/cung megstu afile a rinštok ojsramen, ober di hent loz curu *glxv.* языком можаш нават рыну вычысьціць, але рукам волі не давай
rip *f*, -n [*d.* Rippe] *anat.* рабро, рабрына
• derlangen emecn in/biz der zibeter rip моцна ўдарыць, выцяць
• er lojft arum un zuxt zajn rip *glxv.* ён бегае вакол і шукае сваю рабрыну (сваю пару)
ripen [*ukr.* рипіти, *p.* grać] рыпаць, рыпець, скрыпець, скрыпаць; **riplke** *f*, -s рыпалка, трохструнная скрыпка
• gegesn, getrunkn fun tajerstn sort, /dos vajn hot gerunen ariber der bord, /un s'hobn biz iber der zibeter gas /di fidlen gevejnt un geripet der bas (M. L.) елі й пілі ўсё самае лепшае, віно лілося цераз край, і нават на сёмай вуліцы чуўся плач скрыпкі і рыпаньне басэтлі
rípkele *f*, -s [*ukr./r.* гриб] грыб
rípkuxn *m* [*d.* Rippe] рахітызм, пакрыўленьне касьцей
rips *m* [*d.* Rips] *tekst.* рыпс; **rípsener** рыпсавы
rirn (mit) [*d.* ruhren] пасунуць, паварушыць, крануць, кратаць, чапаць; **rir** *m*, -n 1. дотык, датыканьне; 2. (з)рух; **a rir ton*** паварухнуць, паварушыць, крануць; **rír(n-d)iker, rírevdiker** узрушлівы, рухавы, рухлівы, спрытны; чульлівы, жаласьлівы; **rírevdikajt** *f*, **rírenіš** *n* рухавасьць, спрытнасьць; **rir-mix-nit-ón** *m/f* 1. недатыка; 2. мімоза
• a rir ton* zix fun ort крануцца зь месца
• cu a rirevdiker вёрткі, вяртлявы
• rirn a štejn расчуліць камень
• rirn epes funem tojtn punkt зрушыць штосьці зь мёртвай кропкі
• rirn zix vi a ber (in hrečke) варочацца як мядзьведзь (у грэчцы) (варочаецца што вол у хляве)
• rirn zix vi a blajener fojgl рухацца/варочацца як целяпень (як мех/мярлюй, што вол у хляве)
• un di zax rirt zix nit funem ort (s'rirt zix fun ort nit!) справы не крапаюцца зь месца
• nit rirn zolstu zix fun ort! *kll.* каб ты зь месца не крануўся! каб ты колам стаў!
• rir dem mojer, di unterste bervene! паварушы мур, ніжняе бервяно! (нешта немагчымае)
ris *m*, -n [*d.* Riss] разрыў, прарэх, дзірка; рывок; **a ris ton*** (і)рвануць

• a ris in haren сэрца ёкнула
risek-éjvrim *m* [*s.* ר(י)סוק־אברים] "разрываньне/расьціскаьне чалёсаў"; востры боль пасьля ўдару або пасьля цяжкай працы
riseven [*p.* rysować] маляваць; **risunek/risunik** *m*, -nkes малюнак; **risovanje** *f* маляваньне
risjove(r)=rusjave(r) русы
riskal *m* [*ukr.* рискаль] капаніца, матыка, кірка, зялязьняк, рыдлёўка, рыдаль, грацоўка
ristokrát *m*, -n *iron.* арыстакрат (наўда вялікая; фігурант, боты ў рант)
rišes *n* [*s.* ר(י)שעות →(ha)roše, rešas, maršas] зло, злосьць, злаваньне, зласьлівасьць, зламыснасьць; сапсутасьць, сапсаванасьць; варожасьць, нянавісьць да гэбрэяў [*sin.* šlextskajt, bejzvilikajt, fardorbnkajt, jidn-fajntšaft]; **ríšesdiker** злы, зласьлівы, злосны, зламысны
• a rišesdike kavone злосны намер
• a rišesdiker blik злы погляд
• rejdn* rišes af emecn абгаворваць/аблайваць кагосьці
rišn *m* [*s.* ראשון →horišn; alie] "першы"; гэбрэй, якога першым заклікаюць да чытаньня Торы ў сынагозе [*sin.* eršter]; **rišojnim** *pl.* [*s.* ראשונים →poskim-rišojnim] былыя пакаленьні, продкі; папярэднікі, піянэры [*sin.* amolike dojres, oves; forojsgejers, pionern]
• gebn* emecn rišn выклікаць кагосьці першым
rištevanje/rištovanje=ruštovanje *f*, -s [*ukr.* риштовання] рыштаваньне
riter *pl.* →rut *f*, **ritl** *n*, -ex прут, прэнт, розгі
riter=ricer *m*, -s [*d.* Ritter, *p.* rycerz] рыцар; **ríterlexer, ríter(i)šer** рыцарскі; **rítertum** *n*, **ríteriškajt** *f*, **ríteršaft** *f* рыцарства
riv *m*, -n [*ukr.* рів] роў; **rivčak/rivčok/rivčik** *m*, -es равок, калдобіна
rival *m*, -n. (-n *f*, -s) [*d.* Rival] сапернік (у каханьні); **rivalizírn** (rivalizírt) (mit) сапернічаць
Rivke=Rifke *f* [*s.* רבקה] *tnx.* Рэбэка, Рыўка (жонка Ісака)
• az me zet nit Sore di blinde, iz Rivke di švarce šener *šprxv.* як не да спадобы сьляпая Сора, дык чорная Рыўка прыгажэй
rixtn [*d.* richten] 1. накіраваць, накіроўваць; 2. судзіць; **ríxt(ik)n zix** (af, cu) рыхтавацца, чакаць; **ríxteven** [*p.* rychtować] рыхтаваць, кіраваць, рэгуляваць; **rixter** *m*, -s, (-n *f*, -s) судзьдзя; **ríxterišer** судзейскі; **ríxtiker** правільны, слушны, стырновы; **ríxtikajt** *f* правільнасьць, дакладнасьць; **ríxt(ik)ung** *f*, -en напрамак, (на)кірунак; **ríxtndiker** які накіроўвае, накіравальны; **ríxtcejxn** *m*, -s тычка, вяха; **ríxt-šnur** *m*, -n адвес, грунтвага
• di rixtike cajt дакладны час
• in ale rixtungen па ўсіх кірунках
• in der zelber rixtung у тым жа напрамку
• rixtik vi gold праўда як золата (як бог на небе)
• rixtik vi in di gazetn праўда як у газэтах (праўды як у жабрака грошай; праўда як у рэшаце вада, як на вярбе ігрушы; праўда такая як вош кашляе)
• rixtn zix (in kimpet) чакаць (рыхтавацца да) родаў
• az me rixt zix af a grojsn ojlem, kumt kejn mešugener hint nit *glxv.* калі разьлічваць на вялікі натоўп, ня прыйдзе аніводны шалёны сабака
riz *m*, -n [*d.* Riese] калос, гігант, волат, асілак; **ríz(ed)iker, rízndiker** велічэзны, велізарны, вялізны; **ríznkraft** *f* валатоўская моц; **rízštarker** валатоўскі
• a riz af lejmene fislex калос на гліняных нагох
riz=ris *m*, -n [*d.* Ries Papier, *p.* ryza] стапа, стос (паперы)
rizen=ridzen=grižen грызьці
rizikírn (rizikírt) (mit) [*d.* riskieren, *p.* ryzykować] рызыкаваць; **a ríziker ton*** рызыкнуць; **rízike** *f* рызыка; **rizikánt** *m*, -n, (-ke *f*, -s) рызыкант; **rizikálišer, rizikirter, rizikántišer** рызыкоўны
• af majn rizike на мой страх і рызыку
• gejn* af rizike ісьці на рызыку
• nox vos umzist rizikirn? навошта дарма рызыкаваць?
rizlen [*d.* rieseln] струменіць, бегчы (аб струменьчыку); цурчаць, журчаць; **rízldiker** які цурчыць, журчыць
riže(r) [*ukr.* рижий, *p.* rydzy] рыжы, руды
r(j)ábine *f*, -s *bot.* рабіна
rjad *m*, -n [*ukr./r.* ряд] рад, шэраг
rjadovój *m* [*r.* рядовой] радавы, шаранговы (жаўнер)
rjase *f*, -s [*ukr./r.* ряса] раса (сьвятарская вопратка)
rjáženke *f* [*r.* ряженка] ражанка
r"l *abr.* **raxmone-liclán** [*s.* ר"ל=רחמנא־ל(י)צלן] барані /бронь/крый нас божа, хай нас бог крые
rob *m*, -n, **robe** *f*, -s [*d.* Rabe] *zool.* крумкач, груган, варона, крук
• di roben ejne alejn hobn gekraket адны толькі крумкачы каркалі
robe *f*, -s [*d.* Robe] роба
roc=rost *m* іржа; **rocn=rostn** іржавець; **róciker** іржавы
roc *m* [*d.* Rotz] сапля, смаркачы, смаркавіньне; **rocer** *m*, **rócjung** *m*, **róclefl** *m pejor.* смаркач
rocn *m* [*s.* רצון →šabes-rocn, berocn] жаданьне, воля [*sin.* viln]
• Maj ko mašme lon der zejger? /Vos že lozt er mir cu hern? /Mit zajn gelbn cifer-bletl, /mit zajn klingen, mit zajn švern? /S'iz an ongeštelte kejle, /s'hot kejn lebn, kejn gefiln, /kumt di šo, dan muz er šlogn, /on zajn rocn, on zajn viln... (A. R.) Які сэнс мае гадзіньнік? Што ж я магу ад яго пачуць? Са сваім жоўтым цыфэрблятам, са сваім цяжкім боем? Гэта штучная рэч, без жыцьця, без душы, настае час, і гадзіньнік б'е, хоча ён таго ці ня хоча...
rocxim *pl.* →recejex/recojex=rojcejex *m* [*s.* רוצח(-ים)] разбойнік, галаварэз, забойца, кат, злачынец, ліхадзей, вылюдак, зьвер, душагуб; **rócxeven** разбойнічаць, лютаваць, катаваць, ліхадзейнічаць; **rócxišer** разбойніцкі, зьверскі, люты, злачынскі, ліхадзейскі; **rócxiškajt** *f* лютасьць, бязьлітаснасьць, няшчаднасьць, ліхадзейства, зьверства
• rocxiše majsim зьверствы
• rocxišer onfal разбойніцкі напад
rod *n/f*, *pl.* reder, *dim.* **redl** *n*, -ex [*d.* Rad] кола, круг, карагод; **ródeven** каціцца; **ródbiksl** *n*, -ex букса; **ródbrexn*** калесаваць; **ródfelgn** *m* вобад; **ródšpajxn** *m* сьпіца (у коле)
• arajnštekn a flokn in rod устаўляць палкі ў колы
• nejtik vi a finft(e) rod cum vogn патрэбна як пятае кола ў возе (да возу; як сабаку пятая нага/лапа (другі хвост), як дзірка ў мосьце)
• az der vogn falt, zajnen di reder cu šver *šprxv.* калі воз падае, колы робяцца задужа цяжкімі
• In rod arajn, in rod arajn, /tanet alc hexer, hexer! /S'iz ba

R

undz di simxe grojs. /to gist on ful dem bexer! /Tanc, tanc, tanc a bisele mit mir, / du host lib dem ejdem, /un ix hob lib di šnir. *flksl.* У кола, у кола, танцуйце ўсе мацней, мацней! У нас вялікая радасьць, дык налівай паўней келіх! Патанцуй трошкі са мной, табе падабаецца зяць, а мне – нявестка.

rodfim *pl.* →rojdef *m* [*s.* (רודף-)ים] перасьледнік, ганіцель, прыгнятальнік

rodiš=rudiš *m*, -es [?] *kul.* печаны яблык у салодкім цесьце

roe *f*, -s [*s.* (רעה-)ות] зло, бяда, ліха, няшчасьце, непрыемнасьць, шкода [*sin.* šlexts, umglik, šodn; *ant.* tojve]

• ix vil nit dajn roe я табе ліха не жадаю

• far a tojve kumt oft mol arojs a roe *šprxv.* паслуга часта канчаецца ліхам

• fun a gutn frajnd di klenste roe krenkt mer, vi fun a sojne di greste *šprxv.* ад добрага сябра меншае ліха болей баліць, чым ад ворага большае

• fun ale roes kumen arojs tojves *šprxv.* ліха без дабра не бывае (ліха перамелецца, дабро будзе; ліха ня ўморыць, толькі раз натворыць)

roe (cu) [ראוי] варта, карысна; дапасавана, адпаведна, [illegible], стала, гатова, падрыхтавана [*sin.* vert. verdik; pasik, [illegible], cajtik, dervaksn]; **róedikajt** *f* выбіральнасьць, адпаведнасьць, падрыхтаванасьць; **roe-lehojróe** [*s.* להוראה] здольны на вырашэньне спрэчных пытаньняў (даваць парады); адпаведна з пасадай рабіна; **roe-lexúpe** [*s.* לחופה] адпаведна шлюбнаму ўзросту; **roe-livróxe** [*s.* לברכה] 1. гатовы для прамаўленьня блаславеньняў; 2. падрыхтаваная да шлюбу (аб дачцэ)

rofe *m*, -s [*s.* (ס-)רפה →nekude] (ֿ) гарызантальны штрых (дыякрытычны знак) над гэбрэйскімі літарамі ў ідышы "v", "f" [*s.* בֿ. פֿ]

rog=rug *m*, -n рог (перакрыжаваньне вуліц)

rogal *m*, -es [*p.* rogal] брошка ў выглядзе паўмесяца

rogatke *f*, -s [*p.* rogatka] рагатка (на дарозе), каза, шлагбон

rogl *m*, *pl.* regilim [*s.* (רגיל-)ים →regiles, margl] спрактыкаваны, дасьведчаны, звыклы, прывычны чалавек [*sin.* geniter, gevojnter]; **rógldiker** звычайны, прывычны

rogovke/rógevke *f*, -s [*p.* rogówka] квадратная шапка

rog(o)že *f*, -s, **rogež(k)e** *f*, -s [*p.* rogoża, *ukr./r.* рогожа] рагожа

rohač *m*, -es [*ukr.* рогач] рагач, вілкі

rohočen=rahočen 1. рагатаць; 2. шчыкатаць, казытаць, ласкатаць

roj *m*, -es [*p.* rój, *r.* рой] рой

roj *m*, -en [*p.* rów, *r.* ров] роў, яр

rojbn (ba) [*d.* rauben, *mhd.* rouben] рабаваць, грабіць; **rojb** *m* здабыча; **rojber** *m*, -s, (-ke *f*, -s) рабаўнік, грабежнік; драпежнік; **rojbung** *f*, **rojberáj** *f*, -en грабеж, рабаваньне, рабаўніцтва, рабунак; драпежніцтва; **rójberišer** рабаўніцкі, грабежніцкі, разбойніцкі; драпежны, хіжы; **rójbfojgl** *m*, -en драпежная, хіжая птушка; **rojb-xáje** *f*, -s [*s.* (חיה-)ות] драпежны зьвер, драпежнік

• ver es lernt nit zajn zun a meloxe, der grejt im cu rojberaj *šprxv.* хто ня вучыць свайго сына рамяству, той рыхтуе яго да крадзяжу (хто дзяцей балуе, вяроўку ім на шыю гатуе)

rojcejex=recejex/recojex *m*, *pl.* rocxim [*s.* (רוצח-)ים] разбойнік, галаварэз, забойца, кат, злачынец, ліхадзей, вылюдак, зьвер, душагуб

rojdef *m*, *pl.* rodfim [*s.* (רודף-)ים →redife, nirdef] перасьледнік, ганіцель, прыгнятальнік; **rojdef-kóved** *m*, *pl.* rodfe-/rotfe-koved [*s.* (רודפי) כבוד] чалавек, які ганяецца за прэстыжам; **rójdefn** 1. **rojdef zajn*** пра-, пера|сьледаваць, уціскаць, гнаць, ганяць [*sin.* farfolgn]; 2. *n* прасьледаваньне, перасьледаваньне; ганеньне; **rojdef-šólem** *m*, *pl.* rotfe-šólem, **rojdef-šólemnik** *m*, -es [*s.* (רודפי) שלום] *iron.* міралюб, міратворца, пацыфіст; міралюбівы, міралюбны чалавек [*sin.* šolem-zuxer, fridlexer menč, pacifist]

rojen=rien рыць

rojen [*mhd.* rohen, *md.* rühen] выць, ныць, скуголіць, скаголіць, скавытаць; **rójerhéjt** *adv.* скуголячы, выючы, ныючы

rojen=rien zix [*p.* roić się] раіцца, кішэць

• in ganejdn rojet er *hum. glxv.* у раі ён супакоіцца (*vrtš.* "ruen" – "rojen") (пра чалавека, які не заслужыў навагі)

rojer [*d.* roh] сыры, неапрацаваны; **rójlexer** неапрацаваны; **rójerhéjt** *adv.* сырым чынам; **rójerd** *f* цаліна; **rojkajt** *f* сырасьць, неапрацаванасьць; **rójvarg** *n*, **rójmaterjal** *m*, -n, **rójštof** *m*, -n сыравіна; **rójšveml** *n*, -ex *bot.* суравежка, сыраежка; **rójzajd** *f* шоўк-сырэц

• a rojer menč навічок

• a xazer est gekajte zaxn, un a hunt xapt roje *šprxv.* сьвіньня есьць перажаванае, а сабака хапае сырое

• az me koxt mit štroj, blajbt dos esn roj *šprxv.* хто варыць на саломе, той будзе есьці сырое

roje-veejne-níre *m* [*s.* רואה־ואינו־נירא →rie, reej. xuš-harie] няўгледка [*sin.* ništ-gezeener]

roje-xéžbn/-xéžbm *m*, -s [*s.* (רואי-/ס-) רואה־חשבון] бухгальтар, кнігавод; інспэктар, рэвізор [*sin.* buxhalter; inspektor]

roje-zójnes *m* [*s.* (רועי-/ס-) רועה־זונות →zojne, znus, mezane, bejs-zojnes] зводнік, сутэнэр

rojfe *m*, *pl.* rojfim, (-te *f*, -s) [*s.* (רופא-)ים →refue] лекар, фельчар [*sin.* mediciner; feldšer, hejler]; **rojfe-xójlim** *m* [*s.* חולים] "лекар хворых"; азначэньне для бога [*sin.* hejler fun kranke, got]

• a dokter un a rojfe tor men nit vinčn a gut-jor *glxv.* доктару і фельчару нельга зычыць добрага году (маўляў, яны будуць мець шмат хворых)

• di cajt iz der bester dokter/rojfe *glxv.* час – найлепшы лекар

• mit a grojsn rojfe gejt a grojser malex *glxv.* вялікага лекара суправаджае вялікі анёл

rojfn [*d.* raufen] выдраць, выдзіраць, выр(ы)ваць, выскубаць, вышморгваць

rojg *m*, -n [*d.* Rogen] ікра; **rojgner** *m* рыба з ікрой; **rójgegen** нераставаць

• oplejgn rojg класьці ікру

rojgez *m* [*s.* רוגז →ragzn, rugze, b(a)rojgez, de(r)ragzenen] гнеў, лютасьць, злосьць, злаваньне, узлаванасьць, раззлаванасьць, азлобленасьць, сердаваньне [*sin.* corn. kaas; cekrigtkajt, dos zajn cekrigt]; **rójgezdiker** раззлаваны, злы, гнеўны, злосны, зласьлівы; **rójgezn zix** гневацца, злаваць

• beser der eršter rojgez ejder der cvejter/anderer *glxv.* першая злосьць лепш за другую

• mit rojgez/rugze fort men nit vajt (vestu vajt nit farforn) са злосьцю далёка не заедзеш (злуе, сябе за хвост грызе)

rojm *m*, -en [*d.* Raum] прастора; **rójmiker** прасторны, разьлеглы, вольны; **rójmlexer** прасторавы

Rojm *n* [*d.* Rom] г. Рым; **rójmišer** рымскі; **rojmer** *m*, (-n *f*, -s)

рымлянін; **rójmiš-katójlišer** рыма-каталіцкі
ro(j)men=ramen [*d.* raumen] чысьціць, прыб(і)раць
rojmen [*d.* raunen, *mhd.* rûmen] шантаць, нашэптваць; цурчаць, журчаць
rojpe *f*, -s [*d.* Raupe] 1. вусень; 2. гусеніца; **rójpn-traktor** *m*, -n гусенічны трактар
ro(j)r *m* [*d.* Rohr] *bot.* трысьнёг, трысьцё, чарот
rojšem *m*, -s [*s.* (ם-)שם(ו)ר →barojšemen] уражаньне, узьдзеяньне, уплыў [*sin.* ajndruk, virkung]; **rójšemdiker** выразны, уражвальны, уплывовы
• maxn a rojšem (af) рабіць уражаньне
• maxn dem rojšem, az... зьдзіўляцца, шго...
• nit maxn kejn rojšem не зрабіць ніякага ўражаньня (праваліцца)
rojše-verúbe [*s.* ראשרובו] уласнай душой і целам [*sin.* mit zajn lajb un lebn]; **rojši-verúbi** [*s.* ראשרובי] усёй маёй душой і целам, са шчырым сэрцам
rojšn [*d.* rauschen] шумець; **rojš** *m*, -n шум, гул; шастаньне, шолах, шамаценьне, шапаценьне, шалясьценьне; **rójš(n-d)iker** шумны, шумлівы; **rójšlozer** бясшумны
• a klejne matbeje maxt a grojsn rojš (a sax tuml fun gornit) *šprxv.* дробная манэта робіць вялікі шум (шмат тлуму зь нічога) (пустую бочку далёка чуваць)
rojšt *m* [*lit.* raĩstas] ройст(а), падлесак, зарасьнік, хмызьняк
rojt *f* [*mhd.* rute] алмаз, дыямэнт
• (oder) rojt oder tojt! жыцьцё (дыямэнт) або сьмерць! (была не была; ці пан, ці прапаў)
rojter [*d.* rot] чырвоны; **rojtlen=rejtlen zix, rojt vern*** (па)чырванець, пунсавець; **rójtlexer** чырванаваты; **rójt-(lex)kajt** *f* чырвань; румянец; **rojt(s)/rojc** *n kort.* чырвы; **rojtbákiker** чырвонашчокі; **rójtfarbiker** чырвонага колеру; **rójtholc** *n* чырвонае дрэва; **rójthojtiker** чырвонаскуры; **rójthoriker** рыжавалосы; **rójtkelxl** *n*, -ex, **rójtheldzl** *n*, -ex *zool.* малінаўка; **rójtkepl** *n*, -ex, **rójtšveml** *n*, -ex *bot.* асавік, падасінавік; **rójtvajn** *m* чырвонае віно
• di rojte jidelex гэбрэі з чырвонымі тварамі [→Sambatjen]
• rojt hinter/unter di ojer чырвоны за вушамі (дужы, у сілах – звычайна аб састарэлым чалавеку)
• rojt vi (a) cvik/burik/blut/funk/fajer/cunter, vi an indik чырвоны як бурак/кроў/іскра/агонь/цэра/індык (як гіль/жар/рак/мак/каліна/кроў)
• rojtinke epelex чырвоненькія яблычкі
• ba naxt zajnen ale ki rojt *šprxv.* уначы ўсе каровы чырвоныя (паначы ўсе каты шэрыя/буйныя)
• ejn rojte ku iz do af der velt? *glxv.* ці адна чырвоная карова ў сьвеце?
• far a rojtn zol men zix hitn *glxv.* сьцеражыся рыжых (лысы, рыжы і кутарногі – то найгоршыя людзі)
rojx *m.* -n/-es, *dim.* **rejxl** *n*, -ex [*d.* Rauch] дым; **rójx(ene)n/rójxern=réjxern** [*d.* rauchen] 1. курыць, дыміць; курэць, курадыміць; 2. *n* курэньне; **rójxerer** *m*, -s курэц; **rójxiker** дымны; касматы; **rójxerdiker** дымячы; **rójxlozer** бяздымны; **rójxerpapir** *n* папіросная папера; **rójxšlejer** *m*, -s дымавая заслона; **rójxervarg** *n* духмяныя рэчывы
• fun deruf iz gevorn aš mit rojx застаўся адно попел і дым
• lozn*/blozn* a rojx in di ojgn пускаць дым у вочы
• ale kojmens šmekn mit (nox) rojx *glxv.* усе коміны пахнуць дымам
• beser az der man šmekt nox vint, ejder az er šmekt nox rojx *glxv.* лепш хай мужык нюхае вецер, чымся чад (лепш хай ідзе шукаць заробку, чымся мяшаецца на кухні)
• Di jorelex cien, di jorelex flien, /zej gejen avek vi a rojex... /Ven ix dermon zix in dir, majn zis lebn, /gejt mir ojs majn kojex. *flksl.* Гадочкі цягнуцца, гадочкі ляцяць, яны зьнікаюць як дым... Калі я ўзгадваю цябе, мая радасьць, пакідаюць мяне сілы.
• dort, vu es iz a rojx, iz a fajer ojx (on fajer iz kejn rojx nit; on fajer iz nito kejn rojx; vu rojx, dort iz fajer) *šprxv.* дзе дым, там і полымя (дзе гарыць, там і курыць)
• er klert, vu di rojxes kumen ahin *glxv.* ён разважае, куды дым дзяецца
• rojx est uf di ojgn *šprxv.* дым выядае вочы
rójxvarg *n* [*d.* Rauchwerk, Rauchwaren] футравіна, футра, пушніна; **rójxvarger** *m*, -s гандляр футравінай
rojz *f*, -n, *dim.* **réjzele** *n*, -x [*d.* Rose] 1. ружа; 2. *med.* рожа; **rójzn-ejl** *m*, -n ружовы алей; **rójzn-honik** *m* ружовы мёд; **rójznkranc** *m* ружанец, пацеркі; **rójznvaser** *f/n*, -n ружовая вада
• ale rojzn šmekn, ober zej štexn *šprxv.* усе ружы пахнуць, але колюцца (ружа без калючак не бывае)
rok *m*, *pl.* rek, *dim.* **rekl** *n*, -ex [*d.* Rock] капота, хламіда, сурдут
• Bin ix mir a šusterl, /klap ix mit a flekl, /ongeton a fartexl, /darf ix ništ kejn rekl. /Zic ix af dem benkele, /tanct ba mir der hamer, /hob ix ništ kejn štibele – /vojnt ix in a kamer. (Z. B.) Я шавец, я ляпаю калодачкай, апрануты ў фартушок, іншай вопраткі мне ня трэба. Я сяджу на лаўцы, малаточак мой танчыць, я ня маю хаткі – жыву ў пакойчыку.
rokite *f*, -s [*ukr.* рокита, *p.* rokita] *bot.* ракіта
rol *f*, -n, **rol(j)e** *f*, -s [*d.* Rolle] роля
• špiln a role *fig.* адыгрываць ролю
rol *m* [*d.* Rolle?] перакладныя; паштовая карэта
rolje=pojle-rójle *f*, -s [?] *zool.* сьлімак, смоўж
rolke *f*, -s [*p.* rolka] скрутак, рулён; ролік; бабіна
roln [*d.* rollen] каціць, качаць
• a generol oder a kaprol – abi es iz "rol" (abi es "rolt" zix) *glxv.* генэрал або капрал – абы дзейнічаў (любымі сродкамі, абы толькі зьдзейсьніць мэту)
rom=ram=rem *m*, -en, *dim.* **reml** *n*, -ex рам(к)а, аправа, абрамленьне
romansírn (romansírt) [*p.* romansować] фліртаваць, юрыць
romaške=ramaške *f*, -s *bot.* рамон(ак)
rond *m*, -n [*p.* rząd] рад, шэраг; **róndze(ve)n/róndže(ve)n** 1. кіраваць, правіць; 2. чыніць бязладзьдзе
rope *f* [*p.* ropa] гной; пена на вуснах
ropuxe *f*, -s [*p.* ropucha, *ukr.* ропуха] рапуха, жаба
ror=rojr *m* [*d.* Rohr] *bot.* трысьнёг, трысьцё, чарот; **rórcuker** *m* трысьняговы цукар
rose *f* [*p.* rosa, *ukr.* роса] расá
Roséj=Raséj *n* [*p.* Rosja] Расія, Расея
rosl *m*, -en [*p.* rosół, *ukr.* розсіл] расол; **róslflejš** *n* кісласалодкае мяса
• lozn*/lign* in rosl пасадзіць/сесьці ў калюжыну (макам сесьці)
roskoš *m* [*r.* роскошь] раскоша; **roskošne(r)** раскошны; **roskóševen zix** шыкаваць, раскашавацца

rost=roc *m* [*d.* Rost] іржа; **rostn=rocn** [*d.* rosten, *mhd.* rozen] іржавець; **róstiker=róciker** іржавы

Ro"š *m*, *abr.* **rabejnu Ošer ben-Jexiel** [*s.* רא"ש=רבנו אשר בן־יחיאל] рабін Ошэр бэн-Ехіэл, знакаміты рэлігійны аўтарытэт (Германія–Гішпанія, каля 1250–1327)

roš *m*, -im [*s.* (-ים)ראש →(be)rejšes, beroš] г(а)лава, кіраўнік, правадыр, вож, шэф [*sin.* kop, onfirer, šef]; **roš-béz(d)n** *m*, *pl.* roše-béz(d)n [*s.* (בית־דין) ראשי־]. **roš-hadajónim** *m* [*s.* הדיינים־] старшыня суду рабінаў

róščine/róščene *f* [*p.* rozczyn, *ukr.* розчин] рошчына, рашчына; **róščinen** расчыняць

roše *m*, *pl.* rešoim, (-te/rošejte *f*, -s) [*s.* (-ים)רשע →rešas, rišes, maršas; arboe-bonim] зласьлівы, зламысны, кепскі, благі, дрэнны чалавек; паганец, ліхадзей, злачынец, злосьнік, незычлівец; юдафоб [*sin.* šlexter un bejzer menč, jidnfajnd; *ant.* cadek]; **rošejte/róšete=rešante** *f*, -s [*s.* (-ס)טעה(נ)רשע] кепская і злая жанчына [*sin.* šlexte un bejze froj, maršas]; **roše-gómer** *m*, *pl.* rešoim-gmúrim [*s.* (-ים)גמור] цалкам благі чалавек [*sin.* absolut šlexter menč, fun'endiker rose]; **(roše-)merúše** *m*, -s [*s.* מרושע] вылюдак, выродак, вельмі кепскі/благі/дрэнны чалавек

• a menč iz ništ kejn cadek-gomer un ništ kejn roše-gomer *glxv.* чалавек цалкам ня можа быць праведнікам і цалкам ня можа быць ліхадзеем

• a nar iz erger far/fun a roše *šprxv.* дурань горшы за ліхадзея

• az der roše kukt in vaser arajn, pejgern di fiš *šprxv.* варта ліхадзею глянуць у ваду, рыба падохне (гляне – сэрца зьвяне)

• dem rošc gejt af der velt, dem cadik af jener velt *šprxv.* злачынцу шчасьце на гэтым сьвеце, праведніку – на тым

• gib dem roše trinken fun zajne zind, vet er avek fun der velt gešvind *glxv.* дай злачынцу выпіць ад яго граху, ён хутка трапіць на той сьвет

• kejner bahalt nit: nit der roše zajn rišes, nit der nar zajn nariškajt *šprxv.* ніхто нічога не схавае: ані злосьнік сваёй злосьці, ані дурань сваёй дуроты

• šabes hot afile der roše in gehenem ojx ru *glxv.* у суботу нават ліхадзей у пекле мае адпачынак

rošeprókim *pl.* [*s.* ראשי־פרקים] "назовы разьдзелаў"; галоўныя пункты кантракту; тэзісы, галоўныя тэмы лекцыі або даклада

Rošešóne *m*, *abr.* **r"h** [*s.* ראש־השנה=ר"ה →šone(-tojve), lešone-tojve] "пачатак году"; Рош-Гашона (гэбрэйскі Новы год, які сьвяткуецца 1–2-га тышры); *tlmd.* назоў 8-га трактату 2-га разьдзелу (запаветы аб пачатку году, месяца і аб сьвяткаваньні Рош-Гашоны)

• a jid ken ale meloxes: Pejsex bakt er maces, Švues iz er a gertner, tišebov iz er a zelner/bal-milxome, Sukes iz er a bojmajster, Xanike gist er drejdlex, Rošešone blozt er šojfer *glxv.* жыд ведае ўсе рамёствы: на Пэйсах ён пячэ мацу, на Швуэс – садоўнік, у пост – жаўнер, на Кучкі – будаўнік, на Хануку адлівае са сьвінцу ваўчкі, на Рош-Гашону дудзіць у шофар (і шавец, і кравец, і каваль, і стругаль, і на дудзе ігрэц)

rošetéjves *m*, -n, **r"t** *abr.* [*s.* ר"ת=(ן-)ראשי־תיבות] ініцыялы, абрэвіятура

róš-goj *m* [*s.* ראש־גוי] *argo* навічок, навабранец-паліцыянт

roš-hagójle *m*, *pl.* roše-hagójle [*s.* (ראשי־) ראש־הגולה] старэйшына дыяспары, тытул правадара гэбрэяў у Бабілёніі пасьля разбурэньня Другога Ерусалімскага Храма рымлянамі ў 70 г. [*sin.* rejš-goluse]

roš(-h)akó(h)ol *m*, *pl.* rošekóol/roši-hakóol [*s.* ראש־הקהל (ראשי־)] старасta, старшыня, кіраўнік кагалу

• a parx tor ništ zajn kejn roš-hakohol пархатаму нельга быць старастам (у яго хапае клопату з уласнай галавой) (з шалудзівай галавой у дух ня лезь; маўчы з паршываю галавой)

roš-ham(e)dábrim *m*, *pl.* roše-ham(e)dábrim [*s.* ראשהמדברים (ראשי־)] лідэр, вож, правадыр, кіраўнік; аратар, прамоўца, красамоўца

• vern* der roš-hamdabrim (з)авалодаць размовай

rošješíve *m*, *pl.* roš(e)-ješíves [*s.* (ראשי־ישיבות) ראש־ישיבה] кіраўнік ешыбота

roš-veríšn *m* [*s.* ראש־בראשון] "галоўны і першы"; (най)важнейшы, самы паважны, шаноўны [*sin.* der hojpt un der eršter, der vixtikster, der ongezeenster]

хамец [*jid.* xomec]: Хамец, хамец, ідзі вон! – Хамец, хамец, хадзі ў хату! То не я казуў: – Ідзі вон, – а сабака брехуў; хамец, хамец, ідзі пад пец, маца, маца, хадзі сюда (хадзі ў хата)

хаўрус, хаўрусьнік, хаўрусаваць [*jid.* xavruse]: у цябе зь ім хаўрус

хаіць, з-, аб-, ад|хаіць [*jid.* xaj]: адхаілі душу; адхаілі мы свае жываты за вольнасьцю; не адхаівайся, яшчэ ня ўсё прапала

хедар [*jid.* xejder]

хлюндра, плюндра, флюндра 'няхлюйка' [*jid.* fljonder, *d.* Flunder]: падбрыпдалася як флюндра

хеўра, росхеўрыс 'разыходжаньне' [*jid* xevre]. даскуліла дужа прываротная хеўра

цінка 'защрка' [*jid.* cipkelex]

цугундэр [*jid.* cuhunder]: жыд – цугундэр, ему нечага верыць; узяли, павялі на цугундэр

цукернік 'печыва, якое пяклі й прадавали жыды' [*jid.* cukernik]: цукернік леней чымся пернік

цымбалы: жыдоўскае вясельле без цымбалаў не бываець
цымус, цымас [*jid* cimes]: ты спадзяваўся на цымус жыдоўскі, да не гатовілі яго для цябе; а ей! там то ўжо цымас; А ў бабкі старой самы цымус, самы лой (У. Някляеў)
цыцалы 'фрэнзьлі' [*jid* cices]
цэханка [*jid.* cejxn]: жыдоўчынкі ў цэханкі іграюць
чопавое *hist.* 'падатак ад чопа за піваварэньне і вінакурства': чопавага ня ўсё аддаў рэндар; а ты з нас браў, /а ты з нас драў: /маставое, брукавое, /а пагалоўшчына, а батраччына; браў ты з нас і драў ты з нас і крупавыя, і млынавыя, і мякіну, і сьмяціну; браў ён з нас /і драў ён з нас: /калавоім, шмулавоім, /айчызну, паншчызну, /рэкруцізну драў (батлейка)
ша [*jid* ša]: ша, дзеці, не крычэце, не свавольце
шабас/шабус, (па)за-, ад-, пера-, (пра)шабасаваць, шабасоўка 'гарэлка; полька (танец)', **шабасны, шабасовы** [*jid* šabes]. жыд круціць і шабасу не глядзіць; перасьвятковаўшы шабас, пасдзіць; жыды тут астанавіліся шабасаваць, зашабасавалі: жыды яшчэ не адшабасавалі; жыды скора перашабасуюць, тагды пасдзім; шабасоўкі свой даў чарку; ой, ты шабас не дзіві, высэй ногі падымі /Кул.; не я скачу, бяда скача, а ты, шабас, не дзівуй, відзіш бяду і клопат муй; сталапеў і шабас!; шабас зайшоў; хто у лесе гукае? – шабас жонку шукае; за граші/пянендзы шабас!; жыды ўжо пазашабасавалі; тры суботы з жыдам прашабасавалі на дарозе; шабасныя сьвечы
шабаш, (за)шабашыць [*jid.* šabaš]: шабаш табе даваць на веру, бо круціш; закурым, зашабачым, на тым сьвеце чорта ўбачым
шафаваць [*jid.* šafn]: шафаваць чужым дабром
шах(ір)-мах(ір), шахер-махер, шахармахарства 'ашуканства' [*jid.* šaxer-maxer]: пусьціўся на шахір-махір; шах-мах і нічога не асталась; туды шах, сюды мах
шахірыньне, с-, пра-, (рас)шахірыць [*jid.* šaxern]: чаго ты тут шахірыш; увесь кубел перашахірыла, нідзе не нашла стужкі; шахірыш грошы, покуль усі расшахірыш; дасьць табе бацька за шахірыньне грошай на шалы-балы; якое было багацьце, усё прашахірэна; усё расшахіраваў, што ад бацькі засталося; можа, ён тут сшахірыў што – было абгледзіць яго; прашахірыў зборшчык падатковыя грошы
шахраваць'ашукваць', **шахер, шахраваньне, шахрай** (слова стала нават беларускім прозьвішчам) [*jid.* šaxern, šaxraj]: не шахруй коло мяне; ён у картах шахруіць
швах [*jid.* švax]: справы швах!
школа 'сынагога', **школішча** [*jid.* šul]: жыды ў школе крычаць; аж угледзеў сем жыдоўскіх школаў (атрымаў моцны ўдар); даў на тры школы (Зарок, афяра на сынагогу з прычыны хваробы блізкага чалавека. Такі звычай ("даць на яўрэйскую школу") быў вядомы ў дарэвалюцыйнай беларускай вёсцы. Меркавалася, што калі ня свой, дык, можа, чужы бог дапаможа. Выслоўі. Мінск, 1979.); адважны жыд то й у школе бзьдзіць; трэба хоць акрасьці жыдоўску школу; убіўся ў жыдоўску школу; галасуюць як у жыдоўскай школе; крычаць, паднялі гоман як жыды ў школе; Школьная вуліца; жывець подле жыдоўскага школішча; школьны жыд (вартаўнік); школьная гарожа
шлімазул 'недарэка' (С. Грахоўскі), **сьлімазарнік, (за)сьлімазурыцца, сьлімазурны** [*jid.* šlimazl]: сьлімазарнеькій якій твой хлопчык; куды ты лезіш, сьлімазарнік?; гдзе табе, сьлімазарніку, гэта зьдзелаць; сьлімазарнае дзіця; ня шыеш, а толькі сьлімазурыш палатно; досыць табе сьлімазурыць кніжку/шыцьцё; засьлімазурыла палатно; дзіця сьлімазурыцца возграмі; досыць табе сьлімазурыцца кала гэтай работы; абатры гэтага сьлімазурніка; сьлімазурнік гэты ня зьдзелаець харашо; сьлімазурніцу гэту яшчэ не пара выдаваць замуж; проч, сьлімазурніца, ты толькі порціш работу; сьлімазурны хлопчык; сьлімазурная работа; сьлімазурнымі рукамі бярэшся за бялізну
шлэер [*jid.* šlejer]: ня хочаш у нас жыць, будзеш шлэеры жыдоўкіны мыць; абвязалась шлэерам як жыдоўская нявеста, штоб не загарэць; жыдоўкі шкляною галкаю выкачываюць свае шлэеры
шлэпар [*jid.* šleper]: шлэпар ты!
шлэх [*jid.* šlext]: сам лепшэнькае выбраў, а мне ўсё шлэх аставіў; шлэху гэтаму ніколі не ўступлю; калі б хто добры гаварыў, а то шлэх; ты проціў мяне шлэх
шлюндра [*jid.* šlumper]: жыды ўсе шлюндрамі ходзюць
шляк 'сардэчны ўдар' [*jid.* šlak]: нехай іх шляк трафіць!
шм- [*jid.* šm-]: шмаравоз, шмаравідла, шмэндрык
шмалец 'топлены гусіны тлушч' [*jid.* šmalc]: каша са шмальцам
шнапс [*jid.* šnaps]: хваціў шнапсу
шолам 'шубутны' [*jid.* šolem?]: гэта шолам, а не чалавек
шоўмэр [*jid.* šojmer]: я не люблю шоўмэраў
штафіравацца [*jid.* štafir]: штафіравацца перад жаніхамі /люстрам; досыць табе штафіравацца
шустэр [*jid.* šuster]: шустэр гэтый скора расшустаець бацькіна дабро
шын(о)к, шынкаваць, шынкарка [*jid.* šenk]: пайшлі ў шынк гарэлку піць; дзяржаць шынк
шэйгец 'малы хлопец' [*jid.* šejgec]
шэлупейка 'ермулка': жыды ўсе ў шэлупейках ходзюць
юда, юдашка, юдоўка, юдаства, юдзіць, юдашыць [*jid.* jid]: юдоўка чортава абманула мяне; а вон ходзіць юдзіць, юдзіць Васіля, думае, мо шо той біцца будзе

II

КАРОТКІ СЛОЎНІЧАК ІМЁНАЎ
(якія гаксама сталі часткай абедзьвюх моваў)

Ejner redt rusiš/pojliš vi a jid, der anderer redt jidiš vi a goj.
(Адзін размаўляе па-руску/-польску як жыд, другі па-жыдоўску як гой.)

Абра(га)м: траціць да Абрама на піва; пара да Абрагама на піва; да Абрагама на піва пасхаць/пайсьці; авечкі пасьвіць да Абрагама пайсьці; у школу не хадзіў, богу не маліўся, гдзе Янкель і Абрам, няхай і ты будзеш там (батлейка); згінуў Абрам: нейдзе хапун яго схапіў; ідзі к таму Абраму, што жывець на рагу

Адам: Адам-кні! (*vrtš.* Адам – адамкні)

Андрэй: Андрэй, лэйг ан эй, гайнт эйнэ, моргэн цвэй; Андрэй, лэйг ан эй, ніт эйнэ, нор цвэй, ніт цвэй, нор драй, ах, скарэй, давай, давай

Афоня-злодзей (Апанас) [*jid.* Fonje ganev/kvas *hum./pejor.* 'кацап, маскаль; прадстаўнік улады (у царскай Расеі)']: **az Fonje hejbt on cu gejn, hejbt on a kalter vint cu vejen** (як Фоня ў дарогу, дык сівер дзьме); **ojslejzn fun Fonjes hent** (вызваліцца з Афоніных рук)

Бася: У балоце пад кустом /Цяцера нясецца. /Хаім Басю (жыд жыдоўку) любець, /Аж ярмолка трасецца.

Борах, Борух: Борух сьпіць, а шчасьце само пад вароты яму лезець; цягасіцца як Борах па дварох; ходзіць "бу-бу-бу" як борахава кіла; чысты борах, распусьціў валасы; борах борахам абадраўся; мужык з кіем вялікім, а яўрэй крычыць голасам дзікім, Іцка, Борух сьпявае... (батлейка)

Бэ(й)ля 'неахайная жанчына' [*jid.* Bejle]: настаяшчая бэйля, ні пра што ні дбая; набраўся як бэ(й)ля

Бэрка [*jid.* Ber]: лёгкі Бэрачка; чэсны як Бэркавы штаны на леву сторану; па сяле езьдзе Бэрка крамнік

Вінцук: **vincik iz a šejgec!** Вінцук – басалай (*vrtš.* "vincik" мала – "Vincik" Вінцук)

Вэлвэл: Мэйшэ Вэлвэлу пытае: – Чаму каза кароткага хваста мае? І, як яна ў полі йдзець, уніз яго, апушчаным, нясець? А назад йдучы, ужо задзіраець? Вэлвэл ведае і адпавядае: – Назад йдучы хваста задзіраець, бо ваўка пад хвастом ужо маець, назад йдучы, ваўка не баіцца, гатова нават зь сястрой пабіцца, і на лазьзё лезець, грызець, бо за ваўком ня трэба глядзець...

Гаман Геман: усі крычаць на яго як на гамана; напалі як на гамана якога; пападзісь толькі ў рукі гаману гэтаму; пацікаюцца мною як гаманам; б'юць як жыды Гамана; біці як Гамана; таўчуць яго бы Гамана, чорны як Гаман; злы як Геман які

Гандзя: [*jid.* handzje] *fig.* лялька: **geślejerte handzje** фарсуха

Гінда: Гінда ты сьляпая

Гірша: Гірша з Моўшам добра жыў, Гірша кроіў, Моўша шыў, Гірша з Моўшам дровы сек, Гірша Моўшу хуй адсек; ня будзя Гіршы, дык будзя чорт іншы

Ёсель: татухі-мамухі, Ёселі-Моселі, гуц-гуц! (батлейка); лёгенькі Пятрочак, лёгенькі Ёсечка; **Joške/Josele pandre /pandrik** *pejor.* расьпяты Хрыстос; **Jojzl** *pejor.* Ісус (Хрыстос); расьпяцьце, абраз

Зуська: дванаццаць з поўначы прабіла, прывёз на базар Зуська мыла і пачаў таргаваць

Іван [*jid.* Ivan] няжыд; селянін; *pejor.* кацап, кацапюга, невук, цюхцей; неадукаваны жыд

Ірад: жыдоўка-ірадка абманіла мяне; жыды-ірады, нехрысьць

Ітка: каму Ітка брылка, мне хораша

Іцак, Іцка: – Іцак, Іцак! /Дзёгаць выцек – /Кап, кап, /цурр – руру! (Р. Барадулін. Нагбом); у нас Іцка аплятае гаршкі

Кацярына: **a najes, Katerinke iz mes** навіна, Кацярынка памерла (старая гэта ўжо показка)

Куба: **Maček hot kejn vogn, Kuba hot kejn ferd** Мачык ня мае калёсаў, Куба ня мае каня

Лэйба 'гультай': адкажы мне, Лэйба мой любы, колькі месяцаў таму назад нарадзілася тое дзіця (батлейка)

Лэйзар: аблілася, ахлапалася як Лэйзарава карова; з Лэйзарам прывітаўся/бачыўся (пабыў у карчме, напіўся)

Малка: каб ты сабе Малку за жонку браў, ніколі б бяды і гора ня знаў

Мацей: **Motje meg, Fotje tor nit** Моцю льга, Фоцю нельга

Мэер: зарабіў як Мэер на Кузьме

Мікіта: **az ox un vej iz cu dem dorf, vu Mikite iz der vojt** гора тае вёсцы, дзе Мікіта войтам; **a klog cu di jorn, az Mikite iz a staroste** бяда, калі Мікіта – староста

Мірка: на дочкі сарочкі, а сыночку шапочку, Гэлька як бэлька, Мірка як гірка і Ітка ня брыдка

Моіша, Моўша: ой, Моўша, Моішка, ты праз сваю адвагу згінеш; Сьцянан! не дасмаж каўбасы, бо прыйдзе Моўшка ласы; Мэйшэ вузэ, ды гробэ пуза, галава, як цабер, не павернеш ніт аін ніт агэр

Мэйсушэлах: зжыўся як Мэйсушэлах, састарэўся як Элімэйлах

Мэндаль, мендаль 'хітры ашуканец; дурны, някемлівы, нездагадлівы': ай, гвалт! жыды Мэндаля б'юць! (незвычайная і сьмешная навіна); у куточку на пруточку вісяць Мэндалевы яйцы *vrtš.* (клубок нітак)

Рохля: рохля рохляю ходзіць – ня ўмыецца, не прычэшацца; матчына рохля!

Саламон: хітры/разумны як саламонавыя порткі

Сора/Сур(к)а: хваліла цябе Сора сягоньня і ўчора, казала, як не забудзе, то й заўтра будзе (і мы, калі не забудзем, то хваліць будзем); хваліла цябе і Сора ўчора зь вячора і Абрам каля крам; (ня)хай будзе гэтак, як Сора/Роха казала; Сора дае, Іван бярэ (дурань дае, разумны бярэ); наша Сора то шые, то пора, а ўсё ніткам гора; як Сора казала, так Мэндаль запішаць

Сруль *pejor.* [*jid.* Srol, Srul, Jisroel (мужчынскае імя)?]

Хаім: казаў Хаім: памахаім; казаў Хаім: пакалыхаем, і матка ў ахвотка, каб Аўрагам не рабіў тарарам, тут і там!; Хаім, уцякаім; Хаім, што мы з табой маем?; жыдоўскае вясельле: трэці дзень гуляе ўсё мястэчка, і Хаімку пасылаюць па другую пляшку

Хацкель/Хацкаль: я табе не Хацкель; Хацкаль ты!; іх бін дыр кайн фэйгэлэ, кайн пташэчка, нор Хацкеля брат!

Хая: Жыдовачка Хая: і сцае, і срае, і пацеры чытае (сцае, срае і трэскі зьбірае)

Хвёдар ходзіць жыдок ходарам перад панам Хвёдарам

Церах [*jid.* Terax]: **ho-ho! prišol Terax na derex!** го-го! дайшоў Церах да розуму!

Шлёма: шанцуе, як Шлёме на арэндзе; як бог да Шлёмкі, гэтак і Шлёмка да бога; сядзі, Шлёма, удома; выйграў як Шлёма на арэндзе

Шмуйла; разлажыўся як Шмуйла з абразамі; ходзіць абквэцаны як Шмуйла

Шурка [*jid.* Šurke] 'гультай, абібок, лайдак, брында, лабатрос, латруга': **a gut-morgn dir, pan Jurke, /a gut-morgn dir, pan Šurke, /a gut-morgn dir, Ivan, /dajn flinke kljače /lojft vi a ban,/ fun Svincjan /kejn Koltenjan, /borex hašem, borex undzer prace** *//ksl.*

Шымко: Шымко лупаты, вядзі кабылу дахаты

Юда: Архіпка на скрыпка, Юда на дуда сыгралі цуда, цуда, адда, да, дада...; а ў Юды чорны муды; а ты, Юдко, скачы хутко (батлейка)

Юрка [*jid.* Jurke] Юрка, бабыль, "дзярэўня": **hern emecns vi dem Jurke** не зьвяртаць увагі на кагосьці; **švajgn vi Jurkes hunt** маўчаць як Юркаў сабака (у Юркі й сабакі німа); **ojszen/ citern vi jurkes hunt** выглядаць/дрыжаць як юркаў сабака

Элімэйлах: зжыўся як Мэйсушэлах, састарэўся як Элімэйлах

Ягайла: **a najes, krol Jagjele iz mes** навіна, кароль Ягайла памёр (казаная казка; сьпяваная песьня)

Янкель: убіўся як Янкель у касыцёл; – Гвалт, гвалт! гвалт!!! – Што за гвалт, га? – Жыды Янкеля б'юць... – А Янкель што, ня жыд? – А б'юць ткі... ах... ах...; ня йдзі да Янкеля ў краму – ён абакульнік

ליאַכאָוקע (מינסק)

III

Выдатны ўзор жывой беларускай гаворкі зь "ідышызмамі" прыводзіць Сакрат Янавіч зь Беласточчыны:

"Як цяпер разумею, крынкаўцы густа перакідваліся ў гутарцы жыдоўскімі словамі зь ідыш. Юрлівага кавалера, шчыпайлу дзяўчат празывалі "маладым шванцам". Сварлівы тып – гэта "фэкі чалавек". Ненадзейны тавар – "шайс". Камбінатар – "шанцоўнік". Асобы зь лёгкім языком – "мэхляр" або "фукс" (шукаць фукса). Байкі гарадзіць наіўным – гэта "дурыць майсамі". Вось прыкладныя фразы: – Чаго гэты фукс ад цябе хоча, га? Які гэта шайс ён табе прынёс? Ой, фэкі чалавек! Майсамі дурыць галаву. Хай пільнуе лепсй свайго маладога шванца, якому салодкая Фэля зробіць гевалт, гешэфт поткаю... І будзе кіндрык на пацеху (кіндар кучаравы)."

Жыды, нават ведаючы славянскія мовы, прынамсі, ставіліся да іх іранічна-абразьліва: "joldiš", "jevoniš", "foniš","belošn jevones/fonje", "po gojiške". Ня дужа шанавалі яны й гойскі ідыш: "gebroxn/geharget jidiš", "kalvarier dajč". Але гэта не замінала беларусам гергетаць на ідышы і нават сьпяваць. Яны, як ня дзіўна, і дагэтуль яшчэ сьпяваюць. Вось дзьве песьні, якія 11 верасьня 1983 г. запісаў Генадзь Лойка ад Станіславы Іванаўны Рымко ў вёсцы Малявічы (або ў Калоніі ці Старадубраўцы, што паміж Шчучынам і Мастамі, на дарозе з Ружанкі ў Каменку):

***

Lebn majn fencter in majn gortn
Vaksn blumen ale sortn.
    Kinder blumen nit gerisn,
    Vajl me darf zej nor bagisn.
Ot a žulik ongekumen,
Alc blumen cugenumen.

***

Zict a mejdl, lejent a blat –
Zogt men on, vos Brajnke zix gešmadt.
    Avrom, majn man, špan dem ferd in vogn,
    Lomir bejde kajn "sili/selo" (?) unterforn.
Vi zej zajnen kajn "selo" gekumen,
    Ot azoj Brajnken af di knies gefunen.
        Brajnkele, du majn, kum cu mir cugejn,
        Ix vel dir gebn, vos du vilst nor alejn.
    Ix darf nit hobn dajne xalasn mit dajn nedan,
    Makarevič der šejgec iz dox majn man.

Словы, якія прыводзяцца ў гэтым слоўнічку, маюць рознае паходжаньне, але лучыць іх сумеснае жыцьцё беларуса і жыда. Безумоўна, гэта далёка ня поўны збор, хутчэй гэта толькі ўзор. Таксама вялікая частка лексыкі зьяўляецца агульнай для абодвух народаў:
у беларускай – цэгла, дах, дрот, друк, дрыліх, цыбуля, цьвік, каўпер, клюбы, клямары, крама, крамар, кушнер, рына, рэй, рэшта (урэшце, нарэшце), зэдаль, мур, рыдлёўка, латруга (лотр), шынок, ніт, фарба, цалёўка, цукар, наладовываць, танцаваць, радзіць, рыхтаваць, шпацыраваць...
у ідышы: tate, mame, babe, laske, lapcje, bulbe, večere, veverke, sažlke, samohon, suxote, torbe, kiške, kolt(u)n, polke, bajke, derkač, žabe, živice, žalejen, havken, pojzen, polen, pojen, topčen, xapn...

Ніхто зараз дакладна ня скажа, зь якой мовы гэтыя словы прыйшлі ў беларускую (зь нямецкай альбо зь ідышу) альбо ў ідыш (зь беларускай, украінскай, польскай, лускай, чэскай...), але пра некаторыя запазычаныя беларускія словы ў ідышы ўсё ж ільга гаварыць з упэўненасьцю, да таго ж у ідышнай лінгвістыцы існуе нават тэрмін "*vajsrusiše redenišn*" (беларуская гаворка):

abedrik набедрыкі, набэдрыкі (конская зброя)
apinujen zix апынуцца
hametne(r) гаматны, нехлямяжы, нязграбны
juške юшка (у печы)
kalejen калець, мерзнуць; **farkalejeter** скалелы
kamornik каморнік
kečken [*v.* кешкаца] лашчыць, мілаваць, галубіць
kutnice [*v.* кутніца] кіньдзюк, сычуг
kljok клёк, касьцявы мозг
kraž краж, плаха
krop *bot.* кроп
kublik кублык (від жаночай прычоскі)
madzgen, madžgen мадзгаць, вэдзгаць
matl(j)e мятлух, мятлушка
muraške, mureške мурашка; **murašnik, murešnik** мурашнік
nametke наметка, намітка
njamken [*v.* нямкаць] цокаць языком, цмокаць
ojsmagljeven вымаглеваць, выпрасаваць (бялізну)
onzoljen назаляць; **ongezoljeter** назойлівы, надакучлівы
pročkes упрочкі
stromke стрэмка
sumne(r) сумны; **sum** сум
šarien (af tog) шарэць, сьвітаць, днець
zejde [*v.* дзеду!] дзед
žvave(r) жвавы
-uk – зьняважлівы паляшуцкі суфікс **-ук** (шаўчук, краўчук, бандарчук, кавальчук...):
šusteruk шаўчук; **kamcenjuk** скнара, скупянда

Безумоўна, гэтых словаў у ідышы значна болей. Яшчэ, для ўзору, колькі прыкладаў літвацка-ліцьвінскіх ды жыдоўска-славянскіх "локшынаў":

hakn a morde, az di cejner zoln trcščen даць у морду, каб зубы затрашчалі
a volveler privarik! танны прыварак/навар!
a vixtike šmate! *iron.* важная ануча! наўда вялікая!
visn počom funt lixo ведаць па чым фунт ліха
zupe di krupe, krige di kraft суп з крупамі, гаршчок моцны
abi ix bin gezunt (abi ja zdruv) абы я быў здаровы
vestu zajn in kas, vestu trinken kvas! *iron.* будзеш злаваць – будзеш піць квас!
lebn sventim duxom жыць сьвятым духам
sam sapožnik/pan сам сабе сапожнік/пан
straše di vancn! палохай клапоў!
zajn a gance pani-matke быць паважнай асобай
faln in di ahlobljes *fig.* падаць у аглоблях (аб стомы)
cacki na jolki! цацкі на яліне! (шышкі/грушы на вярбе)
mozoljen umzist dem cung дарэмна мазоліць язык
af kazjone propitanje! на казённыя харчы!
bose komande босая каманда
besimxe-babe (пародыя на "besimxe-rabe")
kormenen mit terucim карміць абяцанкамі
grob vi a budke/bečke тоўсты як будка/бочка
koxn zix vi a šuster in bulbe-kaše *iron.* гарачыцца як шавец у камяках
kalt vi a ščavje халодны як шчаўе
nit kejn xux nit kejn dux ні хуху ні духу (аб печцы, якая ледзь гарыць)
kejn dux nito і духу німа
panske x(v)arobe панская хвароба
štrojene panc/panjenke кіясйная/саламяная пані

zajn mit emeen panibrat(iš) быць з кімсьці запанібрата
ix bet ajx iber ajer laske я прашу ў вас прабачэньня (вашай ласкі)
er hot šojn zajn službe opgedint ён ужо сваю службу адслужыў
oplozn di lejces адпусьціць лейцы
s'vet arojskumen af svente nigde гэта будзе на сьвятыя ніколі (на сьвятыя Міколы або ніколі)
genug cu bohomoljen! досыць багамоліць/балбатаць!
s'vet arojs bokom выйдзе бокам
blajbn bez hene, bez smene застацца безь нічога
a brat fun di breter брат з брагоў (*vrš.* "brat" брат – "bret" дошка)
puste gajve пустая фанабэрыя
a gešlogener gastinec выбіты/укачаны гасьцінец
a gancer ja-tebe-dam наўда вялікая (фігурант, боты ў рант)
ganevski vid выгляд як у злодзея
gezogt gevorn af trascen! сказана на трасцу! (аб перабольшваньні шчасьця)
es iz nit varem fun dobre rejdele, nor fun dobre mejnele цёпла не ад добрых словаў, а ад добрага намеру
hašivejnu nazad! варочай назад! паварочвай аглоблі!
ojszidlen vi dem poslednem (merzavec) аблаяць як апошняга (паскудніка)
ove-tove – di ku iz a krove як ні круці – корова ёсьць карова
ox un mox un es vakst nox *hum.* вох і мох і яшчэ й расьце
"vajove Homen", maxt Raše: – Čort jeho prinjos (der švarc-jor hot im ahergebraxt) "і Гаман увайшоў", Рашы тлумачыць: – Чорт яго прынёс
ejner – u Lisi, der anderer – u Strisi хто ў лес, хто па дровы

Словы зь ідышу трапілі нават у беларускія дзіцячыя лічылкі:

***

Шытыль-пытыль, шэндыль-мэндыль!

***

Анцы, цванцы,
Трычы, рычы,
Эны, бэны,
Мэны, вэк!

***

Она, дуна, рэс,
Кіндэр, віндэр, рэс.
Она, дуна, раба,
Кіндэр, віндэр, жаба.

***

А ты, шындаль-біндаль, што пашындаль,
Гарцу-барцу з калагрынцу – кох!

IV

Blojz vinter,
Ven s'iz der besalmen
Farfrojrn,
A šnejveg vert tetik.
Er firt
In di noentste štetlex,
Vos hejsn:
Azariči,
Pariči,
Kojčici,
Svisloč.
(P. Plotkin. Štejner dercejln.)

На жаль, у мясцовай тапаніміцы вялікага сьледу жыды не пакінулі. Гэта – Жыдова Буда (неіснуючая з 1935 г. вёска Клімавіцкага павету Магілёўскай губерні), Жыдчэ (вёска ў Пінскім уезьдзе, Менскай губерні), Жыдачоў (горад на Львоўшчыне), Жыдычын (сяло на Валыні), Жыд(ы)кі (Жыдыкай, вёска ў Мажэйкскім раёне, Літва), Жыдкайміс і Жыдзейканы (Жыдавішкіс, вёскі ў Троцкім уезьдзе, Віленскай губерні). На Камянеччыне жыды заснавалі тры сельскагаспадарчыя калёніі ў вв. Сарава, Лотава, Абрамава (біблейскія імёны Сара, Лот, Абрагам). На Меншчыне – Аронава Слабада. Але ў розных кутках Беларусі можна знайсьці вёскі, назвы якіх утвораны ад гэбрэйскіх імёнаў: Абрамава, Абрамаўцы, Адамаўка, Адамава, Верамеічы, Верамеева, Гаўрылаўка, Гаўрылаўцы, Давыдкавічы, Давыдаўка, Данілевічы, Данілавічы, Елізаравічы, Захарычы, Захаркі, Ількавічы, Ісакавічы, Ісакаўцы, Майсеевічы, Майсееўка, Міхсеўка, Міхевічы, Міхейкі, Міхневічы, Міхноўка, Мішкавічы, Самсонаўка, Самуйлава, Юдзіна, Юдаўка, Юдзічы, Якубовічы, Якавішкі, Якімавічы, Якімаўка, Ялізава, Янава, Янавічы, Яроміна, Ярэмічы... Ёсьць вёскі Суботнікі, Суботы... Напэўна, ня менш на́званў можна адшукаць у мікратапаніміцы – Жыдоўскае поле, Жыдоўскі луг, Жыдоўскі город, Жыдоўскі лес, Жыдоўскі шлях, Жыдоўская грэбля, Жыдоўскі брод, Жыдоўскі канец, Жыдоўска(я) яма, Кагальны калодзеж, Школішча... Народная этымалёгія тлумачыць назву мястэчка Невель як гэбрэйскае "nevel" арфа (цара Давіда) [*h.* נבל] – на жаль, гэта ня так.

Часта зьмянялася (перакладалася на ідыш) першая частка ў падвойных назвах гарадоў, мястэчак і вёсак – Новы-, Стары-, Вялікі-: Naj-Dubrove (Новая Дуброва), Naj-Zipkev (Навазыбкаў), Naj-Seversk, Naj-Šepelič, Naj-Bixev (Новы Быхаў), Alt-Bixev (Стары Быхаў), Grejs-Sele (Вялікае Сяло), Grejs-Brestovič, Grejs-Rite (Вялікарыта)

У большасьці выпадкаў у ідышы захоўваецца беларускае вымаўленьне ў назвах гарадоў, мястэчак і вёсак ("аканьне", шчылінны "г"): Abčihe (Абчуга), Abolés (Абольцы), Amčislav (Амсьціслаў), Asipovič (Асіповічы), Astravec (Астравец), Astrin (Астрына), Ašveje (Асьвея), Azarič (Азарычы), Babovne (Бабоўня), Babrojsk/Babrujsk (Бабруйск), Barkulabev (Баркулабава), Behomle (Бегамля /Бягомель), Brahin (Брагін), Brisk (Берасьце/Берасьця), Dalhinev (Даўгінаў), Daškávke (Дашкаўка), Drahičin (Драгічын), Hajne (Гайна), Hajšin (Гайшын), Halubic (Галубічы), Hancevic (Ганцэвічы), Haradec (Гарадзец), Haradečine (Гарадзечна), Haradok (Гарадок), Harodej (Гарадзея), Hom(e)l/Homle (Гомель), Horadne/Harodne (Горадня), Horval (Горваль), Hresk (Грэск), Ihumen (Ігумень, Чэрвень), Kabilnik (Кабыльнікі), Kapulje (Капыль), Knjahinin (Княгінін), Kruhle (Круглас), Lahišin (Лагішын), Lahojsk (Лагойск), Mahilne (Магільна), Malodečne (Маладэчына), Mazir (Мазыр/Мозыр), Mjor (Мёры), Mo(hi)lev (Магілёў), Navahradek/Navar(e)dok (Навагрудак), Rádiškevič (Рáдашкавічы), Rahin (Рагінь), Rebzevič (Рубяжэвічы), Rohečov (Рагачоў), Samaxvalevič (Самахвалавічы), Skrihelov (Скрыгалаў), Slabodke (Слабодка), Smargon (Смаргоні), Stejpc (Стоўпцы), Stučín (Шчучын), Taločin (Талачын), Valožin (Валожын), Varnjan (Варняны), Žaludok (Жалудок).

Ёсьць у ідышы й свая назва для Беларусі – Rajsn...

Мястэчкі, мястэчкі, мястэчкі... Панямоньне, Падняпроўе, Падзьвіньне, Палесьсе...

"Farbrent zol vern di stancje Baranovič!" (Гары яна гарам, тая станцыя Баранавічы!) – піша Шолам-Алэйхэм. Але й жыдоўскія прыказкі не абмінулі геаграфію Беларусі: "Орша, Шклоў і Магілёў, Стары Быхаў, Рагачоў"; Сураж, Веліж і Парыж; "fun Minsk biz Pinsk un Motele af šabes" (ад Мінску да Пінску, а ў Мотыль на шабас); "a šmic in Janovic – hajda in bod arajn!" (хлысь у Янавічы – гайда ў лазьню!); "ojsšteln di ojgn/kukers vi der brisker malex-hamoves" (вырачыць вочы як берасьцейскі анёл сьмерці); "hern vi in Puxovič di megile" (слухаць як у Пухавічах сьвятое пісаньне); "s'vet gor blajbn Trok on zojernilx un Ivje on smetene!.." (*iron.* застануцца Трокі зусім бяз кіслага малака, а Іўе безь сьмятаны!..); "ošmener šljaxticn" (*iron.* ашмянскія шляхціокі); "bjalistoker tej" (беластоцкі (кепскі) чай); "želudker konovodes" (жалудоцкія канаводы); "čercjer levone" (чарэйскі месяц); "polocker likes" (полацкія завулкі); "rožankover mexile-beter" *iron.* (рожанкоўскі просьбіт); "kapuljer naronim un klecker ganovim" (капыльскія дурні і клецкія злодзеі); "a kapuljer oncuhereniš mit a buxce in zajt" (капыльскі (празрысты/тоўсты) намёк і таўхель у бок); "nu iz in Lukoml" (ну – у Лукамлі); "di Vilie brent nit" (Вяльля не гарыць); "s'brent di Vilie!" (*iron.* Вяльля гарыць!); "me ken mit a špendl di Vilie ništ faršparn" (нельга трэскай Вяльлю запрудзіць); "opton af rajsiš" зрабіць па-беларуску (утнуць штуку); "s'iz rajsiše vaser" *iron.* (гэта – беларуская вадá).

Паводле жыдоўскіх прозьвішчаў можна вывучаць местачковую беларуска-жыдоўскую геаграфію:

Азерскі (Азяры),
Альхоўскі (Альхоўцы),
Альшанскі (Гальшаны),
Амдурскі, Андурскі (Індура),
Амханіцкі (Амхінічы),
Амчыслаўскі (Амсьціслаў, *jid.* Amčislav),
Антопальскі (Антопаль),
Арлянскі (Ворля),
Аршанскі (Орша),
Асіноўскі (Асінаўка),
Асоўскі (Асоўцы),
Астравянец (Астравец),
Астрамецкі (Астромічы),
Астроўскі (Востраў),
Ашмянскі, Ашмянец (Ашмяна),
Баркоўскі (Баркі),
Барысавец (Барысаў),
Баярскі (Баяры),
Беластоцкі (Беласток),
Бельскі (Бельск),
Беразень, Берзін (Бераэіна, *jid.* Berezin),
Брагін, Брагінскі, Рагінскі (Брагін),
Браслэвэр, Браслаўскі (Браслаў),
Брыскер, Брыскін, Брэскі, Брэскін (Берасьце, *jid.* Brisk d'Lite),
Быстрыцкі (Быстрыца),
Быхаўскі (Быхаў),
Валожынэр (Валожын),
Васілевіцкі (Васілевічы),
Вейнаў (Вейна),
Відэмлянскі (Відамля),
Віленскі, Вільнэр (Вільна),
Віцебскі (Віцебск),
Вішнёў (Вішнева),
Вобальскі, Вобалец (Вобаль),
Вольпін (Волпа),
Высоцкі (Высокае),
Галаўчынэр (Галоўчын),
Гарадзецкі, Гарадніцкі (Гарадок),
Глускер, Глускін (Глуск),
Глыбокін (Глыбокае),
Гомельскі (Гомель),
Грабаўшчынэр (Грабаў?),
Гразоўскі (Грозаў?),
Гролнэр, Градзенчык (Горадня),
Дабрушын, Дабрусін (Добруш),
Даўгапольскі (Даўгапольле),
Даўгінавэр (Даўгінава),
Дзяньдзельскі, Дзяньцельскі (Дзятлава, *p.* Ździęcioł),

Друян (Друя),
Дрыбінскі (Дрыбін),
Дрэчын (Дзярэчын, *jid.* Drečin),
Дубравіцкі, Дуброўнэр (Дуброўна),
Журбінскі (Журбін),
Жухавічэр (Вялікія Жухавічы),
Жырмунскі (Жырмуны),
Жытлоўскі, Жэтлоўскі (Дзятлава, *jid.* Žetl, Žitl),
Забалоцін (Забалацьце),
Зарэцкі, Зарэцэр (Зарэчча),
Заслаўскі (Заслаўе),
Імханіцкі (Амхінічы),
Індурскі (Індура),
Камайскі (Камаі),
Камянецкі (Камянец),
Карлін, Карлінэр, Каралінскі (Каралін, цяпер частка Пінску),
Карэліц (Карэлічы),
Касоўскі (Косава),
Кахановэр (Каханава),
Клецкін (Клецк),
Клімавіцкі (Клімавічы),
Клічаўскі (Клічаў),
Клявіцкі (Кляўцы?),
Кобрын, Кобрынскі, Кобрынэр, Кобрынец (Кобрынь),
Койдэнавэр, Каданэр (Койданава),
Копысскі (Копысь),
Косаўскі (Косава),
Краснэр (Краснае),
Крупкін (Крупкі),
Крывіцкі (Крывічы),
Крычаўскі, Крычэвэр (Крычаў),
Лапіцкі (Лапічы),
Леплеўскі (Лепель),
Лёзнэр (Лёзна),
Лідзкі (Ліда),
Лінтуп (Лынтупы),
Ліпскі (Ліпа, Ліпск?),
Лоеўскі, Лойсў (Лоеў),
Любавіцкі (Любавічы),
Любан, Любанскі (Любань),
Любчанскі (Любча),
Ляльчук (Лельчыцы),
Ляхавіцкі (Ляхавічы),
Магілевэр, Молівэр (Магілёў),
Магільнэр, Магільніцкі, Магілянскі (Магільна),
Мінскі (Менск),
Мірскі, Міраў (Мір),
Навагрудзкі (Навагрудак),
Навадворскі (Новы Двор),
Наваселецкі (Навасёлкі),
Неманскі (Нёман),
Оршэр (Орша),

Падліпскі (Падліпкі),
Падлускі (Падлужжа),
Пажэжынскі (Пажэжына),
Палонскі (Палонка),
Парэцкі (Парэчча),
Пастаўскі (Паставы),
Пінскі, Пінчук (Пінск),
Плешчыцэр (Плешчаніцы),
Полацкі (Полацак),
Пружанскі, Пружан (Пружана),
Прылуцкі, Прылук (Прылукі),
Рагачовэр, Рагачэр (Рагачоў),
Радашкевіч (Ра́дашкавічы),
Радунскі (Радунь),
Радуцкі (Радута),
Ражанскі (Ражанка),
Ракаўскі (Ракаў),
Розінэр, Разіноэр, Ружанскі (Ружаны, *jid.* Rozinoj),
Рудзенскі (Рудзенск),
Рудніцкі (Рудня),
Рэчыцкер (Рэчыца),
Скідэльскі (Скідаль, Скідзель),
Склоўскі, Скловэр (Шклоў),
Слабоднік (Слабада),
Слонімскі (Слонім),
Слуцкі (Слуцк),
Смаргонскі, Шмаргонэр (Смургоні),
Сьмілавіцкі (Сьмілавічы),
Сосенскі, Соснэр (Сосенка),
Старобінскі, Старобінэр (Старобін),
Столін, Столінскі (Столін),
Сураскі, Суражскі (Сураж),
Сьвірскі, Сьвірноўскі (Сьвір),
Татарскі (Татарка),
Трасьцянецкі (Трасьцянец),
Тураўскі, Туравэр (Тураў),
Турэцкі (Турэц),
Ходас (Ходасы, Хадасы),
Хомскі (Хомск),
Хацемлянскі (Хоцімск),
Целеханэр (Целяханы),
Цымкоўскі (Цімкавічы),
Чарналескі (Чарналесьсе),
Чавускі, Чаўсэр (Чавусы),
Чарэйскі (Чарэя),
Чачэрскі (Чачэрск),
Чэрыкавэр (Чэрыкаў),
Шарашэўскі, Шэрэшэўскі (Шэрашава),
Шклоўскі, Шкловэр (Шклоў),
Шацкі, Шацкер (Шацк),
Яноўскі (Янава),
Ясіноўскі (Ясень)...

... альбо рамёствы й заняткі жыдоў на Літве:

Агульнік,
Алейнік,
Аптэкар,
Бакалейнік,
Балагол,
Баншчык,
Батвінік,
Бляхер,
Бондар, Бэндзэр,
Бортнік,
Бровэр,
Брукаж,
Брыгадны,
Буднік,
Вадавоз, Ваданос,
Вапняж,
Васкабойнік,
Вінакур, Вінараў,
Вучыцель,
Гамарнік,
Ганчар,
Гарабейнік,
Гарбар,
Гарнік,
Гарэлік,
Гольнік,
Гонтар,
Гуральнік,
Гэндлер,
Дзягцяр,
Друкер,
Дуднік,
Жалязыняк,
Загальскі,
Златар, Злотнік,
Зэйгарнік,
Зямцоў,
Ігольнік,
Каваль,
Калесьнік,
Камісар (кіраўнічы маёнткам),
Канвісэр,
Капялюшнік,
Карабельнік, Карабейнік,
Карчмар,
Катляр,
Квасьнік,
Кілімнік,
Кравец,

Крамар, Крамін,
Красільнік,
Краўчык,
Крахмальнік,
Кузьнец.
Купец,
Кучар,
Кушнір,
Лазьнік,
Лекар,
Ліквopнік,
Люстэрнік,
Магазыншчык,
Малочнік,
Малярчук,
Медавар,
Меднік,
Мельнік,
Мірошнік,
Млынар,
Музыкант,
Мукамел,
Мулер,
Мучнік,
Мытнік,
Мэханік,
Паграбенік,
Падрадчык,
Паперны,
Партны,
Пасечнік, Пасечны,
Пасманік,
Пастолаў,
Паташнік-Стрэльнік,
Пачтарук,
Пашэрсьцьнік,
Пекар,
Перавозьнік,
Пераплётчык,
Півавар,
Пільшчык,
Плаўнік,
Плотнік,
Плужнік,
Пляшэчнік,
Правізар,
Пячнік,
Пячэнік,
Раменік,
Рамізьнік,
Рольнік.

Руднік,
Рыбак,
Рымар,
Рэзьнік,
Саладоўнік,
Сапожнік,
Скрыньнік,
Смаляр,
Стараста,
Столер,
Стралец,
Стругач,
Стрыхер, Стрыхаж,
Стэльмах,
Сукенік, Сукнавальнік,
Сьлесар,
Сьпівак,
Сьцякольшчык,
Талесьнік,
Тандэтнік,
Тартаковэр,
Ткач,
Токар,
Трубнік,
Тыпограф,
Фабрыкант,
Фактар,
Фарбэр,
Фарфурнік,
Фурман,
Футэрнік,
Фэльдчэр,
Хвойнік,
Хмельнік,
Цагельнік,
Цесьлер,
Цукернік,
Цымбаліст,
Цырульнік,
Цэхмайструк,
Цюцюнік,
Шапашнік,
Швец,
Шкляр,
Школьнік,
Шкроб,
Шпітальнік,
Шынкар,
Ювэлір,
Юрыст
Ярмольнік...

... альбо беларускую фаўну:

Акунёў, Бабёр, Баброў, Бараноўскі, Барсук, Бык, Варонін, Верабейчык, Вэвёрка, Вэвюрка, Галкін, Галубоўскі, Глушэц, Голуб, Журавель, Заяц, Зайчык, Зязюлін, Казлоўскі, Карасік, Карп, Карпаў, Кобец, Кролік, Крук, Кулік, Куніца, Лашак, Ліс, Лісіц, Лось, Лосеў, Окунь, Плоткін, Рак, Расамаха, Рысь, Сабалеўскі, Салавейчык, Сарока, Сарокер, Сокал, Шчукін, Шчупак...

... альбо проста беларускую мову:

Агрэст, Агурок, Бабін, Бакаляр, Балоцін, Барада, Басок, Белавусаў, Белснькі, Блінчэўскі, Боршчык, Бублік, Булкін, Бярозкін, Віхор, Гармідэр, Гарэлік, Грубіян, Гуз, Гузік, Дазорац, Дзёгаць, Дубавіцкі, Жалейка, Жаніхоўскі, Жаўнераў, Жытніцкі, Зудзілін, Кабак, Кавалерчык, Каліка, Калцінюк, Калядны, Капшук, Капялюш, Карачунскі, Картопель, Картуз, Каўтун, Качаргінскі, Кіт, Крупнік, Круцель, Крываруцкі, Крывашэй, Крывулін, Кульбак, Куцэногі, Лапата, Локшын, Маразовіч, Мармур, Мураваччык, Мястэчкін, Мяцеліца, Падмаза, Плаўнік, Правідла, Прыблуда, Прыгонікер, Прымак, Разумны, Рыжыкаў, Рэдзька, Сапун, Сірота, Сіўчык, Скобла, Скурка, Сьляпак, Смолкін, Старажылец, Сьвярдзель, Сьляпняк, Трылесьнік, Фанабэрыя, Халяўскі, Хват, Хітрык, Цьвік, Цыбулеўскі, Цыбуля, Чарняк, Шляхтэр, Ядваб...

АД ШЭНЁЎ ДА ПРУЖАНЫ
з росказаў цёткі Ноны
(занатаваў Уладзімер Ракіцкі)

Езжу гэтак далёка, гэтак доўга,
а ад Шэнёў да Пружаны – дзесяць капеек,
у мяккім – трынаццаць.

У. Ракіцкі

По сярэдзіні села быў пляц, которы называўса Курэлем. На Курэлі заўшэ на сьвята зьбіралосо много людзей, "біліса ў яйца"...

Там жэ на Курэлі стоялі тры жыдоўскіе хаты, у одной жыў Шлёма (Гальперын) і ёго маці Бэйля. Жонку Шлёмы звалі Пешка, і дочку воны мелі Малку – маленькая, рокоў пяць-шэсьць было ёй. Брат Шлёмы, Мовша, жыў з свосю жонкою, і дочка была ў іх Гітля. Мовша быў балагола, розвозіў усе і возіў, а Бэйля торговала ў корчме. Торговала хлебом свое выпэчкі, крупамі, соль продавала, газу, запалкі і табак. Много чого можна было там купіці, навэць колі ты грошэй не меў, то Бэйля давала на довер, ано ў цітрадзь свою запісвала і ніколі нікому не отказвала. Вэчорамі мужыкі зьбіраліса ў корчме, зімою, колі воны доўгіе, то і сядзелі там доўго. Шлёма выпісваў жыдоўскую газэту, то ёго дочка, малая Малка, чытала гэту газэту і одразу ж перэказвала ўсім, шо там было напісано. Так у Шэнях дознаваліса, шо ў сьвеці робіцца.

Шлёма мог і пострыгчы, але за грошы. Одного разу Мікола Засім попросіў, коб пострыг ёго.

– Э, чым, босота, плаціці будзеш? – попытаў Шлёма.

– А, от давай, покі будзеш стрыгчы, то я тобе вершыка складу.

Згодзіліса. І, ано Шлёма скончыў, устае Мікола і чытае:

Яго ножны стукі, стукі,
А як возьмэ брытву ў рукі,
Як шарне туды-сюды,
Так не стане барады.

Хахочэ ўся корчма.

У трэйцёй хаці жыў коваль Овэль. Вон меў сына Хайма і дочку Нэху. Хайм не стаў ковалем, а меў гіншы гешэфт. Другім ковалем на селе быў Козёл Фома.

У пана Дзяконского было много земле, гэто од Крывулі, од самого полотна аж до Шэрэшова, усе ёго было. Меў вон землю і ў Ружанской пушчы і землю за Вэлікім Селом. Стары Дзяконскі лечыўса ў Варшаві і ў 1920 годзі продаў Волю і Бекешоўку немцу Драгайму. Драгайм лес вырэзаў у 1926 годзі, а землю продаў пэрэкупшчыкам. Гэту землю і ешы не вырэзаны лес купіў прамысловец з Бярозы Фінгельштэйн. Бекешоўку і Волю до 1939 года вон розпродаваў ужэ нашым людзям.

Уся Пружана топіласа дровамі. Гэто ж на кажды комін колькі дроў трэба было. Лесопілкі мелі жыды, воны закупалі лес на корню ў обшарнікоў і заготоўлялі осьмухі (1/8 частка кубічнага сажня дроў, сажэнь быў роўны 2м 10 см). Одного разу такі купец Ляцкі, наймаючы шанёўцоў, зорваў цэну за вывозку осьмухі. Усе село зробіло забастоўку і не хоцело проці двух злотых за

осьмуху, возіці по одному з половіною. Але одзін згодзіўся і на такіе грошы. Ляцкі і кажэ: "От, Мікола, можэ возіці, ёму выгодно, а вам не. Але вон розумнейшы за вас".

Вывэрнуўшы кожухі і завязаўшыса хусткамі, хлопцы пэрэпынілі того Міколу і попэрэрэзвалі ўжэ ў хамутах. Тут Ляцкі обачыў, што не можэ цягаціса з усімі і згодзіўся на два злотые за осьмуху, як і было. А коб заготовіці дрова, то за одну осмуху плацілі по злотому. На заготоўку ў лес ходзілі і молодые хлопцы, але воны не выроблялі только, як дорослые, которые моглі за дзень заготовіці по штэры-шэсьць осьмух, а молодые ано по дзьве. От, то про іх і говорылі: "По золотому і харчы з(у) дому".

Хто хоцеў найняціса до кого на роботу, то шоў до Белых Лавок і там ждаў, колі хто з жыдоў поклічэ, чы дрова порэзаці, чы хлева поладзіці, чы лёду наколоці для леднікоў, поладзіці моста, а то і просто ў шабэс ростопіці самовара чы печ. Бо ў гэты дзень воны не моглі навэць запалкі браці ў рукі. Было гэтэ чаканьне "под лаўкамі", як у той байцы з работнікамі на вінаградніку.

У Пружані была одна лесопілка, у Зэйды Круцеля, піўзавод у Померанца, гарбарня была ў Макарэвіча. Была ні одна кузьня, валюшная, маслобойня, мелосо тры паровых млына, сыроварні жыды трымалі на хуторах. А ўжэ краўцоў і шаўцоў не полічыці. Былі сярод іх і мэшчане, але колі ты хоцеў шось по-людску пошыці чы роскроіці, то шоў до Штамера.

Пружаны былі жыдоўскім мястэчкам. Торговалі з каждого окна Белых Лавок, торговалі по ўсіх Пружанах. Торговалі товаром дзяржаўным, быў такі цэнтар "Рольнік" і, конечно ж, прыватная вялікая лаўка Камінского, у Равіцкого была оптовая лаўка абутку. Нашые людзі з Шэнёў робілі не только ў Пружані, а наймаліса на роботу ў Беловежу і Ружанскую пушчу. Осушалі болота, дробілі каменьне на дорогі. Чэчко Ігнат, Чэчко Андрэй, Чэчко Володзя, Чэчко Васіль дробілі каменьне ўруч. Обмотвалі онучамі ногі і імі трымалі на наковальні камэня, по которому і білі молотом, а потом ногамі ссовалі ўжэ роздробленэ каменьне. Валікого камэня колоў Адамовіч Васіль, по-хатнёму Сепко. А рваў камэня Клемэз. Позьней гэтые дробільшчыкі замест онуч сталі на ногі надзеваці гумовые бахурэ, которые сталі шыці ў Пружанах і про якіе казалі, што "кажды белорус мае свой аўтобус". Гэто былі гумовые лапці, зшытые з мотоцыклетных опон. Іх сталі обуваці і на сенокос і ў поле на жніво – лапцей з лыка ужэ не носілі, бо "кожны белорус меў свой аўтобус".

Шане не моглі жыці бэз Пружаны, а Пружана не могла быці бэз Шэней. Жыды жылі своім кагалом і ў іх быў рабін. Рабін чытаў Тору, судзіў і радзіў усе іх справы. Усе сёла былі подзелены між імі і ано назначаны ім чалавек мог зьбіраці там онучы чы торговаці, чы купляці короў і целят. Рабін робіў монопольку, помагаў бедным і заступаўся за богатых.

У шабэс бронь божэ коб жыд узяўса за ножа чы за запалкі. Ні можна было і сало ім есьці, але былі і сярод іх, шо елі, бо дзе ж было сілы ўзяці, як цяжко робіў. Колі до цябэ ў хату прыходзіў жыд, то вон заўшэ здымаў шапку. Але колі вон попросіт воды і будзе яе піці, то зноў надзене шапку. Жыд заўшэ ест і п'е з покрытою головою. У суботу воны ніц не робілі, і німожна было нікуды рухаціса, але колі мусово трэба было кудысь ехаці, то Мовша под сено ў свой возок клаў бутылку з водою – і вон ужэ не ехаў, а плыў по водзе – то по моры плыці закон не возброняў.



מעינקע קאַין

מאַי אין מיכאַלישעק און סווינציאַן

א

וואָס טוט אין מיכאַלישעק דער מײַ אַצינד
אויב ניט צו ווײַזן וואָס ס'איז עלנטער פון אַ שטיין, –
און אויב דודס פידעלע איז אינעם ווינט,
קען נאָר אויף ייִדיש דודס פידעלע דאָ וויינען,
ווײַל נאָר אויף ייִדיש האָט דאָ מײַן פאָלק די זון געזען,
נאָר אויף ייִדיש איז דאָ די וועלט אַ מעשהלע געווען. –
איז אַ געבעט אַזאַ אין מײַן שטעטעלע געבליבן,
אַ געבעט, ווי די האַנט פון אַ בעטלער אַ בלינדן,
אַ געבעט אַז אויך גאָט זאָל סײַ זײַן האַס, סײַ זײַן ליבע,
סײַ שילטן, סײַ בענטשן אויף אונדזער איינציקן מאַמע־לשון,
אויף אונדזער ייִדיש אויסגעלאַבטן, אויסגעוויינטן מאַמע־לשון.

ב

ייִדיש, מיט שיכּורלעכן טעם פון אַן ערשטן קוש,
ווי מײַן מאַמעס אָנבליק פאַרגייט קיינמאָל ניט.
ייִדיש, צו דיר מײַן ערשט געשריי, צו דיר מײַן לעצטער קוש!
ייִדיש, מיט בלענד פון שײַטערהויפנס אָנגעגליט –
ווער וואַגט קענען אַזאַ גרויזאַם ליכט זיך ווערן?
דורך אַזאַ בראַנד בלײַבט פון שונא קיין זכר ניט.
ייִדיש, פראָסט ווי ליכט דורך חרובע געסעלעך,
ייִדיש, פשוט ווי די שטיינער וואָס האָבן געצאָרנט
קעגן שונא – אין ווילנער און וואַרשעווער געסעלעך.
אַזאַ טרער – אַזאַ פלאַם, וואָסער בעזעם קען פאַרקערן?
ייִדיש, ווי דעם מאַי איז דיר באַשערט אַזויפל יאָרן.

ג

וואָס איז אין סווינציאַן דער מאַי – מײַן קינדהײַט אַצינד,
אויב ניט אַקעגן זונאויפגאַנג – אַ בלינדער גרײַז.
אַז ס'קען דאָ אַ ווינטעלע, אַ בלום, אַ שטערן, אַ גראָז,
נאָר דעם אייגענעם טרויער די שיינקייט ווײַזן.
אַ ווינטעלע פלאַטערט, ווי אַ פאַרפײַניקט, גופלאָז קינד,
פון טאַטע־מאַמע, פון הימל און ערד פאַרלאָזן.
אַ בלום איז אַ פאַרשפּילטע, מאָרגנדיקע פרייד,
אַ שטערן איז – אַן אויסגערונען אויג פון אַ קינד.
און וואָס איז אין שאָטן אַ גראָז, פון זון און פעלד צעשיידט,
אויב ניט אַן אומרו וואָס פלאַפלט ניט דערזאָגטע רייד?
אַ ניט דערזאָגט וואָרט איז אַ קדוש – אַש אין ווינט.

ד

וואָם איז אין מײַנע שטעטעלעך דער מאַי אַצינד.
אויב ניט אַ בליִענדיקער פּחד איבער קברימלאָזע קינדער?
אַז ס'איז ניטאָ ווער ס'זאָל די שׂמחה פון אַ בלעטעלע דערזען.
ווי ס'וואָלט נאָר קיין שום אויג דאָ קיינמאָל ניט געווען.
איז דאָ אין יעדן ליכט אַ בלינדקײַט אַזאַ פאַראַנען.
וואָם קען דער זון מיט גבורה פון נאָר דעם אומקום באַפאַלן.
דאָם עלנטסטע שאָטנדל דערשרעקט דעם פריידיקסטן שטראַל.
איז דאָ אין יעדער בלום דער צאָרן פון דאָרן פאַראַנען. –
איז דאָ דער מאַי – אַן אויסגעזונדיקטער טוים.
איז דאָ די בענקשאַפט נאָך יִדיש ביז שטאַרבן צאַרט –
צאַרט. ווי אין ווינט – אַ האַרציִסנדיקע פליט.

ה

גוט וואָם איז מײַנע שטעטעלעך איז נאָך דער מאַי געבליבן.
די ווינטעלעך קושן נאָך פון יִדיש דעם פראָסטן קלאַנג.
דער יִדיש וואָם איז נאָך אין שאָרך פון חורבות געבליבן.
מיט גלי און ציטער פון קידוש השם אין יעדן קלאַנג.
אָ, וואָר ס'לאָזט ניט יִדיש. ווי אַ מאַמען ליב צו האָבן.
איז אָן ליבשאַפט. מיט שׂנאה פון אַ ראָב געבאָרן געוואָרן.
קען נאָר זײַן אייגענעם האַס ניט אויפהערן ליב צו האָבן:
אָ, ס'איז נאָך קיין גאָלד דורך פיַער פון האַס ניט געגאָסן געוואָרן.
אָ וויסט איז ער. ווי אַ מדבר־זינגער פון אַ שאַקאַלך־כאָר.
יִדיש, וויפל שטיינער, וויפל שׂנאה ס'וועט דעם וועג אונדז צאַמען.
וועלן מיר, ווי מאַי זיך רײַסן פון צעשפאָלטענעם שטיין.

ו

ברודער, אָן יִדיש, וואָם איז דײַן קינדהײַט, וואָם איז דער מאַי,
אויב ניט, ווי אָן בליטן – אַ הוילע רויז?
ברודער, אָן יִדיש, אָן דײַן קינדהײַט – אָן מאַי,
ווי רײַסט כּעס פון אַזויפל טויט זיך אַרויס?
אָ, יִדיש: טויזנט יאָר חלום, טויזנט יאָר מאַי!

סוויגציאַן

81053

Ідыш-беларускі слоўнік = ייִדיש־ווייַסרוסישער ווערטערבוך / сабраў і пераклаў на беларускую мову
И29 А. Астравух. — Мінск : Медисонт, 2008. — 928 с.

ISBN 978-985-6530-86-2.

У новым «Ідыш-беларускім слоўніку» зьмешчана лексыка найбольш вядомых ідыш-слоўнікаў (аўтары: А. Гаркаві, Г. Страк, Ю. Марк, У. Вайнрайх, Н. Стучкоў, Р. Лёцш, Э. Фальковіч, Ш. Роххінд, Г. Шкляр, Ш. Плаўнік, Н. Рубінштэйн, І. Бэрнштэйн, Ш. Бастомскі, І. Гуры, І. Ніборскі і інш.), апрача таго частка неапублікаваных фразэалягічных матэрыялаў з архіву Ш. Роххінд і В. Сосенскага, жывая лексыка ідышу. У слоўніку блізу 25000 слоўных артыкулаў, 50000 словаў, больш за 5000 прыказак і прымавак, вялікая колькасьць ідыёмаў і цытатаў з літаратурных твораў і жыдоўскіх песень, анэкдотаў, блаславеныі й праклёны, кароткая этымалёгія словаў, а таксама аднакарэнныя словы, сынонімы й антонімы да словаў сэміцкага паходжаньня. Апроч таго, ва ўступных артыкулах і ў дадатку шырока разглядаецца агульны беларуска-жыдоўскі моўны й музычны фальклёр. Слоўнік прызначаны для ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі й яе дзьвюма дзяржаўнымі мовамі: беларускай і ідышам.

УДК 811.161.3'374=112.28
ББК 81.2Идиш

Аўтар рыхтуе да выданьня ідыш-расейскі слоўнік
Автор готовит к изданию идиш-русский словарь

Даведкавае выданьне

Ідыш-беларускі слоўнік

Сабраў і пераклаў на беларускую мову
Аляксандар Астравух

ייִדיש־ווייַסרוסישער ווערטערבוך

געזאַמלט און איבערגעזעצט אויף ווייַסרוסיש פון
אַלעקסאַנדער אַסטראַווּך

Адказны за выданьне: У. Сілянок
Ідэя афармленьня кнігі: Аляксандар Астравух, Андрэй Гарбенка
Кампутарны дызайн: Зьміцер Міцура
Карэктары: Алег Хадыка, Юлія Міцура, Тацьцяна Лаўрык,
Галіна Рабянкова (літара "В")
Афармленьне форзацаў:
мапа „Lita (Lite): Jewish Lithuania" (аўтар Довід Кац),
мапа „Беларусь у канцы XVI ст." (аўтар М. Сьпірыдонаў)

Падпісана да друку 11.01.08. Фармат 70x100 1/16.
Папера афсэтная. Гарнітура Times New Roman. Друк афсэтны.
Ум. друк. арк. 107,2. Улік.-выд. арк. 135,2.
Наклад 1000 асоб. Замова N 5.

Выдавец і паліграфічнае выкананьне:
Сумеснае таварыства з абмежаванай адказнасьцю «Медисонт»
ЛИ № 02330/0133391 ад 19.07.04 г.
ЛП № 02330/0056748 ад 22.01.04 г.
220004, г. Мінск, вул. Цімірязева, 9.



ЖАМОЙЦКАЯ
ЗЯМЛЯ
КУРЛЯНДСКАЕ ГЕРЦАГСТВА
ЗЕМГАЛЬСКАЕ
ДЫНАБУРГ
ПАНЯВЕЖ
ШАДАЎ
ШАЎЛІ
КЕЙДАНЫ
ВІЛЬКАМІР
РАСІЕНЫ
ВЯЛЕНА
КОЎНА
ВЯРБІЛАВА
НОВ ТРОКІ
ВІЛЬНЯ
АЛІТА
МЕРАЧ
ГАРОДНЯ
ЛІДА
НОВАГАРОДАК
ВАЎКАВЫСК
СЛОНІМ
БЕЛЬСК
КАМЯНЕЦ
КОБРЫН
БЕРАСЦЕ
ПІНСК
ТУРАЎ
РАТНА
КАМЕНЬ КАШЭРСКІ
ЛЮБОМЛЬ
КОВЕЛЬ
НЯСВІЖ
КЛЕЦК
ЛЯХАВІЧЫ
СЛУЦК
МЕНСК
БРАСЛАЎ
ВІЦЕБСК
ПАЛЕССЕ

The Chronicle (Continued, 6857)

Of the Events

That Took Place in the Year

— The Second Year

of the Reign of

Queen Victoria

Of England

Of the Events That Took Place in the Year

Of Our Lord — Eighteen Hundred

And Thirty-Seven

Of the Events That Took Place in the Year

Of Our Lord — Eighteen Hundred

And Thirty-Seven

Of the Events That Took Place in the Year

Of Our Lord — Eighteen Hundred

And Thirty-Seven

Of the Events That Took Place in the Year

Of Our Lord — Eighteen Hundred

And Thirty-Seven

Of the Events That Took Place in the Year

Of Our Lord — Eighteen Hundred

And Thirty-Seven

Of the Events That Took Place in the Year

Of Our Lord — Eighteen Hundred

And Thirty-Seven